1

Маладняк

1932

ЕНСК

БЕЛАРУ

ЗЬМЕСТ

Стар.

Мірон Гельфэр. Волат 3

Сымон Баранавых. Два канцы 27

Ц. Зарэчны. Эльбрусы чалавечага шчасьця 45

П. Броўка. Уступ да паказу гэроя 69

С. Фамін. Наш крок (верш) 76

В. Маракоў. За тысячы новых тваіх Асіпбудаў (вершы) 79

Нарысы

Іван Гуцаў. У чым справа? 91

Я. Скрыган. Гомсельмаш 99

Крытыка

А. Салагуб. Клясавая барацьба ў літаратуры Заходняй Беларусі 119

Ул. Сядура. Камсамол у беларускай паэзіі. 142

Хроніка 157

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Зак. 3
6382

МАЛАДНЯК

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЯ і ГРАМАДЗКА-ПОЛІТЫЧНАЯ ЧАСОПІСЬ—ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ АСОЦЫЯЦЫІ ПРОЛЕТАРСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ

ПАД РЭДАКЦЫЯЙ
ІЛ. БАРАШКІ, П. ГАЛАВАЧА, А. ЗВОНАКА, В. КАВАЛЯ, Я. ЛІМАНОЎСКАГА, А. МОРКАЎКІ, А. СЯНЬКЕВІЧА

ГОД ВЫДАНЬНЯ ДЗЕСЯТЫ

КНІЖКА ПЕРШАЯ

МЕНСК ■ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ ■ 1932

Надрукавана ў друкарні
„ПАЛЕСДРУК“, Гомель.
Зак. № 1456—1700 экз.
Галоўлітбел № 364.

Институт литературы
им. М. Горького
АН СССР
37-10382п.

Мірон Гельфэр

Волат

(Апавяданьне)

Частка I

„Рэальнасьць нашай праграмы гэта жывыя людзі, гэта мы з вамі, наша воля да працы, наша гатоўнасьць работаць па-новаму, наша рашучасьць выканаць плян".

(І. Сталін).

Клюб пільні быў перапоўнены. Алесь Мікалаенка далей працягваў даклад.

— Пазыка „пяцігодка за 4 гады" ідзе на сацыялістычнае будаўніцтва. Частка з гэтых грошай, а менавіта 5 мільёнаў пойдзе на пабудову волата лясное прамысловасьці—на дрэваапрацоўчы камбінат, што побач з нашаю пільняю. Гэта будзе першы ў Эўропе камбінат.

Напружана слухае заля. Перад кожным, на месцы невялічкага гаю, выростае магутны камбінат. Усё мэханізавана. Растуць новыя цэхі, ахутаныя лесам, вялікія, цёплыя.

— Бамаўскую маленькую халодную пільню мы ператворым у музэй. Яе месца зойме мэханізаваны камбінат. Усё будзе пабудавана на кнопках. Націснуў кнопку і закруціўся варштат, вылецеў брус, перакінуўся, уляцеў у другі варштат і дошкамі пабег па шырокіх пасах.

На канцарэзках ня будуць відны пілы. Кнопку націснуў—выляцела з-пад нізу піла, адхапіла кавалак дошкі і зноў схавалася.

Па тэхніцы мы нашым камбінатам перагонім Эўропу...

... Невялічкі куток Беларусі, з групаю маленькіх пільняў раней, зараз перагоніць Эўропу.

Прахору стала сьмешна ад гэтае думкі.

— Ну дык хто за тое, каб пазычыць дзяржаве месячны заробак?

Мора мускулістых рук магутна паднялося ўгору.

Задумаўшыся, Прахор ледзь не прапусьціў галасаваньня і, схамянуўшыся, падняў абедзьве рукі. Калі-ж пасьля сходу падпісваліся на ліст, Прахор першы праціснуўся і вялікімі крывымі літарамі надрапаў „Курылаў", а потым падбег да Мікалаенкі і сказаў:

— А вось добра было-б, каб нас туды станкавымі.

— Лепшых, безумоўна, туды пашлём.

У нізе, крыху павярнуўшы ўправа, задумена, праносіла свае ціхія воды Бяроза.

На ўзгор'і рэдкі гай хвойніку стагнаў пад піламі. Дрэвы хісталіся, трывожна шалясьцелі сваімі галінкамі, нахіляючыся бездапаможна кружыліся ў паветры і потым падалі аб зямлю. Выкарчоўвалі пні. На зямлі аставаліся глыбокія раны. Кулацкая Жукава зямля ператварылася ў рытвіны.

Поле прыціснулі шпаламі, закавалі сталёвымі рэйкамі, і адвечную ціш прарэзалі першыя гудкі цягніка. Сюды імчаліся вагоны з жалезам, з каменьнем, з цэмэнтам, з цэглаю.

У Алеся Мікалаенкі на правай руцэ два пальцы, болей у яго няма. Тры захапіла шалёная польская куля ў Вільні каля вастрогу. Гэта было калі ён з атрадам чырвонаармейцаў абараняў горад ад белых. Ён ужо пасьпеў пранесьціся праз Польшчу з Гаеўскаю коньніцаю, секануць не адзін уланскі атрад, прайсьці праз Нямеччыну абяззброеным, і—працаваць напільні мэханікам. Цяпер ён вылучаны брыгадзірам па ўстаноўцы варштатаў.

Шкодзікаў Сяргей Паўлавіч быў прызначаны галоўным інжынэрам. Шкодзікаў меў свой асабісты погляд на жыцьцё. Раней ён працаваў у Астрахані, будаваў камбінаты. Часта наяжджаў да сваіх сяброў па лесатэхнічным інстытуту ў Маскву. Усе яны былі ўпэўнены ў тым, што надалёка той час, калі ад усяе палітыкі савецкае ўлады застанецца толькі шыльда: рынак разгарнулі, замежныя капіталістыя па ранейшаму бралі канцэсіі. Шкодзікаў увесь час быў супроць вайсковага камунізму і цяпер здаволена думаў, што самі бальшавікі ўпэўніліся, што шляхам вайсковага камунізму нельга нічога рабіць. Сацыялізм—гэта бязумоўны прагрэс чалавецтва, але-ж яго нельга прынесьці на штыхох. Дайце вольна разьвівацца прыватнаму гандлю, адчынеце вароты замежнаму капіталу і тэхніцы, ня руйнуйце найбольш здольных працаўнікоў сельскае гаспадаркі — кулакоў, і тады Расія хутчэй выкарабкаецца з адвечнае азіяччыны, і толькі поруч з гэтым льга будаваць сацыялізм.

Вось такую палітыку Шкодзікаў усхваляў-бы ўсёю душою. А то зрабіць пераварот у грамадзкай фармацыі, скінуць магутную клясу і невялічкаю кучкаю людзей кіраваць краінаю, насаджваць сацыялізм. І ўсе гэта на штыкох.. Не. Гэта выбачайце. Нідзе падобнага ня было і ня будзе.

І НЭП Сяргей Паўлавіч успрыняў, як першую ластаўку павароту да старога, за якою павінна быць яшчэ большае пашырэньне правоў прыватнаму капіталу. Ён гатоў шчыра дапамагчы савецкай уладзе ў гэтых мерапрыемствах.

Але потым з Шкодзікавым здарылася нешта нязвычайнае. Ён ня ведае, ці ён раней быў пад чадам НЭП'у і добра не прыглядзеўся, ці бальшавікі зноў захварэлі вайсковым камунізмам, але здарылася нешта ня так.

Прыватніка пачалі прыціскаць падаткамі, прымусілі адступаць. На межах краіны супроць капіталу выставілі штыкі. Манаполіі замежнага гандлю не зьнялі... І дзівакі-ж гэтыя бальшавікі. Яны думаюць тут пабудаваць сацыялізм. Тут у краіне цемры і азіяччыны? Нават іхнія лепшыя кіраўнікі як Троцкі і то пасьля шматлікіх спробаў, упэўніліся, што сацыялізму тут не пабудуеш. Яны думаюць што мы, інжынэры, выкліканыя гісторыяй весьці чалавецтва да прогрэсу, будзем самі зьнішчаць яго? Не. Мы будзем усяляк перашкаджаць рэалізацыі іхнае фантазіі. Не дапусьцім, каб экспэрымэнт сацыялізму рабіць на Расіі. Расію трэба далучыць да сям'і ўсіх эўропейскіх народаў, і гэта павінны зрабіць мы—інжынэры, зьяўляючыся ў век тэхнікі штурхачамі прагрэсу і цывілізацыі, накшталт філёзофаў даўнейшага Рыму...

Сяргей Паўлавіч тут ужо тыдзень. За 2 месяцы трэба скончыць рабочыя праекты.

Фалей прыехаў, на дзень пазьней галоўнага інжынэра. Нізкага росту, шырокаплечы, поўны тварам, з чорнымі вачыма, ён адразу кінуўся ў вір будаўніцтва. Фалей даўно ужо, з 1921 г. на гаспадарчым фронце. Тады ён зьмяніў вайсковы камунізм на НЭП, ЧК—на гаспадарчую работу, але на такім вялізарным будаўніцтве ён упяршыню.

„Трэба прысьпяшыць крыху Сяргея Паўлавіча з рабочымі праектамі. Хутка 20-е. Патрэбна разгарнуць будаўніцтва".

— Станцыя. Злучыце мяне з галоўным інжынэрам... Сяргей Паўлавіч? Добры дзень. Гэта Фалей. Але, Сяргей Паўлавіч, мы рабочыя праекты скончым да 20? Амаль—што? Іх трэба ўзгадзіць у Маскве ў Дзяржпляне? Яны-ж зацьверджаны. Удасканаліць, кажаце? Ну што-ж, калі знаходзіце патрэбным, дык едзьце. Аля хутчэй, калі ласка, варочайцеся. Падганеце іх. Добра.

Павесіўшы трубку, Фалей зноў углыбіўся ў кучы папер. Ляжаў цыркуляр з трэсту:

„З вызначанае сумы аб'ектаў будаўніцтва вам трэба дамагчыся зьніжэньня сабекошту на 12 проц..."

Трэба будзе склікаць трыкутнік і выпрацаваць праект загаду".

Перад тым, як разыходзіцца на работу, рабочыя згуртаваліся ля дзьвярэй сталоўкі каля загаду.

Загад № 1 па будаўніцтву камбінату.

„З 20 верасьня будаўніцтва камбінату бярэцца за нёпасрэдную пабудову цэхаў.

Шляхам сацспаборніцтва і ўдарніцтва нам трэба дамагчыся:

1. Зьніжэньня сабекошту на 12 проц.

2. Сваячасовага выкананьня вытворчае праграмы.

3. Поўнае ліквідацыі прагулаў.

Дырэктар камбінату Фалей.

— Напісана, а нават і не зразумееш. Колькі і чаго эканоміць, дык чорт яго ведае.

— Колькі-ж гэта—выкананьне вытворчае праграмы?

— Хто-ж у нас прагульнікі?

— На сонейка іх!

— Што гэта—12 проц.?

— Зьніжэньне заробку?

— Тав. Батукевіч, гэта трэба паставіць на сходзе, дэталёва абгаварыць.

— Тут нечага няясна.

Фалей дакладваў сходу:

... Да Кастрычнікаўскага сьвята мы павінны скончыць лесцэх.

— 1 студзеня фанцэх. 15 ліпеня белцэх.

Гэта баявая праграма кожнаму цэху, кожнаму рабочаму. Зьніжэньне сабекошту на 12 проц. я мяркую правесьці так: па кожным цэху складзены каштарыс. Мы складом каштарысы на ўстаноўку варштатаў, мататаў. Для пасьпяховага выкананьня гэтага, трэба, па прыкладу ленінградзкіх заводаў, аб'яднацца ў брыгады. Лепшым па выкананьні гэтых умоў будуць вызначаны прэміі...

Першым выступіў Алесь.

— Таварышы, каб пусьціць лесцэх да Кастрычнікавых сьвят—засталіся лічаныя дні. Толькі напружанаю работаю можна дамагчыся, каб скончыць у тэрмін. Я арганізаваў брыгаду па зборцы варштатаў. Давайце-ж нам каштарыс на кожны варштат з паказаньнем тэрмінаў.

Лёша Канчагін выступіў ад брыгады камсамольцаў па ўстаноўцы мататаў...

— Я прашу паказаць расцэнкі на маторы, забясьпечыць нас матар'ялямі і ад імя нашае камсамольскай брыгады, абяцаю скончыць да Кастрычніка ўстаноўку ўсіх мататаў.

Загаварыў Найман.

— Мы, каменшчыкі, таксама аб'яднаемся ў брыгады. Мураваньне электрастанцыі зробім ударнымі тэмпамі. Дайце нам нормы, расцэнкі. Выклікаем астатніх каменшчыкаў па нашаму прыкладу аб'яднацца ў брыгады.

Радкі загаду ўскалыхнулі будаўнікоў. Кожны цэх меў па некалькі ўдарных брыгад.

— Нашай брыгадзе даручылі ўстанавіць варштаты. На ўстаноўку варштату ідзе па 17 дзён. Расцэнка 400 руб. за варштат. Калі будзем працаваць так, як дагэтуль, дык ня скончым і за месяц. Нас-жа 5 чалавек. Будзем прасіць дапамогі.

Прахор не згаджаўся на дапамогу.

— Алесь, мы ўправімся. Можа толькі давядзецца адмовіцца ад выходных дзён.

— Значыць, Прахор кажа па-мойму. Ну, а вы, Мацеенка, Папоў ды Яфіменка?

— Крый, ад вас не адстаномся.

— Калі ўзялі, значыцца і выканаем.

Тады давай выклікаем Алёшыну брыгаду на спаборніцтва. Я думаю на такіх умовах: 1) абавязваемся да Кастрычнікавых сьвят здаць варштаты, 2) на гэты час адмаўляемся ад выходных дзён, 3) ніводнага прагулу. Ну як, усё здаецца?

— Не ня ўсё. Трэба дапісаць, што патрабуем, каб аддаць недакончаную царкву пад клюб. Самі грошы давалі на яе пры паляках.

— Гэта сюды ня мае дачыненьня.

— Нічога, давай сюды. Давай дапішам чацьверты пункт: патрабуем аддаць царкву, што будавалася на грошы рабочых, пад клюб.

Алёша пачуў невялікую пакрыўджанасьць. Як гэта Алесь аперадзіў камсамолію? Чаму яны не здагадаліся раней? Трэба чым-небудзь перакрыць іх.

— Хлопцы, сюды. Алесь нас выклікаў на сацспаборніцтва. Думаюць, што мы з іншага цеста зроблены. Яго ўмовы мы прымем, вядома Але давайце дадамо: калі ўстанавіць маторы ў тэрмін, дык выйдзе па 6 руб. 32 кап. на дзень. Я лічу, што гэта забагата. Давайце дапішам, што зьніжаем сабекошт на 20 проц., нам выйдзе па 4 р. і 74 кап. на брата.

— Давай, давай. А ну, хто каму падасца?

Ня сьпіцца Алесю. Горача ў грудзях. У галаве камок сьпякотных думак. Няўжо-ж прадзедаўскімі мэтадамі будаваць першы ў Эўропе камбінат? Дошкі раскіданы па ўсім пляцы. Перарэзваюцца яны ручной пілой. Праўду казаў Алёша, што трэба нешта з электрычным маторам прыдумаць.

Горача ў грудзях. У галаве камок сьпякотных думак. Алесь адкінуў коўдру. Рукою выцер пот з ілба. Варочаецца з боку на бок, і драўляны ложак скрыпіць, выдаючы непакойства свайго гаспадара.

Раптам Алесь усхапіўся з ложку, і пабег у куток. Знайшоў круглую канцарэзную пілку. Заварочаў у руках, надзеў на палец.

— Правады... Ток... Кружыцца... Дошкі... Рэжа...

— Што з табою, Алеська? ты зноў мармычаш! Трызьніш ці што? прачнуўшыся трывожна пытаецца жонка.

— А што? Я бегаў? Напэўна пра пілу гаварыў? Разумееш, ляктрычную пілу ўстанаўліваем з Алёшам. Ты злуешся? Ну, ня трэба, Варка. Ня трэба...

— Алёша, злучай правады—папрабуем.

— Гэй, сьцеражыся, пускаю!—У Алёшы пахаладзела сэрца,— і калі ток па мядзяных жылах прабег да сэрца матора і піла закружылася ў шалёнай віхуры—сэрца зрабілася гарачым, аж ня можна ўздыхнуць.

— Пайшло, рэжа!

Алесь прагна чапляўся вачыма за кожны круток пілы. Спыніў. Падцягнуў шрубы і зноў пусьціў,

— Давай, Алёша, дошку!

Ад націску дошкі піла глуха завыла, але ня суняла свае шалёнае бегатні.

— Глядзі—роўны кант! Ёсьць, Алёша!—і Алесь нязграбна абняў Алёшу сваімі вялікімі рукамі.

Пачало зьмяркацца. Заходзячы, сонца пакідала крывавыя плямы на рацэ. За ракой бранчала гітара, корчыўся і выгінаўся гармонік. Ціха хлюпалі чаўны. Ад скошанага сена разьліваўся прыемны водыр. На сенажаці іржалі коні. Ноч апускалася няпрыкметна, і лёгкаю чорнаю хусткаю атуляла іх. І ўсе гэтыя гукі здаваліся гукамі начы.

За зялёнай хвояй хаваўся месяц. Ноч тушэла, і, падмяняючы месяц, сям-там запаліліся электрычныя ліхтары.

У лесцэху ішла ліхаманкавая праца па ўстаноўцы варштатаў і мататаў. Брыгада Алеся Мікалаенкі канчала мантаж Баліндарскіх варштатаў. Прахор падцягваў раму, і ў тысячны раз пахваліў варштаты: глядзіце, якая ўдалая канструкцыя—Баліндары. Швэды—народ кемкі. Калі мяняць пілы—адчыняеш пярэдні валік, як фортачкі і, калі ласка, прастора. Ня тое, што ў Гофманскіх. Там мяняць пілы—адна пакута.

— Але,—згадзіўся Міцкевіч,—на гэтых варштатах можна будзе разагнацца. Я ня буду Міцкевічам, калі ня выганю 200 проц.

— Асьцярожна, не ганіся. Ты раней вывучы яго, выведай, чым дыхае кожны вінцік, навучыся яму дагоджваць, а потым можна разагнацца,—сказаў з упэўненасьцю Алесь.

— Гэта глупства, не такія вывучаў.

Алесь, рукавом спэцоўкі выцер тоненькія раўчукі поту, адшпіліў каўнер.

— Ай, з якою ахвотаю я-б цяпер прылёг... Як не кажы—трэцюю ноч ня сплю.

— То ідзі прыляж, Алесь. Тут мала чаго ўжо асталося, скончым самі.

— Ды не ўжо, хлопцы. Да ўсходу сонца дзьве гадзіны асталося. Вытрываю,—і раптам рвануўшыся, схапіў французскі ключ і з новаю сілаю налёг на шрубы.

— Зірні, хлопцы, і Шкодзікаў ня сьпіць.

— А што гэта за незнаёмыя з ім у капялюшох?

— Глядзі!

— Ша, сюды ідуць.

— Здраўствуйце, таварышы.—

— Добрага здароўя.

— Ну, што канчаеце мантаж?

— Але, Сяргей Паўлавіч, канчаем і, нават, да тэрміну,

— Добра. Канчайце — крыху замяўшыся і, здавалася, крывячыся прагаварыў Шкодзікаў. Праз хвіліну ўсе ўтрох яны пайшлі да басэйну.

— Чаго яны там швэндаюцца!

— Відаць, што аднекуль прыехалі.

— Але адкуль „аднекуль"?

— Чаго ты Яўхіменка, ачумеў? Напэўна з трэсту.

— Каб з трэсту, дык прывіталіся-б, а то павоўчу глядзяць.

— Ды гэта анжынэрыя іхная.

— А можа замежныя?—чамусьці падумалася Алесю, але думка праказалася ўголас.

— Шныпарылася вараньнё, чорнае, карклівае.

— Ведаеце, Варка,—гаварыла Жукава дзеверка ў чарзе па газу,—лесцэх укараціл, вунь—12 аршын не парэжа, скульля.

— Няўжо?—зьдзіўляецца Варка.

— Яй-жаж-богу,—шэпча яна на вуха,—учора гаварылі...

— Прахор, а падмуркі вашых варштатаў хісткія. Хі, хі, хі—яхідна пасьмейваецца ў казьліную бародку кулачок Станкавы Мацей.

— Сволач! Усё выдумляеш. Я-ж сам заліваў.

— Сам заліваў, але хісткія хі... хі... хі.

— Кар-кар-кар.—Сьцяна трэснула. Лесцэх ня пойдзе.

— Кар-кар-кар.—Варштаты складаныя, паб'юць.

— Кар-кар-кар.—5 мільёнаў нашых потных угробілі.

— Ах тя ядры тваю лапаць! Жукава падпявала. Ты-ж не працаваў—гарачыцца Алёша.—Дзе-ж тут твае потныя грошы?

— Але, сыночак, лесцэх ня пойдзе? Га? Будаўнікі! Галаштаньнікі!

Алёша ня змог стрымаць злосьці.

— Кулацкая морда, вон да Жукава!—і зьнянацку схапіў яго і шпурнуў з усходаў.

— Ага, электрастанцыю трэба ламаць. Раней корпус будуюць, а на машыны забыліся. Цяпер ламі. Савецкія будаўнікі,—мармытаў бяззубы Прозар, выгнаны з пільні за п'янства.

— А ты раней паглядзі, там-жа машыны стаяць, чаго дарма балбочыш.

— Не стаяць. Ламаць трэба,—са здаволеным тварам паўтарыў Прозар.—Мяне гоніце, а самі ня можаце.

— Чаго мелеш, старая падла, я там працую.

Шныпарылася вараньнё. Выдумляла, шаптала, каркала.

Шныпарыліся выгнаныя п'янчугі—Жукава племя.

— Ага! ня пойдзе цэх.

— Будаўнікі! Не бярыцеся, калі ня ўмееце...

— 5 мільёнаў нашых потных угробілі!

— Бім-бом,—жудасна ляскаюць медныя языкі на званіцы.

— Праваслаўны народ у царкву, „анціхрысты"—на камбінат!

— Бім-бом,—хочуць царкву забраць. Заступецеся, праваслаўныя!

— Бім-бом,—казалі—хлеба норму зьнішчаць.

— Ліецца зялёненькім струменчыкам хлебнае віно.

Ліецца, поўнячы чаркі і галовы.

Часта, калі бачыш перад сабой прорву, бяздонную, нямінучую, прорву, і калі табе страшна ў яе апускацца, тады топіш сябе, свае думкі, розум у гарэлку, як хворы бярэ хлараформ перад апэрацыяй, каб ня бачыць як па ім гуляе нож. Як бедны гаротны кулі бярэ опіум, каб крыху забыць сваё гора. І тады сьмялей ступаеш у прорву. Так і Масьлянік. Сёньня ён п'е ўжо другую шклянку і ніяк не п'янее.

— Бэлька, ліха тваёй матары, гарэлка слабая твая, давай яшчэ!

Апараж няюцца бутэлькі. Наліваецца галава, і думкі бракнуць, расьцякаючыся сьлізьзю.

— Нам ужо, братцы, амба, каюк. Камбінату на выкатку не патрэбны будуць коні, гэта ня пільня. Вунь канчаецца два вялікіх элеватары, якія самі з вады выкочваюць бярвеньне ў ярусы. Кропка... Трэба што-небудзь рабіць...

Масьлянік гэта ўжо даўно адчуваў, але яшчэ не хацелася верыць, што пойдзе лесцэх. А гэта ўжо факт. Вось заўтра спроба, і трэба даць лесу. Цяпер мы яшчэ патрэбны камбінату, а як пойдуць элеватары, нам дадуць каленам. Распадзецца арцель. Мінуць прыбыткі. Мінуць і жонкі Пятро і Міколы. Эх, жылося, а цяпер...

Мась янік схамянўся ўсім станам і хутка наліў яшчэ шклянку.

— Ну, дык што-ж маўчыце? Ці вас гэта ня тычыцца?

— Чаго малоць дарэмна языком. Нічога ня зробіш, прадамо коні і пойдзем працаваць. Чаго тужыць асабліва.

— Ды ты ратазей, чуй што кажаш. Што працаваць? Чаго працаваць! Пойдзеш за два рублі ў дзень. Будзеш жыць галадранцам, як Трахім!

— Па-мойму, таксама, што тутака зробіш? Сідар кажа праўду—пойдзем працаваць.

— Не, гэта ня плян, гэта значыць з торбаю па сьвеце хадзіць. Давайце вось што: заўтра субота, лесу дамо, а ў нядзелю баста: праваслаўны народ адпачывае. Хай яны папрабуюць элеватарамі. У нядзелю яны ад нас залежаць.

— Што-ж з гэтага толку, Масьлянік? Думаеш, гэтым іх застрашыць?

— Дурні вы! Мусіць, думаеце ня гэтаю галавою. Мы іх прымусім на год кантракт з намі падпісаць і тады—наша выйграла. Тут трэба ўзяць галавою, а ня тым, чым сядзіш. Лес выкочваць павінны мы і крышка,—Масьлянік залпам апаражніў шклянку.

— А ліха яго ведае,— падумаў Сідар,—паспрабуем, на кані ўсёж-такі вальготней жыць.

— Ну дык што—ідзе? Тота-ж! Бэлька, гарэлку давай!..

Сідар гэтае ночы ня спаў. „І што я за дурань? Мне вялікае бяды ня будзе, што прадам каня. Усёроўна на Масьляніка працую. Як п'яўка, сядзіць гэты крывапійца на мне і смокча. Яму гэта пагібель—ня будзе дурняў, каб за яго працаваць. Хай сам. Ня здохне. І сапраўды, што я за дурань! Чаму я згадзіўся ў нядзелю баставаць. Я-ж звычайна ў нядзелю працую. Гэты Масьлянік толькі ў бяду ўцягне. Пайду заўтра і дакладу дырэктару. Паабяцаю сам памагчы гнаць ранжыры. А Масьлянік хай сам галавою накладае. Так і зраблю. Пайду заўтра і дакладу".

Найман узрадаваны. Добра кладзецца цэгла. Вапна белаю масаю распаўзаецца паміж цаглінамі, запаўняючы шчыліны і застывае.

„Сёньня ніхто ня будзе дапікаць,—думае Найман. Я параўняўся з імі. Семнаццаць цаглін на 4-ты паверх без перапынку... Сёньня не адстаў".

І так, неўзаметку, задумаўся.

— Ну, што прыстаў, жыдзюга аднавокі? Цагліны давай!

— Зараз,—схапіўся зьнянацку Найман.

Ізноў паляцеў ён па ўсходнях уніз да вялізных клетак белае цэглы. А з ім ляцела і крыўда, маленькім камочкам падступаючы да горла. Чаму гэта—жыдзюга аднавокі, няўжо-ж у яго няма прозьвішча? Чым ён вінаваты, што бяльмо нажыў дробячы камень?

— Найман, сёньня скончыце чацьвёрты паверх?

— Але, Паўлік, павінны скончыць.

— Паўлікава таварыскасьць рашчуліла Наймана.

— Што ў цябе на пальцы, Паўлік? Націснуў?

— Ды тут цаглінаю... дробязь.

— Не, Паўлік, тут бруду ўсякага: можа быць заражэньне крыві ідзі перавяжы. Я сам цэглы накладу.

Найман зноў быў на чацьвёртым паверсе. Ужо 18 цаглін зьляцела з яго гарбаватых плеч. Цьвірка ня сунімаўся. У яго быў сёньня ўзьняты настрой: дома чакала гарэлка. Але з каго пакпіць? Вядома, з Наймана. Ён аднавокі і ціхі жыдзюга.

— Вось бачыш, Пеця, які забаўны гэты Найман, ты на яго пакрычы, і заваліць цаглінаю.

Пётру апальвае злосьць: на яго ў газэце быў зьмешчан артыкул, некаму галава баліць, што ён тры дні п'янстваваў, наша братва гэта ня зробіць, гэта Наймана работа. Трэба яго правучыць, пісаку.

— Давай, Цьвірка, прымусім яго цягаць па 25 цаглін. Хай здохне жыдзюга!

— Давай. І заскача ён тады. Гэй, аднавокі!

Найман кінуўся з усяе моцы да Цьвіркі.

— Хочаш, каб мы скончылі 4-ты паверх сёньня, нясі па 25 цаглін.

— Па 25? Ці занясу?

— Занясеш, ня прыкідвайся, усе вы хітрыя.

І пабег Найман зноў па ўсходнях уніз, а наверх цягнуў 25 цаглін. Муліла сьпіну, пот раўчком распоўзваўся. Карцела адна думка: трэба па 25, а то скажуць, што праз мяне ня скончылі.

— Глядзі, зараза, вытрымлівае па 25!

— Але, Цьвірка, ты бачыў, як блішчыць яго вока?

— Яхіднае жыдоўскае вока, я яго зараз заляплю.

— Заляпі,—зарагатаў Пятро,—дык ён і пісаць тады ня будзе. Спакойны—нікому не раскажа.

Найман зморана скінуў шостую ношку. Ногі перакошваліся ў каленках. Кашуля прыліпла да цела. Твар мокры, гарачы.

— Што прыстаў? Ужо замарыўся?

Найман, цяжка дыхаючы, стомлена павярнуў галаву і адзінае левае вока напоўнілася цёплаю вільготнаю кропляю.

— Што ўжо спускаеш дух? ха-ха-ха.—Цьвірка зелянеў ад прыступу злосьці і, пакамячыўшы ў руках вапну, кінуў у вока.

— На табе, жыдзюга, за брыгады і рабкоры!..

— Ай, вока, вока! Гвалт,—заенчыў Найман высунуўшы наперад правую руку, нібы абараняючыся ад каго.—Гвалт!—і ён калануўся ўсім целам, прысядаючы ад болю на калені.

— Што з табой?—кінуўся стары рабочы, каменшчык Піліп.

А Найман ужо качаўся па рыштаваньні, праваю рукою моцна сьціснуўшы вока. Сьцякаючы апошнімі сіламі, ён хрыпла енчыў:

— Ой, вока, ой вока.

— Што з вокам?..—Прымі рукі!

— Ой вока... Цьвірка...—паказаў невядома куды рукою Найман і ўпаў у няпрытомнасьці...

Зьвінелі тэлефоны...

Сьціслы маленькі камок вапны ўляцеў чорнаю варонаю ў цэхі, на рыштаваньні.

— Кар-кар, Найманава вока. Кар-кар, Найманава вока.

І здалося Цьвірцы, што маленькае, сплюшчанае, шэранькае вока, напоўненае цёплаю вільготнаю кропляю, забегала і некага шукала. Вось яно сунялося па ім і вырачылася. Зараз вырвецца і ляпне яму проста ў твар, як кавалкам вапны... Рванулася знаёмая сырэна і абарвалася нібы з некім змагаючыся. Зноў прагула ў паветры і змоўкла.

Пачаўся мітынг. Выступаў Піліп. У яго блішчэў шырокі лоб, у глыбокіх ямах хаваліся маленькія, выцьвілыя гадамі, вочы.

— Антысэміцкая гадзюка акутала Наймана і нас. Варожыя рукі кінулі едкі камок вапны ў вочы лепшаму рабочаму, кінулі, каб пазбавіць яго магчымасьці змагацца з імі. За сьпіною Цьвіркі—п'янчугі-прагульніка—хаваўся клясавы вораг. Ён прытаіўся і, як гадзюка, імкнецца ўсюды разьліць сваю атруту. Найман быў у маёй брыгадзе лепшым, мы яго перакінулі да Цьвіркі на дапамогу. Цьвірка пажадаў паслабіць рабочую клясу нацыянальнымі перагародкамі...

— Кулацкіх падсобнікаў ў Салаўкі!

— Расстраляць іх, гадаў!...

— Самім вапнаю заліць вочы!

— Найман наш! Суроваю пролетарскаю рукою пакараць іх!

Абураўся мітынг. Цягнуўся доўга і грозна. І яшчэ ня сьціхла гэтая грознасьць, як пачуўся голас:

— Аслабані праход!

Па праходзе, двое са стрэльбамі—правялі чалавека.

Заблыталася вялічэзная і нямая прырода ў сваёй хадзе. У шэрыя кароткія і дажджлівыя восеньскія дні, яна ўткала вясну.

Вясну з усяе яе вялічэзнасьцю, прыгожасьцю, ласкаю і радасьцю. Сонца вялікім вогненым клубам узьнімалася з-за лесу. Блакітнае неба апраналася ў чырвонае адзеньне раніцы. Ціха. Вецер прытаіўся недзе

пад лесам. Сонца бегала зайчыкамі па шкляным даху лесцэху. Пра крадвалася праз вокны і падала на Алеся так, што яму даводзілася прыжмурваць вочы. Але, хоць і прыплюшчыўшы іх, Алесь глядзеў на варштаты—ня мог наглядзецца. А варштаты стаялі, бліскучыя—гатовыя да работы.

Падбег Алёша ў новым гарнітуры, з выгаленым тварам.

— Ты ўжо тут, Алесь? Здароў!

— Здароў, Алёша! Не пазнаць цябе. Іш, як прыбраўся! Ну што-ж сёньня папрабуем, га? Мы таксама з маторамі скончылі... Як прышлося ўстанавіць апошні, дык ужо і рукі апалі—стаміўся, але як успомніў, што заўтра пуск, дык сьцяў зубы, налёг з усяе сілы і зрабіў. Падумай: 40 матораў за такі тэрмін. А зрабілі!

— І нам, брат, ня лёгка было. Апошнія дні бралі на ўсю. Ад сну адвыклі. А сацумову выканалі...

Рабочыя з усіх пільняў зьбіраліся на ўрачысты пуск лесцэху. Кожны ганарыўся сваім новым цэхам, што сатканы воляю і энэргіяй рабочае клясы.

— Ай, ладныя варштаты,—неўгамоньваўся Прахор.

— Глядзі, Гізуноў, тут бервяно без кантавіка накоціш. Толькі за дрот дзір... і бервяно ў цябе на вагонцы.

— Але,—згаджаўся Гізуноў,—гэта не бамаўскі самавар. Там чэравам, а тут болей розумам трэба.

На пляцоўцы стаяў Васіль са сваім амэрыканскім аўтавозам.

— Ну, Сідар, мінулі дзянькі. Цяпер можаш з сваёю гнядою лізацца цэлы тыдзень. Адным аўтавозам усё адвязу.

— Чорт з вамі,—чухаў Сідар патыліцу,—заганю каня, надзену лямец і на пляц.

— То-та, даўно-б так!

Але Сідар ужо ня чуў апошніх слоў. Ён залез пад аўтавоз, каб зьнізу паглядзець на такую веліч.

— Чаго там мацаеш, вытрывае. Зараз пабачыш, як ён пад чэрава шэсьць тваіх вазоў падбярэ, з тваёю гнядою разам.

... Зьбіраўся натоўп.

Мітынг.

Канчаючы прамову, Фалей аб'ясьніў:

— За выключнае гэройства, што забясьпечыла пуск цэху, прэміруюцца: брыгада Алеся Мікалаенкі па 100 руб. кожнаму. Брыгадзіру—месца ў санаторыю. Брыгада Алёшы Канчагіна па 80 руб. кожнаму. Брыгадзіру—месца ў санаторыю. Абедзьве брыгады занесьці ў чырвоную кнігу гэрояў будаўніцтва камбінату...

Пасьля, рукою, што можа ад хваляваньня крыху задрыжала-Фалей перарэзаў чырвоную істужку.

І пайшло, як-бы істужка разьвязала цэх, вызваліўшы яму хаду. З басэйну пачалі выпаўзаць 12 аршыновыя качалкі. Паўзьлі да вар-

штатаў і самі спыняліся. Прахор, успацеўшы ад пасьпешнасьці і ад нейкага новага адчуваньня, пад'ехаў на вагонцы, тузануў за дрот, і аднекуль выраслі тры вялізныя лапы, абнялі бервяно і ўскацілі на вагонку. Зноў пайшла саматаска, зноў паўзьлі бярвеньні. Прахор пазваніў—уключыўся матор. Нярухомы варштат захадзіў, замахаў шырокаю рамаю і, яквялізны страўнік, глынаў бярвеньні, неўзабаве выплёўваючы іх дошкамі.

А Васіль, дачакаўшыся першых дошак, абхапіў іх, зацісnуў жалезнымі лапамі, даў сьвісток і—паехала.

Упяршыню на камбінаце гуў матор. Цэх ажываў: шоргатам, рухам, людзьмі.

— Сьцяны не ўкараціліі. Старыя станкавыя на складаных працуюць.

— Значыцца, гэта былі кулацкія шэпты...

Заблыталася вялічэзная і нямая прырода ў сваёй хадзе.

У шэрыя, кароткія і дажджавыя дні яна ўткала вясну, вясну з усёю яе вялічэзнасьцю, прыгожасьцю, ласкаю і радасьцю. І прырода сьвяткавала—нарадзіўся першы лесцэх.

Частка II

У вялікай чырвонай камяніцы, зьмяшчалася сталоўка камбінату. Доўгі шэраг столікаў з венскімі крэсламі запаўняўся рабочымі. Быў абедны перапынак. Алесь Мікалаенка, хутка пераможваючы страву, чытаў „Пралетарскую пілу"—шматтыражку камбінату.

Пярэдні рад займала мэханічная майстэрня.

— Ну, цяпер супакоіліся, лесцэх пайшоў,—праказаў Мацеенка, цягаючы макарон з талеркі,—з тыдню, тры дні выходных, спадраду бяру.

— Але,—згаджаўся Яхіменка,—пакутны час прайшоў, адпачнем.

— Адпачнем,—падняў голаў Алесь,—а во!—і ён паказаў на раскінуты вялізны цэх.—Варштаты ўстанавіць: усе замежныя.

— Варштаты? Хай ужо немцу галава баліць, не адну тысячу агроб.

— Але, яму ўжо баліць. Дзе ён? Ён-жа фі-фі, птушкаю паляцеў у Нямеччыну.

— Як паляцеў? Чаго паляцеў?—зьдзіўляўся Алесь.

— А ан-жа, нагроб грошыкаў і фі-фі.

— Сур'ёзна?—Алесь ужо адсунуў недаедзеную страву і павярнуўся да Мацеенка. Можа жартуеш?

— Добрыя жарты, калі я сам бачыў.

— Вось як,—ужо сам сабе гаварыў Алесь,—вось гэта будзе гісторыя. Пайду да Фалея. Разьведаю.

Фалей сёньня прыехаў досьвіткам на камбінат, абышоў бел. цэх патрэбаваў ад галоўнага мэханіка плянаў будаўніцтва, доўга ў іх

поркаўся, вымяраў, потым з плянамі накіраваўся да галоўнага інжынэра, зачыніў дзьверы і праз гадзіну выбег расчырванеўшы, уляцеў у свой габінэт і засеў за паперы.

Алесь зайшоў ціха, ня хочучы перашкаджаць Фалею. На прывітаньне Фалей толькі кіўнуў галавою, вачыма не адрываючыся ад паперы.

Алесь падышоў да стала і па нэрвовым руху рукі, якая што хвіліну макала асадку, як быццам ня было атраманту, бачыў, што нявялікія літары расстаўляліся крыва.

„Прашу адтэрмінаваць пуск белцэху на два месяцы, бо прадстаўнік нямецкае фірмы Л..., які павінен быў устанаўліваць варштаты, часова паехаў у Нямеччыну..."

Алесь прачытаў і зьдзівіўся.

— Тав. Фалей, а чаму ён раптам паехаў у Нямеччыну?

— А лясун яго ведае. Кажа, што ўстаноўку такіх варштатаў трэба вывучыць.

— Ну, а што калі ня вернецца?

— Як гэта ня вернецца? Зусім?

— Ну, пазьней, ці хоць-бы зусім.

— Гэтага ня можа быць.

— Ведаеш, Фалей, у гэтым цяжка быць упэўненым. Трэба ўжыць якую-небудзь перасьцярогу.

— Дык я-ж ужываю, хіба ня бачыш.

— Вось гэта захады. Адтэрміноўку! Шукаеш самага лёгкага выйсьця. Падумай, што робіш.

— Я раблю як разумею,—сказаў успыліўшы Фалей.

— Як хочаш, а я пастаўлю на бюро парткалектыву. Гэта ня выйсьце.

— Станаві. Хто табе не дае.

Алесь адышоў ад стала і задумаўся:

— Ч-ч-чорт, каб нам самім, што ў гэтым скумекаць. Можа ня трэба адтэрміноўваць пуск.

— Адкуль нам у іх разабрацца. Гэта-ж замежныя,— і памаўчаўшы хвіліну Фалей дадаў:—зайдзі ўсё-ж-такі да Сяргея Паўлавіча, пагавары, я з ім таксама перагавару.

Алесь раптам ажывіўся. Ён, здавалася, ня слухаў Фалея, і апошнія словы яму перабіў.

— А што, Фалей, можа ўстановім бяз немца. Баліндары швэцкія ўстанаўлівалі-ж самі.

— Гэта складаней за баліндараў—і зноў паўтарыў не дачутае Алесем: — Схадзі да Сергея Паўлавіча, пагавары, потым заходзь мяне.

— Я такі пайду, а ты з адносінаю пачакай. З гэтым няма чаго сьпяшацца...

Зноў трывога апанавала рабочых. І новы лесцэх перастаў радаваць. Гэта прайшло. А вось трэба ўстанавіць варштаты ў белдрэўным.

— Крыўдна! - гарачыўся Алёша Канчагін,—крыўдна, разумееце, хлопцы. Мы перад немцамі на каленках павінны стаць.

— Давайце памазгуем... Можа на каленях станавіцца і ня трэба.

Алесь з Алёшам швэндаліся ўвесь дзень растрывожаныя па цэху.

— Мудрыя махіны.

— Не такія ўжо мудрыя. Галоўнае, гэта—нэрву знайсьці ў машыне, а астатняе—семячкі.

Алесь узяў каўпак ад нямецкае цыркуляркі і паварочваў у руках.

— Вось яна, простая рэч—каўпак. І пальцы цэлыя, а мы дурні да гэтага не дадумаліся, пальцы пазьбівалі, што грушы...

У мэханічнай падняўся лямант.

— Немца няма, сарве ўстаноўку Сяргей Паўлавіч.

— Трэба самім узяцца за ўстаноўку.

— Лягчэй там на паваротах. Варштаты нямецкія.

— А што, калі прасіць дазволу на ўстаноўку.

— Нічога ня выйдзе, не дазволяць. І нічога ня зробіце.

— Ня слухай іх, Алесь, хадзі!

— Не бярэцеся. Запамятайце, што гэта нямецкія. Нам у іх не разабрацца.

— Ша, таварышы!—падняў руку Алесь,—заўтра гэтае пытаньне будзе абмяркоўвацца на партбюро. Мы не дапусьцім адтэрміноўкі.

— Бярыся Алесь! Націсьні там!

Мікалаенку партбюро даручыла дамовіцца з Шкодзікавым пра белцэх. Адзін з радкоў пастановы быў такі:

„Цэх пусьціць у намечаны тэрмін. Ужыць усе захады для выкананьня гэтага“.

Цяпер Алесь Мікалаенка стаў ля дзьвярэй галоўнага інжынэра. Праз шчыліну незачыненых дзьвярэй ён бачыў, што суровы твар Сяргея Паўлавіча, утаропіўся ў нейкія пляны на сіняй паперы. Стала няёмка ўваходзіць. Але ўрэшце наважыўся.

Алесь пачаў:

— Да вас можна, Сяргей Паўлавіч?

— Калі ласка, заходзьце.

— Добры дзень!

— Здравствуйце. Сядайце. Што ў вас добранькага?

— А нічога, але я да вас з просьбаю.

— З просьбаю? Давайце,—Шкодзікаў адсунуў плян і павярнуўся да Алеся.

— Сяргей Паўлавіч, у белдрэўным павінен устанаўліваць немец?

Інстытут літаратуры ЦНК СССР. им. М. Горького

— Так. А што такое?

— Ня добра выходзіць. Ён паехаў і—як-бы не сарвалася...

— Ня турбуйцеся тав. Мікалаенка. Усе будзе ў тэрмін.

— А ведаеце...—Алесь крыху замяўся.—Што каб вы дазволілі ўстанавіць нам самім.

— Устанавіць. Што вы, Алесь Алесевіч. Гэта-ж дарагое імпартнае абсталяваньне. Што-ж скажуць рабочыя, калі...

— Вось яны і кажуць, што трэба ўзяцца самім.

Шкодзікаву зрабілася неякавата, і ён не знаходзіў, што-б адказаць.

— Вы, Сяргей Паўлавіч, сумляваецеся, што мы ўстановім.

— Дарагі, ды адкуль жа вы іх ведаеце? Я вельмі паважаю вас, як здатнага, кемнага, настойлівага мэханіка. Але гэтага вы ня можаце ведаць. Такіх варштатаў у нас яшчэ ня было. У нас, ведаеце, яшчэ азіяччына. Мы не дарасьлі да Нямеччыны.

Алесю зрабілася прыкра і ад гэтае сладычнасьці і ад гэтае песьні пра „адсталую Расію" і пра „перадавую Эўропу". Ён кінуў бы ўсё гэтае пустамельства і пайшоў-бы. Але яшчэ цяплілася надзея, што можа і ўдасца дамовіцца:

— Дык, Сяргей Паўлавіч, у вас зусім няма веры ў нашы жаданьні і магчымасьці?

Шкодзікаву здалося, што Алесь сьмяецца з яго. Ён закурыў цыгарку, глыбока зацягнуўся дымам і праказаў:

— Ад жаданьняў да сапраўднасьці—прорва. Але я вас, Алесь Алесевіч, добра разумею. Вы чырванееце за тое, што я даручыў устанаўліваць варштаты немцу, а ня вам. На жаль, нам яшчэ доўга давядзецца так рабіць. Мы не вінаваты—не дарасьлі.

— Я не чырванею. І мне ня сорамна. Але мы хочам устанавіць. Учора пра гэта была пастанова партбюро,—Алесь паглядзеў на Шкодзікава напірыста, доўга,—і ад вас, як ад галоўнага інжынэра, мы просім дапамогі.

— Я магу вам дапамагчы. Але,—Шкодзікаў махнуў безнадзейна рукою,—ад гэтага наўрад ці што выйдзе.

— Выйдзе,—загарачыўся Алесь, усхапіўшыся з зэдліку,—усё выйдзе. Нам толькі трэба ўзяцца. Тады ня толькі выйдзе, але і пабяжыць. А цяпер я пабягу ў майстэрню...

Разьвітаўшыся, Алесь хутка пакрочыў па гасьцінцу.

Дні ператвараліся ў ночы. Ночы ў дні. Сьцерліся лічбы, гадзіны. У белцэху людзкая рэчка абмывала варштаты. Вывучалі часткі, а мэханізмы не даваліся. Зморанымі часта кідаліся пад варштаты і клаліся спаць.

У першыя дні праца ішла туга. Аўладаць таемнасьцю нямецкіх складаных варштатаў было ня лёгка. Быў час, што пасьля двух тыдняў няўдалых спроб, брыгады адмаўляліся працаваць далей.

— Кітайская грамата для нас варштаты.

І ў адзін з такіх вечароў Алесь адклікаў Алёшу і на вуха сказаў:—комсамолія, сёньня пасьля сходу ў белцэх.

— А што ты наладзіў? Знайшоў?

— Прыходзь. Нікому не кажы. Можа наладзім.

Дні ператвараліся ў ночы, ночы ў дні. Сьцерліся лічбы, гадзіны. Алесь, вылаяўшыся, кінуў швэцкі ключ і сеў.

— Сядай, Алёша.

Алёша выцер пот і як няжывы кінуўся на дошку.

— Ну і немцы. Здаецца ўжо складзены, а халера ня ідзе.

Алесь, ужо крыху адышоўшы ад злосьці, успакоена зацягваўся махораю. Дым лёгкімі ўзьвізамі падымаўся ў гору і шэраватаю істужкаю прарэзваў змрок.

— А ўсё-ж такі, Алёша, разгадаць трэба.

Зноў сталі ля варштатаў.

— Валік вось так перакруціць. Так. А плашку збоку. Шрубы нацягвай слаба, вось так. Добра.

— А колца забыліся. У падшыпнік удзень.

— Гатова пайсьці.

— Гэй, сьцеражыся. Уключаю матор.

У Алёшы зноў пахаладзела ў грудзёх, так як тады, калі пускалі электрычную пілу. Закруцілася цыркулярка роўна, бяз дрыготкі. Усё было прыладжана да месца...

— Давай плашку!

— Ідзе!

Клёпка ляжала роўна і гладка.

— Значыцца, ёсьць!—крыкнуў Алесь, сам яшчэ ня верачы ў гэта.

З трэсту прыехаў новы тэхнарук, інжынэр Барковіч. Сярэдняга росту, шырокаплечы, хадзіў ён заўсёды спакойна і ўпэўнена. Шкодзікаў быў адкліканы ў Менск. Пра яго хадзілі розныя чуткі, але ніхто ў цэху толкам ня ведаў, што здарылася.

Барковічу даручылі мантаж белцэху. Ён зайшоў у цэх, калі пачало зьмяркацца. На ўстаноўцы разам з Алесем і Алёшам працавалі ўжо 12 рабочых з мэханічнае. Павітаўшыся, Барковіч запытаўся:

— Што, на другой зьмене працуеце?

— Не. Гэта яшчэ першая па-нашаму. Вось скончым устаноўку, і першая зьмена скончыцца.

— Значыцца, вы па ўстаноўцы цэху, вось і добра. Будзем разам працаваць.

— А вы да нас прызначаны.

— Але, я тэхнарук камбінату—Барковіч.

... З прыходам Барковіча работа пайшла спарней. З самае раніцы да позьняга вечару Барковіч, закасаўшы рукавы, стаяў з брыгадамі за зборкаю варштатаў.

Павесялеў цэх. Пайшлі жарты. Алеся называлі „інжынэр саматужнік". Гэта азначала –няпісьменны інжынэр.

Алёшу—„старэйшым памочнікам малодшага інжынэра".

Сёньня, Алесь, акінуўшы вокам убачыў, што палова варштатаў ужо ўстаноўлена. Ён дамовіўся, каб склікаць сход і вырашыць пра тэрмін пуску цэху.

У пастанове значылася: „Рабочыя па ўстаноўцы абавязваюцца ў тэрмін здаць гатовым цэх".

Фалей, атрымаўшы пастанову, доўга гутарыў з Барковічам. Аглядаў варштаты і, прышоўшы ў свой габінэт, знайшоў папку, дзе ляжала адносіна ў трэст пра адтэрміноўку пуску, якую ён тады не наважыўся зьнішчыць. Цяпер ён парваў яе на дробныя кавалачкі.

У час абеду Барковіч паклікаў Алеся і Алёшу ў свой рабочы габінэт. Выняў з шафкі нямецкую часопісь і паказаў.

— Вось такога тыпу пяць варштатаў нам давядзецца ўстанавіць. Алесь з Алёшам зьдзіўлена паглядзелі то на рысунак, то на Барковіча.

— Што-ж, нам цяпер ня вучыцца...

Праца пайшла, як лепш ня трэба. Брыгады давалі кожны дзень па чатыры варштаты. Весялей стала і ў хаце Мікалаенкі. Алесь прыходзіў з працы вясёлы, і Варка заўважыла, што ён пачаў яе нават лашчыць. А ў першы выходны дзень Алесь прынёс з гораду падарунак.

— Варка, прынёс я табе нешта цікавае, цікавае,—і сплюшчыў вока.

— Ну, што-ж там?

— Адгадай.

— Ня ведаю. Можа крамніна?

Пажартаваўшы, Алесь разьвярнуў газэту. Ніякае крамніны там ня было, а ляжала проста кніжка.

— Дык што-ж гэта?

— Акуляры, зноў расьсьмяяўся Алесь.

— Акуляры? Жартачкі яму, як-бы я ня бачу, што гэта кніжка нейкая. Я яшчэ не сьляпая...

— Ты, Варка, няпісьменная. Для няпісьменнага кніга—акуляры.

Я табе прынёс лямантар. Будзеш хадзіць да нас на лікпункт.

— Ну і гасьцінец,—абражана папікнула Варка. Але ўзяла і разгарнула.

— Алесь, што гэта за качарга?

— Гэта літара „Л".

. А гэта?

— Гэта ўжо цэлае слова „Ленін". Я табе дам прамфінплян па лікпункту. Да пуску цэху, ты павінна стаць пісьменнай. Да пуску ты будзеш лёзунгі чытаць мне ўжо. А?—як-бы запытаўся, гледзячы ў вочы, Алесь, і пакладзеная на плячо рука пацягнула да сябе.

Шкодзікаў убачыў неба праз іржавыя краты. Ён прабаваў разабрацца ў хаосе вельмі хуткіх, заблытаных уражаньняў. Процэс Рамзіна... Слабасьць і няўпэўненасьць мясцовае арганізацыі ў апошнія дні... Пагалоўны арышт.

Шкодзікаву здавалася, што ня ён за кратамі, а за кратамі закованым апынілася неба І неба такое далёкае - проста, здаецца, адплывае ўцякаючы.

Павольна, манатонна, падобна да кропель дажджу, працякалі дні. Урэшце, Шкодзікаў наважыўся напісаць Фалею ліст.

„Паважаны т. Фалей! Пасьля шмат начэй бяссоньніцы і перадуманага, я наважыў зьвярнупца да вас з вялікаю і маленькаю просьбаю. Прыедзьце да мяне на спатканьне. Мой лёс ужо вырашаны. Пра гэта ўчора мне паведамілі. Мне вельмі хочацца з вамі пагаварыць.

Ваш былы супрацоўнік.

С. П. Шкодзікаў".

Весела палае тырса ў вялізным горле. Агонь паўстае перш невялічкімі іскаркамі, а тады зьліваецца ў адно аграмаднае полымя.

Добра Савічу хадзіць каля катлоў і сачыць, як булькае вада ў вадамернымм шкле. Савіч правярае энжэктары, глядзіць на манамэтры і здаволена ўсьміхаецца, чуючы раўнамерны і няўтомны стук машын.

Падбег качагар Мадорскі.

— Савіч, напішы. Абавязкова прабяры іх, так далей нельга.

— Я ўжо закачу. Будзь упэўнены. У мяне яшчэ не здаралася, каб маіх не зьмясьцілі, паглядзі „Комуніст", там часта сустрэнеш мае артыкулы.

— Дык ты прабяры іх, хай лічацца і з нашай думкай.

— Можаш спадзявацца, мала ня будзе.

Дружна працуюць качагары, дружна абмяркоўваецца кожная думка, кожны недахоп, а Савіч рабкор, усё асьвятляе ў друку.

Накінуўшы чырвоную хустку Варка сьпяшыла з Алесем на працу. Яна таксама працавала ў белцэху (першыя дні ёй усё здавалася, што спозьніцца).

— Ну, хадзем, хадзем, Алесь—марудзіць, як баба.

— Чакай, тытуну хаця захаплю.

Варцы заўком даручыў адказную працу: зьбіраць подпісы жонак рабочых пад заявай пра высяленьне шынкаркі Бэлькі. Варка мела ўжо 15 подпісаў. Гэта толькі ў сушылцы. А наперадзе вялікі цэх.

— Дуня! Гэй, Дунька, хадзі сюды. Прыкладзі сваю лапу.

— На што,—зьдзіўлялася Дуня,—на Мопр.

— Не на Мопр, а каб Бэльку выселілі. Каб твой Прозар ня піў і ня зьбіваў цябе.

— Гэта было-б добра,—і яна падняла крыху прыпаленую ўчора руку. Але-ж як ён дазнаецца—прыб'е.

— Ня пужайся, заступімся, калі трэ' будзе.

— Ну, добра, галубка. Але не кажы нікому.

— Ды ладна. Пішы, ня пужайся.

Дуня з вялікаю натугаю надрапала „Прозарава".

— Глядзі, аж у сёмы пот кінула, а ў лікпункт ня ходзіш,— нядобра.

— Што ты, Варка, кажаш, калі-ж я час маю?

— Усё п'янага мужа даглядаеш?

— Што-ж зробіш, Варка, але-ж муж ён мне.

— Але-ж муж.

— Дзівачка, то што-ж ты думаеш праз дурнога і самой прападаць. Ну, ладна, а 5 гадзіне прыходзь на лікпункт.

Увечары Варка атрымала ліст ад сястры з калгасу. Гэта быў першы ліст, які Варка сама чытала. Цяжка, але сама. Язык блытаўся, словы чапляліся за зубы, застравалі ў горле, але сама. Сама Варка чытала першы ліст.

Алесь зайшоў, Варка радасная накінулася на яго.

— Чаго ты?

— Сама прачытала... Памятаеш, як лемантар прынёс мне тады ў падарунак.

— А, тота-ж. А тады была загневалася.

Раптам Варка задумалася.

— Чаго ты?—зноў запытаўся Алесь.

— З Прозараваю гутарыла,—гледзячы недзеў бок адказала Варка.— Пакута ёй. П'яніца муж, вечна калатня—загубіць ён яе... Трэба памагчы ёй, Алесь,—падняла голаў Варка,—давай паможам, Алеська, а? Таксама на лікпункт трэба...

— Во, за гэта малайчына... Дай хоць пацалую цябе.

І Варка пахіснулася на Алеся.

Загаварыўшыся з Мадорскім, Савіч ледзь пачуў хрыпат машыны. Зірнуў на вадамернае шкло, вада ўжо ня булькала, і хутка апускалася ўніз. Савіч трывожна крыкнуў Мадорскаму:

— Адкруці энжэктары, вады няма!

Мадорскі кінуўся да энжэктараў. Хутка адкруціў, але вада не паказалася.

Дарэмна чакалі Савічавы вочы. У вадамерным шкле вады не паказвалася ні кроплі.

— Зноў, напэўна, закавырка. Трэба прыпыніць машыну. Ідзі пакліч Барковіча.

Барковіч прыбег, засопшыся, ледзь пераводзячы дух. Абабег з усіх бакоў машыну, кінуўся да энжэктараў. Адкруціў і сьцяў сківіцы... Потым кінуўся да вадаправоду.

— Вады ня будзе,—панура абвясьціў ён.—Гэта вялікая музыка.

— Вады ня будзе? А што трэба рабіць?—запытаўся Савіч.

— Рабіць? Трэба шмат рабіць. Дзён дзесяць давядзецца рабіць, пакуль знойдзем аварыю.

— І электрастанцыя будзе стаяць?—усё яшчэ ня верылася Савічу.

І ніяк не магла ўкласьціся ў галаву думка: „як гэта дзесяць дзён стаяць". Вадаправод сапсаваны... Можа ўсім гуртам узяцца і за дзень зрабіць.

Стаў камбінат. Сталі цэхі, варштаты...

— Што здарылася?

— Чаму стаім?

— Электрастанцыя сапсавана. Вады няма.

Рабочыя кідаліся з усіх бакоў да свайго сэрца—да электрастанцыі.

— Тав. Барковіч, чаму мы стаім?

Савіч упарта сачыў за інжынэрам, як-бы чакаючы ад яго выратунку.

— Тут, відаць, шкоднікі пастараліся. Вадаправод на такой глыбіні праклалі, а пра тунэль і не падумалі. Цяпер на дзесяць дзён станем Трэба раскапаць увесь вадаправод, інакш нельга дазнацца, дзе сапсавана.

Рабочыя стаялі абуранымі. У кожнага тарганулася нянавісьць.

— Ы, сволачы! На кожным кроку рагаткі ставілі!

— Дзе ён, галоўны інжынэр?

— Дзесяць дзён стаяць камбінату?!

— Дзесяць дзён! Дзесяць дзён!!—стаяла ў кожнага трывожная думка.

„Тунэль не зрабілі, думаюць, рабочыя самі ў трубу ўлезуць".

Рабочы сам у трубу ўлезе? Як гэта сам? А няўжо-ж гэта можна,—думаў сам сабе Савіч.—Гэта ў трубу, па якой вада ідзе, туды пад зямлю, у гэтую бяздонную прорву. У цёмную трубу?—Савіч не зна-

ходзіў сабе месца. Ён бегаў, марыў, зазіраў у трубу і твар пакрываўся жахам. Пасьля бегаў ад рабочага да рабочага, нешта гаварыў, спрачаўся.

— Ну, чаго думаць,—гаварыў Барковіч,—бярэце рыдлёўкі і за работу.

Рабочыя накіраваліся да кладовае.

— Стой!—раптам моцна закрычаў Савіч.

Усе зьдзіўлена азірнуліся на яго.

— Як—дзесяць дзён капаць?

Нехта ўсьміхнуўся, а нехта з натоўпу крыкнуў:

— А што, дзівак—дзень думаў.

Савіч быў у роспачы. Яго не разумелі. Рабочыя зноў рушыліся па рыдлёўкі, і ён адчуваў, што чым далей яны адыходзяць, тым больш таропка і мулка б'ецца ягоная думка. Савіч падбег да інжынэра, пацягнуў яго за рукаў.

— Тав. інжынэр, а што можна яшчэ зрабіць, каб хутчэй пайшла станцыя?

— Што? Нічога! Трэба капаць,—і падумаўшы крыху, дадаў як бы сам ня верачы ў гэта,—можна было-б у трубу апусьціцца, але гэта вельмі рызыкоўна. Гэтага нельга.

— У трубу? А за колькі праз трубу можна знайсьці аварыю?

— Праз трубу хутка. За паўгадзіны.

„Дзесяць дзён і поўгадзіны. Дзесяць дзён і поўгадзіны,—тукала ў Савіча ў галаве разам з крывёю. Кроў напірала ў вены.—Дзесяць дзён і поўгадзіны".

— Я палезу!

— Што ты ачумеў?

— Успомні пра сям'ю!

Рабочыя паварочаліся і абступілі кругам.

— Я, як адказны за небясьпеку забараняю вам гэта рабіць,—праказаў спужаны Барковіч.

— Я палезу ў трубу!—падвышана і ўпэўнена крычаў Савіч.

— Хочаш хуткай сьмерці?

— Не рабі глупства!

— Хай сьмерць—я палезу... Шкоднікі думалі, што мы ў трубу не палезем? Палезем. Палезу!—У Савіча горача білася сэрца там, дзе ў бакавой кішэнцы ляжаў білет камуніста.

— Я палезу!

— Можаце лезьці, але я не адказваю за ваша жыцьцё.

— Ладна, не адказвайце!

Савіч апрануў бразэнтавы спэнсэр, запаліў ліхтар „Сьветлана" і, блытаючыся ў хадзе, накіраваўся да трубы.

Падышоўшы ён зірнуў у яе бяздонную глыбіню, аглядзеў нярухомы натоўп, і ціха сказаў:

— Каб падняцца—трасяну вяроўкаю,—і пачаў апускацца ў трубу.

— Гэй, разьвітайся хаця з жонкай!

— Маўчы, дурань,—буркнуў Алесь, акуратна спускаючы вяроўку.

Раней зьнікла галава,—пасьля стан, пасьля ногі, і ўжо толькі вяроўка бязупынна апускалася ўніз. Натоўп стаяў нярухомы. Згрудзіўшыся ўсе напружана глядзелі ў чорную пляму глухое дзіркі.

Праходзіць хвіліна... пяць... восем... дзесяць... дванаццаць—няма Савіча.

Вяроўка не трасецца, а толькі шпарчэй апускаецца ўніз. Па натоўпе бегае непакой. Але ніхто ня хоча паказаць яго. Рабочыя стаяць моўчкі. Перад кожным стаіць Савіч: наважваецца лезьці ў трубу.

Чаканьне робіцца мулкім.

— Чаго яго няма?—ня вытрымаў Мадорскі,—і вяроўка не апушчаецца ўніз, і ня торгаецца.

— Гатоў захлібнуцца...

— Што думаеш...

... Мадорскі хутка нацягваў вяроўку і апускаўся ўніз. Можа трэба памагчы ці выратаваць.

А Савіч поўз па трубе, мацаючы рукамі сьценкі халоднага бэтону. Галава ўлараецца то аб адну, то аб другую сьценку. Балюча але некалі скардзіцца. Дзесяць мэтраў.. дванаццаць... восемнаццаць... дваццаць. Але далей загін. Каб яго пралезьць трэба цела выгнуць паўкругам. А што там. Як вылезьці пасьля. Але ўспомнілася дадзенае абяцаньне. Савіч прасунуў голаў, выгнуў сьпіну—нешта хруснула. Пралез. Дваццаць пяць мэтраў. Няма... Савіч ужо абліваецца потам. Мала паветры. Холадна. Мокра. Цемна. Дваццаць шэсьць... Дваццаць сем... Коўзаюцца рукі па халодным і няроўным бэтоне. Дваццаць восем... Дваццаць дзевяць... Вось аб нешта зачапілася рука. Савіч прысунуў ліхтар, пасьвяціў і перад ім вырасла шчыліна. Вось яна—на дваццаць дзевятым мэтры. Савіч яшчэ раз рукою аб. вёў яе—„на дваццаць дзевятым капаць". Як-бы звалілася ўтома і цесная даўкасьць.

І раптам пацямнела ў вачох, як быццам ліхтар патух. У галаве зашумела. Закружылася... Галоўны інжынэр... Алесь... Вяроўка... Дваццаць дзевяты мэтр..

...Праз пяць хвілін дрыгнула вяроўка. Савіч ляжаў у няпрытомнасьці на зямлі і праз няпрытомнасьць нешта сіліўся сказаць.

— Дзевяць... дваццаць... дзевяць... дзевяць...

— Зьмераць канат!—загадаў Барковіч.

— Дваццаць дзевяць мэтраў!

— На дваццаць дзевятым капайце!

... Пад вечар, калі сонца захлібаючыся апускалася за сіняе мора небасхілу, зноў задымілі чатыры люлькі. Закруціліся машыны, пайшлі цэхі.

На заўтра, у вывешаным загадзе было: „За выключнае гэройства і самаахвяру па ліквідацыі аварыі на электрастанцыі качагары Савіч і Мадорскі прэміруюцца: месячным адпачынкам у санаторыі, гарнітурам і 100 руб. уснагароды кожны. Абодвых занесьці ў чырвоную кнігу гэрояў камбінату. Тэхнаруку Барковічу на працягу 10 дзён выпрацаваць праект тунэлю.

Дырэктар камбінату Фалей".

За цэхамі сьпявала сваю адвечную песьню красуня вясна.

Ноч апускалася нябачным дываном з вышытымі аксамітам зоркамі і турэцкім месяцам.

Гудзеў камбінат, сатканы з рабочай волі і энэргіі.

У неба курыліся чатыры люлькі дымароў электрастанцыі.

Менск. Сьнежань 1931 г.

Сымон Баранавых

Два канцы[1]).

(Аповесьць)

Частка трэцяя

1.

Цэлым днём ня сыходзіла сонца на Муравейнікаўскае поле. Як гультайства ўспала на яго, ці як баялася яно халоднага на зямлі сьнегу: ня вылазіла з-за хмар, што растрос вецер зрэбнаю кудзеляю.

Сіратою пакінутае вісела над зямлёю калматае неба. Па чарзе пасылала на зямлю нашатыраную кастрыцу-сьняжынкі. Падалі невінаватыя сьняжынкі—сотым разам у гэтую зіму тарнавалі на зямлі чалавечы сьлед. Хацелі, каб зямля была ўся адным непачатым кавалкам . . . каб не пачапаў хто больш, імі заваскаваных, разрэйпаных земляных шчылін.

А калі прышоў на Муравейнікаўскае поле вечар—спудзіліся сьняжынкі—аселі разам з днём на земляное седала. І ціхата распусьціла свае крыльлі па ўсёй ваколіцы. Толькі калі-б углядацца гэтым вечарам з Чырвонаўскай гары, можна было ўбачыць: белы сьнег, а на сьнезе чорная кропка. Не спазнаць здалёк што на сьнезе—чалавек гэта, ці зьвер. І ўсё забірала чорная кропка далячыню—меншаю рабілася на разасланым бела-ўзорным сьнежным абрусе.

От-жа і быў у чорнай кропцы Даніла Шчупак. Ішоў ён прамі-ком—ламаў на Муравейнікаўскім полі цаліну.

Прыехаў Даніла з Луцішча, як ужо на дварэ быў сівы змрок вечару. Без па пытаньня швэндаўся змрок па заканурках гаспадаркі—злосьць узводзіў на здарожанага чалавека.

— Хай бы было яшчэ кавалачак дню, выпрагаючы каня, засмаргу калупаючы ў хамуціне, думалася Данілу.—Не пасьпееш азірнуцца, як дзень хвастом перад табою вільне.

Засмарга, была, зацягнулася туга. Калі вузел яе аслабляў, загнуў пазногаць зажывое. Яшчэ большая злосьць апанавала старэчае сэрца. Плюнуў ад злосьці на той вузел, ды расьцёр сьлінаю сырамятную супоню.—Дастаў туга зацісьнуты канец сырамяці.

— Вот...

---

[1]) Глядзі № 9, 10, 11 і 12 за 1931 г.

Скораю рукою, тады, адпрог каня—хамут унёс у цёмныя сенцы. Жонка пачула прыезд—сустрэчаю стаяла перад мужам. Сьпешкаю зачапіў хамут паўшорамі за цьвік, сказаў да жонкі:

— Паглядзі чаго-небудзь перакусіць... ня стой... пайду ў Муравейнікі.

Дзіву далася кабеціна:

— Чаго-ж, ты... поначы, ды па сьнезе?

Даніла буркнуў з неахвотай:

— Потым будзеш ведаць... Ды не канечне ведаць пра ўсё: не твайго бабскага розуму дзела. Калі патрэба наверазлася, дык і ноч і сьнег, і ліха—нагамі падбярэш... Ідзі, нябожа, паглядзі чаго-небудзь мне для вострага зубу.

Скрыпам цёрся пад Данілавымі нагамі, скарынкаю залядзянеўшы сьнег. Палахліва кідалася на ўхабы ад Данілавай хады, вартавая цішыня. На заўсім нехта выцер у гэты вечар, сухою фанцінкаю, захадам напражанае, неба. На чыстым яго палатне—зоры былі рассыпаны як далёкія зёрны з веялкі. Чарадою сабраныя зоры пазіралі на зямлю—гаварылі: „Чаго трэба швэндацца чалавеку па начных заканурках? Чаго шукае нязгубленага гэты чалавек?"

А Даніла ішоў да Ахрэма Танцулькі. Поўнае сэрца бяды-клопату нёс да свайго суседа. Быў сёньня ў Луцішчы, а тамака сваімі вушамі чуў, што калгасы будуць убірацца ў сілу. Мужчыны, былі, сабраліся ў Ёселевай завозьніцкай—чыталі адзін перад другім надрукаванае ў газэце, гаварылі: „Хто ў калгас ідзе—карову пакідаем на сям'ю... сьвіней зможа гадаваць—сам сабе... агарод засяваць—сам сабе. Ад калгасу будзе выдавацца, хто які зробіць вырабатак, харчам...

Слухаў тых мужчын і прыкрасьцю агарнулася Данілава нутро. Праз увесь час чакаў—кпінкі брытваю вастрыў над калгасам. Думаў, што ня будзе жыцьцё такім паддатлівым: адойдзе яно назад як тая марская хваля,—ізноў застанецца адзін сухі бераг з пазлацаным прыбярэжным каменьням.

Дык ня ведае Даніла, што яму цяпер рабіць, якую ўзяць ад свайго жыцьця параду.

Пакідаў на зорным сьнезе нікому непатрэбны свой сьлед—далей усё адыходзіў, нёс пакрыўджаную чуласьць. І от калі ішоў напрамкі па сьнезе—Вацік Такарскі ня сыходзіў з яго думак.

Калі ўзяў Ваціка з дарогі да Чырвонага, як усёроўна ўсю бяду свайго жыцьця падабраў. Дзе ні сустракаўся з Вацікам—торгала Данілу дрыжачая боль. От як бярэ яго гэты чалавек за загрудкі ды кажа: „Ідзі туды... аддаю табе загад: бяры ўсю сям'ю, усю гаспадарку ды ідзі... прамяняй сябе на калгаснае жыцьцё".

Тады гаварыла за Данілу разагнаная яго кроў. Яна хадзіла цьвёрдымі выступамі па Данілавых жылах, бурапеніла ліхім адчаем, ды—

„А няўжо я ня здолею сказаць гэтаму гарадзкому нахлебніку свайго перакорлівага слова? Няўжо аслабла воля майго кулака? Няўжо аддам я ў падарунак мае кірмашовыя выезды... ня буду чуць з-заду, за маёй драбінкаю, як фыркае над самым вухам конь... як ён глэмае на бягу з драбінкі пахучае сена... А мой, абнесены клянамі, ды прысадамі, хутар... Дзе я знайду яго мяжу, калі будзе ўзрыта ўся яе цаліна? Клён пад маім вакном можа прастаяць да маёй сьмерці. А калгасныя тапары не ў пару сьсякуць яго“...

— Трэба ўсё-ж такі невашта рабіць.

Танцулька папарадзе за Данілу знайшоў чуткі, што былі ўпісаны газэтамі. Ён іх у бяду ўвярцеў ды насіў за пазухаю, каля самага сэрца. І гэта яшчэ нічагусенькі, калі-б не загарэўся Ахрэмаў сьвет з Міхася Кляўковага.

Усёроўна як узяў нехта моцнаю рукою Ахрэмаў сьвет за загрудкі, ды так страсянуў, ажно не магло застаяцца ніштo на сваім месцы. Ад уструсу на сярэдзіне дарогі быў пакінуты Ахрэм. Уцяміць ня мог, ня ведаў на які канец дарогі, па якой жыцьцё чалавечае спацыруе, больш будзе выйгрышным пайсьці.

А чуткі пайшлі па Муравейнікаўскіх дварох цэлым табуном, што:

— Танцулька хацеў Міхася скусіць.

— Подпіс быў Танцулькаў, як ад усяго калгасу ў раёне, нашчот Міхасёвага высяленьня.

— Міхась ня любіць вока жмурыць: не раз Харытону ўпікаў пра сельсавецкі парадак, дык і Харытон на Міхася ўзьеўся.

— У адну дудку іграюць Харытон з Ахрэмам.

Стары Старавойт не сьцярпеў—злосным прыскам асыпаў Ахрэма.

Прышоў Ахрэм да Старавойта для заўтрага работу вызначаць, а ён—

— Навошта, табе, Міхась? Што зрабіў Міхась табе, што ты пісьмы пішаш раёну? Ды яшчэ і нас падстаўляеш: мы нібыта хочам, каб Міхася саслалі. Калі-ж, гэта, мы цябе Ахрэм прасілі на гэту ласку? Ты, чалавеча, ня будзь задзірыстым. Не даўніна чалавеча. Кемім каго трэба, калі пайшло на тое, каго трэба выкулачваць.

Вытрашчыў вочы—глядзеў Ахрэмаў у маршчыністы Старавойтаў твар. Ня мог абабрацца ад дзіўнага: „Каб хто, а то стары казьляк... З жызні трэба зводзіцца, калі гэткія пачнуць цябе вучыць“.

Дадому, быў, прышоў, а жонка ні з сяго новае паднесла. (Кожным разам гэтак бывае: любіць расьці чалавечая няўдача аж да самага цьвету):

— Прасіла-ж я,—казала Наста Ахрэму,—ня пішыся. Дык, не: дзето відана, каб Ахрэма узяў ды паслухаў сваю жонку! Людзкія, нябось, слухаюць і розум свой дзеляць напапалам. Паслухай унь, што цяперака сяло гаворыць. Кажуць, што хутчэй трэба калгас рых-

таваць. Кажуць, што ты унь і каровы патруціў. Банадысіха казала—напісалі на цябе аж у Маскву, у суд. Абмызгуйся цяпер, як той лыска.

Словам не абазваўся быў на жончыны ўпічышчы. З хаты выйшаў і, ня ведаў чаго, а вельмі было нечага шкода. Ішоў на сваё да калгаснае прыгуменьне і на ўспамінак узбрыло, як лягло на далонь, усё яго жыцьцё. Момантам трымаліся на памяці адлічаныя гады жыцьця. Як раз як некалі быў хлапчуком-падросткам—тапіўся ў Муравейцы, дык жыцьцё за адным разам мільганула бліскавіцай. Аж холадам прабрала Ахрэмава цела—сьцепануўся быў ды:

— Я-ж не таплюся... што гэта за трасца... ці не захварэў, бронь божа, я?

Рукі ў рукавы ўтышчыў глыбей—пайшоў да подстрэшку. А там, цэлы зьезд калгасных саней... А пад падстрэшкам абагуленыя калёсы. Не ўлезьлі ўсе пад страху Старавойтавы, Халімончыкавы, ды Янушкавы—стаяць сьнегам абцярушаныя. Марозам умарожаныя ў зямлю. Чакаюць пакуль не надыйдзе вясна, ня возьме іх на сваю патрэбу.

Падыйшоў бліжэй да падстрэшка—убачыў сваю драбінку. Сам паставіў яе на сярэдзіне падстрэшку: каб мяцеліца не забівала праз адчыненыя закоты... Гэтак праз цэлых некалькі дзён: не сваім быў сам, а чужым—чэўраў сухою нэндзаю.

А ўчора новая лягла бяда на Ахрэмавы плечы. Ня гэтак толькі лягла як на суседа Данілу, а цяжэй—стопудовым каменем. Па свойму разумеў сусед, што пісала ў газэтах далёкая Масква пра калгасную сілу, па-свойму на розум браў напісанае Ахрэм. Дык і ня дзіва, што большым пластам нэндза асела, ды калупала Ахрэмава нутро.

... Узышоў Даніла на Ахрэмаў двор і ад нечаканасьці зьлякнуўся: каля падпаветкі тышчылася чалавечая цень. Да Ахрэмавага вушака прытуліцца хацеў, а цень вышла сваёю выразнасьцю насустрэчу.

— Хто тут?—запытаў голас невядомага чалавека.

А Даніла спуджана-нясьмелым адказам:

— Я.—І таксама ішоў сустрэчаю.—Ці ня злодзей лазіць па чужым двары?—кінулася Данілу думка. Але двума крокамі зямлю зьмераў, пазнаў незнаёмага чалавека:

— Каб ты цяміўся,—сказаў,—чаго-ж гэта ты ходзіш начніцаю? Добры вечар!

Ахрэм не падарыў адказу на прынесеную дабрату вечару. Усёроўна як ведаў, чаго прышоў сусед. Сьціснутую холадам падаў руку.

— Ну дык, ідзем... сказаў Ахрэм,—у хату.

Не парушылі дворнай ціхаты, пакуль у хату ішлі. Кожны сваю сам тасаваў развагу. Невядома чым гаварыла нутро гэтых двох чалавек. Мо' думаў Даніла пра сьнег, што шмат яго на Ахрэмавым ганку натаптана ды не саскрэбена; можа думаў Ахрэм,—што-ж прынёс Даніла яму гэтым зімовым надвячоркам.

Калі ў хату ўвайшлі—кінулася Данілу: спала Ахрэмава сям'я. На ўсю хату вісячая лямпа раскідала ўскручанае сьвятло. Пасьля цёмнага надворку вочы прыжмурыў—сказаў да Ахрэма:

— Навошта такі агонь у лямпе, калі ніхто нічога ня робіць?

— Весялей... да лавы ідучы адказаў Ахрэм.—Газы даюць, дык няхай гарыць.

Ды ізноў (усёроўна як вельмі трапны знайшоў адказ):

— Калі гарыць лямпа на ўвесь кнот, здаецца тады ў хаце сьвята. І нават, ведаеш (можа я прывык),—шмат на што, забываешся, калі вялікі агонь у лямпе.

І ня чуў Даніла, што гаварыў Ахрэм. Другія думкі кужэльнай ніткаю з вітушак разьвіваліся ў галаве. Каля стала сеў, ногі падняў над падлогаю. Адну аб другую абцасамі пастукаў, каб атросься з ботаў сьнег, зьнячэўку кінуў на Ахрэма прыжмурысты ўкрадзены зірк, ды:

— Выпагадзілася...—сказаў Даніла.

— Але... Перабіла на мароз.

— Зьмена квадры...

— Ці-ж зьмена?

— Так... Трэцяя нядзеля.

— І мароз гатоў, цяпер, на доўга пратрымацца.

— Зіма... Нічога ня зробіш...

— А летась гэтаю парою—была адлега... праз увесь месяц.

— Гады пераменьваюцца... кажуць, старыя людзі, што маразы супадаюць праз сто гадоў...

— А ўсё-ж такі, бачыш, супадаюць...

— Н-ну—ня дзень у дзень, а зіма ў зіму супадае... Ці ў цябе ў хаце толькі свае?

Ахрэм сваім наваратам запытаньне паднёс:

— А што?—і не чакаўшы адказу:—свае...

Вачыма вадзіў дзе спала сям'я—гаварыў:

— Унь-дзе, на ложку, Наста з Ёўкаю, а ўньдзе—Арцём... Міхля—ў той хаце.

Тады бліжэй, Даніла, да стала прыліп. Узлокаткамі ўсьпёрся на рубец ды казаў:

— Ці памятаеш ты, як гаварыў мне, калі мы былі на Бярчукоўскім мосьце... каля млыну... як ты казаў, што раскажаш мне пра сьвіны хвост. Дык ты вось і да гэтага часу мне не расказаў... хэ-хэ...

Мацней, абаперся нарубец стала: усёроўна як шукаў на настольным рубцы цьвёрдай падпоры.

— ... ты мне не расказаў, дык я вот уздумаў, ды прышоў, каб расказаць табе. Ты, вельмі, ужо, як пабыў калгасьнікам, скрытным зрабіўся чалавекам. А са мною можна весьці якія хочаш гішэфты.

Я чалавек адкрыты. Калі бачу я што мне давяраюцца і я магу даверыцца. От вышлася такое дзела і я адразу да цябе...

Акінуў хату спанатраным зіркам—важнасьці больш падліў да прынесенай патаемнай думкі—гаварыў:

— От што, Ахрэм, цябе зьбіраюцца выкідаць з калгасу, а потым, канечне, і раскулачаць...

Сказаў і цэлы момант шчакатаў струну нацягнутай маўклівасьці. Пазіраў у Ахрэмавы вочы—чакаў, што будзе казаць сусед. Ня мог Даніла спазнаць, што было ў суседа. Ці то нявыказаны боль, вычуцьвераўшай абыякасьці.

Ахрэм парушыў маўклівасьць:

— Я ведаў... Неўзварушаным сказаў голасам.—За тое. што я зрабіў для іх калгас... Ну што-ж, няхай падзякуюць...

А Даніла:

— Дык от-жа, дай ты рады... Гэта-ж я быў у Ёселя—вазіў у яго крупэрню, каб садраць грэцкіх круп, дык Ёсель мне ўпатайкі расказаў. (Потым як сабе не гавары—Ёсель цябе паважае). Ты-ж ведаеш: сын яго, Борка, сакратарыць у раёне і ён расказаў бацьку, каб толькі ніхто ня ведаў. Гэта-ж гэтага саўгасаўца ўся работа...

Калі гаварыў Даніла меў у сваім пачуцьці: от ён раскажа, а Ахрэм ведае з чаго рабіць пачын. Усім часам ня зводзіў з сваіх думак, Даніла, Ваціка. Ахвота імжэла—зрабіць нешта гэтаму „наеждаму" чалавеку. Толькі ня было ў Данілы адважнай сьмеласьці на тую невядомую работу. А калі дачуўся сёньня пра Танцульку—счакаць ня мог, каб яго ўбачыць, расказаць. Ведаў Танцулькаву натуру, ад таго і цьвіла ў Данілы надзея: „Ахрэм зробіць тое, чаго я не магу зрабіць. Толькі патрэбна ўзварушыць яго заляжалую жвавасьць".

І ён узварушыў яе.

— Праз Міхлю ўся работа,—сказаў Ахрэм.—Яны ўдвох не падзялілі маёй пляменьніцы, а на мне спаганяюць злосьць. А яна над абодвымі імі сьмяецца... Што толькі ня робіцца на сьвеце.

Ды:

З кішэні дастаў рознакаляровымі кліночкамі нашыты мяшок. Павольна разматаў шнурок—клаў у газэтную паперу капэрацыйныя карашкі. Бачыў Даніла як дрыжэлі з карашкамі Ахрэмавы пальцы—уцеху сваю песьціў.

— Па-мойму, каб я быў, Ахрэм, на тваім месцы,—скрадзеным голасам гаварыў Даніла,—я-б адчаіўся... прыпільнаваў бы яго, калі едзе ён з Бярчукоў, альбо з Прыстані, ды-ы... каб аж дзесятаму заказаў, як трэба з людзьмі жыць... Далібог.

Тады Ахрэм палажыў локці на стол—зацяжку зрабіў усім дымам. Глядзеў перад сабою, як і ня чуў Данілавых слоў, а Даніла:

— ...ты-ж калгасьнік. Цябе ніхто ня возьме ў галаву. І ён больш ня будзе раскашэльвацца... калі прыехаў, трэба было жыць, як усе

людзі жывуць—па суседзку, па-чалавечаму. Яму было-б добра і нам спакойна. Нашто было—ых, калгасы-смалгасы!—Як яго насіў, ня ў хаце кажучы, нячысьцік. Далібог... Праўду я кажу... як таго Максіма Нічыпарава...

Кінуў Ахрэм на падлогу недакураную папяросу. Разам з акуркам, сьліну сабраную паслаў на падлогу. Паглядзеў на Данілаў зашмальцаваны кажух, ды ня то з спалохам, ні то з адвагаю:

— Пра Максіма ня трэба рабіць успамінку... Ты, Даніла, чалавек разумны і гэта на пасуе сталаму чалавеку. Я ведаю, як ты гаварыў з Журам у млыне. Я ўсё зьбіраўся табе намякнуць. Жур—падлізьнік для саветаў і табе з ім ня трэба было ўшчынаць гаворку. Ты-ж бачыш, што яны, каб прымелі, у лыжцы мяне ўтапілі-б...' а Максім з таго сьвету ня ўстане. І я вельмі рад... я на цябе, Даніла, век не забудуся. А толькі гэтага ня трэба...

Абарваў сваю гаворку, а потым дадаў:

— ... гэтага чалавека ня трэба як Максіма, ці як бы там ня было. Трэба з падцішка.

Голас яго дрыжэў далёкай унутраною глыбінёю, аж прыўзьняўся Ахрэм з тапчана. Вачэй ня зводзіў з суседа—усё дарыў імі неададзеную дабрату.

Даніла запытаў:

— Дык што-ж рабіць... якія, па-твойму, трэба браць меры? Яны-ж усіх улагодаюць у гэты калгас. Цяперка... ты-ж мусіць, чуў, што напісала Маскава ў газэту, якія палёгкі даюцца ў калгасе?

— І няхай сабе...--зацярушаным спакоем сказаў Ахрэм.--Бярчукоўцы ужо, як дачуліся пра газэту,—высыпалі з калгасу, як пчолы з вульля. Так што ўвесь калгас ляснуў... Але ня ў гэтым, Даніла. Лепей хай-бы быў Бярчукоўскі калгас.

Асалавелымі вачыма ў суседзкія вочы пазіраў Даніла. Ня мог узяць на свой розум: „Як-жа вышла, чаму Бярчукоўцы кінулі-рынулі калгас, калі газэта напісала столькі палёгкі? Чаму кажа Ахрэм, што лепей, калі Бярчукі былі-б у калгасе?

І на адзін момант паўстала перад вачыма ў Данілы адышоўшая прошласьць:

— От ужо нідзе ніводнага калгасу. Ізноў людзі сабе жывуць... жнёі жнуць з жніўнымі песьнямі на Булгаковым полі. Хлапец-пастушок вядзе з раніцы Данілавага каня. Авадні цэлым роем гудуць каля конскіх персьняў...

... маладзіковая нядзеля: Даніла кірмашуе на Луціцкім мястэчку сьвінчата скігічуць на вазох... за прададзеную карову барыш п'юць... Даніла торг трымае ў руках: мяняе каня, што прадаў у Доўгае Поле... на відавокага. Толькі з невялікаю прыдачаю: зараз пойдуць таксама барышаваць...

„Божа мой... дай божа... але чаму-ж Ахрэм гэтак гаворыць пра Бярчукі?"

У Бярчукоўскім калгасе газэту прачыталі ў самым ранку. Перша-на-перш прышла пошта на сельсавет, ды на калгасную канцылярыю. Антон быў у калгаснай канцылярыі, калі конна прыехала пошта. І мо' ніхто так скора ня ўзяў на ўвагу, калі-б не Антон. А ён, як наўмысьля расхінуў газэту і адразу: „Так што калгасы будуюцца па сваёй ахвоце—во! І ня трэба было Харытону сілком нас перці на ўсю выскачку: „Ідзеце, бяжэце!" Хоць мне і ня трэба было вадзіць каня на начлег, а я не хачу заставацца ў калгасе. Навошта Харытон мяне і пятага бадбухторваў, і нават пагрозы прысылаў: „Калі ня пойдзеце—сілаю пазаганяем". От мяне за яго „сілу" і разьбірае цяперака злосьць."

А надвячоркам, на Бярчукоўскай вуліцы ўбачыў Яўхім Антона з кароваю. Ня пытаўся тады ні ў кога Яўхім. З жонкаю нават не рабіў рады. Прышоў да кароўніка Мікалая, ды: „давай маю, Мікалай, карову".

Харытон быў як раз на насялёным крыжаўскім пункту. Калі прыехаў змрокам у Бярчукі, як і ня было ніколі калгасу. За Бярчукамі сьледам пайшлі Крынічкі. Там ня ўсе, а трэцяя частка калгасу разышлася па хатах з сваім дабром. І кожны рабіў сабе сам: абы, каб найбольш сабраць Харытону злосьці.

Калі ўчуў Ахрэм, што распаўся калгас у Бярчукох—нацягнуў на сябе непагодлівую хмару. Усё, што было на яго з Міхляю меркаваньні, пайшло пад ногі. Праз увесь час на Міхліных словах песьціў думку:

„Добра, што вы, дзядзя,—гаварыла Ахрэму,—зрабіліся калгасным чалавекам.—Каб толькі нам болей такіх людзей. Такія людзі нам вельмі патрэбны. Хай бы сабе, было чым больш калгасаў з такім людзьмі. Тады-б хутчэй надышла калгасная гібель. А гаспадарку, што змарнавалася—вы яе вернеце за адзін год"...

І Даніла ня мог цяпер узяць на свой розум Ахрэмавага меркаваньня

Высмактаў агонь з магазына ўсю газу. Па кутох Ахрэмавай хаты шпацыравалі доўгія цені. Ахрэм дастаў з-пад лавы глячок, каб наліць у магазын, а Даніла казаў:

— Ото-ж і добра. Я нават і вунь як рад! праз які тыдзень усе калгасы—фу-фу, як той дым. Вельмі добра... файна.

— Добра і дрэнна...—машынку ў лямпе круцячы, казаў Ахрэм.— Добра тое, што ўцякаюць людзі з калгасу. Хай бачаць наўкруг што ўцякаюць людзі... Хай бачаць, што няма ў калгасе жыцьця... Бо як не кажы—уцякаюць?А яшчэ горш (як гаворыць мая Міхля)—усёроўна будзе калгас. Адны ўцякуць, другія прыдуць...

Лямпу ўставіў у дрот, і на ўвесь кнот пусьціў агонь. Сеў на тым самым месцы тапчана, гаварыў:

— ...хіба-ж я ці ты ногі паперабіваем, скажам, гэтаму канцу?— яны-ж... от ім цяперка гэта палёгка—рынуцца, як апантаныя. Што ім абыходзіць? Скажам хоць бы таму самаму Журу?—Адных галапузых сямёра, ды іх дваіх. Хіба-ж ён зможа пракарміць такую саранчу? А вырастуць—няма як дзяліць шнура. Бо ўжо і так чуць бараною не дзярэ маёй мяжы, а Банадысевай—з другога боку?

Калупаў пазногцем у стале ямку ад сучка. Глядзеў апаўша—тупым зіркам у стол, ды:

— Калгасаў навырабляюць,—гаварыў Ахрэм,—калі хочаш такія Журы. А хто ўцёк, ня дзе дзенецца: прыдзе потым на розум, ізноў будуць па адным уступаць. А па адным, чалавека, цяжка. Усе твае косьці які-небудзь Вацік, перамацае. Ды яшчэ бацькоў тваіх, дзядоў-прадзедаў ні пра што ўздыме з таго сьвету. Ты ўвесь будзеш на відавоку, да якой масьці падыходзіш.

Даніла перапыніў суседа;

— Дык хіба-ж ты, Ахрэм, зьбіраешся век векаваць у калгасе... Калі ты вядзеш такую гутарку?

— А ці-ж ты, хіба, мяркуеш, што калгасы будуць праз увесь век?—сваім наваратам паднёс да суседа пытаньне,—вот прыдзе, калі на тое пайшло, вайна і калгасы гэтыя—пылам зьмяце.

— А калі вайна возьме ды ня прыдзе, а цябе выкулачаць?—бо я-ж табе ня вораг; гэты-ж, я кажу, вельмі ўзяўся старацца

—Тады тое будзе,—устрывожанаю злосьцю сказаў Ахрэм.—А вайна трэба, каб прышла.

— І ты ня сярчаеш на гарадзкога?

— Сярчаю... Але мая крыўда ляжыць пад замком. Ня зьверху трэба браць крыўдаю, а зьнізу... З сярэдзіны. І от калі добра возьмеш—ня вышчаўгнецца з рук ніякае ліха.

Слухаў Даніла свайго суседа і ня мог узьвесьці на розум, што ён гаварыў. „Як гэта браць чалавечую крыўду з сярэдзіны?"

А Ахрэм:

— Я цябе, Даніла, паважаю і люблю. Я табе ўжо казаў... Бачу я, што ты мне не жадаеш урэду... Хоць мы і сварыліся некалі з табою, але скажу я: абодва мы былі вінаватымі. Ведама розум, былі, прапілі. А тут гэты сьлямзак цябе падштурхнуў... От што суседзе... я табе скажу ўсё, што ў мяне ёсьць.

Нехта прайшоў каля Ахрэмавага вакна.

Хата Ахрэмава каля самай вуліцы. Хто ня ідзе—чуваць пад нагамі скрып. Ахрэм паміжволі паглядзеў у вакно. Потым стол пасунуў ад лавы—залез за сярэдзіну стала. Тады голас прыціснуў, ды гаварыў паўслухам:

— От што... Пакуль што, я магу жыць леташнім хлебам. А ўсялякія Старавойты хай крыху папухнуць—хай пасмакуюць калгаснага

хлеба. Я вельмі радуюся, што мы вывезьлі збожжа на станцыю. Нам трэба-б здаць трыста пудоў, а мы вывезьлі пяцьсот дзевяноста. І мне яшчэ хацелася, каб здаць гэтых дзесяць пудоў. Хай-бы роўна было на дзесяць процантаў. І для ўлады мы на воку, і для сябе карысна. От цяперака ўжо няма хлеба, як у Петрыка ды ў Старавойта—калі ласка: „Улада зьела вашу работу; пацярпеце, браткі. Нябось, голад загамоніць наўвесь голас. Голад пакажа сілу. От як Даніла, трэба рабіць як я кажу—зьнізу, а ня зверху.

— Гэта ты, Ахрэм, вельмі разумна кажаш,—гонарам вусы разгладжваў Даніла перад Ахрэмам,—я казаў ня раз сваей бабе: Ахрэм кажу, ведае, што робіць. А яна ўсё абзывала—прызнаюся табе, дурнем, што ты пайшоў у калгас... Дык гэта-ж, як той казаў, і козы сытыя і сена цэлае!

Ахвота падшыхнула Ахрэма, што сусед пацеху трымае за яго кемлівасьць. Вельмі рад быў Даніла, што хоць прышоў да яго ў гэты вечар—смуглую нэндзу расьцярушыў з большага, разьдзьмухаў. Хацелася ўсё сказаць—падзяліць-папалавініць. Роднаму бацьку не сказаў-бы, што трымаў ён у сваіх меркаваньнях, а Данілу гаварыў:

— ... каб не раскідалі бярчукоўцы свайго калгасу, можна было ўстроіць што-небудзь такое... спатайка. А там ёсьцека людзі і добрыя людзі ёсьцека... Як скажам Дзяніс Крэўскі: быў у Калчаковай арміі. Добра ведае як камандаваць войскам. Альбо хоць-бы і Антон... Дарма што ён нягеглым выглядае, а ён чалавек з натурай. Я памятаю яго, калі быў ён валасным пісарам. Гэта цяпер на яго ўсе пальцамі тычуць. А ў старага Аўласа... тры сыны як дубы. Ім-жа толькі падай—вазьмі іх у сваю каманду. Яны, табе, не аднаго камісара са сьвету спэйкаюць. Памятаеш, як спусьцілі кроў, на стасікавым вясельлі, Крыніцкаму Бладзіку? Ды ці мала ёсьцека людзей... Дык от... Я, Даніла, таксама перш быў думаў: ня трэба ісьці ў калгас. Процівам трэба жыць. Але добра зрабіў. І праз Міхлю, скажу табе, зрабіў. Яна чалавек, хоць і жанчына, а ведае як трэба жыць на сьвеце. А на Харытона я ня злую. Ён рабіў калгасы і вельмі добра. Ён штырыў людзей як тых сьвіней у катух. І калі-б ня прынесла нядобрая гэтага Такарскага з яго „карэньнем“, што выкопваў ён з душы кожнага чалавека—жыцьцё наша асталявалася.

Нецярплівасьцю імжэла Данілава нутро. У самую глыбіню яго розуму западала суседава гаворка.

— Далібог...—як ужо дадому ішоў развагаю варушыў Даніла ў думках,—гэта-ж, каб далі Харытону патолю—увесь сьвет ён заколгасаваў. Тады сядзі, сабе, у калгасе, як кажа Ахрэм, ды гэтак ціханька, па-крысе—шчык, шчык... Церабі, аж пакуль ад яго не застанецца ні мднэй пярынкі.

Адна толькі варушылася неспакоем думка ў Данілы; здавалася Данілу, што невашта хавае Ахрэм у сябе пра Ваціка.

II

Не пайшоў у гэты дзень Харытон на сельсавецкую службу. Быў на сваёй кватэры, што здымаў у старога Бярчукоўскага Яўхіма.

У густым тумане, за Харытонавым вакном, плаваў хворы, расхрыста ны, зімовы дзень. У гарачцы кідаўся дзень на рыжы сьнег, таптаў яго аж да сьлёз. Густымі камякамі віселі на аголеным гальлі клёну, ліпы, дубу—гракі—чорныя вястуны вясны. А яна нейдзе далёка за гарою, у лагчыне, прабівалася з-пад сьнегу зялёным, устрывожаным грукатам.

Праз цэлы от ужо месяц, не рабіў Харытон для сябе выхаду з сельсавецкай работы. Усе яго дні былі закілзаны раённымі прадпісаньнямі. А іх так шмат было ў гэтую восень. Здавалася Харытону часам, што галава ня стрывае, колькі прыносіць Косьцік раённых паперак... Тады ахвотная іскра загарвалася павагаю да самога сябе: „Люблю працаваць і раён мне дае даверліваcьць на маю працу".

Толькі от апошнія дні, бураю, ўскалыхнулі Харытонаў настрой.

З таго вечару, як прыехаў Харытон з Крыжоў, успала на яго кіслата гарклявасьць. Ці то была ў яго на сэрцы прыкрасьць, што раскідаўся Бярчукоўскі калгас, ці што атрымаў ён з раёну прадпісаную паперку, каб не раскулачваць Міхася Кляўко. І бадай што раённая паперка псавала Харытонаву чуласьць. „Ён, старшыня сельсавецкі, і ня мае свайго сталага меркаваньня". І яшчэ: „Прадпісуе перш, хоць бы й той самы раён, а потым—слова свайго ня трымае, а ты выношывай перад людзьмі неаплачаную цярплівасьць". Тады хацелася Харытону, каб паказаць перад некім моц-сілу свайго старшынёвага слова.

— І пакажу,—сталымі думкамі гаварыў Харытон.

Ведаў добра, што праз Ваціка вышла справа Міхасёвай затрымкі Бо той ліст, што пісаў гэты канец да Калініна—ў Харытонавай кішэні. Ня ведаў бы, каб тым самым днём не зайшоў Косьцік у яго канцэлярыю. Ад аўсянага апою прапаў у Муравейнікаўскім калгасе, якраз, конь. Аддаваў Косьцік акт пра каня і ня сьцярпеў: („Хай ведае сельсавецкі старшыня якія бываюць у Косьціка лісты")

— Ліст нясу, аж да самага Калініна,—сказаў Харытону.

А той:

— Пакажы... Заўтра паеду я ў раён—адвязу тваю пошту.

Больш як на каго—на Ваціка—з таго дню зубы вастрыў. На свае меркаваньні браў:

„Праз Ваціка і ліст напісаны гэтым муравейнікаўскім канцом Каб даў свой подпіс Вацік—і ня ведаў бы Кляўко: кулак ён, ці ня кулак. Мо і ў праўду кулаком пражываў, калі ўлада прадпісала яго раскулачыць. Улада лепш ведае, што яна робіць".

Апошнім часам ня меў Харытон з Вацікам сустрэчы. От каля двох тыдняў, налічана дзён, як паехаў Вацік з Манечкаю ў горад. Прышла паперка, была, ад ліцейшчыкаў, каб Вацік прыехаў на завод. хоць на некалькі дзён, на фабрычна-заводзкую нараду. Вацік ехаў у горад, адзін тыдзень браў з сабою на дарогу. А надоячы, стары Нічыпар другі ліст атрымаў ад Ваціка, дык было ў тым лісьце: „Хутка прыедзем дзядзька Нічыпар, да вас, з гарадзкімі навінамі".

Харытону вельмі карцела, каб найбольшаю скорасьцю прыехаў Вацік у Чырвонае. Праходзячы сваім жыцьцём праз гэтыя дні, на неспакойным повадзе трымалася яго думка. І ўсё дзеля яе, дзеля Міхлі. Калі прыслаў раён на Міхася прадпісаную паперку, моцнаю крыўдаю ўскіпела Харытонава нутро. Сам сабе гаварыў услух:

„Я, сельсавецкі старшыня, ведаю, што раблю. Міхась—кулацкая шышка".

Браў на свой успамінак, нашчот Міхася, Танцулькавы словы: „Міхась—урэдная птушка. Ад яго й падпалу можна дачакаць і ўсялякага для калгасу порчу".

Тады прыходзілі да Харытона з першаго сходу, Міхасёвы словы „Нашы ў калгас ня пойдуць... Нямашака чаго нам галовы марочаньнем затуманьваць..".

— Дык чаго-ж больш трэба для раённых галоў?—з Марцінам гаварыў перад Міхляю.

А яна ня сходзіла, ні на адну хвіліну, з яго чуласьці. І яшчэ большым сьвечам гарэла Харытонава нутро—ня зводзіў з сваіх думак: „Вацік даносы рабіў раёну, дзеля Міхлінага сэрца. Зайзрасьць апанавала чалавека, дык і ня ведаў, што ён робіць ад зайздрасьці. Хай бы прыехаў, ды няхай бы паразрываўся ад злосьці—паглядзеў, як паважае мяне гэта дзяўчына".

Больш як калі, жыў Харытон Міхляю ў гэты ад работы адсунуты дзень. Дагары пластам ляжаў на сваім жалезам сатканым, вузенькім ложку. Ногі паклаў аж на верхнюю білу, руку падлажыў пад галаву, другою трымаў—прашладзённую газэту. Маленькімі вачыма церабіў дарогу па газэтных радкох. Хацеў забраць на свой розум, што гаварыла газэта цесна ўсланымі радкамі-літарамі. Але як малыя дзеці, ня слухалі Харытона радкі: лукаткамі разьбягаліся, сьлізгаліся перад яго вачыма. А чорненькія літары-кропачкі, дружным роем гаварылі:

„... вёска ахоплена агнём клясавых боек. Вораг залазіць у самыя вузкія шчыліны—абы толькі, каб нападаць на сацыялістычную будоўлю... Барукаюцца паміж сабою два канцы сьвету. Таварышы...

А Харытон у сваёй чуласьці:

— ... я гатоў біцца. Які ён абрыдзоны чалавек... Яна ня хоча, нават, мець з ім гаворкі. Яна яго ненавідзіць, а ён смалою шавецкаю ліпне да яе. Ды на мне спаганяе ў раёне сваю злосьць...

„... кулацтва шчыра служыць контррэволюцыі. Кулацтва гарыць агнём нянавісьці да нашых рабоча-сялянскіх і чырвонаармейскіх саветаў. Саветы змагаюцца за пабудаваньне сацыялізму. Калгасная вёска—вострая зброя з контррэволюцыянэрам-кулаком, і правільная дарога да вялікай камуністычнай будучыні... Дарагія таварышы...

— ... мы будзем жыць. Мы будзем любіць адно другога моцна, шчыра. Яна будзе шыць на машынцы, а я працаваць буду... старшынёю, альбо ў калгасе... Я працу люблю, як сам сябе. Мы зьнішчым, зьвядзём з сьвету ўсіх кулакоў. А наша жыцьцё такое малое... шмат чаго трэба чалавеку на гэтым сьвеце...

„... трэба добра вартаваць клясавага ворага. Ён выбіт сацыялістычным будаўніцтвам з каляіны свайго жыцьця, ён больш, як калі небудзь раззлаваны. Ён нападае цяпер на нас спатайка ліхім, раздражненым зьверам. Ён не здаецца жывым у апошняй сваёй бойцы. Беднота сялянская...“

— ... хай-бы ты цяперака да мяне прыщла. А мо‘ я схаджу ў Муравейнікі? У мяне-ж сёньня ад штодзённай работы сьвяточны дзень, добрая, мая Міхля!

— „... кулак ідзе на апошнюю стаўку. Ён часам, не шкадуе сваёй маёмасьці, свайго жыцьця, абы толькі каб узарваць нутраную энэргію працоўнага энтузіязму. Бо ведае ён добра, што ня ўжывецца з людзьмі якія былі яго парабкамі. Жыцьцё перайначыла сьвет працавітага чалавека: яно дало яму волю быць ўладаром над сваім векавечным апякуном. Новае жыцьцё...“

— .. і што за такая моц гэтага каханьня? Чалавек убачыць чалавека і тады ня можа без яго жыць. Што за невядомая, такая сіла, якая так моцна можа змучыць чалавека? І чаму ня можа кахаць чалавек усіх людзей такою-ж сілаю? А ў кожнага па сабе—новымі дарогамі ідуць скрыжаваныя струны каханьня... Якое мудрае, якое няроўнае жыцьцё кожнага чалавека... Не, а я ўсё-ж такі схаджу ў Муравейнікі...

Наводліў рукою, на вакно, палажыў прошладзённы недачытаны газэтны нумар. Адным звыклым узмахам зьняў з білы жалезнага ложку свае ногі. Узьняцца хацеў з ложка, каб ісьці—несьці хоць, сабе, за дзесяць вёрст, узбуджаны, пякучым агнём запалены, настрой. Але адчыніліся дзьверы з Яўхімавай кухні і да Харытона зайшла старая Яўхіміха.

Не адна Яўхіміха, а ўся ваколіца ведала-гаварыла, што валэндаецца Харытон з Міхляю. Не адным разам жарт строіла перад Харытонам Яўхімава жонка. Неўзьнячэўку ўсё падносіла да яго тым жартам абцярушаную просьбу: „Глядзеце, не забудзьцеся мяне, Харытонка казала, узяць за свацьцю. У-у, які белы, ды які вялікі пірог сьпяку...

А колькі песень вам насьпяваю... каб вы шчасьлівыя, ды багатыя былі, і каб ніколі праміж сабою ня мелі задзірак, ні сварак".

Харытон радасьць гадаваў ад Яўхімішыных гаворак. Ахвотаю слухаў, калі пра Міхлю гаворка ішла наўздым. Тады хацелася Харытону, каб Яўхіміха доўга гаварыла з ім пра яе, а ён бы слухаў, ды сьмяяўся, дробна-шчакатлівым сьмехам.

Калі зайшла Яўхіміха ў Харытонаў пакой,—пружынаю ўзьняўся Харытон з ложку. Усёроўна як чуласьць гаварыла яго розуму: „Нешта скажа, старая, нядрэннае для яго".

А Яўхіміха падыйшла аж да самага ложка:

— Ідзе... Міхля,—вока сьлязьлівае прыжмурыла, сказала прыціснутым голасам: ўсёроўна, як баялася, каб не абудзіць каго ў Харытонавым пакоі, ці каб не пачула Міхля аж за агародамі на Яўхімавай сьценцы.

Што рабілася наўкруг Муравейнікаўскага калгасу — моцным непакоем устрывожыла Міхліную натуру. Яна от ужо каторы час—дні і ночы губляла ў блуклівых неасталяваных думках. Ведала добра, цяпер, што жыцьцё яе ўзмучана аж з самага дна. Усімі гадамі ляжала яно запакаванае—чакала дапаможнага часу. Але ня прышоў, не зьвярнуўся той час, калі-б магло яно красою ўзьняцца—расьцьвісьці для яе белым цьветам.

Крыўду, што трывогаю напакавала Міхліна сэрца, узводзіла на Харытона. Калі раскулачваньне рабілася ў Міхася—думала будзе работа на карысьць для гэтага канца, для ўсіх ваколічных вёсак. Трымала на сваіх думках замкнутую радасьць.

„Цяперака ўбачаць людзі зьдзекі бальшавіцкай улады. Уздымуцца, як гаварыў дзядзя Ахрэм, усе вёскі. Гамузам пойдуць на бунт супроць бальшавікоў. Тады, от яно й прыдзе наша дарагое, наша шматчаканае жыцьцё".

А калі дазналася пра ліст з гэтага канца—ахапіла Міхлю пякучая прыкрасьць на ўвесь сьвет. Другія думкі сьпелі ў яе галаве.

„Лепей не чапаў бы Харытон галадранай басаты. Раздражніў от, як тую ў вульлі асу, а ня выкурыў яе дашчэнту".

А надоечы яшчэ:

Скардзіліся калгаснаму праўленьню Петрык з старым Старавойтавым, што няма хлеба, ня будзе зараз з чаго зварыць нішчымную страву. Ня жмурачы вока выкладалі сваю крыўду на калгаснага старшыню Банадыся. Казалі, што ніхто не прасіў яго, каб двайную норму збожжа здаваць дзяржаве. Гусі, каровы—паставілі на відавокае перад ім. Якраз быў, прышоў з Чырвонага на праўленьне, з Міхасёвым Юзікам, Кастусь Гурбаноўчык. Слухалі хлопцы як выводзіў сябе Банадысь на апраўданьне—віну аддаваў старшаму брыгадзіру:

Тады Кастусь Гурбаноўчык гаварыў:—

— Трэба скласьці камсамольскую брыгаду і яна хай прагледзіць, што хто робіць у вашым калгасе. Бо ўсюды калгасы, як той казаў, як і калгасы, а ў вас людзі будуць ад палавіны зімы, бяз хлеба. Можа і знойдзе брыгада якога небудзь чалавечка для пракуроравай работы.

І Міхліны дні ўзварушаны былі жыцьцём, ды разгушканы на ўвесь мах.

Гаварыла да Ахрэма:

— Позна будзе, калі Такарскі, ды ўся саўгаская саранча ўспадзе на вас. Ды яшчэ з гэтым Муравейнікаўскім канцом напрыпражку... Могуць і напраўду выселіць з калгасу. Пашлюць, як таго малінаўскага Булгака, служыць малебені Салавецкаму манастыру. Так што—рабіць трэба нешта.

... ўвайшла Міхля ў хату і ня ведаў Харытон, якою радасьцю яе сустракаць. Крэсла, што забраў, калі раскулачваў Булгака, паставіў перад ёю. Усёроўна як з марозу ў хату зайшоў:—раз-пораз цёр рукі.

А яна гаварыла:

— У вас так цёпла...

— Два разы паліць гаспадыня печ: раніцаю і ўвечары. Баіцца, каб я хаця не прастудзіўся. Мая гаспадыня вельмі, ведаеце, добры чалавек.

— А ў нас холадна... І мы таксама, два разы палім, а холадна...

— Ваша мусіць, старая печ,—казаў сядаючы насупроціў Міхлі,—старая печ, канечне не дае такога цяпла. Дык от і прыходзьце да мяне, ды грэйцеся...

Міхля засьмеялася прымушаным сьмехам. Квапным вокам акінула Харытонаў пакойчык. Адным момантам бачыла на сьцяне расфарбаваныя плякаты: ундзе на карысьць ашчэднай касы, а ўндзе—на карысьць дзяржаўнай пазыкі... Бачыла на вакне, вышчарблянае люстэрка, а каля люстэрка—круглую пячатку.

— Прыходзьце,—гаварыў Харытон,—я вельмі буду рад. Вы-ж бадай, у мяне другі толькі раз у хаце.

— Трэйці,—сморгаючы памі ж пальцаў зьнятую з рукі пальчатку адказала Міхля. Ды працяжна, ні то жартам, ні то і ўпраўду, дадала:—і апошні.

Харытон, быў, незразумеў, што яна сказала, а яна як наўмысьле:

— ...і апошні,—пераказала другім разам.

— Што гэта вы кажаце?—Згубіў з твару рассыпаную ўсьмешку радасьці.—Як гэта апошні?

Тады ўзьняла вочы перад Харытонам—гаварыла брытваю навостраным тонам-голасам:

— Я, ведаеце, еду ў горад... Паеду на швэйную фабрыку... Насаўсім. Я прышла, каб далі вы мне сельсавецкае пасьведчаньне. І каб у пасьведчаньні напісалі, што я ёсьць дзейсьцьвіцельна чалавек-жанчына і так далей і таму такое...

Яна расьсьмяялася дробна-макавым сьмехам, а Харытон з устрывожаным пачуцьцём:

— Вы жартуеце... Вы не паедзеце, Міхаліна Дамінікаўна... Нікуды вы не паедзеце...

— Чаму?

— Я ня пушчу вас.

— Не дасьце мне паперкі, што я зьяўляюся жанчынай?

— Я дам вам сто, дзьвесьце паперак, але ня пушчу вас.

Ён гаварыў і было ў яго адчуваньні: от невашта каштоўнае выслізгваецца з яго рук. Працінаў вострым зіркам яе твар—бачыў як усьміхалася яна густым разьлітым сьмехам, а не сьмяяўся разам з ёю. Думка раптоўная сьвідравала яго ўзбуджаны розум:

„Цяпер, лепш як калі сказаць ёй нікому негаворанае слова".

Але яна перапыніла яго думку:

— Паеду... сказала, гуляючы з пальчаткаю.—Буду з гораду пісаць вам лісты... Вы прыедзеце ў горад, зойдзеце да мяне... Пойдзем у тэатры... Потым, ажэніцеся, а я прыяжджаць буду да вас у госьці...

І яе гульліва-абыякавыя словы усхавалявалі нецерпялівую Харытонаву натуру. Перапоўненаю выразнасьцю паўстаў вечар, калі застаў яго Вацік у яе пакоі. Лягла наўспамінак, прыціснутая нянавісьцю, Вацікава постаць. На момант былі перад Харытонавымі вачыма гарадзкія вуліцы, а на тратуары ідуць—яна з Вацікам: „Ён-жа цяперака там у горадзе".

— Ты-ы... не паедзеш... —праказаў сам сабе нутраным голасам.

Падышоў да яе крэсла—з рук узяў, сваёй работаю робляную мяккую, чорную пальчатку. Калі браў, яна лёгка яе пусьціла, а ён, адчуваючы пакінутае цяпло на пальчатцы:

— Ніколі і нікуды не паедзеце... ад мяне. І я прашу вашага слова... што ты не паедзеце. Зараз гаспадыня паставіць самавар і мы будзем піць—у мяне ёсьць вышнёвае варэньне—будзем піць, з вышнёвым варэньнем чай.

... Міхля чакала ўзбуджана Харытонавай раптоўнасьці. Яна даўно чакала, што ён скажа ёй слова, запаленае гарачымі іскрамі. І што сказаў ён — вельмі ішло на Міхліну спадобу. Бо што было на яе меркаваньні—расло ядраным ростам—церабіла закіданую, перад яе

жыцьцём, дарогу. От ужо колькі год, а ня была ў такой утульнай вясёласьці. Толькі ад узьнятага пылу-радасьці на момант веру была згубіла ў самую сябе: „няўжо і ў праўду так шмат яшчэ сілы і волі, каб на ўсю сьмеласьць вастрыць кпінкі, над жыцьцём гэтага чалавека?"

А Харытон:

—Можа яшчэ наліць шлянку чаю?

— Я-а... Мне хацелася, паколькі я трэцім разам у вашэй кватэры...—стрыжаныя валасы зачэсваючы грэбянем, гаварыла Міхля,—мне хацелася ня шклянку, папраўдзе кажучы, а чарку... чарку чаю.

Харытон зьбянтэжыўся. Узяў, быў, у руку ад Міхлі ісподак з парожняю шклянкаю, а калі сказала,—па стале ісподкам шараваў то сюды, то туды. І ня ведаў: ці яна жарт строіць над ім, ці ўпраўду сказала такое ярка-зялёнае слова.

Міхля адным зіркам злавіла яго разгубленасьць, ды:

— Калі няма, таварыш Мамчыц, і ня трэба. Я, гэта, для вас... Ну і дзеля вас—мо, ня чарку чаю, а паўчаркі...

— У мяне... канечна, няма,—адказаў Харытон. І каб згладзіць ніякавасьць выказанаму слову „канечне" —дадаў:

— У гаспадыні... Я зараз, праз хвілінку. У яе—ёсьць. Калі мне трэба, я і бяру ў яе.

Вышаў праз кухонныя дзьверы, а яна ўстала з крэсла—падышла да вакна—глядзела ў выліняўшы кавалак ламанага люстэрка. Убачыла, Міхля, свой твар і дзіву далася перад люстэркам: ён быў, на яе выглядзе, вельмі зблажнелым.

Ад таго, што не дасыпаю,—прабегла па яе розуму думка. А калі яшчэ ўглядалася, — заўвагу зрабіла перад сабой: —Я не пазнаю, проста сама сябе. Якое гадкае чалавечае жыцьцё! На што жыве чалавек, калі жыцьцё вядзе яго да гэтых... От яны—адна, другая—маршчыны...—Зайздросна пружыніла шчокі —няўпрыкметку расьцірала пальцамі дробна-накарбаванае цела.

— Калі б цяперака ўбачыў мяне Віктар,—гаварыла думкаю,—не спазнаў-бы. Маё гэта малое, Выктаранётка... Яно і ня ведае тамака, што маршчынкі паляглі на тых шчочках, да якіх прыліпалі мяккія, цёпленькія губкі... Скора ты будзеш разгладжваць іх сваімі рыжынькімі, шчакатлівымі вусікамі.

Ставіла люстэрка, зьнячэўку кінула зіркам на падаконьнік: — тую самую ўбачыла круглую пячатку. Тады ўзяла ў рукі—паперку расхінула, ды пазірала на дно пячаткі на яе літарнае поле.

— Як мудра, зроблена: сюды сабран ўвесь вырашаны савет...— Круціла ў тонкіх пальцах сельсавецкую пячатку, сьлібізавала: „Бярчукоўскі сельсавет"...

Адчыніліся кухонныя дзьверы і Міхля ў міжвольнасьці палажыла пячатку на падваконьнік.

— Чаму вы ня маеце добрага люстэрка,—ішла на Харытонаву сустрэчу.—А яшчэ называецеся кавалерам... Харытон паставіў на стол некім да палавіны надпітую пляжку—гаварыў Міхлі:

— Як ажанюся, тады будзе цэлае люстэрка. Садзецеся, калі ласка... Вып'ём па чарцы, як вы кажаце, чаю. Зараз будзе ў нас—гарачае сала.

(*Канец будзе*).

Цім. Зарэчны

Эльбрусы чалавечага шчасьця[1])

Аповесьць

(*Канец*)

Зьвер на волі

I

Чалавек угрунь бяжыць па голым полі.

Поле—шырокае, неабдымнае,—яно ляжыць у змроку начы. Зямля пад нагамі вязкая, топкая; здаецца, зыбучае балота навокал, непраходны тарфянік на полі,—гойдаецца зямля пад нагамі.

Густое іржышча, адзярвянелы бульбоўнік, высокія межы, глыбокія разоры, сьлізота і гразь, цемень і спалох,—жудасны, дзікі спалох,—усё перашкаджае бегчы, адымае апошнія сілы, злуе.

А хмызьняк, тонкі і гонкі, аголены восеньню ад шаўковае лістоты, б'е па твары, па вачох. Пруты ўрэзваюцца ў цела, быццам хто нарачыта сьцёбае імі па твары, і боязна, каб неўзнарок не прабіць вока на гостры сук.

Самае жудаснае—за плячыма, а будучыня—цёмная, як ноч. Але ўсё-такі застанецца вечны спадарожнік—невядома адкуль ўзяты, інстынктыўны, у крыві, спалох. Спалох за мінуўшчыну, за сучаснае, за будучыню. Можна, аскаліўшы зубы, сьмяяцца, крычаць у дзікай радасьці, але і ў гэтым будзе хавацца спалох. Ад яго нікуды не ўцячэш, не схаваешся,—ён, як цень, будзе ісьці ўсьлед,—і патрэбна вялікая воля, каб рабіць выгляд, што не заўважаеш яго. Але вялікую волю маюць ня ўсе, і лёс большасьці—хадзіць пад прыгнётам спалоху. Гэта—неадступнае, як цень усонечны дзень, і вечнае, як матэрыя або сьвет.

Сьвет—пад знакам спалоху, і трэба памерці, каб яго перамагчы. Сьмерць—мацнейшая ад усяго на сьвеце, і толькі яна можа даць спакой і цішыню. Цішыня і спакой—гэта тое, за што людзі змагаюцца ўсё жыцьцё, і дзіўна і сьмешна: атрымліваюць толькі пасьля сьмерці.

Якім простым і зразумелым становіцца ўвесь пройдзены шлях: надзеі і мары—на недасяжнае, высокае, на шчасьце,—пакуты і сум—

[1]) Пачатак ў №№ 9, 10, 11, 12 „Маладняка" за 1931 г.

у гразкасьці, разьбітай на вялікіх дарогах жыцьця, у грубай пласкадоннасьці навакольнага, у вечнай катарзе прымусовае працы,—агіда і нянавісьць—да драбнаты людзкой, узьведзеннай у норму сталасьці і поўнакроўнасьці, да нізкавекасьці, памножанай на нізкалобасьць,—гэта-ж стыль іхні, так званая форма і зьмест!.. .

Сьмерць, сьмерць! Яна—адзіны збаўца ад пакут і драбнаты людзкой, ад гразкасьці і вечнага спадарожніка—глыбокага спалоху за жыцьцё. Памерці, заламіўшы рукі ў дзікай роспачы, аскаліўшы зубы ў нянавісьці да навакольнага, і каб ухмылка была—зьніштажальная, сымболічная. Жыў—для таго, каб помсьціць, і памёр—добраахвотна, сам сабе гаспадар! І каб не датыкнулася іхняя рука да жывога, і каб ня ўбачыць іхняй ухмылкі на вуснах, і каб не пачуць скрогату зубоў ад злосьці... Памерці, як памірае пустэльнік—далёка ад людзей, у пячоры, адзін. Няхай ваўкі будуць зьдзекваццa над целам і шакалы выць над трупам, толькі-б ня прышлі яны, двухногія, падобныя на чалавекаў...

Сьмерць, сьмерць! Яна—як нявеста: у белым, у вэлюме суму і тугі чалавечае, радасьць! Прыдзе яна—як вясна, як сонечны дзень у маі, напоіць атрутаю вечнасьці—хмельнаю і бунтоўнай—і злучыць, сальне—з вечнасьцю, якой няма ні канца, ні пачатку,—радасьць! Радасна сьмерць сустракаць, як нявесту!—гэта-ж мгненьне, на вялікасьці якому няма нічога на сьвеце!—як нявесту: у белым, у пралесках вясны і ружа-мяце лета;—сьмерць, нябытнасьць—гэта-ж радасьць, высокае мгненьне, шчасьце, і вялікае няшчасьце ў тым, што людзі перажываюць гэтае мгненьне толькі раз у жыцьці.

І колкія, як сьвярдзёлкі, вочы, шапка эскімоса на калматай галаве,—гэта-ж Макар, той-самы Макар: „якім-жа чынам, пан Вялікабрынскі?"—і голас ягоны—грубаваты, плебейскі, суровы і жудасны... „Макар, табе куля не прабіла галавы,—Макар, табе выпадак дараваў жыцьцё,—Макар, я заб'ю цябе"... Гэта ён—сам нянавісны вораг, гэта ён—прычына спалоху, гэта яго—забіць, зьнішчыць, зру йнаваць зямлёй.

Жыць, жыць! Было цёмна і нязручна: чалавечыя постаці раставалі ў цемнаце начы, ямка—гразкая і няглыбокая, горб віднеўся з яе,—боязна, каб не заўважылі:—„а-т за купіну палічаць!"—і мурашкі бегалі па сьпіне, жоўтыя, напэўна, і кусьлівыя; хацелася зраўнацца з зямлёй, накінуць на зямлю шапку-нявідзімку, прыслухацца да кожнага шораху, аглядвацца па бакох. А чалавечыя постаці ўсё бліжэй і бліжэй падыходзілі, пра нешта голасна гаманілі,—слоў не пачуць, адзін гулкі гоман. Яго апазнаў адразу—вушастая шапка на калматай галаве, эскімос,—і стрэлы з маўзэра раскалолі ноч, як цурбан на дзьве плашкі,—людзі завойкалі і закрычалі, кінуліся наўздагон, ня ведаючы, куды бегчы—хмызьняк каля балота схаваў пад сваё аголенае вецьце; на гуту прышоў спакойны, зьдзіўлены нечаканымі стрэламі.

Жыць, жыць!—А гута гудзела, гулам напаўняючы глыбокую ноч, і выдувальшчыкі дзьмухалі ў трубкі, бясформенасьць ператвараючы ў пэўныя формы, і труба-ветрагон давілася важкім паветрам, і вынаходца Антось Шалы правяраў тэмпэратуру ў каляніцы; было звычайна, як заўсёды, і ніхто ня мог прадбачыць, што можа быць праз хвіліну. А кнопка электрычнага праваду была халодная, і здалося, што нешта кальнула ў палец—каля пазногця, і гулкае рэха выбуху аглушыла, прыгнула да зямлі;—звон увушшу і цяжар у нагах,—бегчы, уцякаць—і не хапала сілы, прылегчы, схавацца—небясьпечна, могуць знайсьці. А потым зьявілася пругкасьць і сіла, і дужасьць,—здавалася—ляцеў на крыльлях, па ветру, раскінуўшы рукі, як ветразеі.

Жыць, жыць!—для помсты: Макар—не адзін, Макараў—мільёны, і трэба мець мужасьць пасьлядоўна зьнішчаць іх. Выбух на гуце—экспэрымэнт, экзамэн на годнасьць вялікага зьніштажальніка драбнаты людзкой,—пасьля яго павінна пачацца плянавае зьнішчэньне Макараў,—няхай на іх усе шышкі валяцца—бомбы, газы і бранявікі.

II

... І выбух граматы, і нейчы прарэзьлівы крык, і грукат калымаг па гарадзкім бруку, і чорныя копы дыму на сінім небе прарочылі нешта вялікае, што неўзабаве адбудзецца. Строкат кулямёту на ўскрай гораду напамінаў пра сьмерць, і людзі з шкляными вачыма—у роспачы і замешанасьці—беглі насустрач гэтай сьмерці.

Разам з людзьмі бег хлапчук—проставалосы: чарнявыя валасы яго раскідваў вецер; босы: чырвоныя ногі былі ў цыпках; падрапаныя, перапужаны: касы позірк блішчэў глыбокім спалохам блізкае сьмерці. Чалавеку, што стаяў на вуліцы, здалося: валасы і выраз твару ў хлапчука—сэміцкія: нос з гарбінкаю пацьвярджаў гэта; захацелася пажартаваць з ім, напалохаць яго; разрыўная куля дзыкнула каля ног хлапчука і стрэл прыгнуў яго да зямлі,—хлачук растапырыў рукі, як-бы наважыўся што-небудзь схапіць, паваліўся на зямлю, падскочыў і пабег на ўцёкі—па крутаяру, над самай рэчкаю, усцяж высокага паркану. Чалавеку захацелася жартаваць з ім, як кату з мышынай;—другая куля рванула зямлю пад нагамі хлапчука,—хлапчук яшчэ раз падскочыў, перакуліўся і моўчкі паляцеў з крутаяру ўніз—па каменьнях, па раскіданым дроту, па аскалёпках шкла—у сонечнае люстра вады;—і шкода было, што так хутка паляцеў хлапчук: хацелася яшчэ пажартаваць з ім.

З-за шэрага раду дробных крамак вышаў стары ў чорным лапсэрдаку,—шырокія крысы разьвейваў вецер на дзьве паловы, як і бараду ягоную на ўсе грудзі, сівую;—стары кульгаў, абапіраўся на высокі кіёк, і быў падобны ён—сівы, у доўгім лапсэрдаку на апостала з провінцыяльнай царквы.

— Чалавек, вы забілі майго ўнука,—ціха праказаў яўрэй.

. . . . . .

— Чалавек, майго ўнука звалі Янкель,—яшчэ цішэй прашаптаў стары.—Яго маці, маю старэйшую дачку, учора згвалцілі вашы салдаты.

. . . . . .

— Чалавек, яго маці сёньня забілі вашы салдаты, а мужа яе забралі з сабою, і я ня ведаю, дзе ён і што з ім. А малодшая дачка рве валасы на сябе, і я баюся, каб яна не звар'яцела.

. . . . . .

— Чалавек, навошта забілі майго ўнука, апошнюю радасьць маю, маленькага Янкеля майго?

. . . . . .

— Чалавек, бог адзін, і ён усіх нас будзе судзіць.

. . . . . .

— Чалавек...

Стары глуха ўдарыўся аб распалены сонцам брук. Круталобы камень ляжаў каля яго галавы, і галава яго была падобна на гэты камень.

Чалавек стаяў над старым, зьдзіўлены нечаканай падатлівасьцю слабага цела. Ён нагнуўся над ім, угледзеўся ў твар—вочы былі адчынены, ня мігаючы глядзелі ў неба, прыслухаўся да сэрца—яно стукала ціхімі ўдарамі, як-бы стары гадзіньнік, здадзены ў ламбард.

— А ўсё-ткі жывучы!..—ціха праказаў чалавек і наважыўся ісьці.

Сонца стаяла на паўдні, і палкія промні яго бязьлітасна палілі твар. Хацелася кінуцца ў рэчку, плаваць у сьцюдзёнай вадзе, плёскацца, як некалі на бацькаўшчыне, у крышталёвым возеры. Але гэты горад—ня бацькаўшчына, ня ціхі маёнтак, і рэчка ў ім—брудная, пратухлая смуродам, у крыві. Апрача таго, неабходна сьпяшацца да свае часткі,—яна ўжо напэўна падрыхтавалася да эвакуацыі.

Калі трэба было павярнуць за рог вуліцы, абярнуўся і глянуў на старога. Над ім стаяла жанчына—на каленях, у чорным, прыгнутая да зямлі. Стары ўсё яшчэ ляжаў на бруку, і жанчына перавязвала яму галаву. Чалавек крута павярнуў назад. Ён ішоў шпаркім крокам, пільна гледзячы на жанчыну. А яна, жанчына ў чорным—узьнялася, мгненьне пастаяла ў нерашучасьці, глянула спалоханымі вачыма на чалавека і кінулася наўцёкі. Калі глядзела—сьлёзы заіскрыліся на сонцы, і нават прыкметна было, як адна ўпала на брудную зямлю. Пабегла жанчына за крамы, цераз невялікі мост, у вузкі і вілёнчысты завулак. Чалавек спачатку толькі паскорыў крокі ўсьлед за ёй, а потым і сам пабег угрунь, крокамі парушаючы нечакана надышоўшую цішыню.

— Стой, страляць буду!

Жанчына бегла без аглядкі, моўчкі, і неяк дзіўна было, чаму яна ня спыняецца. Верылася, што яна зараз-жа спыніцца, будзе прасіць літасьці, пачне цалаваць пыльнае бульдо ботаў.

— Стой, застрэлю!—крыкнуў у другі раз чалавек.

Жанчына аглянулася і яшчэ больш паскорыла бег. Адзеньне перьшкаджала ёй бегчы і яна ўзьняла яго вышэй кален, каб яно ня блыталася паміж ног. У чалавека, што бег наўздагон за ёй, захалынула сэрца, нечым сьцюдзёна-ільдзістым занялося яно, і закружылася ад хмелю галава,—ён ласкавым голасам парашыў спыніць жанчыну:

— Малодка... пачакай!..

Ледзь не праказаў усьлед за гэтым:—Маладзіца, дай вады напіцца!—але жанчына схавалася ў пад'езьдзе—хмурым і грузкім, ад сярэдневечча, і чалавек кінуўся ўсьлед за ёй—у цёмны калідор пад'езда.

Жанчына ўзьбягала па крутой знадворнай лесьвіцы на другі паверх, і белыя панталоны яе былі відаць вышэй кален. Чалавек зноў адчуў у сэрцы сьцюдзёнасьць лёду,—і частыя ўсходцы замільгалі перад вачыма, як частакол,—захацелася скакнуць адразу на вэранду другога паверху.

Дзьверы ў дом жанчына пасьпела замкнуць, і чалавек праламіў вакно на кухню.

Пад нагамі хрусьцела шкло, з вялікага пальца правай рукі капала кроў, прагорклы пах на кухні паказаўся балотным,—захацелася разьбіць усе вокны ў доме і пад самы дом падкапаць дынаміт.

Чалавек прыслухаўся да нямой цішыні ў доме. Жанчына напэўна схавалася, і ні за што ня верылася, што яна ня будзе знойдзена. Яна тут, і калі не дагнаў яе на вуліцы, то бязумоўна, зловіць тут.

— Прашу ласкаю, выдзі, інакш будзе дрэнна!

Голас прагучэў фальшыва, і ніхто на яго не адгукнуўся. Зрабілася злосна і крыўдна на самаго сябе. І сапраўды, сьмешны і недарэчны малюнак: на парозе з пратухлае кухні ў бедны агульны пакой стаіць афіцэр слаўнай польскай арміі і лісьлівым голасам просіць нейкую дзікаватую жанчыну паказацца яму на вочы.

— Вы ня думайце на мяне так... Я нічога вам не зраблю...

Голас—фальшывы, зусім ня верыцца, што гэта голас уласны;—каб пачулі яго панове афіцэры, то пасьля яны ня далі-б жыць.

„Фальш, фальш!—думае чалавек. Я гублю гонар афіцэра, саромлю слаўную армію... Тут патрэбны не сантымэнты, а бомбы"...

— Я кіну бомбу ў вашу кватэру, і ад яе не застанецца каменя на каменi!..

„І самога костачак не сабралі-б,—думае чалавек, але яму здаецца, што ён запалохаў жанчыну.—Яна спужаецца і выскачыць, апантаная"...

Па пакоі быў раскіданы пух і ложак быў незасланы. У кватэры панаваў беспарадак, відаць былі сьляды нейчага гаспадараньня,—пад нагамі валялася шкло пабітае пасуды.

— У апошні раз прашу, непакорная жанчына!..

І ў той-жа момант пашкадаваў сказанага. У самым куту заўважыў ледзь узьнятую дошку падлогі, і ў галаве мільгнула нечаканая думка.

Ціха падышоў да кута і ўзьняў дошку. Адтуль глянула чарната падзямельля і павеяла пахам застоенага паветра і затхлае цьвілі.

— Загадваю зараз-жа вылезьці з гэтага паганага склепу!

Была цішыня і няёмкае становішча. Лезьці ў склеп—боязна: можа нажом ударыць пад сэрца або проста выстраліць у патыліцу, стаяць і загадваць—дарэмна: яна ўсёроўна не паслухаецца ніякіх суровых загадаў.

Аднекуль данесьліся гулкія выбухі гармат. „Напэўна, чырвоныя наступаюць",—зьявілася думка, але зараз-жа зьнікла. Яе месца заняла другая хітрая думка: паказаць перапалоханай жанчыне, што яна яму зусім ня цікава і непатрэбна, а самому затаіцца ў кухні і чакаць.

— Чырвоныя бандыты наступаюць, пся крэў!..—зласьліва праказаў чалавек і знарок звонка застукаў абцасамі па падлозе, як-бы сьпяшаўся хутчэй пакінуць кватэру.—Я-б табе паказаў, паганая!—дадаў ён ужо на парозе.

З усёй сілай ударыў дзьвярыма, але з такім разьлікам, каб яны троху адскочылі, пакінуўшы невялікую шчыліну для нагляданьня. Плян задаўся, і чалавек, пастукаўшы абцасамі па падлозе якраз столькі часу, колькі, на яго погляд, патрэбна было, каб дайсьці да дзьвярэй, і ня выходзячы з кухні, але бразнуўшы дзьвярыма на вэранду (дзьверы былі не замкнёны, а ўзяты на засоўку,—засоўку знарок звонка адсунуў), схаваўся за шафаю, блізка дзьвярэй, з такім разьлікам, каб можна было адным вокам бачыць адкінутую дошку падлогі ў куту пакою.

Стаяў на карачках, і з гэтай прычыны млелі ногі. Усё гучней і гучней чуліся глухія выбухі з усходу. Ужо можна было адрозьніць строкат кулямётаў і асобныя стрэлы з вінтовак, але гукі гэтыя ішлі неяк міма, не пакідаючы сьледу ў сьвядомасьці. Уся ўвага і пільнасьць былі сконцэнтраваны на чорнай дошцы ў другім пакоі. Яна—першааснова, згубіўшы якую нельга нормальна працаваць, яна—той парог, не пераступіўшы якога нельга ўзяцца за далейшае...

На чорнай дошцы паказаліся белыя пальцы рукі, і чалавек замёр у затоенасьці. Ён увесь ператварыўся ў гострый зрок,—дыханьня ня чулася, сэрца спыніла сваё трапятаньне, здаецца—абарвалася ад зьдзіўленьня і нечаканасьці, і боязна было, каб яно зноў не адна віла свой ранейшы бег.

За белымі пальцамі паказалася чорная галава, і валасы на ёй здаваліся асмоленымі. А на твары, калі ён вырас над дошкаю, быў прыкмецен глыбокі спалох, і вочы былі на ім—чорныя, як сьпелыя ягады вішні. Жанчына падобна была на цыганку, і грудзі былі ў яе—пышныя, як дзьве высокія хвалі на моры.

Жанчына ціха вылезла са склепу. Калі ступіла на масьніцу, яна скрыпнула, і жанчына нізка прыгнулася да падлогі. Да дзьвярэй падышла ціха, на пальцах, і спынілася на парозе ў задуме. Чалавек чакаў, прагнуў, каб хутчэй пераступіла парог, а яна стаяла, рукой трымаючыся за лутку.

Калі схапіў яе, яна толькі войкнула:—Ай!—і сьціхла, пакорна падаючы на рукі. Была яна гарачая, як распалены сонцам дзень, і пульхная, як доўгачаканы адпачынак.

— Дурная, дурная!..—скрозь зубы праказаў чалавек і панёс яе на ложак.

. . . . . .

Калі жанчына апамятавалася, яна закрычала дзікім і прарэзьлівым голасам. Было жудасна ад гэтага голасу, і чалавек накінуў на галаву жанчыны падушку.

У пакой увайшоў стары яўрэй, падобны на апостала, з перавязанай галавою і з высокім кіяком у руках, і таксама закрычаў глухім, ахрыплым голасам.

Жанчына вырвалася і зноў закрычала,—пакой напоўніўся звонкімі і ахрыплымі гукамі,—было жудасна слухаць гэты крык.

Чалавек выстраліў у вакно з маўзэра, і жанчына кінулася на калені да ног чалавека:

— Пане афіцэру, ня губіце бацьку...

— Маўчаць, паганцы!—аскаліўшы зубы, крыкнуў чалавек.

— Пане афіцэру...

На вэрандзе пачуўся грукат нейчых грубых абцасаў, і людзі ў пакоі настаражыліся. Жанчына стаяла на каленях, разьвёўшы ў замешанасьці рукі, стары прытуліўся да дзьвярэй, шкляныя вочы апусьціўшы на падлогу, а перапалоханы афіцэр зрабіў пагардлівы выгляд і ўпяў крывёю налітыя вочы ў кухню.

Дзьверы адчыніліся як-бы самі, і ў пакой ускочылі два чалавекі. І тут адбылося самае нечаканае: афіцэр пільна глянуў на новых людзей—потных, задымленых, суровых,—і ў мгненьне, як-бы спружынавы, скокнуў у вакно. Шкло зазьвінела, і афіцэр разам з выбітай рамаю паляцеў уніз. Людзі кінуліся да вакна, пачалі страляць, але афіцэр, кульгаючы, пасьпеў схавацца за будынкамі. Людзі выскачылі на двор, на вуліцу, зрабілі некалькі стрэлаў угару, але афіцэра і сьлед застыг. Тады людзі зьвярнуліся ў пакой, да радасных бацькі і дачкі, і старэйшы з іх, аброслы густымі валасамі, глуха праказаў:

— Я цябе з коранем вырву, чортава парода Вялікабрынскіх!

А чалавек бег, часта паглядваючы назад. Ён зьвіхнуў правую нагу і цяпер кульгаў на яе, сьмешна прысядаючы да зямлі. Ён аглянуўся яшчэ раз назад і, упэўнены, што за ім ніхто ня гоніцца, сьцішыў бег. Ён ішоў крокам, чыкільгаючы на правую нагу, і ў душы яго была радасьць за сваё нечаканае збавеньне і нянавісьць, і агіда— да таго, потнага, зарослага густымі валасамі.

Гэта-ж ён, той самы,—Макарам завуць яго, здаецца,—сын, парабка Лявона і дойшчыцы Тэклі ў маёнтку,—чарнявы, сарві-галава, непаседа і шкоднік... І вочы ў яго такія-ж—сьвярдзёлкам, колкія, і сам ён падобны на выпушчанае з зьвярынца ваўчанё...

III

Сонца стаяла нізка, па-над самым борам, і высокія таполі, які грэцкія колёны, зьзялі бліскучай пазалотай апошніх промняў. Паветра было ціхае, нямое ў сваёй нявыказнай затоенасьці, і лісьце на ліпах не калыхалася ад яго жартаўлівых павеваў. Парк тануў у промнях сонца, дзівосны і ўрачысты, як-бы напярэдадні вялікага сьвята.

Паніч ішоў па шаўковым дыване травы ў тым радасным настроі, які бывае тады, калі хлапчук упэўнены, што ён—самы разумны і таленавіты сярод усіх дзяцей, самы прыгажэйшы і больш дужы сярод сваіх равесьнікаў, і што яму, а не каму-небудзь іншаму, павінны падначальвацца ўсе ў недалёкай будучыні.

Ды хто раўня Броню Вялікабрынскаму! Бацька яго мае маёнтак вялікі, людзі працуюць на бацьку і на яго, Броню, слухаюцца бацькі, б'юць паклоны да самай зямлі... Папрабуй хто-небудзь не падначаліцца, бацька адразу разьлічыцца з ім! Бацька Броні—самы магутны чалавек сярод людзей, якіх толькі даводзілася сустракаць. Ды і ён, Броня, не слабы: няхай толькі хто зачэпіць, дык месца ня знойдзе нават там, дзе, як кажа бацька, Макар цялят не пасе...

А з Макарам дык і раўнаць нельга: куды яму, парабкаву сыну, гнацца за панічом! Макар той—як былінка ў полі: куды вецер, туды і постаць яго,—куды-ж яму раўняцца з Броняй? У Макара валасы, як сажа ў коміне, а вочы, як чорнае вугольле—адразу відаць, што цячэ ў ім мужыцкая кроў... А цела—як падлога на кухні: бруднае, мурзатае, у плямах,—маці яго, напэўна, мые толькі раз у год. Не хлапчук, а парсючок Макар гэты: гуляе з шчанятамі, сабакамі, сьвіньню часам ловіць за хвост, у пылу на дарозе купаецца, як курчанё... Ён зусім не падобны на паніча—акуратнага, чысьценькага гімназіста, хіба толькі тым, што мае дзьве нагі, дзьве рукі і вочы, як у людзей. Дый тое няпраўда. Вочы, яго дзікунскія, як у зьвярка, нават боязна сустракацца з імі...

Паніч ішоў па мяккім дыване травы шчасьлівы і радасны, што ён ніколькі не падобен на Макара. Макар-жа—няпісьменны, а ён, Броня, вучыцца ў гімназіі. Макар—мурзаты, абарваны і галодны, а ён, Броня, надушаны сьвежымі духамі, апрануты ў форму гімназіста, накормлены такімі стравамі, якія з роду ня бачыў і ніколі ня ўбачыць гэты мужыцкі зьвярок. Броню было наканована богам нарадзіцца пад шчасьлівай планідай, гадавацца ў харомах і раскошы, улетку жыць у маёнтку, а ўзімку—у вялікім і прыгожым горадзе... Макару-ж—нарадзіцца ў брудзе і рызманох; жыць сярод лесу і ваўкоў, улетку пасьвіць сьвіней, а ўзімку памагаць бацьку карміць коні на панскай стайні або адносіць малако з кароўніка, дзе маці працавала дойшчыцай. Які добры і магутны бог, літасьцівы да панскіх сынкоў! Хвала яму, усявышняму, абаронцу Броні—паніча!

— Хвала, аллах! Хвала, аллах! Хвала!—засьпяваў паніч і пабег угрунь да возера.

На адхоністым беразе, каля самае вады, сядзелі хлапчукі з дворкі і ў нешта гулялі паміж сабой. Яны сядзелі гуртком, у выглядзе кола, і з іхняга гуртка, з самай сярэдзіны, падскоквалі ўгару каменчыкі,—яны, відаць, гулялі вельмі весела. Адтуль чуўся сьмех і паасобныя выгукі, але пачуць, пра што гамоняць дзеці, і даведацца, у ва што яны гуляюць, нельга было. Спачатку захацелася падыйсьці да іх, далучыцца ў вясёлы гурток і самому ўдзельнічаць у гульні, але зараз зьявілася думка: „Як, з мужыцкімі дзецьмі гуляць, як роўны з роўным?"—і жаданьне пайсьці да іх зьмянілася зусім на адваротнае: разбурыць іхнюю гульню, сагнаць з наседжанага месца дзяцей. Каб паніч быў больш старэйшым, ён бы ўспомніў пра сумазбродніцкія выбрыкі сваіх продкаў, якія не маглі бачыць адзнакі вясёласьці на тварах сваіх прыгонных, і калі заўважалі гэтыя ад знакі, то аддавалі прыгонных у салдаты. Паніч ня ведаў гэтага, ён дзейнічаў інстынктыўна,—у ім цякла кроў яго далёкіх продкаў. „Шчасьлівымі могуць быць толькі паны,—думалі панічовы продкі,—шчасьлівыя сярод прыгоннах—гэта вольнадумцы і ерэтыкі; ад іх трэба як мага хутчэй пазбавіцца". Гэта быў закон для старасьвецкіх паноў, іхні катэхізіс дзеяньняў. Паніч таксама знаходзіўся пад уладай гэтага закону.

Ён пачаў кідаць каменчыкі ў дзіцячы гурток на беразе возера. Першы камень зрабіў пералёт і ўдырыўся аб ваду,—плеск на возеры спалохаў дзяцей, і яны ў момант глянулі на ваду. Па возеры разыходзіліся кругі — адзін за адным, як быццам ударыла па паверхні вады якая-небудзь рыбіна.

— Шчука, напэўна,—пачуў паніч нейчы голас.

— Якая табе шчука, гэта вакунь!—пачуўся другі галасок, і паніч апазнаў меншага Макаравага брата—карапуза Янку. Тут-жа, у самай

сярэдзіне гуртка, сядзеў і сам Макар, чарнявы і старэйшы ад усіх; ён, відаць, быў тут за атамана, і ў голасе яго чуўся начальніцкі тон.

— Гэта сом, кажу вам; ні шчука, ні вакунь так моцна не плёснуцца.

— От, каб дзеда нашага сюды!—усклікнуў нехта з хлапчукоў.— Ён бы адразу яго злавіў...

— Так табе і дазволілі злавіць! — пачуўся начальніцкі голас Макара.—І табе, і дзеду твайму так бы ўсыпалі, што і хаты не знайшоў-бы...

— А за што яму ўсыпалі-б?—зьдзіўлена запытаў хлапчук.

— І штрапу яшчэ далі-б,—ня слухаючы хлапчука, тлумачыў Макар,—бо возера панскае і рыба ў ім таксама панская...

— А хіба пан адзін усю рыбу паесьць?—зноў запытаў хлапчук.

Але адказаць Макару на гэтае запытаньне не давялося. Каля дзяцей пачалі падаць адзін за адным каменьні. Яны ляцелі цераз галовы, падалі каля самых ног, і ўгледзець, хто іх кідае, нельга было. Дзеці разьбегліся ў розныя бакі па беразе і пільна ўглядаліся ў кусты вербалозу, адкуль падалі каменьні. Вось адзін камень ударыў маленькага Піліпа па руцэ, і той схапіўся за яе, прыгнуўся да зямлі, а потым заплакаў, як-бы маці толькі што адсьцёбала яго матузамі. Вось другі камень прагудзеў па-над самай Макаравай галавой, і здалося, што мурашкі пабеглі па целе або пырснуў хто-небудзь у твар сьцюдзёнай вадой. Каменьні падалі на зямлю і хлапчукі адскаквалі ад іх, быццам яны і на зямлі зьяўляліся такімі страшкамі, як у паветры. Потым пачуўся прарэзьлівы крык, і ўсе глянулі на Макаравага брата—Янку. Той паваліўся на зямлю і змоўк, як бы толькі перапалохаўся ад гулу камня. Макар заўважыў у кустох вербалозу паніча і кінуўся ў той бок з усяе сілы, як-бы хто гнаўся ўсьлед за ім. Насустрач Макару ляцелі каменьні, але ён на іх не зважаў. Ён уварваўся ў кусты вербалозу, пераскочыў канаву і пагнаўся за панічом, які кінуўся на ўцёкі ў бок лесу.

Паніч бег, адчуваючы за сьпіной сваёй сьмерць. Дыхаць цяжка было, паветра пераймала горла, ногі падкашваліся ад спалоху. Паніч ведаў, што за ім бяжыць Макар, і з гэтае прычыны вырастала агромністая злосьць. Ня можа быць, каб гэта пачвара, гэты мужыцкі выродак дагнаў паніча! Навошта-ж ён займаўся гімнастыкай у гімназіі і браў першыя прызы на спаборніцтвах,—не дагнаць няўклюжаму парабчонку паніча. Але ён усё ткі за сьпіною, блізка зусім, і чутна, як зямля дрыжыць пад яго нагамі. Дагоніць, дагоніць! Ён—дзікі, ён—зьвер,—уцячы ад яго, схавацца, у маёнтак, да хаты,—там зловяць яго і адлупцуюць, загаліўшы нагала, і бацьку яго пападзе, і матцы мала ня будзе... Уцячы, толькі-б хутчэй уцячы, а там разьлічацца з ім, пакажуць, як гнацца за панічом. Але ён блізка, вось-вось дагоніць і схопіць за кіршэнь... А што, калі кінуцца на хітрыкі?.. Бегчы з усяе

сілы, а потым, калі ён будзе за два крокі, паваліцца на зямлю,—ён перакуліцца і разаб'е сабе нос, а тым часам можна далёка ўцячы?..

І паніч паваліўся, калі Макар наважыўся ўжо схапіць яго за кіршэнь, паваліўся пад ногі Макаравы нечакана і спрытна, зусім так, як вучылі ў гімназіі, каб зьбіць ворага з панталыку і выйграць гэтым час. Але плян праваліўся: Макар ударыў з усяго разгону высьпеткам у сьпіну панічову, і той закрычаў, як прыціснутае дзьвярыма шчанё. Макар біў паніча, а той крычаў, і Макар заткнуў яму рот наскубленай травой. Потым Макар ушчаміў паніча паміж ног, перавярнуў яго ніцма, стаў каленямі на рукі яго, адперазаўся і перавязаў поясам панічовы рукі. Той ляжаў, як-бы няжывы, і Макар узьняўся, нарваў крапівы ў кустох, скінуў панічу штаны і пачаў сьцёбаць крапівай па голым целе. Паніч корчыўся і падскакваў, а калі пачынаў крычаць, Макар зноў затыкаў яму рот травою. Паніч аслаб і змоўк, і калі Макар сьцёбаў яго крапівай, цела панічова толькі ўздрыгвала. Тады Макар вырваў на беразе возера лазіну, перавязаў ёй рукі панічовы, падперазаўся поясам і, як-бы нічога ня было, памалу ўзьняўся і пайшоў да хаты.

IV

Дома быў лямант і крык. Маці плакала на ўвесь голас і прыгаварвала:

— А сыночак м-оой лю-ю-бенькі, а Яначка мой да-а-а-ражэнькі... У полі кветачкі расьцьвіта-а-а-юць, а сыночка майго ў магі-і-ілынку па-ха-ва-а-аюць... А сыночак м-о-ой лю-ю-бенькі, а Яначка мой да-а-а-рэжанькі...

Янка ляжаў на лаве, і чорная кроў была на яго скронях. Удар панічоў быў трапны, і Янка сканаў на беразе возера.

Калі Макар убачыў меншага брата мёртвым, ён задрыжэў і ледзь праказаў скрозь зубы:

— Я табе адпомшчу, чорт...

А потым заплакаў і паваліўся, кулакамі стукаючы па падлозе.

У хату ўварваўся сам пан, як бура, як гураган, і схапіў за бараду Макаравага бацьку. Пан затупаў нагамі, закрычаў і ўдарыў на ўвесь мах па твары бацьку. Бацька ня стрымаўся і з усяго разгону таксама ўдарыў пана. Пан пахіснуўся, схапіўся за вуха, пастаяў паўхвіліны моўчкі, шкляныя вочы ўцяўшы ў Макаравага бацьку, а потым выскачыў з хаты, з усёй сілай, бразнуўшы дзьвярыма, ажно шкло зазьвінела ў вокнах.

У той-жа вечар бацьку арыштавалі, а пасьля засудзілі на тры гады астрогу.

Макар з маткай пахавалі Янку і пайшлі шукаць долі ў белы сьвет.

Пан падаў касацыйную скаргу, і бацьку дадалі яшчэ чатыры гады.

Праз два гады памерла матка, і Макар застаўся круглай сіратой.

Хлапчук паступіў на гуту ў горадзе і застаўся на ёй на ўсё жыццё.

Паніч вырас у афіцэра польскай арміі. Здавалася, прайшло шмат часу, і ён запамятаў пра выпадак на беразе возера, на парабчонка Макара, і ўсё гэта патанула ў нябыт. Але сутычка з калматым чалавекам на кватэры, колкія вочы яго, чорныя, як вугальле, аднавілі выпадак на беразе возера, і два чалавекі ў момант апазналі адзін аднаго.

Афіцэру выпадак дараваў жыццё. Ён ня трапіў да польскай арміі, застаўся на гэтым баку, і добрыя знаёмыя афіцэра схавалі яго.

Прайшлі гады бурнага шквалу рэволюцыі, і былы афіцэр Вялікабрынскі перарадзіўся ў інжынэра-хэміка Сакалоўскага. Тады якраз зволілі Рамана Корбута з пасады галоўнага інжынэра на гуце, і яе заняў Сакалоўскі.

Афіцэр-інжынэр глыбока схаваў зьвярыную прагнасьць адкрытае помсты. Ён адчуваў сябе некаторы час адзінотным,—як бы нехта падрэзаў крыльлі,—а потым зблізіўся з Раманам Корбутам, з Калакалухай і з іншымі. Хацелася перацягнуць на свой бок і Насту Корбут, але гэта спроба скончылася крахам. Праўда, яна не перашкаджала шкодніцкай працы, як не перашкаджаў і Паркан, і не з тае прычыны, што яны лояльна адносіліся да яго дзейнасьці, а проста таму, што нічога ня ведалі пра гэта і не маглі нават здагадвацца. Работа, можна сказаць, чыстая была, і нават сам Шаганскі нічога ня мог падумаць, ня кажучы ўжо пра Кулагу.

Калі Сакалоўскі сустрэў Макара на вуліцы рабочага пасёлку, далей адкладваць нельга было. Макар—галоўны вораг, у рукох яго—усе ключы, і ўзарваць гуту было справай або жыцьця, або сьмерці.

Гута ўзарвана, і наперадзе—шырокі разгон жыцьця. Ён вабіць, кліча да сябе, як зялёны оазіс у глухой і сьмяротнай пустыні.

Сьмерць за плячыма, а ў будучыні—шчасьце і радасьць. Толькі-б трапіць на цягнік, спакойна даехаць да Менску, а там недалёка кардон, за кардонам—даўно чаканае і блізкае: бацькі-эмігранты, браты і слаўная армія, у якой на афіцэраў няма беспрацоўя.

І чалавек бег па голым полі, раскінуўшы рукі, як крыльлі, у ружовых марах пра будучыню і ў дзікунскай нянавісьці да мінулага і сучаснага.

У ажухлай цемені начы ён падобен быў на зьвера, які толькі што вырваўся на волю і цяпер удыхае на ўсе лёгкія хмельную слодыч паветра.

Новы завод

I

Антось Шалы ішоў на гуту ў радасным настроі. Прыемна было адчуваць на твары сьвежыя струмені паветра, ступаць нагамі па гразкай зямлі, зусім не ўглядацца ў вузкую сьцежку пад самымі вокнамі хат. Сьцежка знаёмая з маленства, яна вытаптана ўласнымі нагамі, і не адзін дзесятак ботаў застаўся на ёй—дарогу да гуты можна знайсьці нават з завязанымі вачыма. І ўсё-ткі Антось адчувае нейкі хмель у галаве, ногі ў каленях згінаюцца лёгка, па-маладому, і сьвет здаецца падначаленым кожнаму руху, як ручка варштату па вырабу банак.

Сьвет! Які ён вялікі і неабдымны, і колькі няшчасьця блукае па яго шырокіх прасторах! Некалі была ноч—чорная і глухая, як у глыбокую восень, потым падкраўся ён—поціху, няўпрыкмець, як доўгачаканая радасьць, пасьля грымнуў дзень музыкаю сьвятла—высокай і суровай, як само жыцьцё. Але-ж колькі няшчасьця і бруду пад нагамі,—хочацца хутчэй гэта скінуць у сьметнік гісторыі,—і тут пачынаецца новая барацьба: за высокую якасьць чалавечае пароды,—людзі яшчэ трымаюць у сваіх тайнікох дзікага зьвярка старасьвецкасьці, а некаторыя—тоежсамасьць зьвяроў; за будучыню ў вятрох і новыя ўзаемаадносіны чалавека з чалавекам,—гэта барацьба штодзень, штохвіліну, часам у дробным і нязначным, але для вялікага—ўсё мае значэньне і важнасьць. Сьвет—у барацьбе, і зямля гойдаецца ў баламутных вятрох гісторыі.

І Антось сьпяшаўся на гуту ў нявыказнай радасьці зьдзейсьненьня сваіх мараў, у тым настроі, калі хочацца пабегчы па зялёным дыване муравы, як у дзяцінстве, хлапчуком-непаседаю, гарэзай непаслухмянай, і каб гнаўся хто-небудзь усьлед—з усяе сілы, навыперадкі, і каб не дагнаў—стаміўся, захакаўся і адстаў, як больш слабы і няспрытны. І якая радасьць пасьля! Жартачкі сказаць: перамога!

І перамога вялікая: яе чакаў Антось некалькі год, як фанатык прыйсьця другога Мэсіі, марыў пра яе, як юнак на вайне пра сваю пакінутую каханку, змагаўся за яе, як паміраючы за сваё жыцьцё. Колькі начэй у мінуўшчыне—у вылічэньнях і досьледах, у дыме і прагорклаьці, у роспачы і ў новых надзеях, бурных і ціхіх начэй, радасных і цяжкіх хвілін! І ўсё пройдзена пераможана: мары зьдзейсьнены, лятуценьні напярэдадні ажыцьцяўленьня,—але чаму такі сум у душы і незразумелая трывога за будучыню? Так, напэўна, заўсёды; пакуль змагаешся за што-небудзь—упартасьць і бурнасьць захапляюць усяго чалавека, а як дасягнеш мэты—сум і трывога зьяўляюцца ў ім, як роўнапраўныя спадарожнікі радасьці. І ў гэтым, на-

паўна, антытэза дасягнутаму: выкарыстоўваючы і перамагаючы яго, рухацца наперад—да новых лятуценьняў і мар, у бурнасьць і роспач барацьбы.

Другая зьмена канчала работу, і Антось стаў на трэцюю. Гута гудзела, як заўсёды, у раўнамернай працы і напружанасьці. Выдувальшчыкі рухаліся, кіякамі-трубкамі набіраючы шкломасу, і дзяўчаты адносілі бутэлькі і банкі да каляніцы. Сярод дзяўчат кінуліся ў вочы дзьве—Пёкла і Надзя, жвавыя і вясёлыя дзяўчаты. Іх ніколі нельга было ўбачыць у паасобку; яны, як сёстры, былі падобны адна на адну, працавалі разам і жылі таксама ўдзьвёх—у адным пакойчыку, на ўскрай пасёлку. Глядзець на іх было зайздрасна—маладых і здаровых, іхні сьмех заўсёды радаваў. Яны нешта сьмешнае казалі Дзянісу Гаваронку, і той, дзьмухаючы ў трубку, ня вытрымліваў і сьмяяўся. І быў вельмі прыгожы ён у чырвоным сьвятле тапільнае печы—з трубкаю ў руках, малады і дужы. Нехта з рабочых, гледзячы на жарты дзяўчат з Дзянісам, насьмешліва праказаў:

— Ой, глядзі, Надзечка, каб не пабіла цябе жонка Дзянісава вельмі ты каля яго завінаешся...

— Не такая яна дурная, каб біць пачала,—за Надзю адказала Пёкла.

— Памірымся як-небудзь,—засьмяяўся і Дзяніс, у форму апускаючы шкло.

А Надзя глядзела ў вочы Дзянісавы, і гэты погляд казаў больш за словы.

Работа ішла, як звычайна, і пасьля перапынку неяк нечакана надыйшоў канец.

Была дванаццатая гадзіна начы. У дванаццаць павінна была заступіць першая зьмена. І ў гэты час адбылося тое нязвычайнае, што ўскалыхнула ўсю гуту.

Глухі выбух рванўў тапільную печ, і распаленая шкломаса белымі языкамі ўзьнялася ўгару. Здалося, адбыўся зямляздрыг або зямля выйшла з свае орбіты.

Гэта было мгненьне, але яно ўрэзалася ў памяць: бліскучыя языкі шкломасы, высечаныя з мармуру постаці рабочых, вогненнае жарало тапільнае печы.

Больш нічога ня памятае Антось. Усё здалося пышным сном, некалі даўно, у маленстве. І шкада было, калі апамятаваўся, што так хутка скончыўся сон. А калі зразумеў, схапіўся рукою за грудзі і падскочыў з канапы, сам ня ведаючы ў каго пытаючы:

— Дзе-ж гэта людзі? Дзе я?

— Ты дома, дзед Антось, заспакойся,—ціха праказаў нейчы голас.

Антось пазнаў Астапа, і той паклаў яго зноў на канапу. Марыля прынесла ручнік, змочаны сьцюдзёнай вадою, і Астап перавязаў ім Антосеву галаву.

— Што там здарылася?—перапалохана перапытала Марыля.

— Пасьля, пасьля!—праказаў Астап і зьнік за дзьвярыма. А потым зноў адчыніў іх і загадаў Марылі:—глядзі старога... Калі дрэнна стане яму, змачы ручнік і пакладзі на галаву...

II

Астап бег, ня памятаючы самога сябе. Гэта быў нейкі дзікі кругаварот, вырвацца з якога не хапала сілы.

Пажарная команда гасіла пажар на гуце. Людзі хадзілі з ліхтарамі. У цемені ліхтары падобны былі на факелы. Гэта было нешта ад сярэднявечча, жудаснае і суровае.

Тапільная печ была разбурана; на белую ляву шкломасы лілі ваду; на гуце панавалі сумятня і замешанасьць.

Чорныя сілуэты без усялякае мэты снавалі па гуце. Людзі су, стракаліся, запытвалі адзін у аднаго пра жудасную прычыну выбуху-але пра гэта дакладна ніхто ня ведаў.

Гута падобна была на карабель, які толькі што разьбіўся аб падводную скалу. Карабель плыў у глыбокай начы па неабсяжным прасторы мора. Недзе далёка, блізка берагу, слаба мігцеў маяк, то зьнікаючы, то зноў выплываючы з-пад вады. Раптам маяк зьнік, патануў у моры, і карабель нечакана наскочыў на гострую скалу пад вадою. Людзі на караблі зьмяшаліся, ня ведаючы, што рабіць і як выратавацца, а вецер-баламутнік рвануў ветразі, і карабель пачаў тануць у чорную бездань мора. Вецер гуляе па моры, сьвішча на тысячы галасоў, рве ветразі, і людзі на караблі крычаць аб ратунку, аб літасьці. І няма ратунку, няма жаданае літасьці,—карабель глыбей і глыбей хаваецца ў мора. Здаецца, надыйшлі апошнія хвіліны,—некаторыя з людзей пакорна рыхтуюцца сустрэць сьмерць, патануць разам з абломкамі карабля ў завірушным моры. Сьмерць! сьмерць! Яна прышла, як крэдытор у вызначаны тэрмін па грошы, вырасла перад вачыма, як лёс—неадхільны і жорсткі. Сьмерць, сьмерць!

І раптам глухую ноч прарэзвае голас надзеі:

— Хлопцы, ня падаць духам! Гута ня спыніцца!

Шаганскі стаіць на грудзе цэглы, і скураная куртка яго бліскучыць ад промняў сьвятла. Агромністая цень яго фігуры дрыжыць на сьцяне, як выразаны з чорнае паперы шмакутнік, зломаны на выступе каляніцы, няўклюды. Голас яго цьвёрды і роўны, словы ўпэўненыя і важкія:

— Ніякай панікі, таварышы! Гуту пусьцім, у нас ёсьць запасная печ!

Словы Шаганскага, як магнэс, прыцягнулі да сябе рабочых. Вакол яго згрупавалася купка людзей, і кожны па-своему загаманіў:

— Гэта Сакалоўскага работа!

— Ён, сволач!

— Не дарма ён працівіўся, калі Антось прапанаваў зрабіць запасную печ!

— Правільна, правільна!—прарэзьлівым голасам закрычаў майстар Калакалуха.—Я даўно казаў, што ён шкоднік!

— А людзі ня слухалі!—падтрымаў яго Нупрэй Перапечка, злосна глянуўшы на Шаганскага.

— Каму ты казаў? Хто ня слухаў?—падскочыў да Калакалухі і Перапечкі выдувальшчык Сьцяпан Гарбуз.

— А што, табе казаць трэ' было?—падступіў да Сьцяпана Перапечка.—Табе дакладваць, га? Асэсар такі!

— Таварышы, да парадку!—голасна крыкнуў Шаганскі, і Калакалуха дыргануў за рукаў Перапечку, як бы даючы яму знак маўчаць.

Рабочыя змоўклі, і Шаганскі голасна загаварыў:

— Тыя, што працавалі на гэтай зьмене, зараз-жа пачнуць падрыхтоўваць запасную печ. Ніякае панікі, я сам буду сачыць за парадкам. З заўтрашняга дня гута павінна пачаць працаваць нормальна.

— Як-жа інакш!—за ўсіх адказаў Сьцяпан Гарбуз і першы пайшоў да запасной печы.

— Ну, дык за працу, таварышы!—праказаў Астап Паркан, рукой паказваючы на запасную печ.

За імі пайшлі ўсе рабочыя. Каля самага Шаганскага засталіся Калакалуха і Перапечка.

— А вы?—зьвярнуўся да іх Шаганскі.

— Нам на першую зьмену,—глуха праказаў Калакалуха.

— Вы арыштаваны!

Зьдзіўленыя Калакалуха і Перапечка, як-бы па камандзе, узьнялі галовы.

— Арыштаваны!—паўтарыў Шаганскі.—Загадваю зараз-жа пайсьці са мною ў клюб, і калі хто з вас памкнецца ўцякаць, дык няхай памятае, што я прамахвацца ня ўмею.

Шаганскі паклікаў да сябе Паркана. Нешта ціха сказаў яму на вуха. Астап пабег да запасной печы і зьвярнуўся адтуль з двума рабочымі.

Калакалуху і Перапечку абшукалі. У іх знайшлі па фінскамунажу і адзін рэвольвэр. Рэвольвэр быў схаваны за пазухай у Калакалухі.

Моўчкі, як-бы цені, Калакалуха з Перапечкай зьніклі ў цемені ночы. За імі пайшоў Шаганскі з двума чалавекамі.

Рабочыя дружна ўзяліся за работу. Адчувалася нязвычайнасьць становішча, і гэта адчуваньне ўносіла бадзёрасьць у працу. Тут было

нешта ад першых суботнікаў, у цяжкія дваццатыя гады, калі дробнаму, на першы погляд нязначнаму, надавалася выключнае значэньне. Рабочыя неяк самі, мімаходзь, разьмеркавалі паміж сабою асобныя вучасткі работы, і Астап быў упэўнены, што на заўтра, не пазьней, як увечары, гута адновіць свой шумны гул—і, як сёньня або ўчора, зусім нормальна, па-ўдарнаму. Нават больш таго: учора і сёньня нормальнаму гулу гуты заміналі чужыя рукі, цяпер яна вызвалена ад іх, заўтра яна вольна, на ўсю сваю дужую сілу, уздыхне ветрагоннай трубой, забушуе растопленай лявай шкломасы.

Астап толькі цяпер глыбока зразумеў, чаму з няўхільнай паступовасьцю з дня-на-дзень якасьць шкломасы пагаршалася, а хітры Сакалоўскі ў зьдзіўленьні разводзіў рукі, як-бы нічога ня ведаючы.

— Сульфат вінаваты,—спакойна казаў Сакалоўскі.

Толькі цяпер паўставаў перад вачыма агідны малюнак здрадніцкае дзейнасьці Сакалоўскага. Ён насіў маску энтузыяста на сваім ліcьлівым твары, хаваючы пад ёю зьвярыную нянавісьць да навакольнага.

Астап успомніў справу з „Цэнтрасьпіртам", пра якую расказала яму Наста, і нежаданьне будаваць запасную печ па прапанове Антося, і двухсэнсовыя адносіны да вынаходцы, і глухую размову з Настай на ганку дома, і спрэчку ў конторы гуты. Вось ён, зьвер у масцы, агідны і прагны, ненавісьнік усяго новага! Ён трымае ў аднэй руцэ пышную кветку спачуваньня і лояльнасьці, хаваючы ў другой нож у сьпіну рэволюцыі.

А колькі такіх Сакалоўскіх да гэтага часу ходзіць сярод нас? Яны ўдала маскуюцца, б'ючы сябе ў грудзі за сусьветную рэволюцыю і адначасова думаючы, як бы ўзьлезьці на высокую хвалю гэтае рэволюцыі і накіраваць яе бурны шквал на гострую скалу або ў ціхую затоку, на сьмерць. І ёсьць яшчэ шмат нізкавекіх, заплылых тлустасьцю вонкавае спакойнасьці людзей, якія ня ўмеюць бачыць за звонкімі словамі агіднае ўсьмешкі ворага. Кулага з Таратуем яскравае ўвасабленьне гэтых людзей. І Наста, і Сьцяпан, і Антось у пэўнай ступені хварэюць на гэту хваробу. Цы і сам Астап ніколі ня мог уявіць гэтага раней. Нават Шаганскі таксама, напэўна, нічога ня ведаў да апошняга часу.

І Астап пачаў шукаць прычыну агульнага асьляпленьня дзейнасьцю інжынэра. Хіба растлумачыць тым, што ён удала хаваў канцы ў ваду? Або таксама нізкавекасьцю ўсіх, пачынаючы ад Таратуя і канчаючы Шаганскім? Гэтага ня можа быць. Але што застаецца, калі адкінуць гэтыя два прадбачаньні. Мы ўсё хварэем на нізкавекасьць, у самым горшым разуменьні гэтага слова,—парашыў Астап,—і толькі ў гэтым асноўная прычына агульнага асьляпленьня. Сакалоўскі пачаў дзейнічаць ня сёньня і ня ўчора, і выкрыць яго можна было ў часе падрыхтоўкі да выбуху. Гэтага ня было зроблена, значыць—мы ўсе,

у большай або ў меншай ступені, нізкавекія і даверлівыя, нам неабходна высока культаваць адчуваньне, якога нам не дала прырода,—клясавага распазнаваньня людзей. Гэта адчуваньне шмат у каго з нас знаходзіцца ў потэнцыяльным стане, як-бы сказаў фізык, у сабе, як-бы сьцьвердзіў соцыялёг; мы павінны стварыць умовы для поўнага разьвіцьця гэтага адчуваньня, пераходу яго ў кінэтычны стан, на службу для сябе, для нас.

Астапавы разважаньні перабіў Таратуй. Ён павольна падыйшоў да месца работы, паглядзеў на Астапа, а потым, як-бы нічога асаблівага не здарылася, праказаў:

— Вы, таварыш Паркан, падганяйце рабочых, інакш будзеце поркацца тут дзён пяць...

— А мы думаем пусьціць праз тыдзень,—знарок абыякавым голасам адказаў Астап.

— А я вам загадваю пусьціць не пазьней, як праз тры дні!—зласьліва крыкнуў Таратуй.

— А я пушчу заўтры!—крута абярнуўшыся да Таратуя, крыкнуў Астап.

— На дырэктара цэліш?—скрозь зубы праказаў Таратуй.

— Такога дырэктара, як вы, на тачцы выкінуць у балота!—кінуў у твар Таратую Астап. „Жывая ілюстрацыя“,—падумаў Астап і пачаў даваць паказаньні рабочым.

Дырэктар паглядзеў усьлед Астапу, плюнуў са злосьці,—сьліна трапіла самому, на паліто,—адыйшоў некалькі крокаў і праказаў:

— Вярціхвост!

Таратую здалося, што ён гэтым словам зусім зьнішчыў Астапа, і ён спакойна вышаў з гуты. „Я пакажу табе, кар'ерыст!—думаў дырэктар, выходзячы з гуты. От пайду раскажу пра ўсё Шаганскаму, ён табе намыліць холку на бюро... Будзеш ведаць, як гутарыць з дырэктарам, і пастанову ЦК аб адзінаначальні ўспомніш“...

Пасьля дырэктара ў гуту прышоў старшыня заўкому Кулага. Выгляд ён меў разьбіты, як бы нечакана нехта пуднуў яго.

— Ну, як справы?—зьвярнуўся да яго Астап.

— Хто яго ведае,—прамармытаў пад нос Кулага і разьвёў у падмацаваньне сказанага рукі.—Проста ня ўцямлю, як ходарам усё пайшло! Адна бяда, далібог!

— На галаву слаб, ці што?—насьмешліва запытаў Сьцяпан Гарбуз.

— Балазе ў цябе галава дубовая, а мяне як бы з панталыку зьбілі,—агрызнуўся Кулага, з-пад ілба глянуўшы на Сьцяпана.

— Ты з роду такі,—не сьцярпеў і Гарбуз.—Яшчэ бацька твой казаў, што ў цябе аднэй клёпкі ў галаве не хапае.

— А ў цябе ўся галава з клёпак!—крыкнуў Кулага і намерыўся выйсьці, каб не ўваходзіць у далейшую спрэчку.

— Кіньце, хлопцы!—праказаў Астап.—Тут работа, а яны лаяцца...

— Я ня лаюся,—закрычаў Кулага,—і няхай ён ня цкуе мяне... Можаш браць зъўком, я табе сёньня магу аддаць портфэль, не такая ўжо вялікая пасада!.. Пляваць я хачу на ўсю гэту работу!..

Кулага выбег з гуты, і рабочыя дружна засьмяяліся. Але сьмех у момант абарваўся, кожны адчуў сябе вінаватым. І амаль што моўчкі працавалі да раніцы, толькі ў выпадку неабходнасьці абменьваліся кароткімі сказамі. Да іх далучыліся рабочыя першай зьмены, і яны ўсе разам ладзілі запасную печ.

Калакалухі і Перапечкі на першай зьмене ня было. Яны сядзелі ў холадным і цёмным склепе.

Апрача іх, у гэтую-ж ноч былі арыштаваны Калупаенка, Касавокін і Заяц.

Позна ноччу, цераз суткі, гута аднавіла свой шумны гул.

III

Трэці дзень пасёлак быў у жалобе і траўры.

Пагода была хмарная, марасіў дробны дождж, дзьмухала сьцюдзёная сіверка.

Па вуліцы ішоў натоўп—грамадою, без усялякага парадку, хмуры, наперадзе натоўпу несьлі тры сасновыя труны—адну за аднэй, абітыя чырвонай матэрыяй.

Жывыя ішлі ўсьлед за мёртвымі,—ціха, з павагаю, як-бы аддаючы ім апошні паклон.

На кургане, пад высокімі соснамі, былі выкапаны тры магілы, і натоўп спыніўся блізка іх.

Тры сасновыя труны людзі апусьцілі на зямлю, і музыка зайграла пахавальны марш.

Сосны шумелі сваю адвечную тужлівую песьню, музыка грала славу памёршым гэроям, людзі стаялі бяз шапак—хмурыя і суровыя.

Скрозь тужлівы шум і пахавальную музыку пачуўся лямант жанчыны. Над аднэй трунай схілілася Праксэда, трымаючы ў руках двухгадовага Кіма, і загаласіла:

— А Дзяніска мо-о-ой ты, даражэ-э-энькі... А яснае мае сонейка. лю-ю-юбае... Засталася-ж я ўдованькаю, сірато-о-ою... Ніхто-ж мяне не прыгалубіць, не пашкаду-у-уе... Нікому я не паскарджуся на сваю до-о-олечку... І Кіманька ня будзе ведаць свайго та-таньку...

Людзі стаялі, апусьціўшы галовы. Музыка змоўкла, увушшу зьвінеў лямант жанчыны і прарэзьлівы плач дзіця, чуўся прыглушаны шум сосен. За другой труною, поплеч з першаю, апусьцілася на калені Надзя—моўчкі, у сьлязох, чырвоная. Яна прыгнулася ілбом да труны і заплакала наўзрыд, як бы некалі даўно, у дзяцінстве, калі памёр бацька. Яна доўга стаяла на каленях перад труной, і плечы яе

бесьперастанку нэрвова ўздрыгвалі. Потым яна ўзьняла галаву, змоўкла, выцерла рукавом сьлёзы і застыла ў нярухомасьці.

Праксэда сьціхла, глянула на Надзю, і жанчыны сустрэліся поглядамі. Была ў гэтых поглядах і пакутнасьць, і нянавісьць, і радасьць і яшчэ нешта нявыказнае, што можна толькі адчуць сэрцам. З гэтага мгненьня Праксэда і Надзя зрабіліся вялікімі сяброўкамі на ўсё жыцьцё.

Праксэда маўчала, Надзя-ж загаласіла на ўвесь голас:

— А Пёклачка ж мая, сястры-ы-я-чанька... Як-жа буду жыць без цябе я, мая лю-ю-ю-бая... Мы з табой жылі, як ро-о-одныя... Няхай-жа таму калом зямля, праз каго ты загі-і-ну-ула!.. Я-ж цябе буду помніць, як маманьку... На магіланьку тваю прынясу бел-вяно-о-чак.

І ўспомнілася Надзі: сырая зямля на бацькавай магіле, сьлёзы маці, нейкія тужлівыя, як песьня, словы, і яна змоўкла, як бы спалохалася свайго голасу.

Над трэцяй труной ніхто ня плакаў, толькі Шаганскі блізка падыйшоў да яе, і ў яго скацілася па суровым твары буйная сьляза.

Шаганскі адыйшоў ад труны, стаў на насыпаны ўзгорак сьвежай зямлі і ціха, адчуваючы ў сэрцы вялікую боль, пачаў гаварыць:

— Спакойнага сну, дарагія таварышы! Сьні аб сьветлых днёх будучыні, таварыш Макар! Сьні аб новым жыцьці, таварыш Дзяніс. Сьні аб шчасьлівай долі, таварыш Пёкла! Вы загінулі слаўнай сьмерцю на баявым посту. Ваша сьмерць—чырвоны штандар у нашай барацьбе за комуну. Мы будзем высока трымаць гэты штандар, нясучы яго скрозь завірухі і вятры да новага шчасьлівага жыцьця. Твая партыя, таварыш Макар, будзе і надалей па-бальшавіцкаму кіраваць масамі. Твая партыя, таварыш Макар, будзе і надалей весьці суровую барацьбу з ворагамі. Наша партыя, таварыш Макар, і надалей застанецца ленінскай. На тваё месца, таварыш, прыдуць новыя сотні і тысячы рабочых, і мы пад кіраўніцтвам партыі пабудуем соцыялізм.

Оркестр зайграў пахавальны марш, і Шаганскі адыйшоў у натоўп. Пасьля яго выступіў Ляксей Буры. Ён казаў, што сьмерць трох будзе сымболем барацьбы за новае жыцьцё і што рабочая моладзь, у адказ на выступленьне клясавага ворага, колектыўна ўступае ў комсамол, каб пад непасрэдным кіраўніцтвам партыі змагацца за соцыялістычную грамаду.

— Гарушка пры сьмерці,—казаў Буры,—і мы пакладзем усе сілы, каб яго адратаваць. Дваццаць сем новых комсамольцаў—гэта лепшы адказ клясаваму ворагу на яго спробы сарваць соцыялістычнае будаўніцтва. Гэтыя тры таварышы будуць для нас векапомнай зоркай асьвятляць шлях у будучыню.

Выступалі яшчэ Сьцяпан Гарбуз, Наста Корбут, Астап Паркан і рабочыя з дэлегацыі, якая прыехала разам з Макарам правяраць соцыялістычнае спаборніцтва на гуце. Усе яны казалі пра адно:

сьмерць трох яшчэ больш злучыць рабочых у барацьбе за новы заўтрашні дзень, аб'яднае вакол комуністычнай партыі, мобілізуе на ўдарную работу. Пасьля ўсіх выступіў Антось Шалы. Ён ледзь прышоў на пахаваньне, галава ў яго была перавязана бінтам.

— Таварышы!—ціхім голасам праказаў Антось.—Я не магу стаяць на нагах, і галава ў мяне кружыцца... Яшчэ да гэтага часу я не апамятаўся ад выбуху на гуце. Ад гэтага выбуху загінуў таварыш Дзяніс Гаваронак і лепшая работніца Пёкла. Рука ворага не пашкадавала і дарагога гасьця нашага тав. Макара. Толькі выпадковасьць выратавала мяне. На гэтай сырой зямлі магла ляжаць чацьвёртая труна... Антось цяжка перадыхнуў, як-бы пасьля непасільнае працы, глянуў на тры магілы,—на сьветлых ягоных вачох паказаліся сьлёзы,—а потым працягваў:—Дарагія таварышы! Я ішоў у той вечар на працу з вялікаю радасьцю ў грудзёх. Мае мары зьдзейсьніліся, і я ня ведаў, куды дзець маю агромністую радасьць. Тыя досьледы, над якімі я працаваў некалькі год, далі тое, у ва што ня верыў той гад, імя якога я не хачу называць тут... Я вынайшоў шкло, якое ня б'ецца, і гэтае шкло называю імем трох слаўных барацьбітоў за нашу шчасьлівую будучыню... Няхай жыве наша партыя—адзіны правадыр пролетарыяту! Няхай жыве справа трох барацьбітоў, за якую яны аддалі сваё жыцьцё!

Жалобныя гукі музыкі парушылі глыбокую цішыню, і натоўп загаманіў, заварушыўся. Людзі пачалі падыходзіць да нябожчыкаў і разьвітвацца з імі ў апошні раз. Зноў пачуўся лямант жанчын і прыказваньне. І пад завываньне ветру, пад шум сосен і тужлівыя гукі оркестру, людзі ўзьнялі на рукі тры сасновыя труны і на вяроўках пачалі апушчаць іх у магілы. Праксэда і Надзя ламалі рукі і галасілі ў роспачы, а на звонкія пакрышкі трох сасновах трун сыпаліся першыя жмені жоўтага жвіру.

На вялікі натоўп людзей марасіў дробны восенскі дождж.

Людзі стаялі хмурыя, з апушчанымі галовамі, суровыя.

Скрозь гукі пахавальнага маршу чуўся лямант роспачы і няшчасьця.

IV

На тым кургане выраслі тры высокія магілы.

Мароз сцэмантаваў тыя магілы, а завіруха пакрыла пушыстым пластам сьнегу.

Вецер калыхаў колкія галіны сосен, і сосны, як тысячы год таму назад, сьпявалі сваю адвечную песьню тугі.

На могілкі часта прыходзілі людзі на паклон, а ў Кастрычніцкія сьвяты нават наладзілі там вялікі мітынг.

Часта прыходзілі на курган Надзя і Праксэда. Яны сядзелі на могілках і ўспаміналі пра сьмерць трох.

А насупроць, за лагчынаю, каля самага балота гудзела гута. Галоўная печ была даўно адрамантавана, і гулкі гудок гуты прарэзьліва парушаў балотную ціш на некалькі кілёмэтраў вакол.

На гуце за гэты час адбыліся вялікія зьмены. Стары дырэктар за справу з „Цэнтрасьпіртам" даўно аддадзены пад суд, а замест яго прызначаны новы, і гэты новы дырэктар узяў гуту ў свае рукі. Ён, перш-на-перш, увёў строгую адказнасьць кожнага рабочага і служачага за сваю работу, за свой варштат або вучастак. А раней, чым увесьці гэта, ён дакладна разьмеркаваў паміж усімі работу. Цяпер кожны ведаў, за што ён адказвае, і кожны імкнуўся не адставаць ад іншых. А быў новым дырэктарам Астап Паркан. Партколектыў пастанавіў пакінуць яго на гуце, і Астап узяў у хэмінстытуце на год адпачынак. Памочнікам яго была ўсё тая-ж Наста Корбут. Яны, як кажуць, нават быццам пажаніліся, але гэта паміж іншым, ды і давесьці дакладна ніхто ня можа.

Другая зьмена—гэта перавыбары заўкому. Стары опортуністычны комітэт распушчаны і замест яго абраны новы з лепшых рабочых. Старшынёю заўкому працуе Сьцяпан Гарбуз, і з работай ён досыць добра спраўляецца.

Гарушка-ж акрыяў, і цяпер яго разам з Надзяй пасылаюць вучыцца ў хэмічны інстытут. Там, кажуць, ёсьць падрыхтоўчыя курсы, і яны спачатку будуць займацца на гэтых курсах.

А Рамана Корбута выслалі пад Архангельск. Гаспадарку яго перадалі ў колгас. Наста прыняла да сябе маці, і яна цяпер у яе за гаспадыню.

Наогул цяпер зьмянілася атмосфэра на гуце. Шаганскі ўвайшоў у курс работы, пазнаёміўся з тэхнічным бокам справы, дый ня толькі пазнаёміўся, але і глыбока вывучыў, нават сам можа скласьці формулу на шыхту і даведацца, у чым прычына той або іншай непаладкі.

У партыю прышлі новыя рабочыя з дзесяцігадовым і пятнаццацігадовым стажам работы. Цяпер ідзе падрыхтоўка да ленінскіх дзён і чакаецца новы прыліў рабочых.

А за ростам комсамолу нават угледзець цяжка. Якіх-небудзь тры месяцы таму назад колектыў аб'яднаў ня больш паловы рабочай моладзі, а пяпер ужо моладзь у асноўным ахоплена комсамолам. На апошнім агульным сходзе Ляксей Буры казаў, што ў комсамоле знаходзіцца дзевяноста два процанты ўсёй рабочай моладзі гуты.

На гуце шырока пастаўлены досьледы з вынаходніцтвам Антося Шалага. Шклотрэст зацікавіўся гэтымі досьледамі і адпусьціў неабходныя сродкі і прылады для іх паглыбленьяя. Досьледы даюць добрыя вынікі, і Антось Шалы ў нас, можна сказаць, гэрой дню. Мары яго зьдзейсьнены, і шкло яго, бязумоўна, зробіць пераварот у тэхніцы. Цяпер большасьць рабочых упэўнена, што вынаходніцтва шкла, якое ня б'ецца, ня пустыя словы, а самая жывая справа. Ужо

зроблена некалькі бутэлек і колб, якія падкідвалі ўгару, і яны, падаючы на зямлю, не разьбіваліся, а толькі троху ўгіналіся, як быццам ня шкло гэта, а самая, што ні на ёсьць, чыстая бляха. І галоўнае, заўважце, якасьць шкла не зьмянілася, яно засталося такім, як было: празрыстым, як сьляза дзяўчыны ў вялікай бядзе. Шкло толькі страціла свой асноўны недахоп—крохкасьць, і гэта робіць вынаходніцтва Антося Шалага вельмі важным. Агульны сход рабочых нядаўна ўзьняў хадатайніцтва аб узнагароджаньні яго ордэнам Леніна. Антось Шалы—гэта-ж наш сапраўдны гэрой, ад якога будзе вучыцца працаваць уся рабочая моладзь, наш самы лепшы ўдарнік.

Вельмі ўпарта дзейкаюць у нас, што замест старой гуты будзе будавацца новы завод. Ходзяць чуткі, што быццам Шклотрэст ужо вырашыў гэта пытаньне. І падстава для гэтага як-бы тая, што жвіру ў нас дужа багата і вельмі высокае якасьці ён. Апрача таго, у нас будуюць чыгунку, і лінія будзе праходзіць каля самае гуты, цераз балота, а станцыя будзе за поўкілёмэтра, ня больш. Некаторыя-ж гавораць, што ў Шклотрэсьце надаюць вельмі вялікае значэньне вынаходніцтву Антося Шалага і быццам завод будуць будаваць па новай сыстэме, з разьлікам вырабляць новае шкло. Гэта, дзейкаюць, трымаецца ў вялікім сакрэце, бо вынаходніцтва можа перахапіць якінебудзь шалахвост і перадаць яго замежным фірмам. А мы, бязумоўна, не зацікаўлены ў разьвіцьці капіталізму,—няхай ён там корчыцца ў апошняй агоніі крызісу,— вынаходніцтва нашае, соцыялістычнае.

А пра Сакалоўскага дык і казаць няма ахвоты: злавілі яго, як сабаку, на мяжы ў тую самую суседнюю краіну. Ён нават пасьпеў прыслаць нам паштоўку, у якой перадаваў Макару прывітаньне і вялікае „дзякуй" Шаганскаму, а Астапа прасіў пацалаваць за яго Насту. Думаў, што ўцячэ за кордон, але памыліўся ў сваіх плянах, і насьміханьне яго абярнулася супроць самога. Цяпер яны ўсе сядзяць у астрозе, і хутка адбудзецца паказальны процэс на гуце. Хоць Калупаенка і з яго компаніі, але ягоныя словы аб тым, шта Сакалоўскі сядзе на лаву падсудных, спраўдзіліся. Сакалоўскі разам з Калакалухай ашукалі гэтых адсталых рабочых і выкарысталі іх у сваіх інтарэсах. Гэта, як называецца, чужымі рукамі жар заграбалі.

Здаецца, у асноўных рысах і ўсе нашыя навіны. Але самы цымус, можна сказаць, наперадзе: у нас-жа будзе будавацца новы завод.

V

І ўрэшце гэта прышло!

У марозны сонечны дзень у контору ўвайшлі тры чалавекі. Былі яны ў цёплых футравых кажухох і ў высокіх, за калені, валёнках. Яны сказалі, што прыехалі з Шклотрэсту і што ім неабходна ўбачыць дырэктара гуты.

І тады ўсе разам—Паркан, Шаганскі, Шалы, Гарбуз, Наста Корбут і тры інжынэры з Шклотрэсту—пайшлі ў поле. За гутай іх дагнала яшчэ некалькі рабочых. Ішлі павольна, як бы нешта выглядаючы. І нават хто ня ведаў, дык здагадваўся: каля старое гуты вырасьце новы завод.

Спыніліся на роўным месцы, троху вышэй сталоўкі, воддаль ад балота. Самы старэйшы з інжынэраў, як-бы толькі для самога сябе сказаў:

— От тут самае добрае месца!

І ўсе аглянуліся вакол, як-бы ўпяршыню ўбачыяі гэты ласкут зямлі. І неяк само сабой, бяз спрэчак, моўчкі згадзіліся: праўда, тут самае лепшае месца.

За балотам на кургане шумелі сосны, і Шаганскі, глянуўшы на іх, праказаў для інжынэраў:

— Там пахаваны ахвяры выбуху.

Старэйшы з інжынэраў, у вушастай шапцы, якраз як у Макара была тады, ціха адказаў:

— Мы пабудуем для іх помнік!

Антось Шалы выйшаў на сярэдзіну і сказаў:

— Мы назавем гэты завод імем трох!

— Правільна!—адказаў Сьцяпан Гарбуз, і ўсе з ім згадзіліся.

Стаяць было холадна, вецер блытаўся ў крысах паліто, дзьмухаў сіверкай у твар.

— Слаўна на вятру!—праказала Наста.

— Слаўна!—паўтарыў Астап.

А вецер круціў паземку, біў ёю ў твар, у вочы. Вецер гуляў па ўсёй зямной кулі. Ён перарастаў у сьнегавую завіруху.

І неяк радасна было ісьці пад вецер, перамагаючы дужую сілу баламутніка, радасна пераскакваць цераз сумёты, бокам перасякаць клубы сьнегавароту, коўзацца па люстраной гладзі празрыстага ільду. Гэта было адчуваньне высокае радасьці, якая ня ўсякаму дадзена ў жыцьці.

P. S. А „Эльбрусы чалавечага шчасьця" маюць да гэтага толькі ўкоснае дачыненьне: аповесьць завецца „Зямля ў вятрох".

Будзіна—Менск.
Кастрычнік 1930 г.—студзень 1932 г.

Пятрусь Броўка

Уступ да паказу гэроя

Праз будзённую яву
палёў,
Пыл асфальтаў,
і праз граніт—
Зноў устала
шарэнга слоў,
Каб рэспублікі
славіць дні.

Каб бязладзьдзе
дашчэнту вылаяць
І наступнаму
даць паказ
Як расла
і мацнела сіла
Чалавека—бальшавіка.

Як прышоў
ён, чалавек,
(да пары, свой адклаўшы кольт)
І—
забіліся
нэрвы рэк,
І забегалі
пальцы вольт.

І загрукаў матор
ў палёх,
Абуджаючы
новы дзень.
Гэта ён—
балаты перамог,
Гэта ён—
бальшавік
ідзе.

А раней
там хадзіла ноч,
Абдымаючы сьмерць—сястру,
І магілай
палохаў корч,
маладую нашу зару.
Вось такога,
дык шчасьця,
завал,
Ня было,
над куды
падзець.

Нам яды і пітва
хапала
Каб ськілець
у Пятровы дзень.

І ў бядоце сваёй
бясконцай,
Мы спазналі адно
браты:—
чым цяжэй дабівацца
да сонца,
наймацнейшым
выходзіш ты.

Так ладуюцца разам
словы,
Каб узьняцца
у лёт высокі—
І пачатак
маёй прамовы
пра цябе
таварыш Сокал.

Каб у нашым сьвятле
найноўшым,
нам ўбачыць
сакрэт хады:—
як сівізну гадоў
прайшоўшы
Ты на працы
гарыш маладым.

Пачынаю я свой
паказ
ад эпохі вайны
і зброі,
Калі здалі мы
першы заказ
на армейскі шалом
для боек.

Менск дрыжэў
ад марозаў
і злосьці
і штандараў
гарэла кроў.
Наляталі няпрошана
ў госьці
Пан і белы арол.

Поўзла вуліцай
дохлая конка,
(ня было нат' ,чаго абганяць).
А плякаты крычэлі
звонка:
„Пролетары на каня!".
Мы ішлі тады
пешымі,
коннымі
сваю сілу
у бойках сваталі.

А на пляцы
ад раньня да цёмнага
Расьпіналіся
слоўмі аратары:—
Газ на газ!
І вока за вока!

Сып, таварышы,
ўсе на фронт!
... Ты прышоў
сотай шабляй,
Сокал,
Комісарам,
у наш эскадрон.

. . . . . .

Помніш ты:

Мы плацілі за зьдзекі,
і мы секлі ворага
ад Вілейкі да Вільні,
па ўсім Забугоўі,
хоць карміліся воблай,
перасмаленай порахам
сваю смагу сьцішалі
мы варожаю кроўю.

Як у ліпені мухі
так насіліся кулі,
Ды гручэлі гарматы
дынамітам сажонным—
А мы шаблямі ворагам
вызначалі пілюлю,
Што іх кідала ў жар
нават слова Будзёны.
Хай было:
на гарбату—
выпадала раса
і кармілі бары нас
яловаю кашай:
таварыш Сокал,
і ты паказаў
Шабляй, граніцы
рэспублікі нашай.
На пяцёх мы ламалі
акрайчык хлеба.
А ты помніш
якога давалі дыхту:—
І выростала наша
савецкае неба
праз Чэ-ка разганяючы
хмары бандытаў.
Гэтак куплена права
на сусьветны Кастрычнік,
балатамі ішоўшы,
сьмяротнымі тундрамі:
каб на варту прышоў
вартавы пагранічнік
і ключы ад граніц
забраў Фэлікс Эдмундавіч.

. . . . . .

Дні пайшлі
чарадою шырокай,
дні пашлі
як шарэнгі рот...
Зноўку ты,
мой таварыш Сокал,
стаў уперадзе
ўсіх майстроў.
Я-ж твае таямніцы
ведаю:—
(гадаваны
ваеннай практыкай)
перанёс ты былую
стратэгію
і зьмяніў у падыходзе
тактыку:—
Яшчэ вуліцы
моўчкі сьпяць
ходзіць вецер
завулкам адзін—
Ты-ж ўстаеш
і сядзіш у пяць,
Калі трэба
у сем гадзін.
Каб была паслухмянай
сталь,
У разцы разумела
толк
ты ладуеш
сваю дэталь
пры газьніцы
напяўшы зрок.
І з табой
перамога ўрэшце,
Хоць аднолькавай сілы
ток:—
у цябе пасьля зьмены
200,
у Дзянісава
толькі 100.
А Дзянісаў
дык кожны дзень,
напірае на ўсіх
атакай:—

павялічце
расцэнкі мне,
забярэце
пілу-ламаку.
Ды на сходах
раз у раз
Узьнімае паклёпаў
дую:
„З гэткай тэхнікай
як у нас
дамавіну,
адно збудуеш".
Спрыцен ён
да прамовы такой,
сыпаў слоўмі,
нібыццам градам:—
а варштат
як сухотны конь
ледзь рыпіць
стаючы без дагляду.
Ты-ж гарыш
у другіх клапотах,
скончыш працу
і перш каго—
абціраючы твар
ад поту,
абціраеш
суставы яго.
Вось чаму
ад усёй брыгады
перавыканаў
ты сваё—
і ў варштаце
ня маеш здрады,
Як і ў шаблі,
калісь ў баёх...

Ты вышла, рэспубліка
цьвёрдым крокам,
Ты клічаш рэспубліка
новай атакай,
І я з табою згодзен
таварыш Сокал—

Дзянісавым літасьці
аніякай.
Ты трапна сказаў
на сходзе ў ячэйцы:—
„Дзянісава трэба і добра
расьпетрыць,
падобен ён вельмі
такому армейцу,
што кулі пушчае
ў паветра".

Болей увагі
і больш трываласьці,
рэспубліку трэба
ўмець шанаваць,
ў нашыя дні
надзвычайнай дбайнасьці
спрыт ёй увесь
аддаваць.

Я знаю, ты прыдзеш
хвілінай усякай
Пытаць у сябе
і ў другіх парады,
ламаць галаву
як палепшыць якасьць
продукцыі вашай
ударнай брыгады
Каб заўтра патроіць
сваю работу,
бо вышла рэспубліка
цьвёрдым крокам...
Я шчыра вітаю
твае клапоты.
Я згодзен з табою
таварыш Сокал.

Талька, 1931 г.

Наш крок

Ніхто ня зруйнуе,
ніхто не зьмяце,
што створана воляй
мільёнаў.
На месцы гнілога
жывое расьце
і новыя творыць
законы.
За лепшую долю,
за новыя дні
працiем
упарта
няспынна.
На новы падмурак—
аснову-граніт
кладзем за цаглінай
цагліну.
Упарта шумяць
пры драбілках пасы—
машынай
жыцьцё дасканалім.
І граві кладзецца
ў карпусы
Напорна між тросавай
сталі.
На пятым паверсе
шугаюць вятры,
і сьвішчуць
чыгунныя рамы.
Пацеюць там
бацька і сын—
муляры
за выкананьне
програмы.

Змагаецца Клім
дзесяты дзень,
а сын малады,
непакорны.
Стары-бы прывычкай
узяў дзе-ні-дзе,
дык сын пераможа
напорам.
— Ах гэты Алеська!
Чортаў сын...
Ізноў перагнаў
выходзіць!
І вецер знаёмыя
гукі „с-с-с“...
У склёпныя дзюркі
ўводзіць.
І гонар за сына
цьвіце ў вачох
і ў сына палае
за бацьку.
А голаў у бацькі—
як восеньскі мох,
А рукі і спрытны,
і хвацкі.
Сын-жа
балючы
нацёр мазоль,
і ные сярэдзіна
нема.
Ён хоча ня здацца,
хай змора і боль:
ён разам з германцам
Лемам.
Такіх
па многа
ў брыгадах ёсьць,
што ўжо
перагналі Фордаў!
І дзівіцца Лем,
замежны госьць,
сусьветным
нашым
рэкордам.

Па нашаму—проста:
тут дзіва няма.
Хай кажуць:
„Працуюць з нахрапу!“
Навучымся лепей!
Нас ня стрымаць!
Але мы ня йдзем
„на арапа“.
Мы ведаем добра
мэты свае,
навошта габлюем,
стругаем...
І ў нас маладосьці,
запалу
стае,
і нас ужо ніхто
ня стрымае.
Хоць цяжка часамі,
а дружна ідзем
наперад
сталёвай калёнай.
Ніхто ня зруйнуе,
ніхто не зьмяце,
што створана воляй
мільёнаў.
Ударнікі!
Дружна!
Давай-жа:
р-раз!!!
Чацьверты каб лепшы
за трэці!
Каб
Рэха
Наступных паходаў
ад нас
плыло
па вялікім
сьвеце.

Валеры Маракоў

Новыя вершы

1. За тысячы новых тваіх Асінбудаў

Ідуць цягнікі
між балот і азёр
і ветлыя ветры
на поўдзень за імі.

Ў красе і ў бляску
прадранішніх зор
з вінтоўкай
і з песьняй
і з воляй
ішлі мы.

І вось паўстае,
аквечаны заравам,
ўзгадованы воляй
высокі разгон,
і мы—
па крыві і чуцьцю
пролетарыі
гатовы ісьці
і ў ваду і агонь.

У нас за плячыма.
(як толькі глянуць),
б'юцца хвалі
чужых марэй
І адкормлены
крывёю працоўных
паганец
там поўсьвета
за горла
бярэ.

Для каторых
вайна—акраса

і ўзьнімаюцца гарматы
на кітайскія
парты
і руйнуюцца вёскі
і гарады,
і горы устаюць
чалавечага мяса,

І здаецца,
ня людзі,
бразгаюць зброяй
аб яслаўленым шляхам
людзкога адчаю.

Гэта забойцы,
так званыя героі,
Гэта рабы,
з мільёнам пакут
За плячамі.

Тах-та-ра-рах.
за айчызну і веру,
Тах-та-ра-рах,
за багаты стол,
Тах-ра-ра-рах,
прыкладам у дзьверы,
Тах-та-ра-рах,
за горла й на дол.

* * *

Але нас
ня спужаеш ніякаю карай
і той,
хто з бядою
быў колісь знаём,
умее адным,
але моцным ударам,
крывавую спадчыну
зьнесьці
на злом.

Таварыш Будзённы
Таварыш Дзяржынскі,
тым, хто жыве
і тым, хто памёр,

прыносяць прысягу
рабочыя Пінску
і хмурым
натоўпам
клянецца Нью-Ёрк.

Таварышы!
нашае права за намі.
Ўзьнімайце-жа песьню
(паўстань і грымі!).
Ад крыўды былой
нат на каменю камень
для нашых нашчадкаў
ня кінем тут мы.

Як кару
былога,
пляўкі ды акўркі,
зьмяцем
і
зарыем
ў ганебны курган.

Стаю я ў раздум'і
на слаўным падмурку,
і мысьлю,
агні
праразаюць
туман.

І йдуць цягнікі,
і сьпяшаюцца людзі,
дымяцца вазёры,
гамоняць лясы,

. . . . . .

... Тут сонечны горад
наступнага будзе,
высокі,
табою незнанай красы.
ударныя тэмпы
(Ўдарым-жа дружна).
Няхай наш завод,
нашы песьні зьвіняць.
Мы ў бойках і ў шахтах
выкоўваем мужнасьць,—

мы проста і сьмела
стаім ля старна.

І хто, калі з шляху
схісьнецца на момант—
ўзьнімі яго песьняй,
каб сэрца ў агні
ня ведала дружа
ні болю,
ні стомы
і дужым і моцным
дайшло ў комунізм.

За кожнае слова,
за кожную шрубу
змагаемся поплеч—
ударнік,
поэт,
за тысячу новых тваіх
Асінбудаў,
адноўлены намі
у бойках сусьвет.

18-XI-31 г.

2. Ноч трывогі і поэты на прарыве

Гэту ноч
ці выкажаш нанава?
Вось яна
цёмнай заслонай
раскінула змрок,
(Пачынае
трывогу
гудок)
і выходзім
ў парадку мы плянавым.

І ідуць,
і хістаюцца—
хмары-плыты,
і сінімі вуснамі
вецер
скуголіць
Зялёныя,
злыя

ад крыўды і болю
нямеюць бяз торфу
і нафты
катлы.

І ідуць ваганеткі
жалезным крокам.
І граблі рук
заграбаюць торф.
Над балотам,
ахутаным змрокам,
ўстала чорная цень—
Беккендорф.

Беккендорф—
гэта нам знаёма!
Вось крывавыя пальцы,
і зьбіты рот.

Вы грамілі
нас колісь
мячом і громам,
Высокапастаўлены ідыёт...
І цяпер
дзе-небудзь
ў палацах Вэрсалю
паціраеце рукі,
даючы наказ.

Вы марыце:
фабрыкі сёньня сталі.
Заўтра вы кажаце:
— ў добры час,

Многа ёсьць хлеба
на тых палетках,
і лесу,
і золата
аж праз край.
Цэльсія, дружыньнік,
сурова і метка.
Гэта-ж і ёсьць
Твой няказачны рай.

І вось
узьнімаюцца—
пальцы
гарматаў.

І ангел-збавіцель
узводзіць курок
І ангел-збавіцель
штурхае за краты—

таго
хто йшчэ мае
і сэрца
і зрок.

У блёк-ноце Пільсудзкага
мы занатованы.

Расьпесьціцца вусам,
і скажа:—вунь той...

І пойдзеш краінай
жандарам зруйнованай,
як кара
за кожны прагул
і прастой,

Таму
так і ўзьняты
нямоўчныя рукі,—
і ў гэтую ноч,
і праз вецер,
і стынь,

здаецца,
пракладваем рэйкі
да ўнукаў
і людзям наступнага
ўзводзім масты.
Ох,—
як-жа зьвіняць,—
захліпаюцца рэйкі!
Ты чуеш—
адбою ўрачысты гудок?

І зноўку магутны
і радасны нейкі
ўрываецца ў вёскі
і ў фабрыкі
ток.
Мы самі здабылі
высокае права
ударнае працы,
бо волаты мы.
І новы поэта ударнік
другому уславіць
узьнёслы наш дзень
між краінаў чумы.
Ідуць міліёны
ўстрывожаным крокам,
каб новую песьню
на нова тварыць;
сладкай эпохі
ідуць разьбяры
з сэрцам гарачым
і сонечным зрокам.
А тут вось—
пагледзіш
балюча і крыўдна—
складаюць поэмы,
як быццам на зло,

за два,
або тры,
звышбюджэтныя грыўні
поэта Лявонны
й поэта Мурзо.

Яны прапісалі
і зоры і месяц,
хоць, здэцца, ня бачыў
ніхто іх тады.
Чаму-б ім і сонца
куды не падвесіць?

і ім, і рэдактару
меней бяды.
А потым-жа крытык,
і гэта вядома
падпусьціць сьлязіну

(а ва Кабакоў!).
улічыць
і талент,
улічыць
і момант,

і трохі паганіць
за сувязь з тугой.
Рабочы ударнік
Зьмяці гэту дробязь.
Ты вырасьціў
сонца
свайго
гарады,

яны-ж—
з цябе ляльку
якуюсьці робяць

і думаюць,
лялькай застанешся
ты.
Я знаю,—за ноч,
што ня выкажаш
зноўку ты...
Што намі узята
ў агонь і штыкі
надорыш поэту
высокай пуцёўкаю
у слаўнае заўтра
бяз сьлёз і тугі.

23—XI-31 г.

3. Рахунак поэты, пададзены да платы

Комсамолка Каця Крычэня скончыла жыцьцё самагубствам, уключыўшы сябе ў лінію электрычнага току...

Прычына самагубства — няправільнае зьняцьце з работы і прыпісваньне ёй шкодніцтва, якое утварыў здрадзіўшы сваёй клясе рабочы; за гэтым рабочым Крычэня жыла некаторы час.

(з матар'ялаў ячэйкі КП(б)Б)

* * *

Сэрца скажа:
— даволі...
— скончана.
і ня дрогне,
напэўна,
рука.
Не заўсёды-ж
з усьмешкай блукаць
па дарогах
любві
неаплочанай...

Дужа ясна,
і дужа сьціпла:
восень у сэрцы
ўзрасьціла змрок
і за твой,
гэты дзікі крок
вораг, пэўна, з усьмешкай
выпʻе...

. . . . . .

А гавораць:
ну, што-ж самагубства,
той прынадзіў,
а той абмануў,

і нясуць
нясусьветнае глупства
і пра сьмерць
чалавека,
і нашу
вясну.

Я гляджу
на маўклівае гэта
аблічча,
дзе прайшло
дзесяць тысяч
шалёных вольт,
і яно
да адплаты
бязьлітаснай кліча,

І яно ўзьнімае
і гнеў
і боль!..
Хто расьціў
у грудзёх канцылярыі?—
хто пачуцьці
ў портфэлях насіў?—
патрабуюць адказу
ад вас пролетарыі
аб загубленым вамі
ў „справах“ жыцьці.
Чалавек—
гэта вам ня мумія:
узяў са склепу
і выштурхнуў вон,
чалавек—
гэта сад
з залатымі думамі:
дзе па жылах праходзіць
блакітны
агонь.
І вось тут,
дзе грыміць дыяратар
устрывожаным
гулам,
і голас дынамы
ўстае над табой,
таварыш
трэ быць
і суровым і чулым,
і заўжды гатовым
выходзіць
на бой.

Мы новыя ўзводзім
падмуркі і сьцены,
а нехта
рукою нахабнай
іх пляміць
як быццам
з палацаў Парыжу,
ці Вены
над краем ўзьнімаецца
даўняга замяць.

Налева піўнушка,
там вые гармонік
над вуліцай б'ецца
стотонны туман,
і ты галавою
аб злы падаконьнік
сябе разьбіваеш
да крыўды і ран.

Устае над табою
руінам згуба,
Тут вораг штурхнуў цябе
ўчора на дно,
і смокчуць нямыя
зялёныя губы
шалёную шклянку
з крывёй і агнём.

Ты робішся ворагам
злосны прагульшчык,
спыняеш вагоны
і крышыш станкі,
і далей
усё далей,
з надломленай кручы,
куды не дадаць
ні агню ні рукі.

. . . . . .

Змагайся таварыш,
з прарывамі ў сэрцы
за тых,
хто ўпаў,
і хто падае ўніз, грамі
канцылярскіх натхніцеляў
сьмерці,
так званых,
пралаз
і падліз!
Ніякай нам літасьці
сёньня ня трэба,
мы чэсна і проста
свой край беражэм.
Над намі,

як вечнасьць,
шырокае неба
і слаўныя дні
нашых слаўных поэм.

І мы
аддамо усю сілу
змаганьню,
ўвесь розум
і сэрца
нашчадкам вясны.

Мы будзем лячыць
і сьмяротныя раны
Каб пляміць усход наш
Ня сьмелі яны.

20-XI—31 г.

НАРЫСЫ

Іван Гуцаў

У чым справа?

(*нарыс*)

Зарыпелі варотцы. З двара на вуліцу рабочага пасёлку вышаў мужчына.

Крыху прашоўшы, ён спыніўся. Ад поўдню павяваў лёгкі кучаравы летні вецер, але неба было чыстым. Можа гэтыя цёплыя подыхі ветру і прынясьлі на душу яго развагі. Кавалкамі прыплылі ўспаміны, мінуўшае на розных дарогах і сьцежках паўстала перад ім у ягоным жыцьці.

Паўсталі даваенныя заводы, вайна, Харкаў, Ленінград, Масква, Ніжні.

Паўсталі шэрыя, суворыя варштаты, каля якіх ён гнуў натруджаную сьпіну, упіваючыся ўвесь у шпонкі і зубцы шасьцяронак. і так ад цёмнага да цёмнага. Ногі пасьля працы цягнуліся да хаты хадою кронцыркуля. Было цяжка. А на заўтра ледзь сонца пацалуе стрэхі хат—ізноў варштат, ізноў сагнутая сьпіна і мутны дзень.

Потым загрукацелі гарматы...

Нямецкія кулі дзікаю песьняю спаткалі яго на прускай мяжы.

Ваяваў. За што? Абрыдла. Крычалі: досыць, да хаты! Зьявіўся ваяка Керэнскі. Ну, ясная справа, штык у зямлю. Ваюй, Керэнскі, сам.

Грозным шквалам узьняўся Кастрычнік.

Кляса стала супроць клясы суворaю сьцяной. Загарэлася царская Расія.

Выпаўзьлі Юдзеніч, Калчак, Дзянікін, Польшча, Урангель...

Ды ці мала вылупілася з гнілога царскага яйка генэралаў-бандытаў?..

Скончылі і з імі. Тады вярнуўся зноў на завод у Добруш.

З таго часу восем год. Ён паглядзеў на домік у якім пачаў жыць. Стары драўляны домік. Крыты бляхаю. Пад вакном бярэзінка. Усё як і раней, толькі тады домік быў крыты саломаю, ды бярэзінка была меншаю і не такою кучараваю.

Так сама стаяў гэты сьлесар у варотцаў, думаў аб мінулых бойках і рабоце ў капіталістых. Не хацеў работаць—голад гнаў, не хацеў ваяваць—гналі. А цяпер? Цяпер з крывавага фронту ен прышоў на фронт барацьбы не за фабрыку, а за паперу на гэтай фабрыцы.

Добруская папяровая фабрыка да рэволюцыі належыла князю Паскевічу. Стаіць яна на рацэ Іпуць, абнесеная вакол багатымі лясамі Палескае роўнядзі. І вада і лес былі княжацкімі. Рабочыя жылі ў старых, сьцюдзёных хібарках, а печы качагаркі фабрыкі цэлымі эшалёнамі зьядалі лясы. На попеле бярозы і дубу расла залатая скарбніца князева і ягонага дырэктара пана Стуглінскага. Рыхтаваліся лепшыя гатункі паперы, што ішлі на сусьветны рынак.

Князь кінуў фабрыку інакшаю як цяпер. Машыны і абсталяваньне за часы імпэрыялістычнай вайны так знасіліся, што кожную хвіліну рыпелі, скардзіліся і клікалі дапамогу.

Тады наш гэрой, які нічым ня вылучаецца з усяе масы, прышоў на дапамогу. Як сьлёсар першай рукі ён прышоў і біўся за рэмонт машын. Спраўней пашлі машыны. Пачала ажываць фабрыка. Гуртам, усёй масай зрабілі чырвоны сьцяг для фабрыкі, а цяпер:

прарыў!

Трывога. І ён зноў задумаўся, што зрабіць, каб выратаваць разам з усімі фабрыку. Успамінае як лётаў некалі па фабрыцы пасьля разрухі. Перабіраў усе папяровыя машыны, аглядаў кожны шрубік і і кожную шпонку. Ён ведаў толькі адно: краіне патрэбна папера. Краіна ня будзе вучыцца без паперы. А краіне паперы трэба шмат.

Цесна стала фабрыцы ў старых будынках-карпусох. І Добруш будуе новыя карпусы, пераабсталёўвае старыя. 1926-27 гады—гады напруджанага будаўніцтва. 1928 год дае фабрыцы новую, вялізарную, шостую папяровую машыну. Гэта не машына, а злучэньне рычагоў, трубак, цыліндраў, валоў і валікаў, шасьцяронак, калёс і калёсікаў, хітра злучаных паміж сабой спрытнаю рукою навейшай тэхнікі. Сто трыццаць мэтраў у хвіліну дае яно шырокай стужкі паперы.

— Іван Астапавіч!—пачулася з боку.

Сьлёсар крутнуў галавой. Яго клікаў рабочы мэханічнай майстэрні

— Чаго ты? азваўся ён.

— Чаго ты расьпесьціўся. Хадзі сюды!

Іван маўкліва падышоў.

— Пра што ты, Астапавіч, думаеш? Ці ня вынаходку якую мазгуеш? Га!..

— Ты здагадаўся Васіль! Я думаю, толькі пра іншае.

Круглы твар Івана быў суровым.

— А можа ў дваіх хутчэй? я пасоблю, Іван!

— Я вось вышаў, паглядзеў на трубы, ведаеш балюча стала. Разумееш, які ўжо месяц часта прастойваюць машыны. Няўжо для гэтага мы адбіралі яе ў Паскевіча. З разьбітага камяню, што бясформенаю глыбаю валяўся на дарозе, мы зрабілі яе аднэю з буйнейшых фабрык. Няўжо для вока мы ўстанаўлялі шостую машыну? Працавалі-ж мы ня дрэнна. Чырвоны сьцяг атрымалі. А цяпер стаім. У чым тут справа? Я гатовы сам упрэгчся ў шківы і пасы, закруціць машыны і ролы. Але я ня вельмі пісьменны. Часамі блытаюся, сэрцам чую, што фабрыка гэта маё, кроўнае непарыўнае... Вось пра гэта я і думаю— Іван узмахнуў рукой і сваім вострым поглядам працяў курносы Васілёў твар.

— Так! справа дрэнная... азваўся Васіль і ціха спусьціў галаву.

У гэты час густы струмень пары гучна прарэзаў паветра: Гу-у-у-у!..

— Палова дзесятае гудзе. Хутка. Мы толькі з працы і ўжо вечар. Пойдзем!...

І яны пайшлі да фабрыкі. Пасьля некаторае маўчанкі загаварыў Васіль:

— Памятаеш, Астапавіч! Некалі я даў слова зьнішчыць прагулы і спазьненьне. Я ўпяршыню выклікаў цябе на спаборніцтва. Ты пярэчыў мне. Казаў, што лішняе, што ты і так працуеш добра. Ні прагулаў, ні п'янства. Праўда, ты працаваў, як вол. А справа ня толькі ў табе. Справа ў тым, каб усе так працавалі.

— Дык я-ж твой выклік прыняў. Помніш я грукаў молатам па зубілу і гаварыў: гэта я б'ю за „пяцігодку ў чатыры", а гэта каб „дагнаць і выперадзіць". Помніш, мы выклікалі другіх. І пайшло...

А цяпер усё заціхла. Чырвоныя і чорныя дошкі пустуюць, нібы анямелі. Таму мы і тэмпы здалі. Няма спаборніцтва. Я адчуваю, што ў жыцьці фабрыкі нечага няма, не хапае таго, што закруціла-б, каб закружылася ўсё.

Так у гаворцы няпрыкметна прабег час і яны не заўважылі, як падышлі да брамы фабрыкі. Сталі. Было цёпла. Неба ўсё было ўтыкана зорамі нібы заклёпкамі-вугалькамі. Над фабрычным дымаром вісела палова мядзянага месяца. Упарадзі зьвісаў коўш Вялікай Мядзьведзіцы. Сьлесары паглядзелі на неба. Як прыгожа! Усё на сваім месцы. Які парадачак!..

— Эх, узяў-бы здаецца, ды зьняў з неба гэты коўш Мядзьведзіцы ды вычарпаў ім усё да дна, усе непаладкі... захапляючыся гаварыў Іван.

— А я горш ці што?.. абражаўся Васіль.

У гэты час на фабрычны двор праходзілі сакратар парт'ячэйкі і загадчык мэханічнай майстэрні. Ішлі і аб нечым горача гутарылі, ківаючы адзін перад другім рукамі.

— Ага! Вось і хлопцы... Падышлі да сьлесароў. Якраз да рэчы. Хадзем з намі...

Вартавы міліцыянэр добра ведаў усіх і ня пытаючыся прапусьціў на двор.

У двары мэханічнага цэху было ціха. Толькі сьвісткі паравозаў парушалі спакой прарэзьлівым цягам ды грукалі чыгунныя рэйкі. Каля сьценак корпуса, дзе стаіць шостая папяровая машына, каля самага паравознага дэпо і майстэрні, знашлі сабе прытулак спрацаваныя часткі машын, шківы, падшыпнікі, валы, проста розны лом, стружкі з пад токарных варштатаў, аркушы старае бляхі... Усё гэта разам рабіла дрэннае ўражаньне і гаварыла пра безгаспадарнасьць, няўменьне выкарыстаць унутранае багацьце фабрыкі.

—Вось дзе неразьбярыха, таварыш зав!—заўважыў сакратар ячэйкі.—Плачам пра недахоп жалеза, а пад нагамі цэлыя горы. Колькі разоў гаварыў табе, як камуністу, прыбяры лом, выкарыстай патрэбнае, а ты ўсё цягнеш, як мярцьвяка за ногі...

— Часу ні хвілінкі!.. паверыш ці не—апраўдываўся ўстрывожаны загадчык майстэрні.—Рамонт заеў...

— Што гэта значыць, што часу няма... а пастнаовы партыі табе вядомы?

— Вядомы та вядомы. Але... бачыш...

Уваходзілі ў мэханічны цэх. Гэты цэх поўнасьцю забясьпечвае ўвесь рамонт фабрыкі, ад добрай работы ў цэху залежыць нармальная работа фабрыкі.

Пры ўваходзе знаходзіцца цэхавая кузьня. Чатыры горны дуюць бесьперастанку. З раніцы да вечару языкі агню ліжуць жалеза, пакуль яно ня робіцца чырвоным і белым. Кавалі вялікімі і малымі малатамі спрытна надаюць кавалкам жалеза пэўныя формы і памеры. Паравы молат, нібы адчуваючы перамогу перад кавалямі, моцна вухкае па раскаленаму жалезу. Ляцяць у бакі іскры, асьвятляючы процант выкананьня кавалямі прамфінпляну.

Каваль Халшчэўнікаў, адзін з лепшых кавалёў, кажа:

— Хоць я і беспартыйны, але ведаю, што кожны мой удар гэта новая цагліна ў фундамант нашай будоўлі.

Сягоньня ўночы гарыць толькі адзін горан і кузьня асьвятляецца толькі аднэю вялікаю „грушынай ГЭТ'а," Халшчэўнікаў выконвае тэрміновы заказ.

— Разаб'юся ў блін, — гаворыць ён,—але заказ выканаю раней часу.

Рыхтаваліся новыя часткі да сапсутага паравоза „Піянэра" (кукушкі).

Халшчэўнікаў лічыць сябе ўдарнікам, ганарыцца гэтаю назваю і яе апраўдвае. І сягоньня ён наважыў у чым ня стала скончыць хуткі заказ.

Ён дарабляе апошнія дэталі. Брудныя раўчукі поту цякуць па твары і спадаюць кроплямі на кавадла. Кашуля прыстае да мокрага цела. Абцёршы рукавом пот, каваль куе і куе. Так штурмуюць прамфінплян!

Далей ідуць два паверхі цэху. Такары другое зьмены ўжо скончылі працу. Пашлі.

Гарэлі лямпачкі, слаба асьвятляючы такарныя, сьвідравальныя, фрэзэрныя, стругальныя варштаты. У нямым чаканьні раніцы, хмура глядзелі трансмісіі, пасы і шківы. Па цэху хадзіў дзяжурны сьлесар. У рагу каля варштатаў, усьпершыся на ціскі, сядзеў начны вартавы.

Чацьвёра зайшлі ў канцэлярыю загадчыка. Успыхнула сьвятло. Селі.

— Вось што хлопцы,— пачаў сакратар. Мы нашым цэхам зрабілі вялікую працу па рамонту машын і варштатаў. Гэтымі днямі брыгада Кацэрыкава скончыла рэканструкцыю другой папяровай машыны. Мы павялічылі яе на 2 мэтры, перарабілі сетку, дадалі новыя цыліндры-сушылкі. Машыны сягоньня гатовы да пуску на ўсе сто ног. Але старая сілавая ня можа рухаць усе машыны. Новая пара-сілавая станцыя, з прычыны несваячасовай падачы патрэбнага торпу, ня можа даць поўнага ходу фабрыцы. Лепшых рабочых з вытворчасьці мы кінулі на пагрузку торпу, але ня гледзячы на гэта, яны ня могуць даць торпу столькі, колькі трэба. Туды патрэбен паравоз, каб падвозіць торп да пагрузачнай. Паравоза няма. Але ў нас ёсьць паравоз. Ён ляжыць пад плотам, мёртвы. Трэба ажывіць яго!.,—і сакратар змоўк.

— І тады торп быў бы і закруціліся-б машыны... дадаў загадчык цэху.

— Ну! у чым -жа справа?—нэрвуючыся запытаў Васіль.

— Ці выйдзе каша?—сумняваўся Іван.

— Чаму ня выйдзе!—гарачыўся Васіль. Ці нам упяршыню, ці ў нас рукі ня тыя, альбо ў галаве сьмецьце... Выйдзе!—і ён упэўнена грукнуў далоньню па століку.

— Ды ні пра тое... пярэчыў Іван. Я кажу, што ў паравозе ў тым толькі адна дымавая труба засталася...

Іван ведаў гэты паравоз. Даўно ён ляжыць пад плотам. Густы пыл абляпіў яго зломанае цела, травою аброс ён і, ляжыць, як курган на магіле пакойніка. Усе лічылі, што з яго нельга нічога зрабіць і рашылі прадаць на лом Рудмэталгандлю.

І раптам такая дзёрзкая думка. І яму Івану даручаюць рамонт гэтага мерцьвяка. Пачэсна, але цяжка А ніяк ня мог паверыць у гэта. Ён сказаў:

— Дайце памеркаваць. Скончым рамонт „Піянэра", а там...

—Іван Астапавіч, а там і за мерцьвяка возьмемся,—перабіў яго Васіль, ляпнуўшы рукою па плячы.

Іван уздрыгнуў, паглядзеў на Васіля і засьмяяўся. Сьмех ягоны перайшоў на ўсіх.

— Ну ладна. Паспрабуем,—станоўча сказаў Іван і ў канторцы цэха стала ціха.

Пагасла сьвятло. Ішлі праз кузьню. Халшчэўнікаў прыбіраў інструмант.

— Што скончыў?

— Так!—сказаў каваль і засьмяяўся.

Печы качагарак фабрыкі зьядалі лясы. Каменны вугаль з Данбасу доўгімі эшалёнамі прыходзіў на дрыўляны склад фабрыкі замест дроў. Са складу вугаль ішоў у печы-катлы, ганяў маторы і рухаў машыны.

Так было, але так далей нельга, сказаў Добруш.

Недалёка ад Добрушу на балотах Палескае роўнядзі, дзе раней раскідалі сяляне час, каб здабыць няшчасны шкумат сена, вырас торпазавод. Сотні гэктараў балотаў пад ценкім прасьціралам карэньняў асакі і купавіньня хаваюць багатыя

залежы торпу, якога хопіць для фабрыкі на 50 гадоў. Свой Данбас!

І фабрыка парашыла перайсьці на торп.

Пачалася праца.

Ад ярусаў здабытага торпу да карпусоў фабрыкі ў 1930 годзе выраслі слупы. Гэтыя слупы абкруціліся сталёвымі вяроўкамі. Выросла падвясная дарога на сем кілёмэтраў даўжыні. Тоны торпу плывуць па ёй, як гусі па рэчцы, ад торпзаводу да фабрыкі.

Побач з фабрыкай выросла новая белая, жалезабэтонная, сьветлая будыніна. Гэта-новая пара-сілавая станцыя, якая павінна забясьпечваць не данбасаўскім вугальлем, а торпам, што ляжыць пад носам пластамі ў 2 мэтры глыбіні. Гэты торп пападае проста з падвясной дарогі ў бункеры, і ў катлы новай парасілавай станцыі, пабудаванай па апошняму слову тэхнікі.

Але да пагрузачнай станцыі рабочыя не пасьпяваюць кашолкамі падносіць з балота торп. Печы патрабуюць занадта многа. Сяляне заняты бальшавіцкай сяўбою і ня могуць даць коняй. Не хапае торпу, няма пары, няма энэргіі-стаяць агрэгаты.

І Добруш недадае краіне паперы. І вісіць над фабрыкай ганебная кліч-ка:—„прарыў".

Б'е гэтае слова рабочага Добрушу б'е яно рабочага ўсяе краіны. А краіна патрабуе паперы. Балонкі газэт крычаць пра гэтае, і крычаць моцна на ўвесь Саюз.

У часе перапынку на полудзень сьлесар Кісялёў падышоў да Осева, патрос газэтаю, пхнуў пальцам у шэрагі буйных літараў, сказаў:

— Астапавіч! На!.. чытай!..

— Што чытай?..

— А вось пішуць... пра нас...

Осеў узяў газэту і пачаў чытаць. Газэта ня пісала, а проста крычала, сувора і злосна:

— „Мы рабочыя „Палесдруку", што выканалі пяцігодку ў тры гады, даведаўшыся пра невыкананьне вамі прамфінпляну па паперы, патрабуем бальшавіцкіх штурмаў, бо ваш прарыў вядзе да прарываў на нашым фронце".

Прачытаўшы гэтае, Астапавіч накасурыў лоб і, быццам абмяркнўваючы нешта, выціснуў доўгае:

— Т-а-а-к!..

— Ну што т-а-а-к?-запытаўся Кісялёў.

— А тое, што ўсе крычаць пра нас. Учора ў „Зьвязьдзе" Наркамасьветы, пазаўчора Белдзяржвыдавецтва...

— А пра буксір рабочых „Ланцуцкага" запамятаў?

— Ды не. Я хачу сказаць, што чырвоны сьцяг сапраўды ў небясьпецы. Трэба ў суткі сто дзесяць тон, а мы...

— Мы дамо Астапавіч, толькі...

— Што толькі?

— А вось што, паравоз патрэбен.

— Што ты ўсё пра паравоз, што пад плотам?

— Так, скончым сёньня „Піянэра", а потым і за той..

— Скончым,-згадзіўся Астапавіч. Кісялёў сеў каля яго. Гаварылі пакуль ня скончыўся перапынак. Да канца зьмены працавалі моўчкі, нібы на каго злуючыся, упарта.

А калі скончылі працу, пашлі да сакратара парт'ячэйкі.

— Слухай, браце!-пачаў Кісялёў,-мы думаем пачаць,.. Пасоб скалаціць брыгаду. А цяпер да загадчыка—няхай піша заказ на рамонт забытага калекі.

Сакратар адказаў радаснаю ўсьмешкай.

— Дайце рукі. Вітаю... Пасоблю...

І ўсе, утрох пашлі да загадчыка. Ён сядзеў у сваёй канторцы, разьмяркоўваў заказы для будаўніцтва па такарных варштатах на другі дзень.

Будаўніцтва ў Добрушы насіла рэканструкцыйны характар Яно пачалося яшчэ былым палескім папяровым трэстам у 1924 годзе і прыняло ў сувязі з бясплянавасьцю выгляд „пэрманэнтнай рэканструкцыі". Толькі ў 1927 годзе ўзяліся за ра-

боту па пляну, за новае будаўніцтва па рэканструкцыі фабрыкі. Паводле гэтага пляну ішла пабудова падрыхтоўчага і рольнага аддзелаў, паккамэры, саламяна—цэлюлёзнага заводу, новай пара-сілавой станцыі, установка новай вялізарнай шостай папяровай машыны і пабудова найлепшай тэхнікай падвясной дарогі каштоўнасьцю ў 1.300.000 руб.

Усе такарныя працы для ўсяго будаўніцтва выконваліся мэханічнай майстэрняй фабрыкі. Заказаў ішло цэлыя горы. Капаючыся ў заказах, загадчык цэхам не заўважыў як да яго ўвашлі трое.

Калі Осеў кашляну, загадчык цэхам адарваў галаву ад папер.

— Да мяне хлопцы? запытаў ён.

— Бясспрэчна,—адказаў сакратар ячэйкі,—вось хлопцы наконта паравозу прышлі. Заказ выпісывай!

У гэты час увашоў галоўны мэханік фабрыкі Забубённы.

— Таварыш мэханік! мы рашылі паравоз адрамантаваць... што пад плотам,—сказаў загадчык.

— Які паравоз?

— Ды той, што травой зарос

— Ну і што?

— Ды вось хлопцы, рамантаваць бяруцца.

— А-а! разумею. Ды толькі нічога ня выйдзе, грошы дарэмна угракаем.

—Кажаце, ня выйдзе. Не, выйдзе! таварыш мэханік,-запярэчылі Осеў і Кісялёў.

Тады загадчык цэху рашуча выказаўся за рамонт. Мэханік маўчаў. Упартасьць гэтых людзей здалася яму моцнай.

— З такім энтузыязмам мы з аднае трубы зробім паравоз—заявіў сакратар.

— Падумаю,—сказаў мэханік, моцна грукнуў дзьвярыма і вышаў.

— Нечага думаць. Мы думалі, а цяпер рабіць будзем,—паслаў яму ўсьлед Кісялёў.

— Трус! — кінуў пачырванеўшы Осеў.—Бык нейкі, упёрся і больш ведаць нічога ня хоча.

— Дурань, а не мэханік—лаяўся Кісялёў.

— Нічога, хлопцы паравоз будзе —супакойваў сакратар.

На працягу цэлага году чырвонасьцяжная фабрыка ня выходзіць з паласы прарываў.

„Герой працы" адна з буйнейшых папяровых фабрык СССР. Ад яе работы залежыць праца шмат якіх выдавецтваў і ў першую чаргу беларускіх. 7, 31 проц. усяе паперы, што вырабляецца ў краіне, ідзе з Добрушу.

Вось чаму слова „прарыў" прымусіла гаварыць ня толькі грамадзкасьць Добрушу, але і рабочых Палесдруку, завод Ланцуцкага, Гаркома партыі, ЦК партыі, рабочы Менск. Брыгада за брыгадай выяжджаюць са ўсіх канцоў краіны. Былі брыгады ад Саюзпаперы, ад „Зьвязды", ад Гаркому партыі, „Палескай Праўды" і шмат іншых. А прарыў ёсьць. Цягнецца цэлы год.

У чым справа?

Каля фабрычнай брамы вісіць шырокі плякат. Кісялёў і Осеў ідучы з працы спыніліся.

— Трэба пайсьці. Сёньня брыгада ЦК вынікі чытае.

—Пагаворым,—сказаў Астапавіч.

Ішлі рабочыя. Многа іх ішло. Спыняліся каля варот, чыталі, гаварылі паміж сабой.

Гаварылі шмат пра што, па рознаму.

— Гэтая брыгада усыпле,—гаварылі адны.

— Даўно ўжо час, ды не абы як,—казалі другія.

— Каму ўсыпіш, хто тут віноваты?—устаўлялі з боку.

— Вугальля няма, а торп дрэнь

— Вось табе і прарыў!

— А што заводакіраўніцтва зробіць, з пальца высасе? Дайце яму вугальля, дык на ўсе чатыры калясы закруціцца.

— Не брат, тут дык вы глупства гаворыце, да чаго тут тое вугальле, калі пад бокам свой Данбас. Торпу да пагібелі. Толькі галавцяпы нашы ўзяць ня ўмеюць.

— На двары ў мэханічнай горы мэталю іржавеюць, а мы плачам, што жалеза няма.

— На будаўніцтве дзень будуем, а два ламаем. Што гэта такое? Івінаватых няма.

— Знойдзем вінаватых!!!

Адыходзілі рабочыя і расходзіліся па нізкіх, прыземістых хатах А вечарам, калі а шостай гадзіне зароў гудок, да клюбу фабрыкі пацягнуліся рабочыя. Ішлі невялічкімі групкамі і паасобку. Кісялёў і Осеў, чакаючы сходу, стаялі на беразе Іпуці, блізка клюбу, і гаварылі. Над рэчкаю ўсплываў сівы рэдкі туман і праз гэты туман у люстэрку вады вызначаліся контуры двухпавярховага новага клюбу, якому можа пазайздросьціць Гомель і Менск.

На дварэ было цёпла і весела. Не хацелася адыходзіць ад вады. На рэчцы віселі крыкі плытагонаў, дзе-ні-дзе шнырылі чаўны.

— Таварышы, заходзьце. Зараз пачынаем!..

Кісялёў глянуў на гадзіньнік. Была палова сёмае. Гэты голас паказаўся дзіўным. Звычайна ўсялякія сходы пачыналіся на 2-3 гадзіны пазьней таго, як вызначалася ў абвестках. Сягоньня гэты звычай рэзка парушыўся.

Осеў і Кісялёў селі побач, каля самай сцэны.

Брыгада ЦК падводзіла вынікі становішча фабрыкі. Са сцэны неслася:

— Ганебны прарыў... Абязьлічка... Ураўнілаўка... Апартунізм трохкутніка...

Слухалі ўважліва. Шмат пытаньняў. Адказы былі пэўнымі:

— Няўменьне працаваць па-новаму, па-бальшавіцку, а магчымасьць была

Выступленьні рабочых гэта цалкам пацьвердзілі.

— Наша фабрыка працуе на патрэбы культурнай рэвалюцыі, але самі мы некультурныя. Ня хочам берагчы варштатаў і агрэгатаў. Быццам ня нашыя яны, навошта шкадаваць іх...— гаворыць рабочы з рыжаю бародкай, сярэдняга росту.

— Што мы яшчэ малакультурныя, дык гэта праўда, але што зрабіў наш клюб і фабком каб пасобіць нам? Хто павінен пасобіць рабочаму аўладаць тэхнікай? А гэтага няма. Рабочыя вынаходкі па году марынуюцца пад сукном, ці не таму нам здаецца, што рабочыя мала займаюцца паляпшэньнем вытворчасьці,—гаворыць другі.

— Ставілі гэтыя пытаньні на сходах? Дык ці ня тут апартунізм,—размахваючы кулакамі, крычэў Осеў.

— Вы кажаце, што рабочы ня любіць вытворчасьці,—зьвярнуўся ён да другога рабочага.—Няпраўда! Любіць. Калі я пагляджу на фабрыку дзе стаяць машыны, ня круцяцца ролы, ня шумяць каландры, у мяне кроў стыгне. Навошта мы толькі біліся, каб цяпер стаяць, га?! Прагнаць лодыраў і рвачоў з фабрыкі!— крычэў расчырванелы Осеў.

Многа гаварылі рабочыя, паказваючы сваю сапраўдную любоў да фабрыкі і няпрымірымую злосьць да ўсяго, што шкодзіла працы. Ніводзін сход да гэтага ня быў такім бурным.

Брыгада ЦК падсумавала спрэчкі і дала дырэктывы ў рабоце.

Выходзілі з клюбу. Было сьвежа, нават вільготна ад рэчкі. Крычэла радыё—выразна і громка.

— Паравоз павінен быць!—сказалі ўдарнікі мэханічнага цэху. І стары рабочы ліцейнік Назараў, які мае 34-х гадовы стаж работы, сказаў:

— Абвяшчаю сябе ўдарнікам па рамонту.

І дзень і ноч у старой, цеснай ліцейнай рыхтаваў ён са сваёй брыгадай часткі для паравозу. Ліцейная была непрыстасавана да гэтае працы

Ня было гліны, вугальля, мадэляй. Назараў бегаў па майстэрні, лаяўся, моршчыў лоб, чуць ня зьбіў мадэльшчыка за несваячасовую падачу мадэляй. І ён перамог.

Ён прышоў са сваёй брыгадай у рэдакцыю фабрычнай газэты „Чырвоная Бракамолка“ і сьмяючыся рапартаваў:

— Ліцьцё для паравозу ёсьць. Час выкананьня скарочаны напалову.

А ўвечары радыё крычэла пра перамогу ліцейнікаў.

Сьлесары Осеў, Кісялёў, Саньнікаў канчалі клёпку новага катла для паравоза. Рыхтавалі буфяры, падганялі і правяралі трубы, шпунцікі, гайкі Працавалі ў суткі па 18 гадзін. Час імчыць,—гаварылі яны.

Кавалі Халшчэўнікаў, Ляўкоў, Цесьлін, абліваючыся потам каля горнаў і паравога молата, кавалі паравозную вось.

— Хлопцы! Мы застаемся, мы затрымліваем. На нас глядзяць. Хутчэй-жа!..—заклікаў Халшчэўнікаў.

— Ды мы-ж не стаім!.. Ці ты ня бачыш?

— Ды ня гэтак! Глядзі як!..

Кузьня раней ня ведала, як каваць паравозныя восі. Яна ўзялася за гэтую працу і змагалася за яе ўпарта.

І вось была зроблена. Яна закруцілася на вялікім такарным варштаце ў токара Бандарэнкі. Разец грыз жалеза, дыміў, мясьцінамі скрыгаў зубамі ад няўдачы і ізноў грыз, надаючы ёй патрэбныя памеры.

— Ня крыўдуй, што цяжка, ня бурчы, галубок... казаў Бандарэнка і карміў разец вараным маслам.

Дрыжэў супорт ад напруджаньня, пружыніў нэрвы станіны варштату, а разец грыз і грыз... Гарачыя стружкі прымалі мясцінамі чырвоны колер, нібы саромеючыся за тэмпы варштата.

Прыходзілі да варштата загадчык цэхам, сакратар парт'ячэйкі, глядзелі на працу і гаварылі:

— Добра!..

Колер стружак з чырвонага рабіўся сінім Стружкі падалі з гарачага разца на падлогу...

Варштат працаваў бяз зьмены, ён выконваў заказ краіны.

І вось, аднаго дня, каля паравознага дэпо, разьнёсься доўгі, зычны гудок. Гукі праляцелі над карпусамі фабрыкі і зьніклі за Іпуцьцю ў лесе. Гэта сьлесары, рамантаваўшыя паравоз, спрабавалі яго жыцьцё.

Загудзеў фабрычны гудок. Тры гадзіны дню. Зьмена. Пачуўшы гаворку паравоза, уся майстэрня згрудзілася каля яго. Паравоз выведзены з дэпо, грузна шыпеў... Осеў сядзеў на паравозе, радасна ўсьміхаўся і з выглядам пераможцы даваў гудкі. Загадчык цэхам узьлез на паравоз, сказаў:

— Паравоз ёсьць!

Осеў падказаў яму.

— Раней тэрміну на сем дзён!

Паравоз ганарыўся новымі фарбамі і чысьцінёй. Натоўп закрычэў:

— У-р-р-а!!!

Да Кісялёва і Осева падышоў сакратар парт'ячэйкі і сказаў:

— Вы бальшавікі! Вы ўмееце працаваць!

Осеў, адчуваючы сябе нялоўка, адказаў:

— Я бальшавік... але... я беспартыйны... прымеце мяне...—і змоўк...

— Ты наш, я рэкомэндую цябе...— сказаў сакратар.

— І я...—падхапіў Кісялёў.

Осеў выпрастаўся. Вочы глядзелі пераможна. Ён сказаў:

—Грышка, завядзі паравоз у дэпо, заўтра на торп!

г, Добруш, „Герой Працы“.

Янка Скрыган

Гомсельмаш

Генкін.

Маросіць невялікі дождж. Вуліцы прыглушэлі. Асфальт блішчыць ад змытага пылу і па ім, панастаўляўшы каўняры плашчоў, рэдка праходзяць людзі. Газэтнікі з латкоў папрымалі газэты, і газэтныя будкі дрэмлюць, паразяўляўшы глухія раты ваконцаў. Панастаўляўшы буды, праяжджаюць сюды-туды рамізьнікі. Змочаны клінкер здаецца яшчэ больш чырвоным, і па ім падковы ўдараюцца глуха.

Генкін выходзіць з будынку гаркому партыі. Марошаю ападае вільготны халадок. На Савецкай Генкін чакае аўтобусу. Аўтобусу няма—вуліца далёка відна апусьцелым рухам—і ён пехатою ідзе да вакзалу, каб там адразу сесьці, на маршрут на Палескую.

— Так хутчэй будзе, ато не дачакаешся стоячы,—думае сам сабе Генкін, даходзячы ужо да другога кварталу.

У гаркоме ён затрымаўся з самага раньня. Забавіўся, і цяпер хочацца хутчэй папасьці на завод. Муляецца рупесак—як там сёньня, ці ўсё ў парадку? За ўвесь час набылася прывычка быць на заводзе, самому бачыць кожную дробязь, самому ўдавацца ў кожную дэталь работы. Завод яшчэ бытуе такім часам, што ў любую хвіліну можа быць хістаніна, непаладкі, непрадбачанасьці, і ўсё гэта трэба памацаць самому, ацаніць, узважыць, а можа знайсьці выйсьце. Генкін прывык кожны заводзкі дзень прапускаць праз сябе, а сёньня ён ня ведае, як пачаўся гэты дзень і яму хочацца хутчэй у яго ўключыцца. У гэтай гарачай пасьпешнасьці ён нават не захацеў чакаць на аўтобус. Здавалася, калі ён будзе ўдзельнічаць у русе—гэта будзе куды хутчэй.

Няпрыкметна ўрываюцца мысьлі і цякуць у хадзе—разам з хадою—рушлівым патокам.

— А Міхайлаў зноў падлажыў сьвіньню з чыгуном. Да чаго сьлізкі чалавек. Калі з ім не гавары—ён упэўніць, што ўсё у парадку, што з яго боку ўсё зроблена. Яму ніколі нельга верыць. Чыгуну асталося на 3 дні, а ён упэўняў, што запасу на месяц. Добра, што Агранат дагадаўся праверыць. Цяпер давядзецца пазычыць на „Пралетары"... пакуль прыдзе свой. І трэба праверыць усе запасы на ўсім заводзе, бо гэты чалавек калі-небудзь пасадзіць у галёшу...

На вуліцы тоўстымі шынамі прашумеў аўтобус, пераганяючы Генкіна, але Генкін яго не заўважыў, бо ўжо новыя думкі занялі напружаную ўвагу.

— Пра больш разгорнутую работу парткалектыву—у гаркоме гаварылі правільна. Гэты перадавы вучастак павінен стаць на сапраўднай вышыні, увабраўшы ў дзейнасьць задач увесь завод да малюсенькіх ізьвілін, прапітаць яго цалкам сваім духам—пераварыць увесь сьвежы чалавечы матэрыял у кат-

1) „Маладняк" 10, 11, 12, 1931г.

ле перадавога пралетарыяту. Гэта задача ляжыць на камуністах. Гэта задача ляжала на іх, ляжыць, і ляжацьме да таго часу пакуль у нас будуць яшчэ тыя пласты, з якіх фармуецца пралетарыят. Пра гэта— правільна. Але як няпоўна гарком ведае пра заводзкую рачаіснасьць! Ім здаецца: прышоў, сказаў, навінціў—і ўсё гатова. Няма нічога горш, як адарвацца ад таго, чым ты непасрэдна заняты, і здалёк, зьверху дырыжаваць палачкаю. Мы, многія навучыліся мастацкі загадваць, а трэба навучыцца куды больш складанаму—кіраваць, і куды большаму мастацтву—выхоўваць. А гэта льга толькі пры шчыльнай зьлітнасьці з тымі вучасткамі, на якіх адбываецца работа. Брыгады... Зноў вырашылі паслаць брыгаду. Але-ж усё гэта па пратакольнаму, па кампанейскі, а тады зноў разрываецца нітка і—зноў няма канкрэтнага разуменьня абставін, а толькі дырыжэрская палачка. А работа па фармаваньні чалавека—самая цяжкая. Гэта-ж ясна, што стан і ўсялякае арганізацыі, і ўсялякага заводу залежыць ад якасьці чалавечага матар'ялу. Гэта самая складаная работа, яе горш за ўсё можна зразумець здалёк, і кіраваць ею, значыць—быць цалкам у тых абставінах, разумець самыя малюсенькія дэталі...

Думаючы, у Генкіна няпрыкметна сьцішылася хада. Ён ужо забыўся, што сьпяшаў на завод, бо завод цёк у мысьлях, ставячыся то задачамі работы, то цяперашнім станам, то гісторыяй бесьперапыннага змаганьня. У мысьлях завод маляваўся рэльефна, пуката, так што, здавалася, яго льга было мацаць. Вось размотваецца ён як кіно—істужка. Першыя дні, калі ўвесь завод—у кутку аднаго цэху з двума варштатамі, з кучкаю людзей, што рыхтуюць канкструкцыі, мадэлі! Людзі, па заводзе—па цэсе—ходзяць па дачасу пакладзеных дошках. Вільгацьцю пахне з-пад дошак зямля. Людзі ходзяць па дошках, па вільгаці, каб хутчэй нарадзіць Сельмаш. Першыя пробныя машыны. Завод пушчаны, і ўпяршыню на заводзе паяўляюцца людзі, каб арганізаваць цэхі, каб ажывіць мэханізмы. З дня на дзень завод расьце, і з дня на дзень прыходзяць новыя людзі. Прыходзяць: кваліфікаваныя рабочыя мабілізованыя з іншых заводаў, сяляне, калгасьнікі, цырульнікі, фатографы—на работу. У заводзе, у рабоце, расьце новы пралетарыят. Пачынаецца тое, што завецца фармаваньнем чалавечага матар'ялу. Пачынаецца вялізная, складаная работа па пераробцы чалавечага нутра, выхаванага стагодзьдзямі. Вялікі настаўнік пралетарыату глыбока ўскрыў гэтыя законы, што пралетарыят „заўсёды і ўсюды рэкрутуецца з дробнае буржуазіі, усюды і заўсёды бывае з ею зьвязаным тысячамі пераходных ступеняў, граняў, водценьняў." На завод прыходзяць сяляне, цырульнікі, фатографы. Кожны з грудам свае сацыяльнае бытнасьці—тых пластоў, адкуль фармуецца пралетарыят. І пачынаецца цяжкая работа ломкі нутра, бо гэты новы пралетарыят „ад сваіх уласных дробнабуржуазных забабонаў пазбаўляецца не зразу, ня цудам, не па жаданьні божае маці, не па жаданьні лёзунгу, рэзалюцыі, дэкрэту, а толькі ў доўгай і цяжкай масавай барацьбе з масавым дробнабуржуазным уплывам". Так. І гэта тым больш складана, што рэканструкцыйны пэрыод даў і масавыя сацыяльныя зрухі. Людзі зрабілі эпоху, і эпоха пачынае ламаць грань, чалавечую псыхіку мінулага стагодзьдзяў—новымі нормамі вытворчых адносін. І на Сельмаш прышлі людзі з дробна-буржуазнаю псыхікаю, з грузам свайго мінулага, насьці, каб варыцца ў катле перадавога пралетарыяту. Стан ўсялякае арганізацыі, усялякага заводу залежыць ад якасьці чалавечага матар'ялу. Гэтая якасьць давала адчуваць сябе на працягу ўсяго

часу, характарызуючыся станам вытворчасьці. Разам з людзьмі, якія навучыліся завод лічыць сваім, хварэць за яго, біцца за кожную дэталь гонарам права на будоўлю—ёсьць і наплюйства,—тая сацыяльная бытнасьць, якая прынесла з сабою дробна-буржуазную псыхіку Вось у габлюшках у дрэваапрачым знайшлі соннага чалавека. Ён пайшоў спаць і яго нутро нікапелькі не кранулася, што ён пакінуў свой працэс работы, даўшы перабой на ўсім патоку, што праз яго прымушаны былі стаяць дваццаць чалавек тых, якія гатовы былі рвацца на часьці, ня ісьці з работы пакуль не стачаць гэтае дзіркі. Прарывы—гэта таксама сацыяльная зьява. Завод з маладым складам рабочых—перажываць мы патугі свайго росту, фармаваньня. Гэта перажыў Сельмаш. Яшчэ і дасюль ёсьць людзі, якія самі ня бачаць, што яны носяць з сабою сваё мінулае груз свае сацыяльнае бытнасьці. Вось мэханічны ніяк ня можа падняцца, каб стаць на вышыні іншых цэхаў. Прагулы, абыякавасьць, безадказнасьць. Нават варштаты часта не даглядаюцца, карэюць брудам і па іх зразу можна пазнаць іхнага гаспадара. І гэта менавіта таму, што гэты вучастак адстаў у выхаваўчай рабоце, набыўшы складанейшы пераплёт пераходных граняў. І гэты вучастак трэба ўзмацніць здаровым кваліфікаваным ядром камуністаў. Можа нават трэба падумаць ды прасіць у гаркоме, каб мабілізаваць часова з іншых заводаў так, як тады, калі пушчалі завод. Мэханічны адстае яшчэ і таму, што не хапае кваліфікаваных майстроў, а гэта робіць больш заняжным увесь гэты чалавечы разнабой. Так.

Мысьлі мяняюцца, плывуць кінастужкаю і завод ужо ўстае заўтрашнім днём, будоўляю новых карпусоў, аналізам апэрацыйнасьці заводакіраўніцтва, задачамі новае работы. У мысьлях, сьцішанаю хадою, Генкін падыходзіць да вакзалу і мэханічна становіцца ў чаргу на аўтобус. Не перарываючы думак, ён глядзіць у бок на камень, што няроўным краем вытыркнуў з бруку. Пасьля, за паваротам пачуўся гудок і чарга ўздрыганулася, захапіўшы з сабою і Генкіна. Толькі цяпер, калі перарваліся і расьсеяліся думкі, Генкін заўважыў, што ў яго ад марошы прамоклі плечы і па сьпіне ходзіць халаднаватая вільгаць. Калі ён быў растоплены ў мысьлях, ён ня чуў гэтага, бо мысьль таксама мае свае фізычныя законы: у рабоце, у напружанасьці, яна вылучае сваю-ж унутраную цяплынь. Цяпер-жа, калі гэтая цяплынь абарвалася разам з мысьлямі—Генкін пачуў даўно стоены на сьпіне халадок, сьцепануўся і, разам з чаргою, падаўся ў аўтобус.

Фалкіна даўно ўжо няма на заводзе. Ён усё такі не навучыўся быць добрым дырэктарам. Дарма, што пачаў-быў паказвацца ў цэхах. Энтузыязм, гэта ўсё такі ня гульня, так як думаў Фалкін. І гэты энтузыязм, якога ня змог зразумець Фалкін, пакінуў яго ў баку з яго-ж тэорыяй самацёку, тэорыяй скіфаў і дзікунскага права разгрому нормы ды культуры. Нядобра, калі камандзіры адстаюць ад масы. Даганяючы ззаду і хочучы яшчэ быць на чале гэтых мас, яны толькі блытаюць падаючы каманду, каб іх пачакалі. І масы пераступілі Фалкіна, ня слухаючы яго каманды пачакаць. Фалкін стаў на заводзе непатрэбным прыдаткам з назваю „апартуніст", не дагнаў гэтае масавае волі і—завод астаўся бяз дырэктара.

Вось таму так і багата клопату Генкіну. Вось таму такім вялікім рупескам муляецца Генкіну кожны заводзкі дзень, які трэба прапусьціць праз сябе, так каб увесь завод быў відзён навылет.

Зайшоўшы на хвіліну да сябе ў габінэт, Генкін сьпяшаецца ў

цэхі. Ужо на дварэ чутно, як кожны цэх жыве сваім рухам, шорганам, гулам, разносячы гэты рух па дварэ. Добра, калі чуеш прывычны грукат, прывычны гар ад вагранак, і ты тады абмацваеш здаровы пульс свайго самастойнага жыцьця. Каля кавальскага раз по разу нагінаецца Гаранін, ён вымервае толькі што прывезенае жалеза і праз шкелка пэнснэ ня відаць, як прыжмурваюцца яго вочы, вылічваючы патрэбныя мілімэтры

— Добрага здароўя, — адказвае ён на Генкінава прывітаньне, яшчэ ня кончыўшы свайго вылічэньня. Пасьля вочы пад пэнснэ разжмурваюцца, Гаранін складае мэтр і гаворыць, гледзячы недзе ў двор.

— Як-раз у час пасьпела. Цяпер льга будзе хоць палюцку працаваць.

— Не палюцку, Гаранін, а па ўдарнаму, бо люцкае ўсяляк можна разумець, а табе трэба нагнаць запазычанасьць—онь глядзі колькі машын стаіць негатовых.

— Гэта—была не мая віна,—тымжа самым голасам. халодным, як праз шкло, гаворыць Гаранін.— Мы-ж, онь, бачыце, як выкруцілі-ся—пачалі калёсы кляпаць па—новаму: сьпіцы ў адну столку з выгінам каля абаду. Так думаем кляпаць і надалей. І калёсы куды лягчэйшыя, і моц тая самая.

— А гэтая-ж прапанова ляжала ў цябе каля месяцу нерэалізованаю тады, калі праз калёсы зрывалася зборка. Цябе заядае твой прынцып несьпяшаць, Гаранін. Нядобра, калі ты не натхняеш, а ахалоджваеш.

Гаранін нічога не адказвае. Ён глядзіць недзе на канец двара і ад хмурнае пагоды бляск на пэнснэ—матавы-

— Як работа будзе так і пасьпеем. Калі льга будзе, вядома—нагонім, і нават запас дамо,—варочаецца да першае думкі Гаранін, гладзячы чырвоную, некалі апараную пляму на барадзе.

Нізкім, цяжкім корпусам Генкін стаіць грузна. Ён глядзіць, як гладзячы пляму, усё-ж такі нэрвуецца Гаранінава рука. Пасьля ён адыходзіць пад цэхавыя ворота, і ужо адтуль гаворыць, загадзя хаваючы нутраную ўсьмешку.

— А з імі ў цябе ўсё ў парадку? Ня зрываюць? Не прагульваюць?

Цэх грукаціць малаткамі, работаю зваркі, штампоўкі—варштатамі. Ад горнаў агнянымі дугамі на кавадлы кладуцца кавалкі расплаўленага жалеза. Паравы молат грузна бабухае, калоцячы ўдарамі земляны дол. Рабочыя ў шкураных хвартухох стаяць на сваіх працэсах, і ў велічы цэху і варштатаў, здаюцца рэльефнымі. Гаранін таксама глядзіць праз вароты ў цэх і ўжо разумее, пра што пытаецца Генкін.

— Не, з імі то ў мяне ўсё ў парадку. У мяне—малайцы.

— Дык вот, я табе кажу, яны гэта зробяць самі,—і ўсётакі прарываецца Генкінава ўсьмешка, усётакі бегае па губах і кладзецца на твар.—Яны самі перагоняць. І табе брыдка будзе, што яны пераступяць начальніка.

Генкін пакідае Гаранінa і праз кавальскі ідзе ў іншыя цэхі. Ён пройдзе па ўсіх цэхах, прыслухоўваючыся да кожнага вучастку, да кожнага рабочага, да кожнага варштату. Генкін сам мэталіст, сам кваліфікаваны токар і майстра—ён ведае ўсю вытворчасьць на тое, каб пазнаць, які вучастак пачынае слабнуць. Праходзячы, ён на доўга сунімаецца там, дзе працуюць камуністы. Падгульвае варштат? Генкін сам устанаўляў гэтыя варштаты. Ведае іх так, як-бы на кожным з іх працуе, і памагае шукаць прычыны. З варштату ён вылазіць замасьлены, выцірае рукі—бачыш, працуе—і ідзе да другіх, туды дзе таксама няўпраўка.

На зборцы шасьцёрак, якія будуць падаваць сіласарэзкавы ланцуг, два рабочыя доўга марудзяць, падбіраючы валікі, каб не слабка хадзілі ў шасьцёрцы. Але валікі ходзяць слабка.

— Зноў, чэрці, сапсавалі цэлую партыю.

— А ну іх... нават гэтага ня могуць як сьлед абтачыць.

Генкін глядзіць на гэтую маруду, а тады бярэ валік у рукі.

— Што, трэба каб сядзела глуха? Гэта на цягу?

— Не на цягу, але-ж от вечна што-небудзь ды стане ўпоперак работы. От і рабі што хоць.

— Сам кажаш, што ня трэба каб сядзела глуха, а і не даразумеешся, што зрабіць. Дай кернар!

Паклаўшы на клешчы, Генкін ударае кернарам, дзе павінна сядзець шасьцёрка. Кернар выбівае на валіку ямачкі, падымаючы каля ямачак беражкі.

— Круці. Яшчэ круці!

Накернаваўшы кругом, Генкін узьдзяе на валік шасьцёрку. Шасьцёрка ідзе туга, моцна становячыся на свае месца.

— Ну, добра?

— Я ня ведаў, што так можна,— гаворыць сканфужана рабочы за тое, што нядаўна задарма лаяўся.

— Ну дык от і можна. Так і давайце, каб на вас не чакалі...

Цэхі грукацяць гулам работы—шоргатам, стукам, пляскам трансмісій, гудам цэнтрабежнае сілы матораў. Добра, калі чуеш прывычны цэхавы пульс. І абслухаўшы гэты пульс, можна ведаць, дзе завод дае перабоі, якія вучасткі яшчэ не перасталі хварэць.

Праз двор Генкін варочваецца ў заводакіраўніцтва, каб застаць Трафімава, бо ён і забыўся, што Агранат нават нядаўна напамінаў зноў пра чыгун. Трэба сказаць, каб дамовіліся з „Пралетарам"—трэба пазычыць пакуль прывязецца свой. Даваць адміністрацыйныя загады, гэта, вядома, не яго функцыя, але хіба-ж ён мае права, каб не кіраваць заводам, калі на ім няма дырэктара?

На дварэ прывезьлі замежную сіласарэзку. Зноў зьявілася патрэба ўдасканаленьня свае Сельмашаўскае машыны; пасьля работы, кучка рабочых сабралася каля гэтае сіласарэзкі, каб паглядзець, чым адрозьніваецца канструкцыя замежнае, і што льга пераняць ад яе, каб зрабіць сваю, новую канструкцыю. Інжынэр Санаторскі, вывучаючы, паволі разьнімае дэталі. Падгалістая, на тонкіх нагах, стаіць сіласарэзка далікатнаю лялькаю.

— От раму сваю нам давядзецца зьмяніць. Глядзі, як тут—прантамі—проста як струнамі сьцягнена, а ў нашай спрэс кавалак жалеза: прасьцей, але, праўда, цяжэй. Тут камбінацыю можна зрабіць будзе,—нагінаючыся і аглядаючы машыну гаворыць, рабочы са зборкі. Пасьля ў яго мабыць нарадзілася нейкая творчая ідэя: ён мацае дэталі рукамі і, прыкусіўшы губу, вывучае прынцыпы канструкцыі порсткаю беганінаю воч.

— Цалкам яна нам не гадзіцца,— гаворыць Санаторскі, — харошая, зграбная, але далікатная залішне. А некаторыя прынцыпы мы можам пераняць. Нам новая машына патрэбна такая, каб пры максымальнай прастаце яна мела і максымальную прадукцыйнасьць. І трэба, каб яна магла яшчэ прыстасоўвацца да якасьці работы—каб была ўніверсальнаю. І самае галоўнае—гэта канструкцыя перадачы і дыскі.

У рабочага пад сіласарэзкаю перасталі бегаць пальцы. Ён слухае Санаторскага, а калі той кончыў—устаў і задумаўся.

— На калгас не гадзіцца такая. Кулачку добраму яна—якраз.

— Зроблена то мудра, ды толк ці вялікі з яе,—жартуюць рабочыя, аглядаючы прывозную сіласарэзку

— Вось нам і трэба новую зрабіць. Давайце, мазгуйце хлопцы, ды разам і адкоцім такую машыну, каб была—во!—усьміхаючыся выстаўляе вялікі палец Санаторскі, падзадорваючы рабочых.

Той самы рабочы, перарваўшы думку, зноў нагнуўся над сіласа-

рэзкаю, вывучаючы ўжо перадачу. Пасьля локцем ён адкінуў на патыліцу шапку і падняўся.

— А ведаеце, таварыш Санаторскі, я сур'ёзна думаю над гэтым падумаць. Калі вы паможаце...

— Ды не паможаце, а давай от разам і возьмемся. І ты мне памагацьмеш і я табе. Быць ня можа, каб мы ня прыдумалі чаго небудзь добрага.

Генкін мелькам падышоў-быў да рабочых, і цяпер, адыходзячы ад іх, панёс з сабою нейкае харошае адчуваньне. Ён напаткаў тое, чаго ня мог-бы зразумець у цэхах—нутраны кантакт інжынэра з рабочымі. У цэхах, у часе работ гэта было-б акрэсьлена вытворчым абавязкам, ня мела-б самастойнае пукатасьці і цяплыні.

— А здорава ён зьмяніўся, гэты Санаторскі. У яго пачынае гарэць душа,—думае сам сабе Генкін і сьлед гэтае прыемнае думкі малюсенькаю цеплаю ўсьмешкаю застывае на губах.

У пакоі парткалектыву—шумна. Сабраўся актыў. Мае адбыцца партыйная нарада і чакаюць яшчэ на некалькі чалавек, без якіх ня варта цачынаць.

Генкін локцямі грузна ўзваліўся на стол. Стол абсела некалькі чалавек і, пакуль пачнецца нарада, вядзецца абыякая гаворка. Пара чалавек ля шафы, трымаючы ў руках „Науку и технику", спрачаюцца пра загартоўку разцоў. На водшыбе, каля сьцяны, Агранат сабраў каля сябе невялікую групу, і расказвае нейкі эпізод з грамадзянскае вайны. Каля вакна смуглявая жанчына даводзіць пра нерацыянальнае скарыстаньне свайго варштату і прапануе заклёпкі тачыць ня конусам, а роўна, што дасьць куды большую прадукцыйнасьць.

Шум, гамонка, перабойныя галасы.

Увайшоў Дрыц і яшчэ некалькі чалавек з лёгка-кацельнага і Генкін прыўзьняўся з локцяў.

— Ну давайце пачнм..е, Агранат, сьціхні! У аснову сёньнешняе нашае нарады лягуць вытворчыя пытаньні. Прамова тав. Сталі а выклікала вялізны масавы пад'ём. Апошняя міжцэхавая вытворчая нарада дала цэлы шэраг канкрэтных прапаноў і нам сёньня трэба праверыць, як гэтыя прапановы мы выканалі.

Генкін на трошку сьціхае і бярэ аркуш паперы, што даўно ўжо ляжаў няпрыкметна ўбаку.

— От тут у мяне пратакол гэтае нарады з усімі пунктамі і з паказаньнем пэрсанальнае адказнасьці за выкананьне іх. Я думаю, што мы проста і пачнем іх праглядаць. Няхай таварышы, на якіх была ўскладзена гэтая адказнасьць, раскажуць, што імі зроблена.

На некаторы час у пакоі зрабілася ціха. Чутно было, як нехта, выкурваючы, шарганўў запалкаю. Адале цішыня зашавялілася і нехта падаў голас, каб гаварыў Дрыц.

У кутку Дрыц падняўся брытаю галавою, паклаўшы на крэсла шапку.

— Я, таварышы, чэсна сазнаюся, выканаў ня ўсё. Проста, у мяне не хапіла сілы і не хапіла людзей, бо ў нашым цэсе павінна адбыцца работа ня толькі па рэалізацыі прапаноў і ўдасканаленьняў, а цэлая рэарганізацыя ўсяе сыстэмы цэху. Мы былі спазьніліся ў пераломе і гэтае спазьненьне выклікала ў нас гарачку. Няглыбокая прапрацоўка пытаньня пераходу на гаспадарчы разрахунак дала была блытаніну і гэтая блытаніна перашкаджала нармальнай рабоце. Наогул мэханічны цэх...

Дрыц хоча абгрунтаваць невыкананьне даручаных яму мерапрыемстваў станам цэху, але ў аналізе гэтага стану блытаецца і дастае з кішэні замурзаны пратакол. Ён будзе лепш гаварыць па пунктах. Але вось і пункты падводзяць. Цяжка сказаць які з іх цалкам выкананы. Ну, выканана ўстаноўка шпонкапрацяжнага варштату. Карусэльны разгружаны ад дробных

дэталяй. Зроблена прымацаваньне дэталяй да рэвольвэрных. А вось праверка і нарыхтоўка новых шаблёнаў ды кандуктароў не закончана. Не закончаны пуск калаўскага варштату, ад якога залежыць далейшая рацыянальная разгрузка такарных. Не пачата рэалізацыя рабочых прапаноў па мэханізацыі шабравальных працэсаў. Не распрацована... і цэлы шэраг пунктаў у пратаколе стаяць незакранутымі, непачатымі, бо для іх ажыццяўленьня патрэбна папярэдняя работа ўліку, зьвязанага з гаспадарчым разрахункам, з пераломам вытворчае і апэрацыйнае сыстэмы.

Дрыц садзіцца. Брытая галава ўспацела, распарылася. Выціраючы яе рукавом, Дрыцу здалося, што ён нечага яшчэ не сказаў. Гэта асталося нясказаным адчуваньне свае віны, бо як раз вось тут, гаворачы, Дрыц пачуў, што вялікая доля работы правалена менавіта дзякуючы таму, што ён быў даволі непаваротлівым. От гэтае несказанае замулелася і Дрыцу стала неякавата, бо ўсёроўна гэта відно, хоць не сказана.

Між галоў яму відзён быў Генкін, але ён паставіў на локаць руку, запусьціўшы пальцы ў валасы, і цень ад рукі хаваў Генкінаў твар. Другою рукою ён здаецца нешта запісаў і на гэты кароткі час зноў у пакоі зрабілася ціха. Дрыцу здалося, што гэтая цішыня стала ад таго, што кожны думае пра справаздачу, і ён яшчэ раз выцер лоб.

— Кончана? — Генкін адарваўся ад пісаніны.—Я думаю, што мы заслухаем адразу інфармацыю ад усіх цэхаў. Будзе ясьней. А тады адразу па ўсіх будам і гаварыць. Давай ліцейны.

Агранат адкідае на патыліцу шапку. Ад гэтага яго твар адразу робіцца вялікім і лоб блішчыць белаю незагарэлаю палосаю.

— У мяне ня скончаны яшчэ толькі ўстаноўкі наждачных тачылаў у абсечным. Наогул у абсечным багата работы і цяжкасьць ускладняецца капітальным будаўніцтвам, без чаго нельга як сьлед упарадкаваць гэтага аддзяленьня. У ліцейным праробленыя дзьве надзвычайна важныя работы. Гэта: перагляд норм і расцэнак для ліквідацыі ўраўнілаўкі, памяншэньня цякучасьці і падвышэньня прадукцыйнасьці, як вынік гэтага і, другое— мы, сваімі сіламі, сваею рабочаю ініцыятываю пашырылі фармовачную плошчу, што нам дало магчымасьць куды рацыянальней расставіць рабочую сілу і, таксама падвысіць норму выработкі. На гэта мерапрыемства ўвесь цэх сам, добрахвотна, на чале з парт'ячэйкаю, мабілізаваўся на шэсьць гадзін пасьля работы. За гэтыя шэсьць гадзін мы зрабілі новы цэх, перанёсшы туды апокі, зямлю, зрабіўшы ўсё патрэбнае абсталяваньне. Гэтыя мерапрыемствы ўжо далі свае выніkі і цяпер перад намі стаіць задача— да канца перайшоўшы на гаспадарчы разрахунак, падцягнуць такія адсталыя вучасткі, як абсечнае ды выбіральнае.

Нехта падаў рэпліку, пытаючыся як з бракам, але, варочаючыся і дрогаючы крэслам, Агранат не пачуў. Назад на лоб насунуўшы шапку, ён прыгорбіўся так, што здавалася сядзеў на нечым нізкім.

— Ну, давайцё мне цяпер!

Устаў сакратар ячэйкі лёгка-кацельнага. Ад вакна відно падала яму на патыліцу і, гаворачы, па патыліцы ён вадзіў рукою. Яшчэ варочаючы згорнуты ў руках пратакол, Дрыц быў задумаўся, але раптам настаражыўся. Сакратар лёгка-кацельнага ўпамянуў яго прозьвішча. Рэалізацыю ўсялякіх прапаноў і ўсялякіх пастаноў зрывае мэханічны, устанавіўшы апошнюю чаргу падачы туды дэталяй. Бульбасартоўкі, ды бульбамыйкі проста забываюцца, і праз гэта ня могуць...

— Гэта гаворка для бедных, Маглі-б штурмануць, калі-б заха-

целі. Ты лепш скажы ці скора вы як сьлед наладзіце зварку?

— Вот — зварку. Міхайлаў увесь час упэўняе, што аўтоген выпісаны, што тлён закуплены, але ні таго, ні таго да гэтага часу няма. Тыя прылады, якія ў нас ёсьць, не даюць нам магчымасьці электразваркаю даваць поўнае нормы сітаў,-канчае лёгка-кацельны.

Генкін верна сказаў быў, што калі інфармуюць усе цэхі, то будзе ясьней. І з гэтых інфармацый стала ясна, што кожны цэх мае свае хваробы, свае зрывы. У лёгка-кацельным разгульвае самацёк, абязьлічка. У кавальскім пануе ўраўнілаўка. Зборачны, прывыкшы ўсё спасылаць на мэханічны, забыўся, што вялікая доля работы па перабудове ляжыць і на ім, як на арганічнай частцы ўсяго заводу.

І тое, што здавалася ў цэхах прывычным, нармальным, тут, на нарадзе, выпуклілася, завастрылася, паказаўшыся новымі, да гэтага нябачанымі, бакамі. І зразу ўсім стала ясна, што тое, што рабілася да гэтага часу, гэта яшчэ фактычна не работа, а толькі пачатак—падрыхтоўка да яе. Вось ужо пачалі выказвацца. І менавіта гэтае адчуваньне сур'ёзнасьці абставін робіць спрэчкі нейкімі важкімі, адказнымі, ставячы сур'ёзныя запатрабаваньні да сябе і да другіх. Новая, дасюль не зразумелая веліч і складанасьць задачы пераключкі ў рабоце пановаму, вымагае жорсткае самакрытыкі і дакладнага і яснага аналізу становішча. Вось пра гэта ўжо гаворыць камуніст з мэханічнага. Сам Дрыц махае брытаю галавою, згаджаючыся з тым, што ў мэханічным нікуды няварта работа ўліку, што абязьлічка яшчэ тармозіць увесь цэх, не даючы магчымасьці распазнаць добрага работніка ад гультая, кваліфікаванага ад невука. І ўжо ня трэба пытацца хто хоча мець слова, бо кожнаму хочацца сказаць, раскалупаць балячку каб паказаць гной—даць свае пажаданьні, практычныя прапановы. Генкін яшчэ ня браў слова, але і па тым, як уважліва сачыў ён за кожным, як стаўляў запытаньні, рэплікі, як запісваў перад сабою нейкія нататкі, рабілася ясным, што сур'ёзная работа пачынаецца з гэтае нарады, дзе робіцца пераацэнка вопыту і практыкі, і дзе пытаньні перабудовы па-новаму, выцякаючы з саміх абставін, становяцца так шчыльна, што бяз іх нямысьлімы далейшыя посьпехі. І кожная рэч, што дасюль здавалася дробязьзю, паказалася новымі бакамі, набыўшы новую мэтазгоднасьць. Вось рабочыса зборкі мелькам упамінае пра нерэалізаваную прапанову мэханізацыі на шаброўцы падшыпнікаў. А гэтая прапанова, калі-б яе рэалізаваць, дасьць вялізную эканомію людзей і часу, зьмяніўшы нават адносіны рабочага ў працэсе вытворчасьці.

Слова просіць Сімховіч, але яго перабівае смуглявая жанчына. Яна гаворыць пра сваю брыгаду ў мэханічным. Брыгада мае ўсе ўмовы да поўнага пералому, але яна проста няглыбока ўразумела сутнасьць арганізацыйнага прынцыпу. Цэхавы камітэт і партыйная ячэйка аддалі зусім мала сур'ёзнасьці, каб арганізаваць рабочую ініцыятыву.

— Я думаю, сам Кесьлер гэта прызнае, і трэба, каб ён сам сказаў, што яму перашкаджала ў рабоце, чаму ячэйка так слаба разгарнула масавую работу, і чаму такое пытаньне, як гаспадарчы разрахунак, як цэлы шэраг пытаньняў, дадзеных тав. Сталіным на ажыцьцяўленьне, якія знайшлі водгук у рабочым колектыве ўсяго заводу,— так нядбайна арганізаваны ячэйкаю.

Сьцямнела, і ўжо ня відна ні Дрыцавае брытае галавы, ні Кесьлеравае апушчанай чупрыны, ні цьвёрдых воч смуглявае жанчыны. Відно толькі, як то ўспыхвае, то дугою апускаецца ўніз дзе-ні-дзе аганёк папяросы. Каля вакна толькі цьмяна абрысованы Генкінаў шырокі нізкі сылуэт і, поруч, некалькі

расплыўкіх контураў плеч. Нават забыліся запаліць сьвятло. І, толькі, калі Генкіну зноў спатрэбілася зрабіць нейкія нататкі, ён падняў руку, шукаючы штэпсаля.

Электрычнае сьвятло лінулася ў дым, у чалавечую напружаную духату і гаворку.

Зноў спрэчкі. У кожнага ёсьць свая думка, і гэтую думку хочацца ўліць у агульны струмень, як права кожнага бальшавіка на сваю-ж бальшавіцкую будоўлю. У Сімховіча, як і заўсёды, голас ціхі, здаецца нясьмелы, але відно, што ён гаворыць так, як чалавек, у якога завод даўно стаў сваім, і што кожную яго балячку ён носіць і перажывае так, як носіць і адчувае сваю рану атрыманую ім у схватцы з басмацкімі бандытамі. Зноў хочацца сказаць Дрыцу, бо новыя бакі, што адкрыліся ў часе спрэчак, нарадзілі ў яго і новыя сур'ёзныя меркаваньні.

Дым, духата, напружаны шум галавы.

Нехта прапанаваў ня курыць, але хіба дагледзіш за сабою, калі ў спрэчках, у напружанасьці пальцы самі, мэханічна, дастаюць папяросу і чыркаюць запалкамі.

У шыбы даўно ўжо ўсмакталася ноч. Праз ноч, праз вокна відаць, як на далёкім канцы заводзкага двара невялікім пузыром паволі віхаецца электрычны ліхтар, а ў нізе, збоку, гараць агні начное зьмены мэханічнага цэху.

За вокнамі—ноч.

У пакоі—дым, духата, напружаны шум галавы.

Разы два ткнуўшы і разгладзіўшы рукою туга пастлепаныя кольцы валасоў, загаварыў Генкін.

— Вы бачыце, як шчыльна пераплецены між сабою пункты, высунутыя тав. Сталіным. Мы сёньня знарок узялі толькі некалькі пытаньняў, палажыўшы ў аснову апошнюю міжцэхавую вытворчую нараду. Здавалася-б, што ў гэтай нарадзе галоўнае месца займалі прапановы рабочых па рацыяналізатарскіх мерапрыемствах на вытворчасьці. Але разглядаючы выкананьне гэтых прапаноў, мы наткнуліся і на гаспадарчы разрахунак, і на ўраўнілаўку, і на абязьлічку, і на цякучасьць рабочае сілы; скрыта-ж, але відавочна вынікала адсюль няроўнасьць зарплаты па кваліфікацыях, адсутнасьць умоў на падвышэньне гэтае кваліфікацыі, дачасная, няўмелая арганізацыя працы, расстаноўка рабочае сілы, скарыстаньне варштатаў і цэлы шэраг іншых дробных і важных пытаньняў, пераплеценых між сабою, залежных адно ад аднаго. Вы бачыце, якая складаная задача пераключкі на новую работу ў новых абставінах. І вы самі ўпэўніліся, што задарма сябе супакойвалі тымі посьпехамі, якія мае за апошні час завод у выкананьні прамфінпляну. Так, завод расьце, завод падымаецца, але мы будам не бальшавікамі, калі супакоімся на раз заваёваных дасягненьнях! Калі-б мы расьлі па дваццаць—па сто раз шпарчэй—дык і то ў нас ёсьць куды расьці. А апрача вытворчага росту на нас ляжыць яшчэ рост ідэалёгічны. Тая моладзь, якая прышла да нас на завод, яшчэ толькі варыцца, часта кладучы свой сьлед, здавалася-б, і на больш устойлівых людзей. Вось Кесьлер гаварыў пра лятуноў ды прагульнікаў. А ячэйка пастаралася вывучыць прычыны, каб ведаць, як перасьцерагчы надалей такія зьявы, і яя дапамагчы, каб найхутчэй гэтых людзей перавыхаваць?

Генкін сунімаецца, каб паглядзець у нататкі. Нататкі ён памяў зьнячэўку ўсьпёршыся локцем, і цяпер доўга іх распроставаць, каб знайсьці парадак мысьлям. Адсунуўшы іх, ён глядзіць недзе трошкі ўбок, і ад гэтага з-пад рашпіленага каўняра ротфронтаўскае кашулі відаць, як на шыі туга напяўся здаровы мускул.

— І гэта вырашаюць сталінскія ўмовы,—зноў загаварыўГенкін, але

цішэй, і ад гэтага голас здаваўся новым, другім. —Толькі рэалізаваўшы іх, рабочы мецьме магчымасьць пачуць завод кроўным, сваім, бо ён будзе ім зацікаўлены. Гэта толькі пачатак. А перад намі стаіць задача ажыцьцевіць усе шэсьць умоў,дадзеных т. Сталіным. Даволі прыгадаць вам стан культурна-пабытовага абслугаваньня. Мы нават ня маем клюбу. А жыльлёвыя ўмовы рабочых? Мы будуем два карпусы, іх трэба найхутчэй канчаць, але іх мала. Да часу, ня маючы кватэр, жыве каля паўтысячы рабочых. Трэба распачынаць новае будаўніцтва. Трэба ажыцьцявіць усе ўмовы тав. Сталіна, бо бяз гэтага мы ўсёроўна будам у хвасьце. Бачыце, якія сур'ёзныя абавязкі на нас ускладаюць новыя абставіны работы? І нядобра, калі і Агранат і Дрыц пробуюць сябе ашукаць, адзін супакойваючыся на невялічкіх эфэктах, а другі— губляючыся і пасуючы перад ударнымі задачамі...

— Не зразумець іх, ня ўключыцца ў вырашэньне гэтых задач, значыць—тармазіць. Сёньня гэта стала ясна кожнаму. Праўда, у нас мала інжынэрна-тэхнічнае сілы. Але да нас прыяжджае брыгада спэцыялістаў, якую мы павінны максымальна скарыстаць. Гэта ня значыць, вядома, што мы павінны ёй цалкам даверыцца. Трэба разумець за якою работаю гэтыя людзі знойдзены. Вось таму іхнае скарыстаньне з нашага боку павінна наскрозь быць прасякнута клясаваю пільнасьцю.

Генкін змоўк. Маленькая цішыня зноў зашавялілася галасамі, але ўжо такімі, якія сталі непатрэбнымі і пасьля якіх павінна быць—работа. І нават дзіўна было, што пасьля такіх вялікіх гаворак прапанова зьмясьцілася на невялічкім лісьціку паперы,увабраўшы ў сябе максымальную дакладнасьць, усклаўшы зноў на людзей пэрсанальную адказнасьць, паставіўшы тэрміны, лічбы, вучасткі работы.

У шыбы ўсмоктвалася ноч. У ноч, у надворак выходзілі людзі. І, калі пстрыкнуў выключальнік, гэтая ноч грузна,але бязшумна ўвалілася ў пакой, прыглушаючы яшчэ сьвежы чалавечы сьлед, што астаўся тлець у кутку аганьком недакуранае папяросы.

9. Гарыць душа

Бывае, слухаеш чалавека і пачынаеш дзівіцца, што гэты чалавек гаворыць тое, што адчуваеш ты, але чаго сам ня змог бы выказаць. Проста, табе гэта здаецца знаёмым, бо адчута недзе ў нутры, але не прадумана, не сыстэматызавана, нават іншы раз не асэнсована і толькі цяпер, дзякуючы гэтаму чалавеку, фармуецца і набывае выразнасьць.

Вось так і на заводзе. Прарывы, тузаніна, непаладкі. Недзе не падалі дэталяй. Недзе стаяў варштат. Недзе абыяк зрабілі. Ня прышлі на работу... Усё гэта аддаецца на заводзе, затарможвае ўсялякія тэмпы ў выкананьні плянаў вытворчасьці. Завод адстае. І на першы погляд здаецца, што завод адстае менавіта праз гэтыя зрывы. Так разумеючы, кожны хто любіў завод—па свойму хварэў за яго, і па свойму шукаў выйсьця. Але сапраўдныя прычыны, якія жывілі гэтае адставаньне і непаладкі, заставаліся непрадуманымі, несыстэматызаванымі, а, часта, нават і не асэнсованымі.

І от зьявілася тое, што зразу дапамагло асэнсіць, прадумаць, што зразу дало сыстэму, каб зразумець усю складанасьць і прастату гэтага адставаньня. Рабочыя прагна накінуліся на газэту. „Новыя абставіны, новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва". Гэта гаворыць чалавек— правадыр, арганізатар, будаўнік тав. Сталін—слухаючы якога робіцца ясна: ён сыстэматызуе тое, што перажыў, што адчуў кожны сьвядомы будаўнік недзе ў глыбіні свае практыкі, але чаго сам ня змог выказаць, Бо, каб гаварыць гэта,

трэба бачыць перад сабою не адзін завод, не Гомсельмаш,—трэба бачыць перад сабою ўвесь Саюз у практыцы будаўніцтва, аналізаваць гэтую практыку, паклаўшы ў аснову перадавыя прадпрыемствы, што за два, за два з паловаю гады, павыконвалі сваю пяцігодку.

Рабочыя прагна накінуліся на газэту. У перапынках яны зьбіраюцца ў цэхах, разьмяшчаюцца на варштатах, на дэталях невялікімі групамі, і ім хочацца як мага хутчэй праслухаць Сталінаву прамову, каб у ёй—у гэтай прамове—пазнаць і свой завод... З пункту погляду выканань'ня плянаў—прамысловасьць уяўляе даволі стракаты малюнак. Некаторыя галіны прамысловасьці апярэджваюць мінулыя гады. Некаторыя адстаюць.

— „Чым растлумачыць гэту стракатасьць? Дзе прычына адставаньня некаторых галін прамысловасьці?"

— „Прычына хаваецца ў тым, што за апошні час умовы разьвітку прамысловасьці паіначалі ў корані, стварыліся новыя абставіны, якія патрабуюць новых прыёмаў кіраўніцтва, а некаторыя нашы гаспадарнікі, замест таго, каб пераіначыць прыёмы работы, усё яшчэ працуюць па-старому. Рэч, стала быць, у тым, што новыя ўмовы разьвітку прамысловасьці патрабуюць работы па-новаму, а некаторыя нашы гаспадарнікі не разумеюць гэтага і ня бачаць таго, што трэба кіраваць цяпер па-новаму".

Рабочым хочацца хутчэй праслухаць прамову да канца, каб у ёй—у гэтай прамове—пазнаць і свой завод. І от завод паказваецца новымі, дасюль не прамацанымі да канца прычынамі адставаньня. Дасюль відны былі факты і гэтыя факты лічыліся за прычыну. А гэта от зразу ўся гісторыя заводзкае барацьбы набывае яснасьць, акрэсьліваецца поўнаю закончанаю сыстэмаю. Гэта-ж праўда, што на заводзе цякучасьць рабочае сілы, а значыць адсутнасьць грунтоўнага кваліфікаванага ядра, кадраў. Гэта-ж праўда, што праца арганізована дрэнна, што рабочая сіла расстаўлена няправільна, нерацыянальна, нават не скарыстоўваецца паводле свае кваліфікацыі. Гэта-ж праўда, што ў падвышэньні кваліфікацыі зацікаўленасьці няма, бо няма стымулю, бо кваліфікацыя не скарыстоўваецца, бо тарыфы заработнае платы не даюць да гэтага цягі, бо ўраўнілаўка, бо разрады не пагоджаны са спэцыяльнасьцю. Гэта-ж праўда, што абязьлічка, што людзі ні завошта не нясуць адказнасьці, а ідзе ўсё так, самацёкам—на сумленнасьць. Гэта-ж праўда, што Фалкін ня змог кіраваць і новыя абставіны зьмялі яго, проста, стыхійна, нават да таго, пакуль ён змог разабрацца ў гэтых абставінах. Так вось Гомсельмаш ілюструе сабою ўсе гэтыя палажэньні, пачынаючы ад кіраўніцтва і канчаючы дробнымі дэталямі. От мэханічны скрозь ня можа акрыяць, як цэхвядун, як цэнтральная нэрва—ён кладзе свой адпячатак на ўвесь завод, бо ў ім больш як дзе перакрыжаваліся ўсе гэтыя нарасты старое сыстэмы. Цэх-вядун—ён мае нават меншыя разрады за іншыя цэхі, і, натуральна, ня можа ўмацавацца, ня можа згрупаваць сталых кадраў, кваліфікаваных работнікаў, ня можа весьці за сабою іншых цэхаў.

У цэхах на варштатах, на дэталях, сабраўшыся групамі, рабочыя абмяркоўваюць прамову Сталіна і пазнаюць у ёй свой завод. І таму, што і прычыны адставаньня заводу, і шляхі да ліквідацыі гэтага адставаньня сталі яснымі, рабочыя пачулі ў сабе новыя сьвежыя сілы. Завод рвануўся пад'ёмам масавае актыўнасьці, творчымі ідэямі, рабочымі прапановамі—сьвежым здаровым энтузыязмам.

Ён, Крупскі, нават ня мог гаварыць. Тады, калі ў цэхах абгаварвалі Сталінаву прамову, тут-жа, зразу даючы прапановы для яе

рэалізацыі—Крупскі ня мог гаварыць. Стоячы на сваім працэсе работы, Крупскі заўсёды сумленна выконваў гэту работу, ведаў яе. Але яму ніколі не даводзілася гаварыць перад такім вялікім зборышчам народу і ён баяўся, што ня так скажа, як хочацца, што расьсьмяюцца людзі ад нягегла зьвязаных слоў. Але пасьля работы, Крупскі да хаты ішоў зусім паволі. Ён нават забыўся, што ішоў ня тымі вуліцамі, а недзе заблытаўся ў вілаватых завулках, бо быў заняты напружанаю работаю мысьлі. Дома даўно чакала жонка, зьдзівіўшыся, што ён так позна вярнуўся з заводу, і прышоў не з таго канца вуліцы. Палуднаваў Крупскі моўчкі, і толькі ўжо выціраючы рукавом губы, запытаўся.

— Папера ў нас ёсьць?

— Якая папера?—перапытала незразумеўшы жонка.

— Ну, абыякая, каб пісаць,—растлумачыў Крупскі.—Сшытак які, ці што.

Жонка зірнула на яго і ўсё яшчэ нічога не магла зразумець.

— Паглядзі ў шуфлядцы, здаецца ляжыць.

Яшчэ ўсё выціраючы губы, Крупскі вышаў у бакоўку і, знайшоўшы ў камодзе паперу, сеў за столік пісаць. Лёг спаць Крупскі позна за поўнач. А назаўтра на завод сшытак з сабою.

— Вазьмі прагледзь. Мо' што і згодзіцца.

— Што гэта?—запытаўся майстра, бяручы сшытак.

— Вазьмі ды прагледзь. Мо' што і згодзіцца, кажу,—адказаў Крупскі і пайшоў на свой працэс.

Піліповіч разгарнуў сшытак. Напісаным Крупскі прынёс тое, чаго ўчора ня мог сказаць уголас. У сшытку аказалася васімнаццаць рацыяналізатарскіх прапаноў, ажыцьцяўленьне якіх прадугледжвала і ліквідацыю абязьлічкі, і ўпарадкаваньне патоку на зборцы сячкарань, і матар'яльную эканомію.

Завод рванўся пад'ёмам масавае актыўнасьці, творчымі ідэямі, рабочымі прапановамі—сьвежым здаровым энтузыязмам. І тады склікалі міжцэхавую вытворчую нараду, каб мерапрыемствы ажыцьцяўляць у поўнай узгоджанасьці цэху з цэхам, каб вытворчы паток выроўніваўся па ўсім заводзе. У лёгка-кацельным павіс Эдэльштэйнаў выклік на практычны прагляд норм і расцэнак кожнага ў сваёй рабоце. Па ўсім заводзе павінна прайсьці праверка норм і расцэнак. Павінна працаваць ТНБ. Эдэльштэйн налёг на сьвідроўку бакавін верхняга кажуха, давёўшы норму з 200 да 300 штук і зьнізіўшы на 20 процантаў расцэнкі. Гэты выклік павіс у цэсе. А праз тыдзень Эдэльштэйн зноў падаў Лысенку заяву, што ён зьніжае расцэнку яшчэ на 10 процантаў.

Эдэльштэйна нагнаў Яфімаў.

— Дай руку, сіваграк.

— Чаму сіваграк?

— А хіба ты ня бачыш, што ты сівы?

— А-а,—усьміхнуўся ў бараду Эдэльштэйн,—а навошта руку?

— Хачу, каб стары за маладым бег, а не наадварот.

— Ну?

— А вот і ну. Я зьбіраю з падручным кранштэйны. На дваіх у дзень наша норма—васімнаццаць штук. Як ты думаеш, колькі можна сабраць, стаўшы працаваць аднаму?

— Ва ўсякім выпадку нормы не паменшыць.

— Ага! От цяпер ты пабяжыш за мною... А я даю трыццаць шэсьць!—выскаліў шырокія зубы Яфімаў, як-бы падцьвельваючы старога ўдарніка. Эдэльштэйн перш змоўчаў, узяўшыся за бараду і нешта прыкідаючы ў галаве. Ён сам сабе рабіў ацэнку гэтага скачка. Адале, пакруціў галавою.

— Здорава. Малайчына...Н-але-е,—працягнуў ён ужо сам сабе, зноў задумляючыся і бяручыся за бараду.

і—з дня ў дзень пачалі паяўляцца трывогі-плякаты, сыгналізуючы там, дзе адставала работа перакпючкі. Парт'ячэйкі, цэхкамы арганізавалі рэйды. Заводакіраўніцтва ажывілася рухам. ішлі да Лысенкі, патрабуючы найхутчэйшае распрацоўкі і рэалізацыі рабочых прапаноў. Ішлі ў плянавы аддзел, у канструктарскае бюро, да інжынэраў, да тэхнікаў—хочацца параіцца, паслухаць, як тэхнічна зьдзейсьніць народжаную мысьль. І тады Генкін падмеціў, што ў Санаторскага пачала гарэць душа, адсьвечваючы ў сабе душу заводу...

Інжынэр Скаблоў зайшоў у сэктар капітальнага будаўніцтва.

— Калі мы адстанем—мы затармозім рост заводу. Трэба прысьпешыць загатоўку матар'ялаў.

— Для мэханічнага ўсё ўпіраецца толькі ў арматуру. Таварыш Шалаеў паедзе ў Менск, у трэст.

Так, рост заводу патрабуе, каб мэханічны стаў на сваё месца, у свой корпус. Трэба будаваць цэнтральную струмантальню. Трэба будаваць новы корпус для складаў, для чарнавых дэталяй... Інжынэры астаюцца, не прыкмячаючы, што іхная гаворка пераростае ў нараду, а калі разыходзяцца—горад пачынае запальваць агні.

Па дарозе інжынэр Ікс спрачаецца з прыяцелем. Яны разыходзяцца ў аналізе і ў пэрспэктыве пабудовы сацыялізму.

— Ты думаеш?

— Так. З прамысловасьцю мы справімся, але перабудова сельскае гаспадаркі і самога сялянства, гэта справа нават ня дзьвюх, ня трох пяцігодак. Не забывай, што гэты сацыяльны пласт складае большасьць, а ён яшчэ ня выскачыў з сераднявечча. Калгасы? Гэта падгонка сельскае гаспадаркі да прамысловасьці і яна будзе штучнаю да таго часу, пакуль гэтае сераднявечча ня пройдзе свайго натуральнага шляху разьвітку.

— Ты хочаш сказаць капіталістычнага? Ха-ха,—інжынэр Ікс настаўляе каўнер плашча.—Значыць рэвалюцыю адставіць? Няхай пачакае, пакуль пройдзе натуральны шлях разьвітку сярэднявечча? Здорава! Няўжо да гэтага часу ты не зразумеў, што гэтае сярэднявечча зьнішчана ўжо самім фактам рэвалюцыі? Ты разумееш сялянства, як спрэс ня толькі кансэрватыўную, а нават рэакцыйную сілу. Ты яго дыфэрэнцуй і ўбачыш, што яно само пахавала гэтае сераднявечча, даўшы вялізныя сацыяльныя зрухі, адкуль ніколі не вярнуцца назад. Новая якасьць ніколі не варочаецца назад, каб апрануцца ў сваю першабытнасьць. А факт індустрыялізацыі? Хіба не перакрочыў ён на сотні гадоў твайго сераднявечча, зьмяняючы ўсё аблічча шостага кавалку сьвету? Так,—інжынэр Ікс панізіў голас,—нявер'е заўсёды вядзе да рэстаўрацыі, асабліва тады, калі гэта нявер'е арганізоўваць. Але арганізованае нявер'е лопнула з прампартыяй і меншавікамі, даўшы мільёны новае веры, якасна куды мацнейшае.

Прыяцель памаўчаў. Ён загаварыў, дайшоўшы да другога кварталу, цішэй.

— Твая жонка і сёньня запытаецца ці зараз ты мецьмеш новую кватэру, і ты яе праканай сваею вераю.

— Што-ж, мая жонка табе радней, гэта ясна. Але я ёй адкажу так, як і заўсёды. Мы будам мець кватэру тады, калі пабудуем, калі ўкантактуем тых паўтысячы рабочых, якія або начуюць па цэхах, або штодня па трыццаць кілёмэтраў езьдзяць дахаты. Ім трэба кватэры не для таго, каб адлежвацца на канапах, а працаваць. Так.

Пасьля гэтага ішлі моўчкі. Прыяцель глыбей на лоб насунуў шапку. Глухая вуліца адплывала рэдкімі ліхтарамі, і там, дзе ліхтары блізка падалі сваім косым сьвятлом, відно было, як на прыяцелевых

шчаках—часта сьціскаючы сківіцы—вытыркалі бугаркі мускулаў.

Ужо разьвітваючыся, у засені ліп, усё-ж такі захацелася сказаць.

— Значыць—мы пачынаем разыходзіцца... Ты даўно ўжо зрабіў такі паварот?

Нічога не адказаўшы, інжынэр Ікс падняўся на ганак.

10. Брыгада спэцыялістаў

Той самы шырокі палітураваны Фалкінаў стол, на якім слаўся пыл. Прэспап'е, вялікая мармуровая чарніліца з фотакарткаю браку, заткнёнаю між вілачак. Той самы графін на воду—парожны, з пабітаю затычкаю. Відаць, што габінэт ужо даўно пуставаў—невялікім пластом на дне ў графіне пастаўся пылок.

Перад ім кніга—кнігі—па ліцейнай справе. Ён адрываецца ад кнігі і, прыжмурыўшы вока, глядзіць наўкос стала. Яму трэба добра абмазгаваць прачытанае. Трэба добра прыгадаць, супаставіць навуковыя абгрунтаваньні. Ліцейны ня мае лябараторыі. Цэх—шыхта—жыве Агранатаваю практыкаю, Агранатавым навыкам, але гэта—саматужнасьць. Цэх патрабуе навуковага абгрунтаваньня. Агранатава практыка патрабуе тэхнічных падмацаваньняў. Гэта дубальтуецца яшчэ тым, што ён сам—як інжынэр, як спэцыяліст па ліцейнай справе—узяў на сябе задачу ўдасканаленьня гэтага вучастку.

Ён адрываецца ад кнігі і, прыжмурыўшы вока, глядзіць наўкос стала... І трэба шыхту будаваць так, каб ня толькі дамагчыся дакладнае нормы гэтае шыхты, а каб скарыстаць і ўсе нутраныя рэсурсы. Ён узяў на сябе гэту задачу, бо пасьля твар заводу—калі ён стане на ганаровай лініі выкананьня свайго заданьня і якасьці прадукцыі—дасьць магчымасьць яму паказаць, што ён хоча акупіць сваю віну. І трэба ня толькі ўпарадкаваць шыхту, а ўпарадкаваць двор—завод—скарыстаць вялізныя залежы лому, браку—утылізаваць усе заводзкія магчымасьці. Лом. Забытая энэргія. Яна валяецца па дварэ,-аблягае ліцейны—ня толькі не скарыстоўваецца, а перашкаджае нармальнаму ўліку свае сілы. Трэба, каб завод меў выгляд закончанае сыстэмы. І па тым, як доўга ён глядзіць, прыжмурыўшы вока, недзе наўкос стала, відаць, што гэта працуе мысьль. Але неўзаметку вочы пакідаюць сваю кропку, зачыняюцца павекамі, і галава апускаецца на пастаўленую на локаць руку. Прападае шыхта, прападаюць кнігі і—забыўшыся, неўзаметку—мысьль пераключаецца на другую работу, на тую, калі чалавек пачынае думаць сам пра сябе...

Ніколі нельга дазнацца, што думае чалавек сам-на-сам. Чужое мысьлі—збоку, другому чалавеку—прасачыць нельга. А яму шмат пра што можна думаць. Яму нельга ня думаць, як нельга ня бачыць, або адмаўляць факту свае прысутнасьці вось тут на заводзе. І ў такой дзіўнай ролі. Брыгадзірам брыгады спэцыялістаў. Памагаць савецкаму заводу, савецкай рачаіснасьці, пасьля таго, як рыхтаваўся арганізованы ўзрыў і гэтага заводу, і гэтае савецкае рачаіснасьці—як памылкі гістарычных падзей. Можа дыялектыка таксама памылка? Але-ж яна—нават у самым факце ягонае работы, вось тут на гэтым заводзе, у той самай краіне, дзе вялося арганізованае шкодніцтва, каб гэтую краіну зрабіць пляцдармам інтэрвэнцыі. Але—тады была прампартыя, тады была сувязь з цэнтрам, з Рамзінымі, з замежжам, каб хітра, тонка сваёю шкодніцкаю работаю ўвіваць увесь Савецкі Саюз, каб яго аслабіць, нарадзіць недавер'е ў пабудову сацыялізму, у першую ў гісторыі пралетарскую дзяржаву,—каб зьнішчыць. І добра было быць дырэктарам трэсту, каб ніткамі гэтае шкодніцкае работы аплятаць прамысловасьць. Нават вось тут, на

Сельмашы, гэтыя ніткі відны, астаўшыся ў праектах пабудовы заводу. Яны зьменены, пераіначаны пралетарскаю пільнасьцю, і гэтым яшчэ больш даюць магчымасьць памятаць пра работу бывалешняга дырэктара трэсту і пра гэтую пралетарскую пільнасьць. І цяпер самому трэба памагаць на тых вучастках, дзе сьвядома рыхтаваўся зрыў. І гэта магчымасьць—гэты нечаканы від кары—дадзены тымі, з якімі вялася арганізованая, але скрытая бараць ба. Дадзена права жыць, працаваць тымі, каму рыхтавалася арганізованая, але скрытая сьмерць. Над гэтым нельга не задумацца. Пра гэта нельга ня думаць. Але думкі перарывае скрып дзьвярэй. Ён забыўся, што прасіў—бы зайсьці да сябе Дрыца.

— Я хачу пагаварыць з вамі пра мэханічны. Сядайце. Стан заводу мне вядомы. Мне вядома, што патрэбна вялізная работа на тое, каб дамагчыся нармальнага бесьперабойнага патоку ўсяго заводу. Чым распалагае мэханічны, каб справіцца з гэтаю задачаю, каб да чацьвёртае квадры ён ня толькі мог выконваць свой прамфінплян, а і ліквідаваць запазычанасьць, якую завод мае за мінулы час?

Дрыц пільна прыслухоўваецца да слоў. Яму хочацца загадзя зразумець, што хоча меркаваць з гэтага інжынэр Фіш. Памаўчаўшы, Дрыц прысядае.

— У мэханічным багата лішняе тузаніны, неўпарадкаваські. Мы цяпер б'емся над гэтым.

— Калі гэта ўпарадкаваць, дык ла сваёй сіле цэх зможа нармальна выконваць заданьні трэцяга кварталу?

— Зможа.

— ... з тым разьлікам, каб узяцца за ліквідацыю запазычанасьці і рыхтавацца да павялічэньня заданьня ў чацьвертай квадры, як пра гэта мяне пазнаёмілі вашы арганізацыі— прыжмурана гледзячы на Дрыца, даканчыў Фіш сваю думку.

Дрыц памаўчаў. Ён зноў як-бы прыглядўася да таго, па якой лініі ідзе Фішава думка. Пасьля ён, здаецца, угадаў гэтую лінію.

— Нам цяжкавата справіцца з тымі мерапрыемствамі, якія намі самімі—нашымі нарадамі—намечаны для ажыцьцяўленьня. Не хапае тэхнічных вылічэньняў, на аснове якіх мы маглі-б дакладна ўсё гэта ажыцьцяўляць. Нам не хапае грунтоўнага вывучэньня і ўліку свае сілы. Паводле грубых накідаў, пасьля таго, як будуць праведзены ў жыцьцё мерапрыемствы па рацыянальным ды максымальным скарыстаньні мэханізмаў—для намечанага павялічэньня заданьня, у нас ня хопіць толькі адзінаццацёх варштатагадзін. Можа, калі-б дакладна вывучыць, то і гэтыя адзінаццаць варштатагадзін у нас знашліся-б.

Інжынэр Фіш прыкусіў губу і яго вока зноў прыжмурылася, як-бы правяраючы нейкую мысьль. Адале галава рыўком павярнулася, гледзячы гэтым-жа прыжмураным вокам на Дрыца.

— А калі наша брыгада возьмецца вывучыць сілу вашага цэху, зробіць усе тэхнічныя разьлікі і абгрунтаваньні з тым, каб нам пасьля скарыстаць максымальна кожную прадукцыйную хвіліну мэханізмаў, даўшы ім поўную і рацыянальную нагрузку—цэх мецьме магчымасьць нармальна выконваць распрацаваныя вамі пляны?

— Гэта і ёсьць намечаныя намі мерапрыемствы. Тэхнічная-ж дапамога гэта тое, чаго нам не хапае. Даўшы яе цэху, цэх справіцца са сваім заданьнем.

Інжынэр Фіш апускае голаў і на ілбе зьбіраюцца складкі. Патрэбна толькі тэхнічная дапамога. Толькі? Ну, ладна. І ўжо голас ніжэйшы, прыцішаны:

— Я загадаў. Інжынэр Шульман робіць каньюнктурны агляд заводу. Ваш цэх патрабуе сур'ёзнае апэрацыі. Вывучыўшы, складом праект

самае першачарговае работы. Дзякаваць за дапамогу.

Кароткімі дробнымі крокамі, ідучы неяк бокам, інжынэр Фіш ідзе шукаць Шульмана, каб даведацца, ці зараз будзе гатоў агляд. Дрыц спускаецца ўніз, і ўжо на дварэ, ад сонца прыплюшчвае вочы. „Новая, моцная сіла на заводзе—гэта добра,—думае Дрыц ідучы,—але таму, што яна моцная, за ею моцна трэба і глядзець". І ўсё яшчэ ідучы проці сонца, Дрыц жмурыцца і—прыгадваючы—нанава правярае ўсю гаворку.

— Бачыў?

— Дзе?

— Ды унь-жа прайшлі.

— Чорт, не заўважыў.

— Прыкацілі...

— Што-ж, няхай папрацуюць. Можа і папраўдзе памогуць.

— Глядзі, каб ня так, як памаглі да гэтага.

— А, не-е. Гэта для іх цяпер нявыгадна. Па-мойму яны цяпер возьмуцца так, як ніколі. Гэта-ж іхны ордэр на жыцьцё. Глядзі, як на Іжорскім каля блюмінга стараліся Ім цяпер трэба сябе апраўдаць. І от хай заваююць сабе гэтае права. Хай пастараюцца...

— Але-е.

— А ўсё-ж брат, хто яго ведае, куды воўк глядзіць.

— Ну, а мы-ж хіба не глядзімо? Дагледзелі-ж!

— Пэўна.

— Ну, от. То ніхто-ж табе ня кажа, каб ты ўжо і язык на зубы палажыў. Уся, брат, і задача, каб умець скарыстаць такі фокус.

— Дзіўна...

— Тота-ж. Ня толькі табе, а на ўвесь сьвет дзіва.

І праўда, дзіўна было. Гэта-ж от прыехалі людзі—ворагі—працаваць, памагаць на заводзе. І калі гэта дзе рабілася так? Каб вораг добраахвотна служыў табе? Гэта значыць, што ён сам пачуў сваё бясьсільле. Як кажуць—лёг на лапаткі. І гэта ўспрымаецца неяк нязвычна. Вось іх ужо бачылі па цэхах—знаёміліся з работаю. Бачылі, як папарадзе—кароткімі шажкамі, крыху неяк бокам, мелькам кідаючы вочы на бакі—ішоў інжынэр Фіш. Некаторыя яго пазнавалі—ведалі: калі быў дырэктарам трэсту, прыяжджаў на завод. Пазнавалі і шукалі зьмены. Крыху паблажэў. Нялёгка відаць далося крушэньне. Нават каўнерыка не пачапіў, голымі мускуламі вытыркае шыя—неўзаметку для сябе апрасьціўся. А крок, усё-ж той самы, энэргічны. Знаёміцца з заводам, з працэсамі работы. Крыху ззаду невялікая кашчавая фігура ў сіняй кашулі, у сандалях з уваранымі ў шкарпэткі порткамі. Выглядае зусім молада, і маладзіць яго гэтае на спортыўны манэр убраньне. Нехта называе прозьвішча—Шульман. Інжынэр Шульман, былы эканаміст ВСНГБ. Інжынэр Сульскі—друзлы, з абвіслым целам, з павешаным на паясох па белай талстоўцы жыватом. Лысы. У фігуры, у набутлым твары—інэртнасьць, цяжкаватасьць, непатрэбная старасьць. Зноў дзіўна: такі непаваротлівы, санлівы чалавек, якому трэба спакойна берагчы сваю друзласьць, і—шкоднік. Бываюць сьмешнымі іншы раз сур'ёзныя рэчы...

— Трое?

— Не, ня ўсе. Яшчэ парачка, кажуць, ёсьць недзе. Можа ў пляновым ці дзе там асталіся—па спэцыяльнасьці.

Пасьля часта бачылі новых інжынэраў у цэхах. І па тым, як Фіш,—як інжынэры—пільна прыслухоўваліся да заводзкага пульсу, відно было але!—ім хочацца як мага хутчэй заваяваць свой ордэр на жыцьцё савецкага грамадзяніна. Генкін рабіў з імі нараду. Генкін сказаў чаго—якое работы, на якіх вучастках—чакае ад іх завод. Інжынэр Фіш разьмеркаваў брыгаду. Галоўнае—дакладнасьць работы. Шульман засеў недзе на другім паверсе,

каб з паперак, з раскіданых формуляў, несыстэматызованых лічбаў, —зрабіць кан'юнктурны агляд заводу. Трэба, каб завод вывучыць, намаляваць перш тэарытычна—лічбамі вымацаць сілу заводу, каб лічбамі, формулямі, праектамі, плянамі бачыць адсталыя вучасткі і, каб пасьля гэтымі-ж плянамі—гэтым-жа формулям, гэтым-жа лічбам —падаваць каманду. Інжынэр Шульман засеў недзе ў габінэце на другім паверсе. Тры дні папярэдняе работы з лічбамі, з вылічэньнямі. Іншыя інжынэры з брыгады—па цэхах, па аддзелах. Трэба работаю заваяваць права на ордэр савецкага грамадзяніна. Інжынэра Фіша ў цэхах бачылі часта. І бачылі—інжынэр Фіш гэтым пачынаў жыць, бо ў гэтым была сіла акупіць віну. Хто дазнаецца, што думае чалавек сам-на-сам? Але работу чалавечую бачыць можна. І бачылі—як спэцыяліст, як інжынэр Фіш узяў на сябе наладзіць ліцейны самому. Лябараторыі няма. Трэба нанава гладаць тэхнічныя кнігі. Фіш адрываецца ад кнігі, каб думаць. І—ліцейнаму патрэбна рэарганізацыя плошчы. Трэба плян. Лініямі, квадратамі, фарбамі трэба пабудаваць ліцейны на паперы. Вылічыць плошчу, вылічыць норму і сілу прадукцыі. Так, каб ліцейны ня мог тармазіць заводу ў росьце. І трэба нанава, лічбамі, вымацаць увесь завод. Інжынэр Шульман сыстэматызуе лічбы, каб пасьля гэтым лічбам даваць каманду. Праз людзей—лічбам. Бо інжынэры бачылі: яны прыехалі на завод і зразу заўважылі, што завод жыве воляю чалавечае заўзятасьці. Тэю, якая была прычынаю іхнае палітычнае сьмерці. Завод жыў, бушаваў чалавечым энтузыязмам. Гэты энтузыязм патрабуе тэхнічнае дапамогі, дакладнасьці—сыстэматызованых формуляў—каб хутчэй ператварацца ў творчасьць. Завод жыве воляю чалавечае заўзятасьці і гэтым людзям патрэбна тэхнічная яснасьць, каб ёю падаваць каманду.

Інжынэр Фіш пакідае кнігі, бо надыходзіць чацьвертая гадзіна, і зараз пачнуць пускаць вагранку. Ён пакідае габінэт, вылічэньні, пляны і—кароткімі крокамі, крыху неяк бокам—абгінае ліцейны. Абсечнае жыве жыцьцём абсечкі, ветрагонаў, тачылаў, грукатам, шумам —маўкліваю чалавечаю камандаю. З долу, па дарозе інжынэр Фіш падымае гатовую абчышчаную дэталь і шукае шаблёну, каб праверыць дакладнасьць. Шаблёну пад рукамі няма, ён пытаецца нечага ў рабочага і пальцамі пабівае па дэталі.

— Што? Не хапае на абточку? Малавата прыпуску?

Але адказу ён здаецца ня слухае, бегае вачыма па абсечным і, зноўжа, думаючы пра нешта сваё, гаворыць:

— Так, так. Мы паглядзімо. Паглядзімо,—і, кінуўшы дэталь, ідучы крыху бокам, зьнікае.

Вагранка рыхтуецца да пуску. Складаецца шыхта. Агранат сам камандуе работаю. Электрычнымі пад'ёмнікамі ўгору падымаюцца мэталі. Да цэху, да пад'ёмніка, мэталі падвозяцца тачкамі. Чорны, з шэрым адлівам грузіцца кокс. Пахне жужлою, жалезам, мэталёвымі сплавамі.

Дробнаю хадою, хрустаючы па грудах закамянелае жужлы, паказваецца Фіш. Стаўшы на бугарку ўтоптаных адкідаў, ён водзячы галавою, глядзіць на работу. Адным краем губы сьціснуты шчыльна, і ад гэтага здаецца, што інжынэр Фіш і работаю і сабою здаволены.

— Вынікі ня дрэнныя?—прыжмурыўшы вока і гледзячы на Аграната, пытаецца інжынэр Фіш.

Агранат стаіць унізе каля пад'ёмніка. Каб глядзець на Фіша—яму трэба падымаць галаву. Але ў вочы падае сонца і, прыплюшчваючы іх, Агранат на лоб насоўвае шапку так, што вочы хаваюцца.

—Нічога. Блізка да нормы. Толькі буйныя дэталі крыху зноў цьвердаватыя.

— Ну вот—і падсыпайце больш лому. Каб нам прыбраць увесь двор. Усё скарыстаць.

— Трэба, інжынэр Фіш, праверыць зразу на дробных дэталях. Я апасаюся, каб ня даць мяккага чыгуна.

— Я зраблю,—інжынэр Фіш сыходзіць з бугарка.—Я праверу... Нават гэта трэба скарыстаць. Вы загадайце, таварыш Агранат. Зрабеце сіты, пастаўце людзей, і—рыдлёўкамі на сіта—прасеяць. Кучы адкідаў! Бачыце колькі ў іх мэталю? Жужла адсеецца, а ўвесь мэталь у вагранку. Мы з вамі павінны прыбраць двор, як ляльку. Што?— як-бы пытаецца ён, востра гледзячы на Аграната, і ўсьміхаючыся адным краем губ, паказвае пачарнелую дзірку ад паламанага зуба.

— Ці тое мы з нашаю сілаю зробім, інжынэр Фіш. Угга!

Раптам зірнуўшы ў ногі, як-бы гледзячы, каб не сашчаўкнуцца па грудах жужлы, Фіш порстка хаваецца ў цэсе. Агранат крыху доўга глядзіць яму ўсьлед,—чаму так раптоўна,—пасьля на патыліцу адкідае шапку і памагае рабочым перакуліць у чан вагранку.

Інжынэр Шульман кончыў работу лічбаў. На паперы, матэматычнымі суадносінамі нарысаваўся завод. Вылічана сіла, прадукцыйная здольнасьць кожнага мэханізму, варштату, працэсу. Тут, з паперы, можна мяняць суадносіны прапорцыі—камбінаваць так, каб выходзіў найбольшы эфэкт. Фіш інжынэрам аддаў чарнавікі плянаў. Пляны трэба нарысаваць тэрмінова. На плянах павінен стаць завод праекцыяй: цэхамі, варштатамі, матэматычна-дакладнымі вылічэньнямі прадукцыі, часу, затраты энэргіі на кожны мэханізм так, каб быў скарыстаны кожны рух, кожны мэтр, кожная варштата-хвіліна. Гэтымі вылічэньнямі трэба зрабіць ператасоўку і прымацаваньне дэталяй так, як была ўхваліла вытворчая нарада. Падсумаваць і тэхнічна праверыць і абгрунтаваць мерапрыемствы заўзятае волі заводу.

Генкін сустракае Ёфіна. З тэкаю Ёфін варочаецца з цэху—яму трэба было праверыць там новую модэль.

— Як твой плянавы?

— Працуем.

— Знаёміліся з работаю брыгады?

— Але, глядзелі.

— Ну?

— Я добра не знаёміўся, ня ведаю.

— А інжынэры праглядалі?

— Ня ведаю.

— Дык хто-ж ведае?

— Па мойму яны яшчэ не закончаны.

— Яны закончаны. Нават прызначана ўжо нарада для абгаварэньня. Вы нават ня ведаеце, што робіцца апрача вас па вашай-жа лініі?

Ёфін варочае тэку і відаць, што яму нечага ня хочацца гаварыць.

— Наогул, вы цікавіцеся іхнаю работаю? Вы ведаеце, што яны робяць? Пагаджаеце, каб ня было дубальтаваньня, паралелі?

Ёфін гаворыць пра тое, што ў іх—у інжынэраў—узьнікла нейкае спрэчнае пытаньне, нейкі вопыт, першая спроба, але і да гэтага часу яно ня вырашана. Трэба даведацца можа ў трэсьце, можа трэба зрабіць спэцыяльны запрос і гэта пакуль што тармозіць работу.

— З брыгадаю талкаваліся? Раіліся?—пытаецца Генкін.

— Не,—і Ёфін зноў варочае тэку. Гэта тое, пра што зразу дагадаўся быў Ёфін і пра што не хацеў сказаць. Блёк невялікае часткі спэцыялістаў. Генкін зразу заўважыў-быў адсутнасьць кантакту і даўно зьбіраўся пра гэта пагаварыць. Дурная інтэлігенцкая замкнёнасьць. Цяжка зламаць гонар, каб інжы-

нэру пайсьці з парадаю да інжынэра, ды яшчэ да бывалешняга шкодніка.

— Дрэнь справа. У нашай задачы—як мага лепш скарыстаць кожнага спэцыяліста, крытычна ставіцца, але не ігнараваць... Перадай, і сам не забудзься—я прашу пасьля работы зайсьці да мяне ў партколектыў.

Ёфін тэку бярэ пад паху і выпярэджвае Генкіна. Суняўшыся і крыху падумаўшы, Генкін зашпільвае на каўняры ў кашулі гузік і ідзе да інжынэра Скаблова, каб даведацца, як ставяцца да брыгады іншыя інжынэры заводу.

Брыгада закончыла работу па падрыхтоўцы праекцыі. На інжынэрна-тэхнічную нараду сабралася поўна народу. Ня ідучы да хаты, пасьля работы, пааставаліся рабочыя. Трэба паслухаць, як сыстэматызаваны мерапрыемствы. Трэба паглядзець, як у праекцыях выглядае завод. Дзіўна: людзі—ворагі—будуць памагаць ім шукаць шляхоў да папраўкі. І трэба паслухаць як будзе пабудаваны гэты шлях. Можа так, па свойму, як некалі? Не, так мабыць не захочуць—бяз толку. А ўсё-ж прыслухацца трэба.

На нараду сабралася поўна народу. Няроўнымі шарамі віхаюцца казыркі, шапкі, на якіх ня зьдзьмуўся яшчэ цэхавы пыл. У кутку, плячом да сьцяны — сіняблюзнаю кашуляю прыпёрся інжынэр Фельдман. З боку, ля модэлі сячкарні—Санаторскі. Нізка, хаваючыся пад шапкаю, каля яго—Агранат. Два сакратары парт'ячэек мэханічнага і ліцейнага—Кесьлер і Белазерскі—яшчэ ня кончылі пра нешта гаворкі. Рабочыя абступілі іх гуртам. Дрыц, нагінаючыся—праз галовы—сьмяючыся, нешта гаворыць Генкіну. Наперадзе, каля сьцяны—з тоўстымі скруткамі ў руках—інжынэр Фіш. Інжынэр Шульман паставіў ногі на дужку суседняга крэсла, і, ад таго, што ўсьпёрся локцямі на калені, здаецца яшчэ больш маленькім. Побач два—лысыя з уціснутымі ў карак галовамі. Пятага відзен толькі край рукава—ён, здаецца, усёўся так, каб знарок заслаціцца другімі. Некаторыя яшчэ ня бачылі—упяршыню вывучаюць брыгаду. Наўкола гамонка, але старшыня адчыняе нараду і Фіш папраўляе ў руках тоўстыя скруткі.

Іх, гэтых першачарговых мерапрыемстваў толькі два. Брыгадзе было дадзена над імі працаваць. Вось інжынэр Фіш ужо пра іх дакладвае.

— Работа праведзена па ліцейным і мэханічным цэсе. Задача была ў тым, каб іх упарадкаваць, каб даць нармальную прапускную здольнасьць. Зроблена спроба дамагчыся тымі-ж самымі сіламі, якія мае завод на сёньня, выкананьня прамфінпляну трэцяе квадры з тым, каб рыхтавацца да павялічэньня заданьняў чацьвертай квадры і лачаць ліквідаваць запазычанасьць. Для гэтага па ліцейным у першую чаргу зроблена пляновае разьмеркаваньне і скарыстаньне плошчы, разьлічанае на забесьпячэньне патрэбнае нормы.

Скрутак разгарнуўся і павіс на дошцы. Фарбамі—квадратамі, кружкамі—вылічанаю плошчаю, апокамі, праходамі, ліцейны стаў на пляне. Інжынэр Фіш расказвае лічбамі. Дэталі пасартованы па залях так, каб імі больш выгадна скарысталася плошча. Каб плошча была скарыстана ўся, пры той-жа меры, даўшы прырост апокаў. Шыхта наладжваецца. Вагранкі хопіць, каб даць патрэбную колькасьць тонаў ліцьця. Інжынэр Фіш гаворыць лічбамі. І плян—з фарбаў, з кружкоў, з квадрацікаў—робіцца рэальнасьцю. Тэхнічная яснасьць. Гэта тое, чаго нехапала заводу.

— Па мэханічным. Я гаварыў папярэдне з майстрамі, з рабочымі, з начальнікам цэху—з Дрыцам Мэханічны ня ведаў свае сілы. Шмат якія варштаты ня мелі паш-

партоў, або мелі — няправільныя. Нельга было дакладна скарыстоўваць прадукцыйнасьці мэханізмаў. Была нерацыянальная загрузка. Вывучыўшы, брыгада зрабіла так.—

Зноў шарганўў скрутак і павіс на дошцы недараскручаным краем. На сіняй паперы—лініямі, контурамі, квадратамі—мэханічны стаў на пляне. Інжынэр Фіш расказвае сыстэмаю. Паток дэталяй па мэханізмах. Нумары дэталяй строга прымацаваны да сваіх варштатаў. Варштаты на паперы стаяць у цэхавым пляне. Дэталі ператасованы так, каб кожнаму варштату мець сваю нармальную нагрузку. Маленькія лічбы з краю паказваюць затрату энэргіі на дэталь. Поруч, на водшыбе—у хвілінах, у гадзінах—затрату часу. Заключная лічба каля кожнага варштату—норма за зьмену. Прадугледжана павялічэньне ў чацьвертай квадры. Мэханічнага хопіць, каб даць патрэбную колькасьць дэталяй. Адзінаццаць варштатагадзін, якіх не хапала, выгаданы за лік ушчыльненьня нагрузкі. Частка нагрузкі пераносіцца на калаўскі варштат, які на днях пачынае работу. Інжынэр Фіш гаворыць сыстэмаю. І плян—з лініі, з контураў, з квадратаў—робіцца рэальнасьцю.

— Брыгада працавала разам з некаторымі заводзкімі інжынэрамі, якія, ўдзяляючы ўвагу на гэта, адрываліся ад свае непасрэднае работы. Брыгада дзякуе за дапамогу. Імі зроблена багата папраўак і каштоўных дадаткаў. Нанава праверaны некаторыя меркаваньні. Мерапрыемствы на ажыцьцяўленьне патрабуюць шэсьць дзён з тым, каб з першага чысла пачаць нармальна выконваць заданьне.

Інжынэр Фіш садзіцца. Крыху памаўчаўшы, нарада пачынае абгаварэньне. Прапушчана мэханізацыя. Ня ўлічаны цэлы шэраг дробязяй, якія ў агульнай сыстэме мерапрыемстваў даюць непрадбачаныя плюсы. Рабочыя гавораць практыкаю. У кемкасьці, у волі, у творчым запале, у пільнасьці—пляны ператвараюцца ў рэальнасьць.

... Тэхнічная яснасьць. Правільнае скарыстаньне сілы.

— Гэта тое, чаго ў тэхніцы не хапала заводу.

(*Канец будзе*)

КРЫТЫКА

Ал. Салагуб

Клясавая барацьба ў літаратуры Заходняй Беларусі

(*Даклад, прачытаны 26/XI-31 г. у Інстытуце Л і М Комакадэміі*)

Фашысцкая Польчша зьяўляецца адным з найбольш слабых зьвеньняў у ланцугу капіталістычных дзяржаў, ахопленых эканомічным крызісам, які перарастае ў эканомічную катастрофу. Гэты крызіс у Польшчы мае вельмі напружаны характар, дзякуючы раду прычын, уласьцівых разьвіццю польскай эканомікі і польскай буржуазнай дзяржаўнасьці. Мы там маем надзвычайную вузкасьць унутранога рынку, дзякуючы паўпэрызацыі і зруйнаванасьці малазямельнага сялянства ў цэнтральнай Польшчы, а таксама і на землях Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Дзякуючы невялікай конкурэнтаздольнасьці польскай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі на міжнародным рынку, адсутнасьць усходняга гіганцкага рынку, як СССР, куды-б Польшча магла кідаць свае тавары, паглыбляе крызіс, ствараемы клясавымі супярэчнасьцямі капіталістычнай сыстэмы, асабліва пэрыоду загніваньня імпэрыялізму. Пры тым ня трэба забывацца, што вынікі імпэрыялістычнай вайны, а таксама вайны антысавецкай у 1920 годзе моцна адбіліся на разьвіцьці эканомікі Польшчы. Надзвычай разбухшы ваенны бюджэт, бюджэт вайны супроць СССР і ў першую чаргу супроць форпостаў яго—БССР і УССР—паглыбляюць гэты крызіс.

Калі гаварыць аб эканомічным становішчы так званых „крэсаў усходніх" (Заходняя Беларусь), то тут мы маем больш жудасны малюнак вынікаў эканомічнага крызісу.

Колёніяльная палітыка польскага фашызму, польскіх акупантаў прывяла Заходнюю Беларусь да руйнаваньня, да канчатковага заняпаду. Працоўныя масы гораду і вёскі прыведзены ў стан паступовай сьмерці.

„Мы зараз ужо стаім не перад зданьню голаду, а жывем у стане фактычнага голаду",—так характарызуе становішча Польшчы буржуазны публіцысты. Гэтая характарыстыка найбольш падыходзіць да Заходняй Беларусі.

Аб памерах і ступені крызісу ў Заходняй Беларусі красамоўна сьведчаць лічбы ліквідаваных і зачыненых збанкрутаваўшых прадпрыемстваў і фабрык. За першае паўгодзьдзе 1931 г. зьліквідавана 7 хэмічных прадпрыемстваў, 19 мэталёвых, 14 адзежных, 14 скураных, 2 папяровых, 4 дрэваапрацоўчых, 2 паліграфічных, 65 сталярных, 44 сьлясарных, 17 кавальскіх, 78 шавецкіх, 29 кравецкіх, 85 лесапільных заводаў было зьліквідавана толькі па Віленскім і Новагрудзкім ваяводзтвах.

А тыя прадпрыемствы, якія яшчэ не зачынены, працуюць два-тры дні ў тыдзень. Толькі ваенная прамысловасьць ня ведае крызісу. Яе прадпрыемствы працуюць з поўнай нагрузкай. Урад Пілсудзкага больш паловы свайго бюджэту аддае на патрэбы вайны.

Рабочыя бязьлітасна эксплёатуюцца. Павялічэньне інтэнсыўнасьці працы, павялічэньне працоўнага дня да 10-12 гадзін, скарачэньне заробку, сотні тысяч беспрацоўных— вось тыя ўмовы, у якіх знаходзіцца рабочая кляса Заходняй Беларусі.

У вёсцы ня лепш. Вёска Заходняй Беларусі знаходзіцца ў надзвычай цяжкіх умовах, дзякуючы моцнаму падатковаму прэсу і кулацкай комасацыі (за 10 год пад камасацыю адышло 77241 сялянская гаспадарка), што зусім руйнуе беднату і серадняцтва. Ліквідацыя сэрвітутаў (за апошнія 10 год на Заходняй Беларусі ліквідавана сэрвітутаў у 46460 сялянскіх гаспадарак).

Пры комасацыі лепшыя вучасткі аддаюцца кулацтву, а горшыя і якія далёка ляжаць ад сяліб—беднаце, серадняцтву.

Закон аб „непадзельнасьці грунту", які ўведзены ў гэтым годзе— гэта закон, які не дазваляе раздрабляць схутарызаваныя гаспадаркі. Усё гэта робіцца з мэтаю ўмацаваньня позыцый кулацтва, для ўмацаваньня ўнутранага рынку.

Польскі фашызм надае хутарызацыі вялікае значэньне. Вось выказваньні вядомага пацыфікатара Заходняй Украіны, начальніка ўсходняга аддзелу міністэрства замежных спраў пана Галуўко (нядаўна забітага ўкраінскімі тэрарыстамі).

„Зьяўляецца пажаданым на крэсах комасацыя. Трэба лічыцца з тым, што за гранічнымі слупамі (у СССР—А. С.) разыгрываецца вялікі экспэрымэнт колектывізацыі, які хоча стварыць новы псыхолёгічны і гаспадарчы тып. Мы гэтаму тыпу павінны процістaвіць тып самастойнага гаспадара, які сядзіць на ўласным кавалку зямлі. Няхай лепш зьніжацца тэмпы зямельнай рэформы ў цэнтральнай Польшчы, каб толькі павысіць гэтыя тэмпы на крэсах" (курсыў наш—А. С.).

Тут мы маем выразную політыку падрыхтоўкі соцыяльнай базы для нападу на СССР. Тут праводзіцца політыка супроцьстаўленьня буржуазна-кулацкага зямляўпарадкаваньня соцыялістычнай бальшавіцкай колектывізацыі. Умацаваньне эканомічна моцнага кулака—вось задача, якую ставіць польскі фашызм для таго, каб умацаваць свае позыцыі для нападу на Савецкую Беларусь і Савецкую Украіну. На грунце комасацыі вядзецца жорсткая кляса вая барацьба. Асноўная маса сялянства пад кіраўніцтвам пролетарыяту і КПЗБ вядуць рашучую барацьбу супроць наступу фашызму ў вёсцы.

Беларускія нацыянал-фашысты ва унісон пану Галуўку адносна комасацыі гавораць наступнае;

„Урад павінен акружыць наш край большай апекай і даць матэрыяльную дапамогу ня толькі зямляўласьнікам, але і сялянству (чытай: кулацтву—А. С.). Урад павінен прысьпяшыць тэмпы комасацыі і зямельнае рэформы на нашых землях". Як мы бачым, паны Луцкевічы і Астроўскія ў гэтым пытаньні ня маюць ніякіх разыходжаньняў з польскім фашызмам. Беларускія нацыянал-фашысты ідуць нага ў нагу з польскім фашызмам у задушэньні нацыянальна-вызваленчага руху, у барацьбе з компартыяй. Яны разам накідваюць пятлю на шыю окупаванай Заходняй Беларусі. „На працягу ўсяго аднаўленчага пэрыоду і ў першы пэрыод НЭП'у, калі буржуазія разьлічвала на буржуазнае пераражэньне Савецкага саюзу, нацдэмы і сучасныя нацфашысты прыкідваліся „спачуваючымі" савецкаму будаўніцтву і рэволюцыйнаму нацыянальна-вызваленчаму руху. Але калі пролетарыят пад

кіраўніцтвам комуністычнай партыі, абапіраючыся на бедняка ў саюзе з серадняком, перайшоў да рэканструкцыі ўсёй гаспадаркі на соцыялістычных пачатках і ліквідацыі кулацтва як клясы, калі гэтае самаахвярнае наступленьне адразу паказала, што ў Савецкім саюзе соцыялізм будуецца пераможна,— тады ад злосьці і роспачы завыла ўся буржуазія і разам з ёю ўчарашнія „саюзьнікі“ і „хваліцелі“ саветаў, якія прымазаліся да нацыянальна-вызваленчага руху“—вось як ахарактарызаваў гэты паварот у поглядах беларускіх нацыянал-фашыстаў тав. Тарашкевіч у сваёй брошуры. „Заходняя Берарусь— пляцдарм імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі“.

Зараз мяняецца тон выказваньняў адносна будаўніцтва ў СССР. Зьмяняюцца адносіны да ўсіх мерапрыемстваў гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў БССР. Беларускія нацфашысты загаварылі ўласьцівай фашызму мовай, загаварылі аб інтэрвэнцыі супроць БССР.

Калі раней беларускія нацыянал-фашысты падрабляліся пад рэволюцыйныя лёзунгі Грамады (хоць яны і зараз не адмовіліся ад левай фразэолёгіі для адурманьваньня мас), то зараз яны разам з генэраламі Жэлігоўскімі і агентамі дэфэнзывы панамі Кіртыклісамі засядаюць за „чорнай кавай“, пасылаюць прадстаўнікоў на пахаваньне душыцеля рабоча-сялянскіх мас Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі пана Галуўко, разам з польскім імпэрыялізмам падрыхтоўваюць глебу для нападу на СССР. Беларускі нацыянал-фашызм зрастаецца з польскім фашызмам. Яскравым доказам такога зрастаньня служыць і брошура Ф. Акіньчыца „Чаму гэта так сталася?“, дзе гэты рэнэгат Грамады паказаў сваё сапраўднае фашысцкае аблічча. Акіньчыц адкрыта піша аб тым, на каго орыентуюцца беларускія нацыянал-фашысты:

„Трэба раз на заўсёды адкінуць нам розныя „орыентацыі“, якія прынесьлі нам так шмат ліхога, і згадзіцца з тым, што самым рацыянальным і карысным для нас зьяўляецца орыентацыя на нашы ўласныя сілы і супрацоўніцтва з тым польскім грамадзянствам (чытай: з польскім фашызмам—А. С.), якое дапаможа нам ажыцьцявіць нашы нацыянальныя і політычныя заданьні... Дзеля ўсяго гэтага, імкнучыся да сваёй канчальнай мэты—нацыянальнага і культурнага адраджэньня аб'яднанай нашай бацькаўшчыны,—у сваім політычным паступаньні мы павінны адкінуць усялякія надзеі на комуністычны ўсход“.

Сказана ясна. Орыентацыя на фашысцкую Польшчу, на буржуазную культуру Захаду, супроць БССР і СССР.

Што-ж гэта за „нацыянальныя і політычныя заданьні“, якія здолеюць ажыцьцявіць беларускія нац.-фашысты ва ўмовах фашысцкай Польшчы?

Гэта—заданьні польскага фашызму, гэта заданьні беларускага кулака і буржуазіі, гэта ўстанаўленьне дыктатуры буржуазіі ў БССР, гэта рэстаўрацыя капіталізму на землях, дзе вялікі Кастрычнік зьмёў капіталістычную эксплёатацыю, дзе зараз пасьпяхова будуецца соцыялізм. Калі раней беларускія нацыянал-фашысты пагаварвалі аб культурна-нацыянальнай аўтономіі, то зараз і аб гэтай нікчэмнай буржуазна-кулацкай програме не гаворыцца.

Група беларускіх хадэкаў і сельсаюз, праваслаўнае аб'яднаньне сэнатара Багдановіча—гэта тая-ж самая група беларускага нацыянал-фашызму, якая разыходзіцца з групай Луцкевіча-Астроўскага толькі ў мэтодах барацьбы з рэволюцыйным нацыянальна-вызваленчым рухам у Польшчы. Але мэты іх адны і тыя-ж.

Усе гэтыя нац.-фашысцкія групоўкі сходзяцца на адным—гэта на зьвя-

рынай клясавай нянавісьці да СССР, да соцыялістычнага будаўніцтва, да нашай колектывізацыі і індустрыялізацыі.

І тое, што падрыхтоўваецца ў канцылярыях генэральнага штабу, у Бэльвэдэры, тое выбалтваецца беларускімі нацыянал-фашыстамі без усялякіх крыўляньняў і маскаваньня:

„Я ня веру ў перараджэньне комуністычнай партыі ў бок „дэмократызму". Яна, па-мойму перакананьню, павінна загінуць цалкам, ачысьціўшы дарогу да ўтварэньня новых, здаровых, соцыяльна-політычных форм у былой Расіі". Так выслаўляецца ў вышэй памянёнай брошуры Ф. Акінчыц, выкладаючы програму падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР. Комэнтарыі тут лішнія. Мы вадаем, што разумеюць беларускія нацыянал-фашысты пад „здаровымі" соцыяльна-політычнымі формамі ў колішняй Расіі— гэта ня больш ня менш як рэстаўрацыя капіталізму ў БССР і СССР— гэта суцэльны пагром дасягненьняў пролетарыяту СССР, гэта мора крыві рабочых і сялян.

„Я пераканаўся, што беларускае пытаньне можа быць вырашана толькі тады, калі згіне тая галоўная перашкода, якая стаіць на шляху да яго вырашэньня—гэта факт існаваньня комуністычнай дыктатуры ў Савецкай Беларусі. Калі гэта дыктатура будзе павалена,— толькі тады адчыняцца магчымасьці для ажыцьцяўленьня нашых політычных і нацыянальных, ідэалаў, толькі тады беларускі народ зможа ўзяцца за аднаўленьне сваёй бацькаўшчыны—да гэтага паваротнага ў гісторыі моманту трэба шыкавацца шляхам пабудовы і ўмацненьня слабенькай пакуль што беларускай грамадзкасьці". Вось адчыненыя выказваньні беларускіх нацыянал-фашыстаў аб інтэрвэнцыі, якая падрыхтоўваецца супроць нашай вялікай краіны—Саюзу савецкіх соцыялістычных рэспублік.

У сваіх антысавецкіх завываньнях беларускі нацыянал-фашызм пабіў рэкорд нават афіцыёзных органаў польскага фашызму і дэфэнзывы. Іх рэптыліі, як „Наперад", „Беларускі звон", „Беларуская крыніца", перапоўнены самай нахабнай хлусьнёй пра наша соцыялістычнае будаўніцтва, пра нашу нацыянальную політыку. Яны стараюцца ўсімі сіламі, усімі сродкамі ачарніць нашу гэроічную пяцігодку, колектывізацыю. Колектывізацыю яны стараюцца прадставіць у выглядзе новай „паншчыны", дзе стаяць прыганятыя комісары з нагайкамі і ганяюць „бедных" колгасьнікаў на прыгон.

Усю сваю аблудную продажную політыку, накіраваную супроць БССР, беларускія нацыянал-фашысты тлумачуць тым, што нібы „ў БССР" маскоўскія бальшавікі „ўціскаюць „беларускіх бальшавікоў", беларускую культуру, беларускую мову. Гэта наглейшая хлусьня на ленінскую нацыянальную політыку, якая праводзіцца ў Савецкім саюзе, на падставе якой да канца вырашана нацыянальнае пытаньне, на падставе якой усе раней прыгнятаемыя прыцарызьме нацыі атрымалі самыя шырачэзныя магчымасьці ўтварэньня культуры нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зьместу. Больш таго, высілкамі ўсяго пролетарыяту Савецкага саюзу творыцца культура ўсяго сусьветнага пролетарыяту. Саюзны ўрад як мага дапамагае слабейшым нацыям у тварэньні нацыянальнай культуры, якая пры капіталізьме прыгняталася, прасьледвалася.

Разгром контррэволюцыйнага нацыянал-дэмократызму ў БССР, разгорнутае наступленьне на ўсім фронце і ліквідацыя кулацтва як клясы—гэтай апоры польскага імпэрыялізму і капіталізму наогул, было спаткана беларускімі нацыянал-фашыстымі ў ЗБ, як удар па іх агульнаму лягеру. І зусім зразумела, бо нацыялал-дэмократы ў БССР зьяўляліся іх агентамі, аген-

тамі польскага фашызму, якія праводзілі шкодніцкую політыку падрыхтоўваючы глебу для інтэрвэнцыі, раззбройваючы нашу краіну перад наступаючым фашызмам.

Сарвалася! Працоўныя масы БССР на чале з комуністычнай партыяй з усёй суровасьцю рэволюцыйнага закону расправіліся з контррэволюцыйнымі нацыянал-дэмократамі, выкрылі іх інтэрвэнцыянісцкі твар.

Перад тым, як прыступіць да разгляду літаратуры Зах. Беларусі, трэба адзначыць, што ў Зах. Беларусі жорстка зьнішчаюцца, руйнуюцца найменшыя праявы культурна-нацыянальнага будаўніцтва. У сучасны момант у Зах. Беларусі ня існуе беларускай школы. Канчаткова ліквідаваны левы рэволюцыйны легальны друк. Зруйнавана культурна-асьветнае т-ва Беларускай школы і яе прадстаўнікі кінуты на доўгія гады турэмнай няволі. Пасаджаны ў турмы прадстаўнікі пасольскага клюбу „Змаганьне“ т. т. Гаўрылік, Дварчанін, Крынчык і Валынец, якія працягвалі рэволюцыйныя традыцыі Грамады. А ў апошні час здрадніцкі схоплены на польска-нямецкай мяжы ў экстэрыторыяльным вагоне правадыр нацыянальна-вызваленчага руху Зах. Беларусі т. Тарашкевіч.

У гэтым годзе польская ўлада зачыніла беларускую гімназію ў Клецку. Віленская беларуская гімназія канчаткова перайшла ў рукі фашызму. Рэволюцыйныя вучні, якія змагаліся з польскім фашызмам, кінуты ў вастрогі. Сёньня беларускі нацыянал-фашызм у сваіх культурных „дамаганьнях“ патрабуе па аднэй беларускай пачатковай школе на павет (!!!).

Зразумела, польскі фашызм ня дасьць і гэтага. Больш таго, ёсьць пастанова ўраду на працягу сямі год зусім не адчыняць беларускіх школ. Працоўныя масы Заходняй Беларусі даюць адпор політыцы Луцкевічаў-Астроўскіх. Масы ведаюць цану „дамаганьняў“ гэтых паноў. Гэтыя дамаганьні“—подлы манэўр беларускіх нацыянал-фашыстаў перад працоўнымі масамі, каб ашукаць масы ілюзіямі, нібы і ў фашысцкай Польшчы можна стварыць беларускую культуру.

Польскі фашызм у адносінах да нацыянальна-вызваленчага руху, да КПЗБ ужывае мэтод белага тэрору, мэтод Луцку, мэтод бязьлітаснага зьнішэньня рэволюцыянэраў.

Беларускаму-ж нацыянал-фашызму польскі фашызм прадастаўляе самыя шырокія магчымасьці для агітацыі і пропаганды ідэй контррэволюцыі, для барацьбы з узрастаючай рэволюцыйнай нябясьпекай, з ростам клясавай сьвядомасьці працоўных.

Літаратура Заходняй Беларусі не стаіць у баку ад клясавай барацьбы паміж двума варожымі лягерамі, якія змагаюцца.

У Заходняй Беларусі формальна ня існуе ніводнага літаратурнага аб'яднаньня, якое-б мела сваю часопісь, свой статут, сваю прогрому. Але гэта не гаворыць за тое, што ўся літаратура Заходняй Беларусі ўяўляе сабой адзіны стройны суцэльны струмень бяз клясавай дыфэрэнцыяцыі, бяз клясавай барацьбы і клясавых супярэчнасьцяй.

Поэты і пісьменьнікі ЗБ концэнтруюцца навакол пэўных газэт розных політычных партый і напрамкаў і гэта характарызуе іх творчы і політычны твар.

У 1927 г. у пэрыод росквіту Грамады былі спробы з боку літаратараў Заходняй Беларусі ўтварыць літаратурнае згуртаваньне пад назваю „Веснаход“, але польскі ўрад не дазволіў гэтага.

Літаратура Заходняй Беларусі падзяляецца па двух асноўных лініях, мае два асноўныя напрамкі.

Напрамак комуністычна-рэволюцыйны, які адлюстроўвае барацьбу пролетарыяту і сялянства пад кіраўніцтвам КПЗБ супроць польскага фашызму, супроць буржуазнай дыктатуры. Гэты напрамак актыўнай

барацьбы з польскім фашызмам за савецкую аб'яднаную Беларусь, за дыктатуру пролетарыяту ў Польшчы.

Другая група пісьменьнікаў, якая адлюстроўвае ідэолёгію беларускага кулацтва і буржуазіі, гэта ідэолёгі беларускага нацыянал-фашызму. Гэта група непасрэдна прымыкае да „Цэнтрасаюзу" Луцкевіча-Астроўскага, а таксама і да іншых кулацка-буржуазных груповак у Заходняй Беларусі. Гэтыя пісьменьнікі формальна не ўтвараюць адзінай організацыі. Але па сутнасьці іх радніць ідэолёгічная накіраванасьць, іхняй творчасьці мэтаімкнёнасьць, сьветапогляд, і гэта ставіць іх па другі, правы бок барыкады.

Пісьменьнікі: Н. Арсеньнева, Аўген Бартуль, Хвёдар Ільляшэвіч, М. Васілёк, Міхась Машара, Марвіч, Ф. Грышкевіч, Ст. Станкевіч, і інш.— гэта актыўныя прадстаўнікі беларускага нацыянал-фашызму — агенты польскага фашызму ў літаратуры, актыўныя пропагандыстыя крывавай інтэрвэнцыі супроць БССР і УССР.

Яны друкуюць свае творы непасрэдна ў органах нацыянал-фашыстаў розных адценьняў і напрамкаў, пачынаючы ад Луцкевіча-Астроўскага да ксяндза Станкевіча і сэнатара Багдановіча ўключна.

Творчасьць іх носіць выразна-рэакцыйны контррэволюцыйны характар.

У недалёкім мінулым некаторыя прадстаўнікі з гэтай групы пісьменьнікаў далучаліся да пары да часу да нацыянальна-вызваленчага руху ЗБ (Хв. Ільляшэвіч, М. Машара). Завастрэньне клясавых супярэчнясьцяй паміж бядняцка-серадняцкімі пластамі вёскі—з аднаго боку, кулацтвам і буржуазіяй—з другога, бурная клясавая дыфэрэнцыяцыя і тыя клясава-соцыяльныя зрухі, якія адбыліся і адбываюцца ў апошні час у Зах. беларусі і ў Польшчы наогул, а таксама завастрэньне супярэчнасьцяй паміж капіталістычнымі дзяржавамі, якія перажываюць вастрэйшы эканомічны крызіс, і квітнеючым СССР, які ня ведае крызісаў, дзе цалкам зьліквідавана беспрацоўе—усе гэтыя прычыны паскорылі процэс дыфэрэнцыяцыі і сярод пісьменьнікаў Заходняй Беларусі.

Страціўшы надзею на буржуазнае перараджэньне Савецкай Беларусі, беларуская буржуазія і кулацтва, а таксама пэўная частка дробнабуржуазнай інтэлігенцыі перайшла на позыцыі нацыянал-фашызму.

Калі ў першы пэрыод нэпу, у аднаўленчы пэрыод цяперашнія беларускія нацыянал-фашыстыя рабілі выгляд „спачуваючых", то ў пэрыод рэконструкцыйны, калі ліквідуецца кулацтва як кляса, на базе суцэльнай колектывізацыі, калі пасьпяховае ажыцьцяўленьне пяцігодкі палажыла крыж на спадзяваньнях беларускага кулацтва і буржуазіі павярнуць кола гісторыі назад,—і яны рэзка мяняюць тон у выказваньнях і ў адносінах да БССР, да таго вялікага нябачанага ў гісторыі соцыялістычнага будаўніцтва. Асабліва адчуўся гэты рэзкі паварот і ў літаратуры правага крыла Заходняй Беларусі ў сувязі з раскрыцьцем ДПУ Беларусі контррэволюцыйнай організацыі нацыянал-дэмократаў Ластоўскага, Лёсіка, Некрашэвіча, з арыштам былых лідэраў БНР.

У „Беларускай крыніцы" № 32 за 17 лістапада 1929 г. Марвіч, актыўнейшы вораг Савецкай Беларусі, прыкасьцельны поэта ксяндза Станкевіча, агент польскага фашызму, піша вялікі гора-верш пад назваю „Пара ўжо з каленьняў устаць", ставячы эпіграф да вершу вытрымку з „Комсамольскай праўды" №180 за 1929 г. аб нацыянал-дэмократызьме:

„... Большую войну с пролетариатом он (нацыонал-демократизм) проиграл, и при том безвозвратно. Революция поставила его на ко-

лени... на колени. Так, на колени. Он будет бунтовать на коленях. А там видно будет"...

„Над краем крывіцкага люду
Кружыліся хмары „крукоў",
Шукалі пажывы прыблуды
Ад даўных ужо даўных вякоў.
Народ наш быў сілен бяз меры:
Навалу крукоў адганяў,
Аднак-жа прышоў той дзень шэры
І сам у палон сябе даў".

Тут мы маем звычайны экскурс беларускіх нацыянал-фашыстаў у „слаўную" мінуўшчыну Беларусі, калі гэта міфічная Беларусь „была сільная бяз меры", маем усхваленьне славутай самабытнасьці беларускай душы, якая непадобна да душы „маскаля". Тут, у гэтым вершы (зусім слабым у формальна-мастацкіх адносінах) праводзіцца ідэя аб тым, што беларуская нацыя ня мела і ня мае сваёй буржуазіі, сваіх абшарнікаў, „міфічных кулакоў".

У гэтым вершы нацыянал-фашыст Марвіч малюе становішча беларускага народу пад панаваньнем расійскага самаўладзтва:

„Нас цар закаваў назаўсёды
І з вольных парабіў рабоў.
Пазбавіў зусім нас свабоды,
І гвалтам рабіў маскалёў".

Вось уяўленьне Марвіча аб рухаючых сілах рэволюцыі 1917 году:

„Аднак-жа прышоў час на цара—
І трон яго моцны зьляцеў.
Была гэта божая кара,
І ўсіх паняволеных гнеў".

З болем у сэрцы ўспамінае Марвіч „Народны сход" беларускіх халопаў, вернападданых лёкаяў кайзэра Вільгэльма і пана Пілсудзкага ў дзень 25 сакавіка 1918 г., калі беларускія нацыянал-дэмократы разам з іншымі буржуазнымі партыямі імкнуліся ўтварыць контррэволюцыйную „незалежную" Беларусь, так званую БНР.

Вось як Марвіч малюе гэты зьлёт контррэволюцыі:

„І вось пасьля той завірухі,
Як лопнулі путы ва ўсіх,
Паўсталі народныя рухі,
Бо кожны стаў клікаць сваіх.
Так кожны народ вызначаўся—
Тварыў ён дзяржаву сваю.
Ад Крэмлю хутчэй аддзяляўся
І ўласну тварыў ужо сям'ю.
І мы так-жа сама рабілі,
І наш азначаўся народ,
Аднак-жа Саветы зглумілі
Ў зародку Народны наш Сход".

Беларускі нацыянал-фашыст Марвіч у наступных радках пераходзіць да нападу на СССР, ставячы знак роўнасьці паміж політыкай царскай Расіі і політыкай СССР у адносінах да Беларусі, паміж політыкай былых сатрапаў Трэпавых, Сталыпіных і паміж ленінскай нацыянальнай політыкай.

„Дзе-ж словы вялікай свабоды?
Дзе роўнасьць, дзе брацтва ўсіх?
І зноў закавалі народы
Ў путах чырвоных сваіх".

Гэты абнаглелы нацыянал-фашысцкі трубадур паўтарае звычайную бульварную хлусьню буржуазнай бульварнай прэсы аб „путах чырвоных", аб савецкай буржуазіі, „савбурах", аб чырвоных прыганятых:

„Там думкі свабоднай ня маюць,
І праўды ня можна сказаць.
За праўды ў Салаўкі ссылаюць,
Дзе доўга ты будзеш канаць.
І вось там свабода і роўнасьць:
Стаіць на каленях мужык
. . . . . .
Над ім стаіць „барын чырвоны"
І б'е яго моцна ізноў.
І шал безгранічны ягоны
Замучыць сялянства гатоў".

Я спыняю ўвагу на гэтым фашысцкім докумэнце, таму, што гэта самы характэрны мэтод, характэрны сродак у руках беларускіх нацыянал-фашыстаў для адурманьваньня працоўных мас байкамі пра зьверствы бальшавікоў над сялянствам, гэта звычайны мэтод барацьбы беларускіх нацыянал-фашыстаў з рэволюцыйным нацыянальна-вызваленчым рухам, з КПЗБ, для таго, каб забіць у бядняцка-серадняцкай частцы вёскі веру ў наша соцыялістычнае будаўніцтва праз паказ нашага со-

цыялістычнага будаўніцтва ў скрыўленым клясавай нянавісьцю люстры, праз адкрыты паклёп на нашу пяцігодку. Яны хочуць паказаць, што быццам там, у бальшавікоў, „нацыянальная няволя", „чырвоны барын", прыганяты з нагайкай у руцэ, як у часы прыгону сочыць за працай колгасьнікаў, „б'е іх моцна ізноў". Усё гэта зьяўляецца сродкам для падрыхтоўкі „грамадзкай апініі", для таго, каб апраўдаць інтэрвэнцыю, якая падрыхтоўваецца супроць „усходніх барбараў", „матэрыялістаў-бязбожнікаў" бальшавікоў. Заканчваецца гэты верш Марвіча не двусэнсовым заклікам:

„Хто мае крыві поўныя жылы,
А сэрца любоўю гарыць,—
Ня бойся Салаўкоў—магілы
І сьмела йдзі прышласьць тварыць",

У гэтым вершы няма нічога новага, калі параўнаць яго з тымі програмнымі ўстаноўкамі Луцкевіча-Астроўскяга, якія найбольш яскрава выказаны вуснамі Акінчыцца: „беларускае пытаньне можа быць вырашана толькі тады, калі прападзе тая галоўная перашкода, якая стаіць на шляху яго вырашэньня— гэта факт існаваньня комуністычнай дыктатуры ў Савецкай Беларусі, калі гэта дыктатура будзе павалена—толькі тады адчыняцца магчымасьці для ажыцьцяўленьня нашых політычных і нацыянальных ідэалаў".

Падобная літаратура, узоры якой я цытаваў, не карыстаецца посьпехам сярод шырокіх мас працоўных, бо масы Заходняй Беларусі буйна выраслі, каб верыць усёй гэтай бязглуздай пісаніне, галімацыі беларускіх нацыянал-фашыстаў. Працоўныя масы ЗБ пад выпрабаваным кіраўніцтвам комуністычнай партыі даюць рашучы адпор агентам беларускага нацыянал-фашызму і іх агітацыі ў якім-бы выглядзе яна не зьяўлялася. Гэтая хлусьня настолькі відавочна для працоўных мас Заходняй Беларусі, што працоўныя падобную макулатуру адсылаюць назад у рэдакцыю Луцкевічаў і Станкевічаў з дасьціпнымі прыпіскамі па адрасу „мэцэнатаў", якія задарма прысылаюць друкаваны дурман. Але ўсё-ж такі гэта літаратура беларускіх нацыянал-фашыстаў мае распаўсюджаньне і функцыі яе маюць пэўныя вынікі.

Але самымі небясьпечнымі ворагамі Савецкага саюзу, Савецкай Беларусі ў літаратуры Заходняй Беларусі зьяўляюцца поэты А. Бартуль, Хв. Ільляшэвіч, М. Машара, Міхась Васілёк, якія пад шалупіньнем дробнабуржуазнай рэволюцыйнасьці, пад левай фразэолёгіяй" працягваюць завуаліраваны, замаскаваны нацыянал фашызм у сваёй творчасьці.

Яны не ад таго, каб у сваіх вершах ды поэмах прыхільна кіўнуць часам на чырвоны ўсход. Але ўсё гэта толькі для таго, каб падкупіць давер'е мас, каб у канчатковым выпадку закончыць свае песьні выхваленьнем нацыянал-фашызму, беларускай самабытнай бясклясавай нацыі.

У іх творчасьці вар'іруюцца адны і тыя-ж ідэі і тэмы аб кулацка-буржуазнай „Незалежнай" Беларусі, пад протэкторам фашысцкай Польшчы. Тут мы маем апяваньне „слаўнай" мінуўшчыны, патрыярхальна-фэўдальнай беларускай вёскі з дапатопнай сахой і бараной.

Ліквідацыя кулацтва як клясы на аснове суцэльнай колектывізацыі ў БССР, машынізацыя нашай сельскай гаспадаркі, індустрыялізацыя Савецкай Беларусі выклікаюць поэтаў беларускага нацыянал-фашызму „грусть и тоску безысходную„ падыходзячай самабытнай беларускай вёсцы і беларускіх самабытных рэлігійных звычаях:

„Шкадую старую я вёску,
Бо зьнішчаць яе машыны,
Ня будзе больш пахнуць бярозка,
Вёска запахне бэнзынай".

Так сумуе па старой вёсцы Аўген Бартуль, актыўны пагромшчык куль-

турна-асьветных устаноў Таварыства Беларускай Школы ў Вільні. Гэта той Бартуль, які выконвае як верны пес, усе загады паноў Луцкевічаў - Астроўскіх, які піша „протэсты" з прычыны арыштаў актыўных контррэволюцыйных нацыянал-дэмократаў у БССР.

„Пагоня"—герб беларуска-літоўскага княства зьяўляецца для іх сымболем беларускай буржуазнай дзяржаўнасьці. „Пагоня" ідэалізуецца, перапяваецца на ўсе лады ўсімі пісьменьнікамі нацыянал-фашызму ўсіх адценьняў і напрамкаў.

У вершы, прысьвечаным контррэволюцыйнаму зьлёту ў 1918 годзе (25 сакавіка), які быў разагнаны Савецкай уладай, Бартуль аплаквае гэтую падзею:

„Заплакалі струны,
І радасьць прапала,
І край знову сумны,
Зноў сонца ня стала,
Маркотна, навокала ціш.
Усё чыста забылі,
Мяжою крывавай:
Наш край разьдзялілі,
Узлажылі на плечы нам крыж".

Паводле ўяўленьня нацыянал-дэмократаў і беларускіх нацыянал-фашыстаў, Беларусь—гэта краіна, якая перажывае трагедыю спрадвечнага нацыянальнага прыгнечаньня, якая нясе крыж пакуты. Але ніхто з іх ні словам не заікнецца пра другі бок гэтай Беларусі, пра бок клясавага змаганьня пролетарыяту і працоўнага сялянства пад кіраўніцтвам КПЗБ за вольную, аб'яднаную Савецкую Беларусь.

Гэты мотыў „трагедыйнасьці „Беларусі цягнулі на ўсе лады і пісьменьнікі нацыянал-дэмократы як Язэп Пушча, Дубоўка, У. Жылка і інш.

Работы контррэволюцыйных нацыянал-дэмократычных пісьменьнікаў БССР зрабіла сваю справу і ў Заходняй Беларусі. Іх работа таксама ў пэўнай ступені дапамагла ўмацаваньню лягеру беларускіх нацыянал-фашыстаў у Заходняй Беларусі.

Характэрны той факт, што ўсе нацыянал-фашысцкія поэты Заходняй Беларусі ня могуць захаваць перад масамі Заходняй Беларусі дасягненьняў Савецкага саюзу, Савецкай Беларусі, як на фронце гаспадарчага будаўніцтва, так і на фронце нацыянальна - культурнага будаўніцтва, на фронце літаратуры. Яны ня ў сілах замазаць і той факт, што ў фашысцкай Польшчы жыцьцё для працоўных мас цэнтральнай Польшчы і нац.-меншасьцяй вельмі цяжкае, нявыноснае, што працоўныя знаходзяцца пад цяжарам капіталістычнай сыстэмы, якая высмоктвае апошнія сокі з працоўных. Яны ня могуць замазаць таго стану рэчаў у Польшчы, пры якім магчымы крывавыя яўрэйскія пагромы, масавыя расстрэлы рабочых на вуліцах у часе дэмонстрацыі, яны ня могуць схаваць тых фактаў, што ў фашысцкай Польшчы больш 10.000 політьняволеных, што амаль кожны чалавек, які сымпатызуе соцыялістычнай сыстэме, адведаў дэфэнзыву, адкуль выйшаў з пакрышанымі зубамі, з паламанымі рэбрамі, інвалідам.

Бурны рост масавага нездавальненьня працоўных супроць окупантаў, рост масавых выступленьняў супроць прадстаўнікоў фашысцкай улады—усё гэта разам актывізуе беларускіх нацыянал - фашысцкіх поэтаў для барацьбы з рэволюцыйным рухам. Яны ў сваёй творчасьці стараюцца згладзіць клясавыя супярэчнасьці, заспакоіць масы прыгожым словам, абнадзейваючы іх будучыняй.

„Яшчэ нам воля агняцьветам
Над Беларусьсю зацьвіце
І сьветазарным сваім сьветам
Далёка злыдняў адмяце.
Хутчэй да працы, каб кіпела,
Пагоня нам пакажа шлях.
Яшчэ ўзаўецца горда, сьмела
Наш—бел-чырвоны-белы сьцяг".

(„Стўдэнцкая думка" № 2, 1928 г.)

Такія падзеі гісторычнага значэньня, як пяцігадовы плян, колек-

тывізацыя і індустрыялізацыя краіны, бурны росквіт нацыянальных культур у СССР і БССР гулкім рэхам адклікаюцца па тым баку кордону, за гранічнымі слупамі. Расьце вялікая зацікаўленасьць нашай будоўляй, нашым соцыялістычным жыцьцём. І вось цікава праілюстраваць, як нацыянал-фашысцкія пісакі, прыхвасьні польскага фашызму, стараюцца скомпрамэтаваць нашу колектывізацыю і тых барацьбітоў нацыянальна вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, якія паказваюць шлях да будаўніцтва такой-жа соцыялістычнай культуры і ў Заходняй Беларусі. Вось верш пад назваю „Да паслоў змаганьня", дзе пад формай допісу з вёскі нехта Былінка піша ў „Наперад"—органе Луцкевіча:

„Ох паслы мае паслочкі,
Не туманьце нашы вочкі,
Бо заплачуць дзеткі, жонкі:
Трапім дзеля вас у Вронкі.
Вас хоць помніць нехта будзе,
Нас увесь сьвет позабудзе.
А „Наперад" так ня ганьце.
На сябе вы лепей гляньце.
Бо хто сам сябе так хвале.
Няхай таго пярун спале",
І колхозаў не хваліце:
Добра? дык на іх валіце".

Але працоўныя масы Заходняй Беларусі падымаюцца на барацьбу з фашызмам, каб у саюзе з працоўнымі Польшчы соцыялістычнай будаваць па прыкладу Савецкага саюзу колгасы, соцыялізм.

Вось прыклад таго, якімі наглымі мэтодамі змагаецца беларуская контррэволюцыя Заходняй Беларусі з ростам сымпатый працоўных да нашай колектывізацыі, да соцыялістычнага зямляробства.

Небясьпечна група пісьменьнікаў (Ільляшэвіч, Бартуль, Машара, Міхась Васілёк) таму, што яны ўмеюць спрытна манэўраваць, лавіраваць левай фразэолёгіяй, умеюць падрабляцца, калі гэта патрэбна, пад прыяцеляў рабочай клясы і працоўнага сялянства і трымаць пад сваім уплывам нязначную частку несьвядомых ці мала сьвядоных адсталых элемэнтаў вёскі і гораду.

Рост комуністычных ідэй, рост атэізму, матэрыялізму ў Заходняй Беларусі выклікае актывізацыю беларускай хрысьціянскай дэмакратыі і беларускіх праваслаўных „правадыроў", накшталт сэнатара Багдановіча. Там выдаецца шмат рэлігійнай літаратуры, брошур, часопісаў, газэт, як, напрыклад, „Хрысьціянская думка", „Беларуская зарніца", „Праваслаўны беларусі і інш. царкоўна-папоўскіх выданьняў, дзе прапаведуецца адчыненае "мракобесіе", папоўшчына, дзе ставяцца проблемы барацьбы з комунізмам, з бязбожжам, якое высокай хваляй ахапіла Заходнюю Беларусь, Заходнюю Украіну і Польшчу. Беларуская духавенства разам з польскім духавенствам занепакоена магутным ростам бальшавіцкіх ідэй, ростам клясавай самасьвядомасьці, ростам антырэлігійнага руху. Яны са смуткам констатуюць той факт, што „не выконваюць рэлігійных практык матэрыялісты... чаму так шмат моладзі гуляе за касьцёлам у часе імшы, набажэнства... сумна... сумна", заканчвае орган беларускай хадэцыі, „Хрысьціянская думка".

Марвіч—не ад таго, каб напісаць вершы ў „Хрысьціянскую думку":

„Хрысьце божа наш каханы.
Уваскрасі народ стаптаны".

А Каруза заклікае да клясавага міру, да спакою. На тым сьвеце, моў, бог узнагародзіць:

„Жывіце ў згодзе,
У сям'і і народзе,
Адкіньце благое насеньне,
А бог міласэрны
Вам дасьць па сьмерці
Душы збаўленьне",

(„Хрысьціянская думка" № 1, 1930 г.)

Гэта чыста папоўская, касьцельная літаратура, рэлігійны дурман. Недаацэньваць яе значэньне, яе функцыі ў зацямненьні клясавай сьвядомасьці працоўных мас, у за-

тушоўваньні клясавых супярэчнасьцяй, недаацэньваць яе надзвычай рэакцыйнага значэньня—значыць не разумець сапраўднага становішча рэчаў у Заходняй Беларусі, дзе польскі фашызм сумесна з беларускім нацыянал-фашызмам мобілізуюць усе свае сілы і сродкі на барацьбу з нацыянальна-вызваленчым рухам, з унутранай рэволюцыяй, якая падымаецца з нізін, для барацьбы з бальшавізмам на Захадзе.

Літаратура ў іх руках непасрэдна накіравана супроць СССР і БССР. Разам з рымскім папай яны падрыхтоўваюць глебу для таго, каб „авечкі дурныя" ішлі праліваць кроў за бацькаўшчыну і сьвятую рэлігію.

Заслугоўвае ўвагі і творчасьць беларускай поэткі Натальлі Арсеньневай, якая зьяўляецца тыповай прадстаўніцай беларускай буржуазіі ў літаратуры. Яна нібы далёка стаіць ад палітыкі і ад барацьбы палітычных партый, яна, на першы погляд, нібы піша аб рэчах, якія ня маюць ніякіх адносін да сучаснай рачаіснасьці, аб „чыстай красе", „чыстай поэзіі", аб сінім, сінім небе, аб васількох, аб тым, што мэта жыцьця—захаваць жыцьцё:

„Мэта жыцьця, кажуць, гэта—хаваці
Сэрца ад смуткаў і сьлёзаў не знаці,
Думкі аб праўдзе... Гэта—глупства ўсё,
Мэта жыцьця—захаваці жыцьцё".

Гэтыя словы напісаны ў 1922 г., але праглядаючы зборнік вершаў „Пад сінім небам", выданы ў 1927 г. у Вільні, а таксама, праглядаючы вершы, якія зьмяшчае Арсеньнева апошні час у органах Луцкевіча, заўважаем, што яна са старых позыцый ня зыйшла. Яна апявае вясельле, якое спраўляюць ля млыну „Вадзяны дзед з заліўцай-дзяўчынай", аб тым, што,

„Зоры ёсьць такія—ясныя, цiхія.—
Душы праклятыя там жывуць, чуваць...

На ўсёй яе поэзіі ляжыць пячатка такой хрысьціянскай цішы і спакою, так сказаць, „умиротворенности", хрысьціянскага „благополучия". Увесь лексыкон, увесь слоўны багаж старанна ёю падабраны, нідзе вы ня знойдзеце ў яе вострага рэволюцыйнага слова. На ўсёй яе поэзіі ляжыць якаясьці пасыўная імгла.

Яе поэзія—гэта свайго роду опіум, гэта палітыка ў літаратуры для затушоўваньня клясавых супярэчнасьцяй, для адцягваньня ўвагі чытача ад барацьбы клясаў, ад штодзённых задач рабочых і сялян Заходняй Беларусі. Яе поэзія—гэта поэзія адміраючай клясы. Прыціснутая да сьцяны падзеямі рэволюцыйнай рачаіснасьці ў Заходняй Беларусі, яна ня ведае выхаду. Правільней сказаць, яна гэты выхад знаходзіць у сьвеце лятуценьняў, там, далёка ў сінім небе, дзе штодзённыя клопаты не гнятуць, ня мучаць. Характэрны ў гэтых адносінах верш, пад назваю „Калі людзі пакрыўдзяць цябе". Гэта пропаведзь клясавага міру, пропаведзь хрысьціянскай пакоры і ўседараваньня:

„Калі людзі пакрыўдзяць цябе,
Калі хочацца плакаць, маліцца,
Ты ідзі ў цямнеючы лес;
Там ў цішы так лёгка забыцца.
Быццам прыдзеш ты ў храм незямны,
У храм, дзе дзіўна шасьцяць галіны
І пачуеш у шэпце лісьця:
—„Ты даруй неразумным, як я"
І адыйдзе паволі нуда...
Уцяміш ты, што нядоля твая—
Гэта кропля ў моры жыцьця,
Дзе ўсюды і боль і нуда".

Гэта поэзія для рабоў, пасыўных размагнічаных людзей, якія на зьдзек, на ўдары ворага адказваюць хрысьціянскай пакорай, бясьсільным плачам, філёзофіяй непраціўленьня злу. Шкоднасьць гэтай поэзіі для нацыянальна-вызваленчага руху відавочна. Рабочая кляса і працоўнае сялянства Заходняй Беларусі адкінуць гэтую поэзію, як непатрэбны хлам, які ляжыць на шляху барацьбы за канчатковае вызваленьне з-пад улады крывавага белага арла. Бо тут патрэбна не плаксівая песьня, а рэволюцыйны,

бунтарны гімн, з якім можна ісьці на барыкады.

З народнай творчасьці Натальля Арсеньнева бярэ самыя рэакцыйныя элемэнты: забабоны, народныя павер'і:

„Плач лясуна, карагод русалчыны,
чары і зводы начное часіны.
Смутнай балотніцы сьмех — прычытальны—"

вось яь любімая тэматыка і матэрыял, які служыць для яе сродкам выражэньня сваёй унутранай сутнасьці ў мастацкіх вобразах. Гэта не выпадкова. Выбітая з каляіны буржуазнага добрабыту Кастрычніцкай рэволюцыяй руская буржуазія на эміграцыі шукае прыпынку, шукае шляхоў да „самоутверждения"

У творчасьці Арсеньневай шмат элемэнтаў „ахматаўшчыны", шмат супольных рысаў з творчасьцю буржуазнай пісьменьніцы Гіпіус, асабліва характарны ў гэтым сэнсе верш Натальлі Арсеньневай „Чаго я хачу?".

Уся сымболіка Арсеньневай, яе туманная філёсофія будзе нам зразумела, калі мы гэтую сымболіку з мовы поэзіі перавядзём на мову політыкі, калі мы разгледзім сьветапогляд, адносіны Натальлі Арсеньневай да рачасінасьці Заходняй Беларусі. Мы бачым, што гэта сьветапогляд буржуазіі. Увесь яе лексыкон, мастацкія сродкі: мэтафоры, мэтанімії, параўнаньні атулены містычнасьцю, яны ўзяты з буржуазнага асяродзьдзя.

„Зоркі" ўяўляюцца Натальляй Арсеньневай вочкамі анёлаў„ "вясна пазірае спакойна пекнай княгіняю". З тэхнічнага боку творчасць Н. Арсеньневай стаіць на даволі значнай вышыні.

Разглядаючы нацыянал-фашысцкую літаратуру ЗБ мы павінны ўсё-ж такі і сярод гэтай групы пісьменнікаў правесьці пэўную дыфэрэнцыяцыю, паказаць на іх пэўныя разыходжаньні ў мэтодах барацьбы з рэволюцыйным нацыянальна-вызваленчым рухам у Заходняй Беларусі.

Хвёдар Ільляшэвіч

Хв. Ільляшэвіч—гэта характарны мяшчанскі поэта ў чорнай фашысцкай кашулі. Яго творчы шлях тыповы для мяшчанскага поэта. Ён у часе надзвычай высокага ўздыму рэволюцыйнай хвалі ў Заходняй Беларусі кідаўся да псэўдо-рэволюцыйных, псэўдо - пролетарскіх, псэўдо-рабочых мотываў, прысвайваючы сабе мянюшку „пролетарскага" поэта, будучы ў той-жа самы час па сутнасьці дробным буржуа, застаючымся мяшчанінам, абыватэлем і ў сваёй дзейнасьці, у літаратурнай творчасьці. Пра рабочага ён ня можа нічога лепшага сказаць, апрача голых і пустых сказаў:

„Я работнік: гэта знача
Ад зары стаю ў варштаце".

У другім вершы пад назваю „з рабочых мотываў" Ільляшэвіч піша:

„Фабрыка, завод,
Дым і смурод...
Чорныя, доўгія дні...
Песьня жыцьця,
Смага сьвятла—
Шчасьця на чорнай зямлі".

У гэты-ж самы час ён піша чыста нацыяналістычныя вершы, у якіх выхваляе „Пагоню", адраджэньне „Новай Беларусі", абагатварае беларускую нацыю, культывуе самабытнасьць беларуса. Асабліва характарны ў гэтых адносінах верш „Мінуўшчына":

Быў май... Цьвіло, гуло жыцьцё...
Мігнуў пярун... Прамчаўся конь...
Нясуцца войскі... Дым... агонь.—
Няволі ноч скавала ўсё.
Мінула, зьнікла... Замялось.-
Прайшоў гадоў бязьлікі рой—
І стуль шукаю як ня свой,
Вясеньніх песьняў адгалос...
Гэй, песьні волі і жыцьця!
Вы зноў ахопіце народ.
І недалёкі ваш прыход.
Вітаю я, чакаю я".

Гэта было напісана ў час, калі „Бурны стыхійны рост беларускай рабоча-сялянскай грамады прывёў у поўнае замяшаньне адміністра-

цыю і на некалькі месяцаў масавым націскам перарваў ланцуг поліцэйскага і адміністратыўнага тэрору". Так гэты пэрыод ахарактарызаваў правадыр нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі тав. Тарашкевіч.

Зараз, у час разгулу рэакцыі, Ільляшэвіч стаіць перад намі, як аформлены поэт нацыянал-фашызму. Ён прымае самы актыўны ўдзел ў нацыянал-фашыцкім друку („Народны звон", „Наперад", „Вучнёўскі звон" і інш.), прымае актыўнейшы ўдзел у антысавецкай контррэволюцыйнай дзейнасьці групы Луцкевіча-Астроўскага. Яго апошняе слова—цыкл вершаў „Новая Беларусь" зьяўляецца поўнай ілюстрацыяй канчатковага пераходу Ільляшэвіча на позыцыі беларускага нацыянал-фашызму.

Польскі фашызм разам з беларускім нацыянал-фашызмам робяць усё магчымае, каб узмацніць свой уплыў і ў літаратуры Заходняй Беларусі. Вядзецца праца па падрыхтоўцы сваіх кадраў.

Другім, так сказаць, „Ільляшэвічам" у беларускай нацыянал-фашысцкай літаратуры Заходняй Беларусі зьяўляецца Машара, шлях якога да фашызму аналёгічны са шляхам Ільляшэвіча. У часе грамадаўскага руху Машара прымазваецца да яго, а зараз сваёй творчасьцю аплёвывае гэты рух. Не выпадкова, Ільляшэвіч „шэфствуе" над яго творчасьцю, над яго дзейнасьцю, над апрацоўкай яго сьветапогляду. З гэтага боку характарны атыкул Ільляшэвіча, зьмешчаны ў часопісу „Вучнёўскі звон" пад назваю „Есенін у беларускай поэзіі", дзе гэты рэнэгат ускладае на Машару лаўровы вянок, выхваляе яго, як беларускага Есеніна, прарочачы яму слаўную будучыню.

Зборнік вершаў Машары пад назваю „Малюнкі" адлюстроўвае Заходнюю Беларусь у Есенінскіх вобразах. Нацыянальныя мотывы пераважаюць, домінуюць. Соцыяльныя мотывы падпарадкаваны нацыяналістычнай пропагандзе, пропагандзе ідэй беларускай контррэволюцыі. На першы погляд гэта вельмі наіўныя вершыкі, але па сутнасьці ў аснове іх нацыяналістычная зараза, шкодная ідэолёгія.

Аўгень Бартуль.

Яго творчасьць па свайму характару нічым не адрозьніваецца ад творчасьці Ільляшэвіча. Ідэолёгічная накіраванасьць гэтай творчасьці аналёгічна творчасьці Ільляшэвіча, толькі з большай доляй нагласьці і няпрыкрытай прадажнасьці. Ён падобна Ільляшэвічу, то захапляецца для віду рабочай тэматыкай, рабочымі мотывамі, то, кідаецца ў самы разнузданы сьвет распусты, апявае кабарэты, піўныя. Гэта творчасьць нацыяналістычна; крыкліваасьць, нічым не апраўданая, не абгрунтаваная крыкліваасьць—вось яе характарная адзнака.

У апошні час Бартуль дае вельмі нізкія па якасьці вершы.

Агень Бартуль, Хв. Ільляшэвіч, Міхась Васілёк, М. Машара—гэта найбольш небясьпечная група пісьменьнікаў беларускага нацыянал-фашызму. Яны ўмеюць манэўраваць левай фразэолёгіяй, прыпісваючы сабе рэволюцыйныя заслугі ў мінулым перад рэволюцыйным рухам, што быццам бы, яны таксама „цярпелі і пакутвалі" за беларускі народ.

Група пісьменьнікаў з лягеру беларускай хрысьціянскай дэмократыі, як Марвіч, Францішак Грышкевіч, Ст. Станкевіч і іншыя, калі выступаюць у сваёй творчасьці палітычнай дзейнасьці супроць БССР, супроць бальшавікоў, то выступаюць адчынена, без маскаваньня. Гэта зьяўляецца іх найлепшай „цнотай". З гэткімі ворагамі, як Марвічы-Станкевічы лягчэй змагацца і выкрываць іх фашысцкі твар, твар інтэрвэнцыяністых супроць БССР у літаратуры.

Францішак Грышкевіч у сваіх „Веснавых мэлёдыях“ выявіў сябе як беларускага нацфашыста. Аплакваньне загінутай “незалежнасьці“ Беларусі, выхваленьне рэакцыйнай працы ксяндза Станкевіча з ягонай бульварнай „Крыніцай“— у дастатковай ступені характарызуюць яго палітычныя і творчыя ўстаноўкі, яго сьветапогляд. Праўда, у апошні час і ён падобна Бартулю прабуе закранаць рабочую тэматыку, але гэта „закрананьне“ рабочай тэматыкі зьяўляецца ні больш ні менш, як далікатным рэвэрансам дробнабуржуазнай паненкі ў бок пролетарыяту (верш „Пролетарыят“). Але ў асноўным творчасьць Грышкевіча гэта—прыкасьцельная творчасьць, рэакцыйная ў сваёй аснове. Нічым непрыкрыты ідэалізм Грышкевіча выпірае з кожнага радка яго вершаў і артыкулаў.

Вось, малюнак фашызму ў літаратуры Заходняй Беларусі. Як бачыце, беларуская буржуазія і кулацтва выкарастоўвае ўсе сілы і сродкі, у тым ліку і літаратуру, для барацьбы з рэволюцыйным нацыянальна-вызваленчым рухам, з КПЗБ, з ростам бязбожжа, з ростам бальшавіцкіх ідэй. Але нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі пад умелым кіраўніцтвам КПЗБ дае магутны адпор „мракабесам“ у літаратуры, высоўваючы з шырачэзных народных пластоў вёскі і гораду сваіх рэволюцыйных поэтаў і пісьменьнікаў для барацьбы з белапольскай окупацыяй, з фашысцкім рэжымам.

Гэта творчасьць, у адрозьненьне ад фашысцкай творчасьці, характарна сваёй масавасьцю. Яна карыстаецца найвялікшым посьпехам, популярнасьцю сярод працоўных мас Заходняй Беларусі. Ва ўмовах белага тэрору, пад навісшымі петлямі шыбеніц, з-за крат турмаў фашысцкай Польшчы гэтая творчасьць падымае на барацьбу за канчатковае вызваленьне, за дыктатуру пролетарыяту, за Савецкую аб‘яднаную Беларусь.

Гэта творчасьць нараджаецца ва ўмовах глыбокага падпольля, за кратамі фашысцкіх казэматаў. Гэта творчасьць разыходзіцца ў тысячах экзэмпляраў у рукапісным выглядзе ці ў выглядзе адбіткаў на шапірографе. Гэтая творчасьць дэкляміруецца на консьпірацыйных масоўках, на дэмонстрацыях. Часам гэтыя вершы КПЗБ выдае ва ўлётках, у проклямацыях.

Не адзін з прадстаўнікоў гэтага напрамку не ўхіліўся ад турэмнай долі. Амаль кожны з іх адведаў засьценак дэфэнзывы, кожны з іх адсядзеў некалькі год у астрозе ці знаходзіцца і зараз там, як напрыклад С.С., які атрымаў 5 год катаргі, а нядаўна фашысцкае правасудзьдзе пакарала яго на 4 гады катаргі. Таму на іх тэматыцы ляжыць адбітак вастрогу, таму і творчасьць іх мае пераважна турэмны характар. Да гэтай групы рэволюцыйнага літаратурнага напрамку трэба аднесьці наступных таварышоў: Л. Родзевіча, А. Салагуба, В. Таўлая, Янку Чабора, С. Сьвітку, Зьвястуна, Дуброву і іншых. Творчасьць іх раскідана па розных газэтах і часопісах, якія выдаваліся ў падпольлі ці нелегальна, ці легальна ў пэрыод Грамады. Толькі некаторыя з гэтых таварышоў, як Л. Родзевіч і А. Салагуб маюць зборнікі сваіх твораў.

Дзякуючы драконаўскай цэнзуры фашысцкіх дзяржымордаў Польшчы іх творчасьць ня мае магчымасьці пабачыць сьвету ў выглядзе зборнікаў. Характарна, што ў Зах. Беларусі амаль зусім няма прозы, аб якой можна-б было гаварыць. Адсутнасьць соцыяльна-эканомічнай і друкарскай базы маюць рашаючае значэньня—гэта асноўныя прычыны. Гэтая творчасьць даходзіць да мас у рукапісах, як, напрыклад, рукапісны орган Комуны політзьняволеных у Коронове, пад назваю „Політвязень“, „Лукішскі сьцяг“—орган Комуны політзьняволеных на Лукіш-

ках у Вільні, „Політзак"—орган Комуны політзьняволеных у Горадзенскай турме, поэма Чырвонага Зьвястуна „Непераможная", выданая комсамолам Заходняй Беларусі на шапірографе і іншыя.

Рэволюцыйныя пісьменьнікі Заходняй Беларусі жывуць і працуюць у акружэньні шпікоў, провакатараў і „мундуровай" паліцыі. Яны праследуюцца, яны праходзяць школу ў астрогах і дэфэнзыве. Турма для іх—зьяўляецца вышэйшай школай, дзе яны навучаюцца марксызму-ленінізму, рыхтуючыся да новых будучых клясавых баёў у Польшчы, Заходняй Беларусі, Заходняй Украіне. Прыходзяць яны ў літаратуру ад допісу аб соцыяльным і нацыянальным уціску, аб экспёатацыі памешчыкамі і буржуазіяй рабочых і сялянскай беднаты. Гэтыя таварышы ў сваіх поэмах, вершах, апавяданьнях даюць малюнкі, насычаныя зьместам клясавай барацьбы, малюнкі політычна завостраныя, актуальныя. Гэтыя творы дапамагаюць партыі мобілізаваць масы Заходняй Беларусі на барацьбу за штодзённыя патрэбы працоўных, памагаюць партыі ўзгадоўваць новыя кадры барацьбітоў за дыктатуру пролетарыяту ў Польшчы.

Характарнай адзнакай падпольнай і вастрожнай поэзіі зьяўляецца яе вялікі рэволюцыйны оптымізм, бадзёрасьць, вера ў недалёкі прыход рэволюцыйных падзей, калі будзе зьнішчаны жандар Эўропы—фашысцкая Польшча, краіна шыбеніц і турэмных рэгулямінаў, калі прыдзе „сьмерць да белых палацаў".

Гэта—агітацыйная поэзія, праклямацыя ў вершаванай форме, вершаваны лёзунг, які заклікае на барацьбу з польскімі окупантамі. Гэта поэзія мае выразна клясавую тэндэнцыю.

Верш „Дрыжэце палацы", які зьмешчаны ў рукапісным органе Комуны „Політвязень", поўны рэволюцыйнага патосу барацьбіта за справу працоўных. Поэта ад імя шматмільённых мас Заходняй Беларусі вылівае крыўды і жаль, прычынены беднаце буржуазій і памешчыкамі:

„Мы з цяжкае працы, ад нэндзы, бяды
Ад голаду й мук паміралі,—
Паны-ж наядалі сабе жываты,
У палацах сваіх балявалі.
Спрадвеку ганялі нас у ярме,
Над шыяй ў нас пуга сьвістала,
Нас сотні душылі, гналі ў турме...
Нарэшце-ж гадзіна настала.

Мы сёньня знайшлі да свабоды свой шлях
І больш не пакорымся пану.
Да бунту нас кліча чырвоны наш сьцяг—
Мы помсту нясем тырану.
Вы ў роскашы,—мы-ж гадавалісь у бядзе,
Нас голад, турма гартавалі.
Дрыжэце-ж палацы, бо сьмерць ідзе
На ўсіх, што кроў нашу смакталі".

Знаходзячыся за кратамі фашысцкіх турмаў, політзьняволеныя з надзвычай вялікай увагай сочаць за тымі вялікімі падзеямі, якія разгортваюцца ў Савецкім саюзе. Яны захапляюцца разам з пролетарыятам і колгасьнікамі СССР усімі тымі дасягненьнямі, якія заваёваны імў вялікі Кастрычнік пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі. Акружаныя чорнымі сіламі рэакцыі і контррэволюцыі, пазбаўленыя ўсіх прывілегій, якімі карысталіся політзьняволеныя, нават ў самыя цяжкія часы царызму, пазбаўленыя права мець кнігу, газэту, аловак і кавалак паперы, пазбаўленыя магчымасьці перапісвацца са знаёмымі, сваякамі, атрымліваць дапамогу ад родных і знаёмых, яны ня трацяць бадзёрасьці і веры ў перамогу пролетарскай рэволюцыі ў Польшчы, у перамогу соцыялізму ва ўсім сьвеце.

Процэс ператварэньня Савецкай Беларусі з краіны балот і гушчароў у краіну індустрыяльна-аграрную, бурнае будаўніцтва фабрык і заводаў у Савецкай Беларусі, рост пролетарыяту, рост беларускай культуры, пасьпяховае выкананьне пяцігодкі—зьяўляецца для іх стымулам для далейшай барацьбы з турэм-

нымі „апрычнікамі". СССР для іх— гэта сьветазарны маяк:

„Калі ў час маўклівай адзіноты
Ляту я думкамі ў далячыню,—
Там бачу дар за цяжкія турботы,
Канец няўдзячнаму, няміламу жыццю.
Там, там далей на сонечным прасторы,
Сярод цьвітучых ніў і творчае красы,
Зіяюць постацьцю у казачным уборы
Надзеяў сёнешніх прыгожыя часы.
Ляту туды на крыльлях лятуценьня,
Ляту, каб там хоць сэрцам адпачыць,
Бо там ёсьць лек ад суму, зьнемажэньня...
Я сілу там бяру, натхненьне, прагу жыць".

Так выяўляе свае адносіны да СССР політзьняволены поэта Заходняй Беларусі С. С.

Пераможнае і пасьпяховае будаўніцтва соцыялізму ў БССР, зьнішчэньне рэшткаў капіталістычных элемэнтаў, кулацтва як клясы— апошняй апоры польскага імпэрыялізму і капіталізму наогул улівае ў іх змучаныя сэрцы веру ў свае сілы, у сілы польскага, беларускага і ўсяго міжнароднага пролетарыяту. Яны гэроічна змагаюцца з турэмнымі „рэгулямінамі" фашысцкіх Цьераў— душыцеляй рэволюцыйнага руху ў Польшчы. Галадоўкамі, сваёй крывёй, сваім жыцьцём і здароўем адваёўваюць політзьняволеныя правы на жыцьцё, змагаюцца за канчатковае вызваленьне ўсіх політзьняволеных у Полшчы.

Ліст польскага пролетарскага поэта Станіслава Бронеўскага з цэнтральнай турмы ў Варшаве дае жудасны малюнак становішча політзьняволеных, уключаючы сюды і зьняволеных рэволюцыйных пісьменьнікаў Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Польшчы.

„Пішам на паперы, у якой нам прынесьлі хлеб. Нашы перажываньні цяжкія і моральныя і фізычныя. Сьцьвярджаюцца нашыя протэсты ў справе лёсу політзьняволеных у Польшчы. Глыбока абураны сыстэмай гвалту, у арбіту якога трапілі і мы. Змучаныя вартымі пасьлядоўцамі ахранкі, але, як і ўсё політзьняволеныя, не злама, ны духам, перасылаем вам пакрыему жменьку ўражаньняў і назіраньняў.

Гэта жудасныя ўражаньні і назіраньні.

Пісьменьнікі схоплены бяз усякіх довадаў і повадаў для арышту, кінуты ў агульныя камэры разам са злодзеямі і альфонсамі, бяз ежы, без газэт і кніг...

Катаваньні—у парадку дня. Адзін з політзьняволеных, з якім мы спаткаліся пазьней, быў у дэфэнзыве так зьбіты і маў такі пакалечаны твар, што дэфэнзыва была прымушана адмовіцца ад фотографаваньня яго".

Вось лёс літаратараў-барацьбітоў, як у Заходняй Беларусі, Заходняй Украіне, так і ў Польшчы. Зразумелы прычыны, чаму рэволюцыйнае поэтычнае слова ў Заходняй Беларусі мае такое вялікае організуючае значэньне. З камэры ў камэру, з рук у рукі пераходзіць рэволюцыйнае слова, накрэмзанае крывёю на так званых „грыпсах"—нелегальнай перапісцы, яно зьяўляецца магутнай зброяй у руках партыі, рэволюцыянэраў пісьменьнікаў у барацьбе пролетарыяту і працоўнага сялянства за свае канчатковае вызваленьне з панскай няволі.

Рэволюцыйным пісьменьнікам няма часу і магчымасьці працаваць над формай вершаў, над апрацоўкай сваіх твораў. За кожным рухам пісьменьніка сочаць сотні вачэй шпікаў, провакатараў. Турма, дэфэнзыва—вось умовы працы рэволюцыйных пісьменьнікаў. Аднак, ня гледзячы на гэтыя ўмовы ўсе-ж такі пісьменьнікі не складаюць зброі і спраўляюцца з тымі задачамі, якія ставяць перад імі ўмовы клясавай барацьбы ў Заходняй Беларусі. Артыкулы, вершы, поэмы і апавяданьні, зьмешчаныя ў зборніку „Політвязень", гавораць аб высокім тэорытычным узроўні зьняволеных пісьменьнікаў.

Ніякімі рэпрэсіямі, ніякімі турэмнымі „рэгулямінамі" і шыбеніцамі ня стрымаць магутнага поступу рэволюцыі, ня здушыць рэволюцыйны рух Заходняй Беларусі, ня здушыць і рэволюцыйнага слова. Яно прабіваецца праз тоўстыя муры „Павяк", „Лукішак", Горадні, Луцку, і падымае працоўныя масы ў рашучы бой з душыцялямі-пагромшчы-

камі, за ўстанаўленьне дыктатуры пролетарыяту ў Польшчы.

Зразумела, для рафінаванага дробнабуржуазнага інтэлігента, які далёка стаіць ад барацьбы пролетарыяту, ад нацыянальна-вызваленчага руху ў ЗБ, ад барацьбы клясаў, гэта поэзія будзе незразумелай, будзе для яго чужой. Больш таго, ён схільны не прызнаваць за ёй права называцца поэзіяй. „Гэта агітка"— скажа ён з пагардай і далей ня пойдзе ў сваёй ацэнцы. Праўда, мы з свайго боку павінны адзначыць, што мастацкія сродкі гэтай літаратуры знаходзяцца на недастатковa высокім мастацкім узроўні, але гэта літаратура ўзьдзейнічае на масы, даходзіць да мас, зразумелая і блізкая ім.

Прастата і яснасьць мэтаімкненасьці гэтай літаратуры мае вялікае агітацыйна - палітычнае значэньне, яна накіроўвае пачуцьці і думкі чытача ў патрэбным для рэволюцыі напрамку.

Вось перад намі зборнік вершаў Л. Родзевіча „На паняволеных гонях". Гэты зборнік дае выразны малюнак таго становішча, у якім знаходзіцца Заходняя Беларусь пад ярмом белапольскіх окупантаў. Гэтыя вершы Родзевіча зьяўляюцца сваяасаблівай ілюстрацыяй настрояў усёй падняволенай краіны. Акупанты жорстка памыляюцца, калі думаюць інквізытарскімі мэтодамі задушыць нянавісьць пролетарыяту і працоўнага сялянства, якая выклікаецца падняволеным жыцьцём:

„Хоць вы сэрца на часткі парвеце,
У кожнай частцы жыць буду, каб мсьціць,
Помсты нашай нічым не згасіць.
Блізкі час, калі мы бліскавіцай
Тут запалім часы навальніц".

Так выяўляе свае настроі і настроі працоўных мас ЗБ Л. Родзевіч у вершы „ў дэфэнзыве".

Гэта не поэзія сьлёз і жальбы, гэта поэзія закліку да бязьлітаснай клясавай барацьбы за дыктатуру пролетарыяту, гэта поэзія веры і надзей у перамогу пролетарскай справы. Аўтар ведае, што:

„Цяпер іх сіла,—наша кроў,
Чырвоніць мур, цьвіце на гонях.
Яны нам сэрца рвуць з грудзёў
Прыкладам б'юць—друзгочаць скроні".

Поэта памятае, што яшчэ ня зьніклі сьляды карных экспэдыцый на палетках Заходняй Беларусі:

„На трэсках вырубленых пушч
Сьляды растрэленых паўстанцаў",

але окупантам нядоўга засталося панаваць:

„Што-ж, окупант, бушуй пакуль,—
А мы мець будзем перамогу.
На вас усіх нам хопіць куль,
На помсту нашу—вас нямнога".

У вершы мы маем ня толькі заклік да бунту, да паўстаньня. Тут аўтар паказвае канчатковую мэту паўстаньня мільёнаў:

„Паўстаньце мільёны, пабеда за намі,
На бой да чырвонае мэты:
За волю, зямлю і Саветы!"

Родзевіч паказвае, што толькі ва ўмовах дыктатуры пролетарыяту, ва ўмовах савецкае ўлады магчыма пабудаваць добрабыт рабочай клясы і працоўнага сялянства, пабудаваць пролетарскую культуру— нацыянальную па форме і соцыялістычную па зьместу.

Верш „Там і тут" у форме антытэзы паказвае ўмовы жыцьця рабочай клясы пад уладай белага арла і жыцьцё рабочых і сялян у вольнай краіне, у вялікай бацькаўшчыне сусьветнага пролетарыяту—СССР. Тут—у Заходняй Беларусі:

„Герб панскі, белы іх арол
У лапы зрэпіў знак праўленьня:
Нагайку, путы—то для сёл
І для рабочых на глумленьне".

У Соцыялістычнай савецкай Беларусі:

„Там молат вольнай працы знак,
А серп пажне таму, хто сее.
Мазоль—грамадзкасьці адзнака,
Жыцьцё цьвіце і багацее".

Як бачыце, гэта поэзія зьяўляецца свайго роду рэалізацыяй конкрэтных лёзунгаў КПЗБ у барацьбе з брудной хлусьнёй бульварнага фашысцкага друку, нацыянал-фашысцкіх і соцыял-фашысцкіх літаратурых брахуноў на соцыялістычнае будаўніцтва ў БССР. Гэта поэзія, зразумелая для рабочых і сялян, зьяўляецца свайго роду антытоксынай супроць папскіх бул, крыжовых паходаў, супроць інсынуацый беларускіх нацыянал-фашыстаў. Гэта поэзія зьяўляецца, у ліку іншых сродкаў барацьбы КПЗБ з буржуазнай дыктатурай, вастрэйшай зброяй на ідэолёгічным фронце Заходняй Беларусі. Гэта поэзія паказвае працоўным Заходняй Беларусі тую вялічэзную перавагу соцыялістычнай сыстэмы над капіталістычнай, паказвае полярнасьць, супроцьлегласьць гэтых сыстэм.

Зборнік „На паняволеных гонях" узгадоўвае сымпатыю да соцыялістычнага будаўніцтва ў БССР, да культурнай рэволюцыі, якая адбываецца ў нас. Поэта паказвае, што толькі ў Савецкай Беларусі на аснове нацыянальнай ленінскай палітыкі да канца вырашана нацыянальнае пытаньне, толькі там „адраджэньне наша ўсходзе", а не ў „культурнай" буржуазнай „дэмократычнай" Польшчы.

У вершы „Чым жыве рабочы" наглядна паказваюцца ўмовы працы на капіталістычных прадпрыемствах у Польшчы і Заходняй Беларусі:

„Я пры станку што дня пацею,
А дома голад сьмерцю страша,
Жыву змаганьнем і надзеяй,
Што перамога будзе наша.
Тут вытвараюць зьдзек для зьдзеку,
Зьдзіраюць скуру—крыкнуць годзе.
Тут дэфэнзыўная апека,
Рэжым фашысцкі верхаводзе.
Вас адрываюць ад машыны
На беспрацоўнае глумленьне..."

Тут паказываецца капіталістычная рацыяналізацыя, у выніку якой сотні тысяч беспрацоўных выкідаюцца на брук, на галодную сьмерць, калі:

„За старасьць, хворасьць і калецтва
Вон гоняць з фабрыкі ды квіта,
Хоць працаваў ты там з маленства,
Хоць потам нашым скарб іх зьліты".

Верш „Гутарка мужыка з панам" расчыняе нам узаемаадносіны паміж селянінам Заходняй Беларусі і памешчыкам. Селянін не заплаціў падатку. За гэта яго цягнуць у суд, у турму, забіраюць сэквэстратары апошнюю карову, апошнюю падушку, апошняе начыньне:

„Быдла, хам ты, совбандыта,
Мала, знаць, цябе набіта.
Ведай, што рэч Посполіта
Не твае, сьвіньня, карыта...
Я тут пан, цалуй мне боты".

Поэта не здавальняецца толькі паказам сялянскай нядолі і жабрацкага жыцьця, паказам селяніна, якога прыгнятаюць, эксплёатуюць. Поэта паказвае селяніна-рэволюцыянэра, які бунтуе супроць пана, зьвяртаючыся да яго са словамі: вон адгэтуль, крута, жыва".

Узрастаючая небясьпека ваеннай інтэрвэнцыі супроць БССР і СССР, небясьпека, якая навісла над рубяжамі бацькаўшчыны міжнароднага пролетарыяту, асабліва з боку польскага імпэрыялізму, польскае буржуазіі, якая марыць аб Польшчы „ад мора да мора", аб Польшчы ў межах 1772 г., ставіць перад поэтам задачу павышэньня пільнасьці рабочай клясы і працоўнага сялянства, ставіць задачу мобілізацыі ўвагі на абарону межаў СССР ад новай інтэрвэнцы, якая падрыхтоўваецца генэральнымі штабамі капіталістычных дзяржаў.

У вершы „Вайна вайне" Л. Родзевіч паказвае масам, што толькі ператварэньнем вайны імпэрыялістычнай у вайну грамадзянскую можна зьнішчыць войны незаўсёды, толькі праз узброенае паўстаньне ўстанавіць дыктатуру пролетарыяту ў Польшчы, Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны, толькі такім шляхам

можна зьнішчыць назаўсёды панскі зьдзек, панскую кабалу, эксплёатацыю чалавека чалавекам.

Зборнік Л. Родзевіча, мінаючы яго слабыя бакі, як схэматызм, павярхоўнасьць падыходу да зьяў жыцьця, неапрацаванасьць мовы і вершу, шурпатасьць вершу, усё-ж такі мае вялікае палітычнае і гісторыка-літаратурнае значэньне.

Вершы Родзевіча ўзгадоўваюць масы ў духу баявога інтэрнацыяналізму і комунізму. Паказываюць вялічэзную ролю правадыра вялікага Кастрычніка Ўладзімера Ільіча Леніна. У вершы „Ленін" поэта піша:

„Ленін выпалаў зямельку,
Слоў працоўнай беднаты.
Праца ўсходзе пладавіта,
Надзвычайнай пекнаты.
Ленін выпалаў зямельку
Бы той рупны гаспадар,
З дрэнства-зельля удаленька,
Жыў якім і бог і цар.
Распарушыў скрытых юдаў,
Жывадзёраў Калчакоў,
Разагнаў сьвятых і цуды—
Аман ім на век вякоў.
Для сялян і для рабочых
Шлях змаганьня даў адзін:
Імя Ленін іх адноча
І працоўных усіх краін.
Ленін дуж, бо разам з намі,
Пераможам разам з ім.
Уладу ў сьвеце возьмем самі,
Хто быў нічым, той стане ўсім".

Пераглядаючы зборнік Родзевіча „На паняволеных гонях", кідаецца ў вочы яго соцыяльная клясавая насычанасьць.

Аднак, трэба адзначыць, што Л. Родзевіч у мінулым (1921-22 гг.) знаходзіўся ў ідэолёгічным палоне нацыянал-дэмократызму. Яго зборнік вершаў „Беларусь", выданы ў 1922 г. у Вільні—гэта даніна нацыянал-дэмократызму. Тут ёсьць і беларуская самабытнасьць і культ народу беларускага з вялікай літары і такія лёзунгі, як „За праўду, бацькаўшчыну і волю", маецца і пэўная доля бяззубага пацыфізму. На ўсім гэтым зборнічку ляжыць пячатка дробнабуржуазнай рэволюцыйнасьці. Гэты час, час блуканьняў поэты, калі ён пытаецца:

„Братка, а можа мы блудзім?"

Яго сцэнічныя абразкі, як „Зьбянтэжаны Саўка", „Конскі портрэт" і інш. гавораць аб нясур'ёзнасьці падыходу пісьменьніка да літаратурнай дзейнасьці. Літаратуру—гэтую магутнейшую зброю ў клясавай барацьбе, пісьменьнік ператварае у сродак пацешаньня, каб пасьмяяцца, каб адцягнуць увагу гледача ад клясавай барацьбы, ад баявых пытаньняў дня. Гэта пара, калі поэта не зьяўляецца яшчэ актыўным барацьбітом за справу рабочае клясы, ён уцякае ад няпрыгляднай рачаіснасьці, не дапамагае прыгнечанай Зах. Беларусі.

Зборнік „На паняволеных гонях" сьведчыць аб вялікай працы над сабой, над сваім сьветапоглядам, аб глыбокім і складаным процэсе пераробкі сваёй дробнабуржуазнай сутнасьці і аб канчатковым пераходзе Родзевіча на позыцыі пролетарыяту, комуністычнае партыі.

Гэты зборнік сьведчыць аб канчатковым адыходзе Родзевіча ад позыцый нацыянал-дэмократызму і опортунізму ў сваёй творчасьці, гэты зборнік сьведчыць аб вялікім творчым росьце поэты-барацьбіта. І тыя твары, якія Родзевіч выдаў у Савецкай Беларусі, зборнікам „Рэволюцыйным шляхам", і „Вогнішча барацьбы", гавораць нам аб вялікіх творчых магчымасьцях пісьменьніка.

В. Таўлай

Сярод твораў літаратурнага рэволюцыйнага маладняка Заходняй Беларусі заслугоўвае ўвагі поэма маладога поэта Валенціна Таўлая „Непераможная".

Поэма адлюстроўвае процэс зьяўленьня Грамады, яе разьвіцьцё і, нарэшце, разгром польскім фашызмам у 1927 годзе. Вось вытрымкі з

8 песьні, дзе аўтар паказвае магутны рост Грамады:

„Ідзе народ—
Сярпа, касы
Станка і молата—
Змагаць бяду
У Грамаду.
Яна расьце,
Рады шчыльнеюць,
Ірвецца песьня
З іх грудзей
Стальных людзей.
Трасецца пан:
Канец прыходзіць
Яго раскошы,
І ён дрыжыць...“

У 9-й песьні поэта абагульняе грамадаўскі рух, адзначае яго гісторычнае і палітычнае значэньне, як масавага, рабоча-сялянскага руху, які ўзьняўся з нізін, і не на жарт, напалохаў польскую і беларускую буржуазію:

„Грамада—паном страх;
Грамада іхні крах;
Грамада—для іх магіла;
Грамада—працоўных сіла.
Панскі страх расьце, мацнее—
А ў яе рады шчыльнеюць.
Вышла, вышла тысяч сто
На шырокі на прастор.
Вышаў, вышаў грозны волат—
Падбірай, панок, падолы.
Скора бунтам закіпіць
Нёман, Шчара—будзем біць!
Перад намі ясны шлях—
Калаці паноў па лбах.
Заўтра ў панскім у двары
Будзем мы гаспадары“.

Поэма Таўлая „Непераможная“ насычана зьместам клясавай барацьбы. Яна вышла ў той момант, калі польскі фашысцкі суд пасадзіў Грамаду і ўвесь падняволны беларускі народ на лаву падсудных, калі катаржныя прысуды лідэрам Грамады, як Тарашкевічу і інш. выклікалі хвалю абурэньня сярод працоўных Заходняй Беларусі. Гэтая поэма ходзіць у рукапісным выглядзе з рук у рукі ў Заходняй Беларусі, асабліва сярод комсамолу, дэклямуецца на вечарох.

У поэме „Непераможная“ і ў шэрагу вершаў, як і Родзевіч, В. Таўлай паказвае рэволюцыянізуючую ролю Савецкай Беларусі, Савецкага Менску, як культурнага цэнтру, які прыкоўвае да сябе ўвагу ўсіх абяздоленых і прыгнечаных сялян і рабочых Заходняй Беларусі і служыць пуцяводным маяком на шляху да пролетарскай рэволюцыі ў Польшчы. Поэта з любоўю, з гарачай сымпатыяй піша аб Савецкай Беларусі, аб тых радасных чутках, якія ходзяць сярод сялян Заходняй Беларусі пра тое, што:

„Там паноў назаўсёды прагналі,
Паказаўшы на Захад шлях.
Там рабочымі фабрыкі сталі,
І мужыцкаю стала зямля“.

Больш таго, там канчаткова вырашана нацыянальнае пытаньне, дадзены самыя шырокія магчымасьці для разьвіцьця нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зьместу культуры (і літаратуры), воляю мільёнаў працоўных усяго Савецкага саюзу Беларусь Савецкая становіцца краінай з перадавой тэхнікай, краінай суцэльнай колектывізацыі, „краінай фабрык дымных і машын“, як пісаў нябошчык Паўлюк Трус. У Савецкай Беларусі:

„Не завецца больш „хамскаю“ мова—
Там рабочы селянін,
Беларускае роднае слова
Вывеў к сонцу з здвечных нізін.
У братэрскай сям'і народаў
І Савецкая Беларусь,
Перамагаючы непагоды
Новых дзён запаліла зару“.

Наперакор усёй хлусьні польскіх фашыстаў, і беларускіх нацыянал-фашыстаў аб тым, што нібы беларуская культура, беларуская мова прыгнятаюцца, зацірающца „рускімі бальшавікамі“, поэта Таўлай супроцьстаўляе гэтай хлусьні нашу нацыянальную палітыку, на падставе якой усе калісь прыгнечаныя царызмам нацыі пры актыўным удзеле ўсяго пролетарыяту Савецкага саюзу і комуністычнай партыі, стварающь якасна новую, вялікую соцыялістычную культуру для сусьветнага пролета-

рыяту, у тым ліку для рабочых і сялян Заходнай Беларусі.

І калі беларускі нацыянал-фашысцкі поэт Заходняй Беларусі А. Бартуль піша вершы аб нацыянальнай годнасьці беларуса ў наступных „высокаўзьлётных" выразах:

„Я беларус—імя сьвятое.
Я горды ім, бясконца горды я:
Яно той скарг, яно мне дарагое,
Яно ёсьць шчасьце майго жыцьця",

то ў вершах Таўлая выказваюцца рэзка супроцьлеглыя думкі. Яго цешыць той факт, што на ўсходзе творыцца новае жыцьцё, новая соцыялістычная грамада, новая соцыялістычная культура.

"Не вярнуцца больш царскаму трону—
Да старога ўзарваны масты.
Эх, Усход!.. Эх, Усход чырвоны!
Нашы сэрцы палоніш ты.
І нясецца радасным гоманом
Песьня волі і працы рытм
Па-над Шчараю і па-над Нёманам,
Дзе крывёю прастор залі́т".

Яго поэзія інтэрнацыянальная і рэволюцыйная. В. Таўлай спазнаў „усе добрачыннасьці" і смак „цывілізаванай буржуазнай Польшчы. На сваёй уласнай сьпіне адведаў смак „заходняй культуры". Ён пабываў у дэфэнзыве на допытах, у турме, ён стаяў перад панскім судом. І ў адказ на гэта з-пад яго пяра выходзяць вершы, прасякнутыя клясавай нянавісьцю, як, напр., „Апошняе слова", „Белапольскім окупантам". Гэтыя вершы насычаны рэволюцыйным запалам барацьбіта. Ён зварочваецца да тыранаў не з плаксівымі просьбамі, жальбой, наадворот, ён прадсказвае буржуазіі гісторычную сьмерць:

„Пачуйце, тыраны! Не плач то нясецца,
Ня стогн набалелай душы.—
То гневу народнага гром раздаецца,
Расплаты рыхтуе грашы.
Тыраны! Ні мукі, ні зьдзекі, ні краты,
Ня змогуць стрымаці народ.
Упадзе забіты яго прыганяты
І—сонца настане ўсход.
Цяпер-жа гуляйце. Кроў пеце, тыраны,
Ды знайце—апошнія дні.
Дух помсты лунае над краем забраным
І зьяюць бунтарства агні".

На апошніх творах В. Таўлая ў значнай ступені адчуваецца ўплыў лепшых польскіх пролетарскіх пісьменьнікаў, як Бруно Ясенскі і Броневускі. Асабліва гэта адчуваецца ў такім вершы, як „У дэфэнзыве", у фрагмэнтах новай поэмы, прысьвечанай лепшаму рэволюцыянэру-бальшавіку, трагічна загінуўшаму на Каўказе, тав. Канчэўскаму.

Перад Таўлаем ёсьць шырокія магчымасьці творчага росту. Яму неабходна ўзмоцнена працаваць над засваеньнем дыялектыка-матэрыялістычнага мэтоду, над сьветапоглядам. Калі ён здолее ўсю сваю творчасьць прасякнуць бальшавіцкай партыйнасьцю, то яго поэзія будзе яшчэ ў большай ступені дапамагаць рабочай клясе будаваць соцыялізм, зьмяняць жыцьцё, зьмяняць самога сябе.

Тэматыка Таўлая—гэта тэматыка шэрых будняў вастрожнага жыцьця, барацьба з белапольскімі окупантамі („Сонейка глянула ў камэру цёмную", „У дэфэнзыве", „Скаваны бунтар", „Цэгла за цэглай").

З другіх рэволюцыйных поэтаў Заходняй Беларусі найбольш аформленыя ў сваёй творчасьці гэта т. т. Зьвястун і Сьвітка. Іх творчасьць раскідана па турэмных рукапісных часопісах. Час ад часу яны трапляюць на волю з-за крат і ўзьнімаюць рэволюцыйны энтузыязм і веру ў перамогу справы пролетарскай рэволюцыі ў Заходняй Беларусі. Вось верш Зьвястуна. „Над намі віхры выюць", выдрукаваны ў зборніку пісьменьнікаў Заходняй Беларусі „Рунь веснаходу", які характарызуе да пэўнай ступені яго творчасьць:

„Над намі віхры выюць і лісьцем дрэў
лапочуць,
І хмары чорныя варожа нам гудуць—
І страх і сьмерць, і барацьбу прарочаць,
І весткі ваяўнічыя нясуць.
Мы людзі, мы арлы, мы ў вочы злога
року
Пасьмелі кінуць вызаў і протэст.
І наш прызыў адклікнуўся далёка
І новага жыцьця ліе будзячы сьвет.

Ты лёсаў нашых пан, далоў ужо з п'едэсталу,
Насільлю тваему прарочым мы канец,
Бо сьмерць ужо табе ад нашых рук настала—
Мы стопчам, разарвём паганскі твой вянец.
Мы людзі, мы арлы—гаворым табе ў вочы,
Пад буры сьвіст і ропат бурных хваль,—
Расьсеем змрок твае паганскай ночы
І заклік падамо ў бушуючую даль".

Тав. Сьвітка напісаў (апрача вершаў) шэраг апавяданьняў з жыцьця Заходняй Беларусі, з жыцьця асаднікаў, як „Паны балявалі", „Гарыць лес", „Амністыі" і інш. Ен зараз знаходзіцца ў фашысцкім вастрозе ў Польшчы.

Міхась Васілёк.

У пэрыод росквіту Беларускай сялянска-работніцкай грамады прымазвацца да нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі, зьяўляецца, так сказаць, папутнікам гэтага руху. Але папутніцтва М. Васілька было ня моцным, ня глыбокім. Зьмяшчаючы свае вершы ў грамадаўскай рэволюцыйнай прэсе, супрацоўнічаючы ў рэдакцыі „Маланка", ён ў той-жа час прыслугоўваецца і перад такімі агіднымі палітычнымі шулерамі, як вядомы на віленскім бруку белагвардзеец Умястоўскі. Міхась Васілёк друкуе свае вершы ў брудненькай бульварнай антысавецкай газэціне, як „Беларускі дзень". „Абы друкавацца!"—вось яго лёзўнг. Гэта сьведчыла аб яго двурушніцтве ў адносінах да нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі.

Зараз у пэрыод абнаглелага паходу фашысцкай рэакцыі на нацыянальна-вызваленчы рух, у час, калі над паднявольнай акупацыоннай краінай замітусіліся цені шыбеніц, зараз, калі польскі фашызм шалёна рыхтуецца да нападу на Савецкі Саюз, калі ў ход пушчаюцца ўсе сродкі і мэтоды, каб на Заходняй Беларусі і Зах. Украіне падрыхтаваць пляцдармы для крывавай інтэрвэнцыі на краіну, дзе будуецца соцыялізм,—Міхась Васілёк, як ганебнейшы здраднік перабягае ў лягер беларускага контррэволюцыйнага нацыянал-фашызму, пад прадажныя сьцягі Луцкевічаў, Астроўскіх, за сьпіной якіх стаіць з ног да галавы ўзброены польскі фашызм.

Міхась Васілёк паказаў, нарэшце, сваё сапраўднае аблічча прадстаўніка тэй клясы, якая зьяўляецца ў панявольнай краіне саюзьнікам окупантаў—беларускай буржуазіі і кулацтва.

Васілёк тым больш небясьпечны, што ён прыкрываецца сваім мінулым, комплектамі грамадаўскага друку, у якіх калісьці зьмяшчаліся яго вершы. Таму, трэба сарваць з усёй рашучасьцю маску з Васілька, паказаўшы яго рабоча-сялянскім масам Зах. Беларусі ва ўсёй „красе", як здрадніка і зброяносца нацыянал-фашысцкай ідэолегіі ў сваёй творчасьці.

У апошні час Міхась Васілёк супрацоўнічае ў беларускім нацыянал-фашысцкім часопісе „Нёман".

Антон Навіна—ён-жа Антон Луцкевіч у рэптыліі „Беларускі звон" № I, за 7 студзеня 1932 г. гладзіць рукамі па галоўках сваіх літаратурных „птенчыков и птенцов" у тым ліку і Міхася Васілька. Ен піша аб павароце ў творчасьці М. Васілька ў бок нацыянал-фашызму „тэматыка якога (Васілька-А. С.) яўна аднаўляецца". А таму і ня дзіва, што орган віленскіх фашыстаў „Кур'ер Віленскі" даў пахвальную ацэнку „Нёмана";

„Нёман" рэдагуецца найлепшымі літаратурнымі сіламі...

Як вонкавы выгляд часопісу, так і ўнутраны яе зьмест заслугоўваюць на шырэйшае прызнаньне.

Акупанты асыгноўваюць для літаратурнай ўзнагароды беларускіх поэтаў і пісьменьнікаў у Вільні I. 500 злотых. Якая „ідылія"!

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што польскі фашызм сумесна з беларускім нацыянал-фашызмам узмоцнена працуюць над мабілізацыяй і літаратурных сіл для прыцягненьня іх на службу фашызму, каб на выпадак вайны з СССР мець сваіх стражнікаў і ў літаратуры, якія будуць апрацоўваць „грамадзкую думку“ для нападу на Савецкі Саюз, якія будуць апраўдваць усе злачынствы белагвардзейшчыны над працоўным народам Заходняй Беларусі.

Час ад часу, праз поліцэйскія заставы і кордоны ў Заходнюю Беларусь трапляюць лепшыя творы пролетарскіх і савецкіх поэтаў Савецкай Беларусі. Гэтыя творы адыгрываюць там вялічэзную рэволюцыянізуючую ролю, яны карыстаюцца буйным посьпехам, робяць вялікі ўплыў на працоўныя масы. Творы перапісваюцца, як, напрыклад, поэта Міхася Чарота „Босыя на вогнішчы“, „Фабрыка сьмерці“, Андрэя Александровіча, поэма Паўлюка Труса „Дзесяты падмурак“ і інш. Іх завучваюць на памяць, іх тайна, з-пад палы, пашыраюць па вёсках.

Буйнай популярнасьцю карыстаецца верш Александровіча „Фабрыка сьмерці“ сярод політзьняволеных Заходняй Беларусі. Гэты верш вы знойдзеце амаль у кожным сшытку політзьняволенага. Праўда, у сучасны момант політзьняволеныя ў фашыстоўскіх турмах Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны пазбаўлены і гэтай магчымасьці—мець сшытак і аловак у камэры, у зьвязку з выданьнем так званага „рэгуляміну веньзеннэго“—турэмнага рэгуляміну.

Аднак трэба адзначыць надзвычай нездавальняючую слабую ўвагу, якая ўдзяляецца пісьменьнікамі Савецкай Беларусі тэматыцы Заходняй Беларусі і проблеме барацьбы працоўных мас на чале з комуністычнай партыяй з белапольскімі окупантамі. Патрэбна ў самы кароткі час ліквідаваць гэту запазычанасьць нашых пісьменьнікаў перад працоўнымі масамі Заходняй Беларусі, перад комсамолам і партыяй.

Працоўныя масы Заходняй Беларусі чакаюць ад нашых поэтаў і пісьменьнікаў мастацкага, вобразнага паказу жудаснага жыцьця і і гэроічнай барацьбы працоўных Заходняй Беларусі.

Пролетарская літаратура (верш, поэма, апавяданьне, нарыс) павінна мобілізаваць увагу савецкай грамадзкасьці да лёсу нашых братоў па клясе, якія знаходзяцца на другім баку кордону.

Ня гледзячы на жорсткі ўціск першыя парасткі пролетарскай літаратуры Заходняй Беларусі растуць і мацнеюць.

Менск. 24-XI 1931 г.

Ул. Сядура

Камсамол у беларускай паэзіі

Агульная пастаноўка праблемы камсамольскай літаратуры

У апошні час, як ва ўсім Савецкім саюзе. так і ў БССР, у прыватнасьці, мы наглядаем узмоцненую зацікаўленасьць камсамолу да пралетарскай літаратуры. Дыскусія паміж „Комсомольской правдой“ і РАПП'ам, выступленьне т. Косарава на апошнім пленуме ЦК ЛКСМУ, у якім было значнае месца адведзена пытаньням літаратуры, арганізацыя аб'яднаньня камсамольскіх пісьменьнікаў „Молодая гвардия“, правядзеньне агляду камсамольскай літаратуры і цэлы шэраг іншых фактаў з літаратурнага жыцьця РСФСР; арганізацыя камсамольскаи ячэйкі пісьменьнікаў у Менску, заключэньне дагавору сацыялістычнага супрацоўніцтва і змаганьня за вялікае бальшавіцкае мастацтва паміж камсамоліяй г. Менску і МенАПП'ам, наладжваньне вечароў камсамольскай літаратуры, агляд беларускай камсамольскай літаратуры і інш. па БССР—усё гэта факты павароту камсамолу тварам да літаратуры.

Рост зацікаўленасьці камсамолу да пралетарскай літаратуры гаворыць аб вялізарным росьце культурных запатрабаваньняў нашай моладзі. Паварот камсамолу да пралетарскай літаратуры адначасна зьяўляецца новым фактам посьпехаў культурнай рэвалюцыі, посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва. Толькі на аснове посьпехаў культурнай рэвалюцыі, якія непасрэдна і неадлучна выцякаюць з посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва наогул, мы маем зараз рост увагі камсамолу і ўсяго пралетарыяту да пралетарскай літаратуры. Усё гэта гаворыць за тое, што „літаратурная справа становіцца часткаю агульна-пралетарскай справы“.

Рост увагі камсамолу да пралетарскай літаратуры, асабліва зараз, у сувязі з вялізарнымі посьпехамі змаганьня за сацыялістычную рэканструкцыю,—у тым ліку рэканструкцыю і чалавечага матэрыялу—зусім законамерны. Расьце роля мастацкага слова, як зброі ў класавым змаганьні, як сродку выхаваньня працоўных мас у камуністычным напрамку. Пралетарская літаратура зьяўляецца перадавым байцом у змаганьні за пераробку чалавечага матэрыялу, перадавым атрадам культурнай рэвалюцыі. І цяпер, у сувязі са змаганьнем за шматмільённы камсамол, калі перад пралетарскай літаратурай паўстае вялізарная і адказная задача дапамогі камсамолу ў справе выхаваньня мільёнаў навічкоў, што,

уліваючыся ў камсамол, нясуць з сабою рэшткі старой псыхаідэалёгіі, рэшткі старога сьветапогляду і г. д.—рост увагі камсамолу да мастацкай літаратуры асабліва неабходны і вельмі сваячасовы.

„Пралетарская літаратура павінна дапамагчы партыі і камсамолу даць маладому пакаленьню напрамак у жыцьці" (Косараў). А гэта задача немалая і нялёгкая. Стварыць такую літаратуру, якая з посьпехам магла-б выконваць гэтую задачу, якая была-б вартай сваёй гэроічнай клясы,—гэта задача ўсяе савецкай грамадзкасьці і ўсяго камсамолу, а ня толькі пісьменьніцкіх мас. Толькі пры такіх умовах з посьпехам можна стварыць камсамольскую літаратуру.

І тут узьнікае пытаньне, што такое камсамольская літаратура і якое яе месца ў агульнай літаратуры пралетарыяту?

Тут мы перш за ўсё, у адказ розным абываталям і мяшчанам, павінны заявіць, што ніякіх літаратурна-палітычных рознагласьсяў паміж пралетарскай літаратурай і камсамолам, паміж аб'яднаньнем пралетарскіх пісьменьнікаў—РАПП'ам ці ВОАПП'ам, ягоным атрадам БелАПП'ам—і камсамолам няма і быць ня можа.

Літаратурна - палітычнай лініяй тых і другіх зьяўляецца лінія партыі ў літаратуры і ніякая іншая.

Камсамольскай літаратурай зьяўляецца вучастак пралетарскай літаратуры, тэматыкай якой выступае камсамол, ягоная гэраічная барацьба пад кіраўніцтвам партыі на франтох сацыялістычнага будаўніцтва.

Камсамольская літаратура не ўяўляе сабою якуюсьці самастойную, асобную ад пралетарскай, літаратуру. Яна арганічна ўваходзіць, як камсамольскі вучастак, у агульную пралетарскую літаратуру. Коратка кажучы, камсамольскай літаратурай зьяўляецца пралетарская літаратура, аб'ектам якой ёсьць камсамол.

Будзе зусім няправільна, нават шкодна, казаць, аб якойсьці літаратуры спэцыяльна для моладзі і камсамолу. Камсамол уяўляе сабою моладзь, якая працуе, як і ўвесь пралетарыят, пад кіраўніцтвам партыі, і таму няма патрэбы для якойсьці спэцыфічнай, адрозьненай і адлучанай ад пралетарскай літаратуры. Пралетарская літаратура зьяўляецца адначасова і літаратурай камсамолу. І таму, калі мы кажам пра камсамольскую літаратуру, мы маем на ўвазе камсамольскую тэматыку, паказ гэраічнае барацьбы камсамолу пад кіраўніцтвам партыі за сацыялізм, пастаноўку ў пралетарскай мастацкай літаратуры спэцыфічных камсамольскіх праблем.

Калі мы так кажам пра камсамольскую тэматыку, то гэта яшчэ зусім ня значыць, што мы выпускаем з пад увагі тую моладзь, якая на сёнешні дзень яшчэ пакуль што не знаходзіцца ў шэрагах камсамолу, але аддана працуе і змагаецца разам з усім пралетарыятам. Камсамольская тэматыка ўключае ў сябе і гэтую моладзь. У сьвятле змаганьня за шматмільённы камсамол, у сьвятле будаўніцтва сацыялізму, наогул павінна атрымаць належны паказ у мастацкай літаратуры і гэтая моладзь. Камсамольская літаратура павінна быць літаратурай адначасова і ўсяе пралетарскае моладзі. Рэзалюцыя ЦК партыі ў пытаньнях літаратуры, перад пралетарскай літаратурай высунула задачу: „быць літаратурай ня цэху, а вялікае клясы, вядучай за сабою мільёны сялян". У адносінах да камсамольскай літаратуры мы можам сказаць, што яна павінна быць не літаратурай цэху, а вялікага камсамолу, які вядзе за сабою ўсю моладзь, дапамагаючы камсамолу выхоўваць

яе ў камуністычным напрамку, патрэбным для будаўніцтва сацыялістычнага грамадзтва.

Таму будзе правільным фармуляваць наша змаганьне за камсамольскую тэматыку, як змаганьне за тэматыку наогул маладзёжную, ня выпушчаючы пры гэтым галоўнага— пад якім кутом, у сьвятле якога сьветапогляду трактуецца гэтая тэматыка. Для камсамольскага сэктару пралетарскай літаратуры трактоўка маладзёжнае тэматыкі павінна ісьці пад знакам чарговых баявых задач камсамолу ў сацыялістычным будаўніцтве і культурнай рэвалюцыі. У гэтым спэцыфічнасьць камсамольскай літаратуры.

Што тычыцца шырэй творчага мэтаду, то тут дыялектычна-матэрыялістычны мастацкі мэтад, марксысцка-ленінскі сьветапогляд зьяўляецца агульным для ўсёй пралетарскай літаратуры, г. зн. і для яе камсамольскага сэктару.

Разьвіцьцё камсамольскай літаратуры павінна праходзіць пад знакам змаганьня за камсамольскага пісьменьніка, марксыста-дыялектыка.

І першым, што зьяўляецца неабходнай прадумоваю пасьпяховасьці барацьбы за дыялектычна-матэрыялістычны творчы мэтад, гэта аўладаньне марксысцка-ленінскім сьветапоглядам. Без аўладаньня марксысцка-ленінскім сьветапоглядам і без прасякненьня ім усяе творчае работы пісьменьніка—не стварыць камсамольскай літаратуры, вартай камсамолу, як і не стварыць бяз гэтага і літаратуры наогул, вартай нашай эпохі. Бязумоўна, гэтае аўладаньне сьветапоглядам павінна адбывацца на аснове практыкі, на яснове непасрэднага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве і толькі ў практыцы будзе правярацца мера аўладаньня ідэямі Маркса, Энгэльса і Леніна.

Цяпер, калі перад усёй пралетарскай літаратурай стаіць вялізарная задача змаганьня за вялікае мастацтва бальшавізму, гэты лёзунг набывае асабліва важнае значэньне і для камсамольскай літаратуры, як часткі пралетарскай літаратуры.

Лёзунг вялікага бальшавіцкага мастацтва, уключаючы ў сябе, як галоўную прадмову, аўладаць марксыцка-ленінскім сьветапоглядам, канкрэтна, у дачыненьні да камсамольскай літаратуры, як і да ўсяе пралетарскай літаратуры, знайшоў сваё выяўленьне ў задачы стварэньня дадатнага гэроя нашай эпохі. Гэтую задачу вельмі чотка завастрыў у адным з сваіх апошніх выступленьняў т. Косараў:

„Мы патрабуем ад нашых літаратурных арганізацый, ад пралетарскіх паэтаў і пісьменьнікаў, каб яны сваёй творчасьцю, сваім майстэрствам добра апісалі-б тып гэроя сацыялістычнага будаўніцтва, які-б адлюстраваў імкненьне перадавых барацьбітоў за сацыялізм, апісаньне якога прымусіла-б кожнага маладога рабочага і селяніна падумаць: так, я хачу быць такім-жа, я хачу быць падобным да яго, ён зьяўляецца маім ідэалам".

І трэба сказаць, што задача стварэньня дадатнага тыпу эпохі знаходзіць вельмі добрае выяўленьне ў той працы па паказу гэроя сацыялістычнага будаўніцтва, якое разгарнула пралетарская літаратура. Праз канкрэтны паказ гэрояў сацыялістычнага будаўніцтва пралетарская літаратура і будзе ісьці да ажыцьцяўленьня задачы стварэньня дадатнага тыпу эпохі.

У гэтай справе стварэньня дадатнага тыпу эпохі не малая роля прыпадае на камсамольскую літаратуру. Яна павінна праз канкрэтны паказ гэрояў ударнікаў-камсамольцаў і наогул усяе моладзі ісьці да стварэньня дадатнага, шырока абагуленага тыпу камсамольца, гэроя ў змаганьні за ідэалы камсамолу,

які-б зьяўвіўся прыкладам для ўсяго камсамолу і для ўсяе нашае моладзі.

Бязумоўна, гэты паказ павінен ісьці па шляху паказу гэроя ва ўсіх супярэчнасьцях, супроцьлегласьцях, ва ўсёй рознастайнасьці і ўсебаковасьці, ва ўсёй складанасьці, а не па шляху адкіданьня гэтых супярэчнасьцяй, па шляху раскрыцьця гэтае складанасьці; а не па шляху яе лякіроўкі, як гэта прапаноўваюць некаторыя таварышы.

Пярэйдзем цяпер да таго, што наогул ёсьць у беларускай літаратуры па лініі камсамольскай тэматыкі. Тут мы можам заявіць, што камсамол, асабліва рэканструкцыйнага пэрыоду, у беларускай літаратуры не атрымаў належнага адлюстраваньня. Можна сказаць, што ёсьць толькі асобныя спробы паказу камсамолу. У большасьці гэтыя спробы носяць (асабліва ў паэзіі) больш выпадковы, эскізна-імпрэсыяністычны, калі так можна сказаць, характар. Няма шырокага вобразнага адлюстраваньня ў беларускай літаратуры камсамолу.

Праўда, з другога боку, нельга сьцьвярджаць таго, што ў беларускай літаратуры пра камасамол амаль нічога ня маецца. Каб зьняпраўдзіць гэтую думку, варта напомніць хоць-бы гэткія творы як аповесьць „Вінаваты" Платона Галавача, аповесьць „Каландры" Броўкі, новую аповесьць „Наша сонца" Барыса Мікуліча і іншыя творы беларускай мастацкай прозы. Варта напомніць цэлы шэраг паэтычных твораў: Паўлюка Труса, Чарота, Александровіча, Броўкі, Таўбіна, Андрэя Ушакова і інш., прысьвячоных камсамолу. Але, ня гледзячы, на ўсё, паказ камсамолу ў беларускай літаратуры ў асноўным зьяўляецца слабым. Пра гэта трэба сказаць адкрыта і рашуча. На гэтым неабходна завастрыць увагу.

Камсамол у беларускай паэзіі

Паказ камсамолу ў беларускай паэзіі амаль выключна прыпадае на паэзію БелАПП'аўскую. Большасьць твораў пра камсамол прыпадае на пэрыод аднаўленчы. Тут мы маем такія творы, як „Юны змаганец" і „Астрожнік" Паўлюка Труса, „Камсамолія" Міхася Чарота, „Камсамол" Андрэя Александровіча, „Райком" і інш. вершы Ю. Таўбіна.

Гэтыя творы пісаны тады, калі ўжо адгрымелі буры грамадзянскае бойкі, і краіна ўступіла ў паласу аднаўленьня разбуранае гаспадаркі ды і ня толькі прыступіла, але ўжо шмат і прарабіла ў галіне адбудаваньня. Таму галоўны матыў гэтых твораў—гэта роля і энтузыязм камсамолу на франтох будаўніцтва новага жыцьця. Грамадзянская вайна тут выступае, як успамін гэраічнага мінулага, як напамін пра той гэраізм, які быў неадлучаным стымулам перамог камсамолу, моладзі на франтох грамадзянскае вайны. Гэты гэраізм, энтузыязм выступае тут не як самамэтны гэраізм „бязвусых энтузыястых", а як гэраізм мэтавы, усьвядомлены ў разрэзе сацыялістычных ідэалаў пралетарыяту. Таму гэты гэраізм служыць задачай далейшага будаўніцтва новага жыцьця. Кажучы так, мы маем на ўвазе асноўную лінію, якая прасякае ўсе гэтыя творы.

Паўлюк Трус першы даў мастацкія вобразы гэраічнага, адданага змаганьня моладзі, камсамолу ў грамадзянскай бойцы.

У паэме „Юны змаганец" ён падае вобраз адважнага юнака, партызана Янкі і яго брата „атамана паўстанцаў" камсамольца Міхася, якія вядуць гэраічнае змаганьне з белапольскімі бандамі пазнанцаў". У паэме пададзены моманты далучэньня маладых паўстанцаў да чырвоных атрадаў і сумеснага пераможнага змаганьня супроць агуль-

нага ворага. Паэма канчаецца ўздымнымі радкамі пра „юнага змаганца.

„Сёньня ён ды нястрымана—вольны
Піанэр і паўстанец у вёсцы,
Дзе нядаўна ў часы падняволья
Гадаваўся ў пакутах і рос.
Яго брат, што старое разбурыў,—
Камсамол з пралетарскаю верай...
Яму матка—узгадована бурай
Камсамолія БССР".

У вершы-паэме „Астрожнік" П. Трус дае вобраз паўстанца юнака „камсамольца Якіма", які адважна сустракае кару расстрэлам з рук ворагаў, бо тая справа, за якую ён змагаўся, ён верыць, не памрэ, а будзе даведзена працоўнымі да канца:

„Ён памёр... Расстралялі Якіма...
Цёмны бор зашумеў галасьней
Але справа магутнага КІМ'у
Не памрэ,—будзе вечна квітнець".

Міхась Чарот у паэме „Камсамолія" дае сынтэзаваны вобраз камсамолу часоў грамадзянскае вайны і аднаўленчага пэрыоду. Новым здаровым, жыцьцярадасным, што нясе з сабою камсамол, вее з кожнага радка Чаротавай „Камсамоліі". Адзінства, зьяднанасьць, радаснаптымістычнае сьветаўспрыйманьне гэраічнасьць, нязломнасьць— вось рысы Чаротавай „Камсамоліі". Цікава, што тэндэнцыя адзінства гораду і вёскі, якая праходзіць праз усю творчасьць М. Чарота, выявілася і на вобразах камсамолу. Чаротава „Камсамолія" выступае ў сынтэзаваным вобразе гораду і вёскі.

„На заводах, на фабрыках дымных,
Дзе палёў сінявокі прастор,—
Яны злучаны палкім уздымам,
Іх злучае юнацкі задор.

. . . . . .

Вёска дрэмле... Вечар ліпнёвы...
Толькі вуліц звонкі сьмех...
У лапці абуты з ліп новых
Едуць яны на начлег.
... Сьвіткі зрэбны... палатаны...
Фабрычнага дыму пах...
Гора бачылі шмат яны,
І цяпер ім змагацца—ня страх".

Праўда, кіруючай ролі пралетарскага гораду вядучай супроцьлеглясьці тут ня відаць—пераважае стыхійнасьць.

Паэма „Камсамолія" М. Чарота адлюстроўвае баявыя ўздымныя настроі, якія валодалі камсамоліяй пасьля пераможнага канца грамадзянскае вайны ў пачатку аднаўленчага пэрыоду, калі яшчэ вельмі і вельмі сявежымі былі непасрэдныя ўражаньні ад гэраічных боек. Радасьць перамогі да таго захлёствала, валодала ўсім, што часамі нават далейшыя задачы ў сваёй канкрэтнасьці ў некаторых пісьменьнікаў вуаляваліся рамантычнай заслонай уздыму ад перамогі. Таму і „Камсамолія" Чарота мае завельмі рамантызаваны характар, калі яснае ўсьведамленьне далейшых і чарговых задач падмяняецца, агульнай рамантычна-ўзьнятай патэтыкай.

„І расьце, і расьце, і мужае
Камсамольцаў адважная раць!
Што ім вораг? Што і мяжа ім,
Як захочуць яны пагуляць!"

Таму ў палоне гэтага ўздыму часамі і ў „Камсамоліі" зьнікае мера аптымістычнасьці і губляецца канкрэтны, рэальны малюнак змаганьня далейшых задач. Таму і рачаіснасьць прымае нейкі падсалоджаны выгляд, зьнікае складанасьць, супярэчнасьці цяжкасьці змаганьня:

„Ня жыцьцё—а раздольле...
Бо дзеці пасўтаўшых краін...
Беларусь і ты, Камсамолія".

Адгэтуль і стыхійнасьць. Але Чаротава „Камсамолія" ў той час зьявілася першым гучным мастацкім водгукам беларускай паэзіі на камсамольскую тэматыку.

У адносінах перамаганьня гэтай рамантычнай ідэалізацыі, перамаганьня агульнай патэтыкі далей пайшоў Андрэй Александровіч. У невялічкай паэме „Камсамол" (1925 г.) Александровіч падае камсамол на фронце тэй будаўнічай працы, у якую камсамол акунуўся

адразу пасьля грамадзянскай вайны. (Праўда апошнюю паэта ўспрымае, як „мяцежную стыхію", а не як кіруемы партыяй працэс). Александровіч пайшоў па шляху паказу творчых будняў камсамолу, штодзённае яго работы па адбудоўванню разбуранай гаспадаркі.

„Зноў загулі на заводах машыны.
Новае ёсьць, ня стала руінаў
І ў гэтаи працы дні і ночы
Камсамол—чорнарабочы".

. . . . . .

Тэндэнцыі паказу камсамолу не ў абстрактна-патэтычных рысах, а ў творчай практыцы—гэта дадатны бок Александровічавага „Камсамолу".

„Камсамол—у фабзаўкоме
Камсамол—у сельсавеце".

У полі зроку паэты і мінулае камсамолу, калі ў агнёх грамадзянскай бойкі „гартавалі буры агнявыя нашы сілы маладыя—гартавалі камсамол", і суботнікі, і фронт вучобы, і змаганьне камсамолу за культурную рэвалюцыю:

„Сонца, распальвай стагодні сумёт.
Збавімся спадчыны катавай.
Гэй, камсамольцы,
Культурны паход,
Акопы культуры захватвай.
За школу,
За лазьню.
За клюб
За журнал,—
Энэргія волі
І кров
І запал".

І баявая гатоўнасьць да абароны:

„За кнігаю помнім мы
Кожнай хвілінай,
дзе і якая
Супроць нас краіна,
Вінтоўку трымаем
Штодня пры сабе,
Жыць рэвалюцыі.
Жыць барацьбе".

І моманты Інтэрнацыяналізму:

„Сусьвет—айчынай нам. Ня знаем межаў нацый,
Мы гартаваліся ў агні вялікай працы".

Але ўсё-ж такі ўся складанасьць, багацьце і канкрэтнасьць працы і жыцьця камсамолу аднаўленчага пэрыоду не знайшлі свайго шырокага, мастацкі тыпізаванага, абагуленага выяўленьня і ў творчасьці Александровіча. Усё гэта толькі асобныя рысы, схэматычна пададзеныя, асобныя кавалкі, між сабою мэханічна зьвязаныя. Тут яшчэ няма суцэльнага вобразу камсамолў ва ўсёй яго складанасьці і ў той-жа час—адзінстве. Гэта хутчэй паэтычна і эскізныя занатоўкі (прычым надзвычай схэматычныя) момантаў з бытнасьці камсамолу ў аднаўленчы пэрыод.

Але ня толькі гэтым вершам „Камсамол" Александровіч аддаў даніну камсамольскай тэматыцы. Трэба адзначыць, што шэраг іншых вершаў паэты, калі непасрэдна і не адлюстроўвае камсамолу, не бярэ яго сваім аб'ектам, то па сваёй ідэалёгічнай, баявой накіраванасьці зьяўляецца вельмі сугучнымі камсамолу і пралетарскай моладзі наогул. У апошні час Александровіч напісаў вялікую вершаваную п'есу, якая зьяўляецца першым буйным паэтычным творам беларускай пралетарскай літаратуры, прысьвячоным камсамолу.

Пэўную даніну камсамольскай тэматыцы мы сустрэнем у творчасьці Пятруся Броўкі.

У „Слове ў камсамольскіх спрэчках" (вершавая прамова на X зьезьдзе ЛКСМБ ад 10 студзеня 1931 г.) Броўка піша пра камсамол у рэканструкцыйны пэрыод, пра актыўны ўдзел камсамолу на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, пра змаганьне камсамолу за выкананьне пяцігодкі:

„Камсамольцы выходзяць
ударным атрадам
У вялікія дні
пяцігодкі.
Нас клікалі шахты—
мы далі ў шахты,
Нас клікала мора—
мы далі на мора,

нас звалі акопы—
мы далі ў акопы
усюды сваіх,
маладых і здаровых.
І вось, каб цяпер
пачаць пераклічку
творчых каморак
краіны нашай,
галасоў камсамольцаў
не пералічыш,
не перамерыш,
і ня ўзважыш".

Баявы заклікаючы настрой „Слова ў камсамольскіх спрэчках"— гэта асноўны ягоны дадатны бок. Але гэтага мала. Агульшчына, адсутнасьць канкрэтна-вобразнага паказу ролі камсамолу ў сацыялістычным будаўніцтве, схэматызм — гэтая агульная хвароба—зьяўляецца недахопамі і Броўкі.

Няма ў ягонай творчасьці жывых вобразаў камсамольцаў. Няма глыбокага, усебаковага, канкрэтнага ва ўсёй складанасьці і супярэчнасьці, ва ўсёй глыбіні паказу вобразу камсамольца, які змагаецца за пабудову сацыялізму. Гэта значыць, няма таго асноўнага, што патрабуецца ад камсамольскай літаратуры.

Некаторую ўвагу камсамольскай тэматыцы аддаў і Юлі Таўбін. („Райком" і інш.).

Але ягоны „Райком" не пазбаўлены інтэлігентшчыны ў горшым разуменьні гэтага слова. Яна перш за ўсё адчуваецца ў нейкай як-бы дыстанцыі, на адлегласьці якой, з боку паэта „восхищается" райкомам. Таму, што да мастацкіх сродкаў, адчуваецца пэўны імпрэсіёнізм. „Райком" носіць некаторы характар занатоўкі ўражаньняў, малюнкаў, якія паэта меў магчымасьць назіраць. Праўда, гэтыя ўражаньні, ці бачаныя малюнкі паэта прасякнуў, зьнітаваў адным сьветапоглядам, тэндэнцыяй. Але налёт, ці бачнасьць пабочнасьці ўражаньняў засталася. І ўжо ў гэтым папутніцкае крэдо „Райкому".

Пасьля напісаньня „Райкому" і іншых камсамольскіх вершаў Юлі Таўбін у сваёй далейшай творчасьці адышоў ад непасрэдна камсамольскай тэматыкі і камсамолу, чым яшчэ больш выявіў сваю дробнабуржуазную сутнасьць.

Але гэтая дробнабуржуазная сутнасьць выявілася вельмі поўна яшчэ і ў самім „Райкоме". Замест паказу кіраўнічай ролі партыі, волю якое і выконвае камсамол і ўся пралетарская моладзь, Таўбін надзяляе моладзь авангардзісцкай перадавой роллю, надае ёй ролю амаль што ні кіраўніка будаўніцтвам сацыялізму і тым самым скочваецца ў балота авангардзісцкіх, трацкісцкіх тэорый.

„Мы—моладзь. Моладзь—гэта ўсё
Мы—моладзь. Будучнасьць за намі...
... Мы аднаўлёныя стагодзьдзі
Мы ўперад на стагодзьдзі бачым". і г. д.

А дзе кіраўнічая роля партыі?— пытаемся мы! Так дробнабуржуазная прырода паэты, калі ён шчыльна ня зьвязаны з пралетарыятам, ня прымае чынага ўдзелу ў сац. будаўніцтве, зьместам творчасьці якога не зьяўляецца творчая практыка кіраўнічай клясы, прыводзіць да трацкісцкіх памылак.

„Сюсюканьне" па адрасу камсамолу

Калі некаторыя блізкія да пралетарскай літаратуры спадарожнікі змаглі даць больш-менш карысныя камсамолу творы, то іншы характар носяць заляцаньні да камсамолу некаторых паэтаў—спадарожнікаў, накшталт В. Маракова і Т. Кляшторнага, спадарожнікаў, якія і на сёньняшні дзень, праўда не ў аднолькавай ступені, але яшчэ ня здолелі належным чынам перабудаваць сваю творчасьць у адпаведнасьці з патрабаваньнямі рэканструкцыйнага пэрыоду. Камсамолу ў творчасьці гэтых паэтаў адведзена месца, вядома, менш за ўсё. У ранейшыя гады ў іхняй творчасьці камсамол быццам і не існаа-

ваў. Рэканструкцыйны пэрыод, выклікаўшы ў іхняй творчасьці пэўныя зрухі ў бок набліжэньня да сучаснасьці, выклікаў адначасова і тэндэнцыю павароту да камсамолу. І, замест таго, каб падыйсьці да справы паказу камсамолу ў мастацкай літаратуры (паэзіі) сур'ёзна, глыбока і на аснове ўсебаковага вывучэньня і азнаямленьня з жыцьцём камсамолу, на аснове прасякненьня ў тое, чым жыве сёньня камсамол, на аснове аўладаньня ідэямі авангарду нашае моладзі—даць высока-мастацкія, каштоўныя творы пра камсамол,—яны адбаярваюцца, як кажуць, адпіскамі, сюсюкаючага па адрасе камсамолу характару.

В. Маракоў піша верш „Камсамолу Мазыршчыны" (1929 г.). Паэту зацікавіў Мазырскі камсамол не на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, не ягоны твар у штодзённай, творчай, будаўнічай працы, а са сцэны аднаго з клюбаў Мазыру, дзе паэта выступіў з чыткаю вершаў. І адгэтуль, са сцэны, паэта робіць рэвэрансы ў бок камсамолу:

„ ... Вітаньне
Вам, сыны новай стараны...
... О, таксама з новай культурай
Іду аднэю з вамі паласой,
Каб несьці сьцяг змаганьня
Перамог!,
Гарэць (!?) імкненьне юных і жывых...
... Які ўздым!
Як сэрца б'е трывогу!
Як ўзьнята ружа (?) гордай (!?) галавы!.."

(„Верш. жад.", ст. 21—22).

А вось чытайце салодзенькія рэвэрансы ў бок камсамолу Т. Кляшторнага:

Пад заходняй зарой

„Цяпер другія далі навакол,
Усё, усё вакол памаладзела,
Выхоўвае наш камсамол
Здаровы дух у моцным целе.
Яму далёка войстрая журба,
Яму далёкі войстрыя надломы,
Яму адчай прыніжаны раба
Таксама сёньня невядомы.
Яны ўмеюць жыць і дагараць.
А не бяз жару и попелу засохнуць.
Спаборніцтва вам ня міраж,
А моцны пульс вялікае эпохі.
Наш камсамол сягоньня на чале (!?)
Вялікага сусьветнага імкненьня...
Вось, сапраўды, дзе моцны чалавек.
А не абстракцыя,
Не лятуценьні..." і г. д.

Тут ужо сюсюканьне проста пераходзіць ў трацкісцкі авангардзізм (камсамол, а не партыя—„на чале (!) сусьветнага імкненьня").

Яшчэ пару мясьцін, адрасаваных камсамолу, з паэмы Кляшторнага „Палі загаманілі":

„Узяўшы ўсё (?) гнілое на прыцэл,
Зьвяртаючы да тых,
Хто заўжды духам дужы:
„О, камсамолія,
З будоўлі новых сьцен
Пусьці на зьлом нікчэмненькія душы!
... О, камсамолія,
Мы разам крок у крок
Ідзем жыцьцё іначай перастроіць!
Мой кожны дзень
І кожны мой радок,
Як вартавы,
На ўдарным стане фронце..
Узяўшы ўсё былое на прыцэл,
Я гавару да вас,
Хто заўжды духам дужы:
О, камсамолія,
З будоўлі новых сьцен
Пашлём на сьметнікі мізэрненькія
душы"

(„Узвышша" № 4-5, 1931 г. ст., 73—74).

Супроць такое тэндэнтнае творчасьці пра камсамол, троцкісцкага сюсюканьня ў ягоны бок, замест глыбокага, сапраўды мастацкага паказу камсамолу, ягонага змаганьня пад кіраўніцтвам партыі, у беларускай паэзіі неабходна абвясьціць самую рашучую барацьбу.

Камсамолу Беларусі патрэбны сапраўдныя паэтычныя (і прозаічныя) творы, якія адлюстроўвалі-б гэраічнае змаганьне камсамолу ва ўсёй складанасьці ў высока-мастацкіх вобразах, а не рэвэрансы па адрасу камсамолу. Для гэтага патрэбны максымум увагі да камсамолу ня толькі з боку пралетарскіх

пісьменьнікаў, але і з боку спадарожнікаў. Досыць абмяжоўвацца падобнымі вышэйпаданымі тандэнтнымі адпіскамі. Пара ўжо адкінуць недаацэнку камсамольскай тэматыкі і ў шэрагах спадарожніцтва.

Супроць халтуры

І тут набывае асаблівы сэнс змаганьне з халтурнай літаратурай пра камсамол. Цяпер, калі ўсё больш і больш узрастаюць запатрабаваньні актуальнай тэматыкі, запатрабаваньні паказу камсамолу ў мастацкай літаратуры, халтура набывае асабліва небясьпечны характар. Трэба раз назаўсёды запомніць, што халтура зьяўляецца аднэй з формаў правай небясьпекі, формай буржуазнай рэакцыі на літаратурным фронце. Пісьменьніку, які знаходзіцца ў палоне буржуазнай, дробнабуржуазнай, мяшчанскай ідэалёгіі, часамі ў мэтах прыкрыцьця свае сапраўднае ідэалёгічнае сутнасьці даводзіцца прыбягаць да актуальнае, злабадзённае тэматыкі, як да зашчытных колераў. Падфарбаваўшыся пад гэты абаронны колер „актуальнасьці", „злабадзённасьці", ён часамі па палітычнай блізарукасьці нашых рэдактароў лоўка працягвае свае рэакцыйныя ідэйкі. У змаганьні з халтурай трэба не забываць ня толькі тое, што халтура кампрэмэтуе ў вачох пралетарскага чытача сваёй нізкай мастацкай якасьцю, антымастацкасьцю пралетарскую камсамольскую літаратуру, але нельга і забываць, што халтурнікі пад шыльдай злабадзённасьці вельмі і вельмі часта хаваюць буржуазна-мяшчанскі зьмест, рэакцыйную накіраванасьць. Трэба ўмець пад халтурай бачыць форму буржуазнай рэакцыі. Халтура асабліва шкодная тым, што яна выяўляе буржуазную рэакцыю на літаратурным фронце ў завэлюмаванай форме, пад якой звычайна пры павярхоўным падыходзе цяжка распазнаць буржуазна-кулацкую сутнасьць. Нельга выпускаць з-пад увагі, таго, што зараз буржуазна-кулацкая рэакцыя ў літаратуры гэта—галоўная небясьпека, вельмі і вельмі часта, і што далей, то часьцей, выступае ў форме халтуры, г. зн. у форме мімікрыі, у форме прыкрытай, завэлюмаванай, бо магчымасьці адкрытага, не завэлюмаванага выступленьня ўсё больш і больш звужаюцца.

Гэтая небясьпека набывае асабліва востры характар і па лініі камсамольскай тэматыкі. Клясавы вораг імкнецца скарыстаць гэты фронт для прапаганды сваіх клясавых, варожых нам інтарэсаў. Неабходна самая бязьлітасная, самая непрымірымая барацьба з буржуазна-кулацкай рэакцыяй і аднэй з яе форм—халтурай у камсамольскай літаратуры. На змаганьне з халтурай у камсамольскай тэматыцы зараз павінна быць зьвернута асаблівая ўвага з боку ўсяе савецкае грамадзкасьці, з боку ўсяго камсамолу і камсамольскіх пісьменьнікаў у першую чаргу. Нельга забываць, што тыя пісьменьнікі, якія ў лёгкай пагоні за знадворнай, календарнай злабадзённасьцю, бяз глыбокага аўладаньня сьветапоглядам пралетарыяту, вельмі часта скачваюцца на шлях халтуры і гэтым самым аб'ектыўна выяўляюць буржуазна-кулацкую рэакцыю, буржуазны наступ на пралетарскую літаратуру.

У апошні час халтура на паэтычным фронце камсамольскай літаратуры асабліва дае сябе адчуваць. Варта назваць такія зборнікі, ці паасобныя творы, як „Камсамольскія вершы" Юркі Лявоннага, „Веснацьвет" Зіны Бандарынай, паэму „Ліпнёвая радасьць" Паўлюка Ананьнева і цэлы шэраг іншых твораў, каб пераканацца, што халтура займае шырокае месца ў літаратуры пра камсамол.

Пра „Камсамольскія вершы" Юркі Лявоннага пісалі ўжо і гава-

рылі шмат. Усе выказваньні сыходзіліся на ацэнцы гэтага зборніку, як халтуры. Таму зараз спыняцца на ім ня прыходзіцца. Мы прывядзем толькі некаторыя мясьціны з вершаў, якія Юрка Лявонны асьмеліўся выдаць пад маркай „камсамольскіх". І тут мы відавочна пераканаемся ў тым, як пад шыльдаю „камсамольскага", халтурнік часта імкнецца працягнуць шкодныя мяшчанскія ідэйкі, якія разбройваюць, дэмабілізуюць камсамол у клясавым змаганьні.

Мяшчанскі зьмест, як-бы Лявонны ні вуаляваў яго надворнай вытрыманасьцю, рэволюцыйнасьцю, на кожным кроку прарываецца, прабіваецца праз лякіроўку. І тады паміж, здавалася-б, ультрарэвалюцыйных, барабанных, набраных з гучных слоў вершаў знаходзяць месца яўна абывацельскія, мяшчанскія настроі.

У вершы „Роднае" Лявонны становіцца ў позу сузіральніка, які, не знаходзячы апоры ў сучаснасьці, жыве смакаваньнем мінулых уцех, якія былі для яго забыцьцём, уцёкамі ад сучаснага:

„Сэрца, сэрца! Калышы
Зжытае каханьне...
Ой празрыста быцам шкло,
На палёх, над жытам...
... Дзе сказала ты калісьці:
„Пачакай!"
Памятаю—ці ўва сне?
(Думкі не застылі)—
Цярусіўся з вішань сьнег
І гарэлі жылы...
„У сярэбранай цішы
Гэтак лёгкі здані...
Ты мяне закалышы
Чарамі каханьня".

(*„Кам. вершы", ст. 32—33*).

Гэтыя дэмобілізуючыя настроі прасякаюць большасьць „камсамольскіх" вершаў Лявоннага. Для параўнаньня ідэалаў камсамолу і „хаценьняў" мешчаніна-абываталя, вуснамі якога гаворыць Лявонны, возьмем яшчэ ўрывак:

„Я хачу ня шмат чаго...
Суму, каб разьвеяцца,
Ды таго, гарачага (?)
Што ў вачох сінее так.
Я хачу—і будзе, мо'—(! ?)
Каб паменей холаду.
...Я хачу, каб век малы
Скончыць перамогаю.
Без пакуты, зьдекваньня (?)
Ісьці сваёй дарогаю.
Я хачу ня згубы.
Толькі крыху (усяго крыху—У. С).
радасьці,
Ды каб тая, любая,
Да пары (! ?) ня здрадзіла!.."

(*„Кам. вершы" ст. 26—27*).

У Лявоннага й прызыўнік напярэдадні прызыву аддаецца забыцьцю каханьня, мотывуючы гэта тым, што гэта, бачыце, толькі сёньня, а заўтра... ну то там будзе іншае...

„Эх, Марыля! Гэта—сёньня...
Ну, а заўтра—
У паход!..
Рыхтавацца трэба зноў нам,
Каб спакойна жыў народ"... (?!).

(*„Комс. вершы", стар., 19*).

Мы ўжо ня будзем казаць пра фармальна-тэхнічны бок „Камсамольскіх вершаў" Лявоннага. Галоўнае ў тым, што нясучы назву „Камсамольскіх вершаў" і гэтым самым прэтэндуючы на паказ камсамолу, зборнік Лявоннага ўяўляе сабою, па сутнасьці, паклёп на камсамол. Камсамол паўстае ў ім праз абывацельска-мяшчанскае шкелца. І ў гэтым ня толькі кампрамэнтацыя беларускай камсамольскай паэзіі, але гэта становіць „Камсамольскія вершы" Лявоннага ў шэраг фактаў, што характарызуюць буржуазную рэакцыю на літаратурным фронце.

Такі-ж характар носіць паэма „Ліпнёвая радасьць" Паўлюка Ананьнева, зьмешчаная ў III зборніку Віцебскай філіі БелАПП „Рытмы будаваньня", які вышаў у 1931 г.

Аўтар гэтага халтурнага твору (гэрой „паэмы" называе сябе прозьвішчам аўтара—Ананьневым), успа-

мінае, як ён калісьці аднойчы сустрэў якуюсьці вясковую дзяўчыну. На фоне сантымэнтальна-падсалоджанай прыроды гэрой завязвае раман. Ён, называючы сябе камсамольцам, у поэме на кожным кроку клянецца камсамолам і часта гаворыць ад яго імя. І вось гэты „камсамолец", а на самай справе нейкі мешчанчук, расказвае чытачу свае кахальныя прыгоды, смакуючы на ўсякія лады сэксуальны бок гэтых прыгодаў. З усімі падрабязнасьцямі ён апавядае, як у забыцьці каханьня „ён аддаў і юнацтва і сэрца", як ён „выпіў каханьне".

„Ой ты, ноч. З гольля капалі сьлёзы,
Усьміхалася зорамі даль,
За кахальную радасьць цьвярозую
Я юнацтва і сэрца аддаў.
Мілы мой, о зялёны мой ліпень,
Ведай сам, а другім не кажы
Што каханьне я першы раз выпіў
Там, дзе ўюцца дарогі—крыжы.
...А за рэчкай таполі шамрэлі,
Звон а хлюпаў крыніцы струмень,
Выплываў у паветраных мелях
На чаўне з-па-за хмар цьмяны дзень.
Бляды месяц з зарой прывітаўся,
Ды і зьнік, ці пабег наўцёк...
А я гладзіў шаўковыя пасмы,
Захапляўся пунцовасьцю шчок".

(*„Рытмы буд."*, *стар. 203-204*).

Расьпісаўшы, як належыць, сваё мяшчанскае каханьне, аўтар далей расказвае, як ягоны аб'ект кахальных прыгод з вёскі выяжджае на вучобу ў Ленінград. Гэрой упадае ў сумоту, пэсымізм. Каб знайсьці выйсьце з свайго пэсымістычнага становішча, ён едзе на рабфак. Але сумота па каханцы і тут не дае спакою нашаму нешчасьліўцу. І на некалькіх старонках аўтар адводзіць месца каханьню ў сумотных настроях гэроя. Каханка з Ленінграду яго супакойвае лістамі:

„Будзе зноў і вясна і раздольле,
Прыляціць статак зноў лебядзей,
Тады пойдзем мы ў жытняе поле,
Я цябе прыгарну да грудзей".

(*„Рытмы буд."*, *стар.*, *20*)

Гэтае абяцаньне „зноў прыгарнуць да грудзей" крыху сьцішае сум нашага „гэроя", і ён у парыве ўздыму робіць рэвэрансы ў бок новае вёскі, камсамолу, сучаснага. Але паслухайце, як гэта тандэтна, халтурна гучыць:

„Цьвіце—расьце плякатам (?)
пышным (!) вёска
Напорна йдзе да сьвету ліхтароў.
І я прыпомню першыя пялёсткі,
І любай россып залатую слоў.
Я веру, знаю—ў кожным камсамольцы
Расьце сьвядомы—новы будаўнік.
І я аддам заранкавыя колцы
Маіх сьпяванай за крышталі (?) дні.
Ужо ўзнуздаў агонь паліць па сьвету
Яздок-гэрой (?) чырвонага каня (!),
А мы штурмуем кніжку і газэту
І гымн сьпяваем пераможным дням".

(*„Рытмы буд."*, *стар. 210*).

Але і гэтыя рэвэрансы, хай і халтурныя, па адрасу сучаснага камсамолу ў паэме носяць выпадковы характар. Гэрою больш з радні ныць па каханай. Таму яго так і мучыць праз увесь час вострая журба, якую ён стараецца, то „замарозіць у сьцюдзёных песьнях-пералівах зімовага ветру", то патапіць у вучобе. Апошняя для гэроя паэмы зьяўляецца сродкам забыцьця ад насову журбы па каханай. Але гэтага ніяк яму не пазбавіцца.

„І ня раз я ў сваім інтэрнаце
У гэту стынь штурмаваў „першы
том"
Размаўляць я ўжо з Марксам
паладзіў,
Часты госьць на стале Ляфарг Поль,
Толькі цяжка, ой цяжка загладзіць
Дзён вясновых срабрыстую боль.
Помню лета і ліпень і бровы..."

(*„Рытмы буд."*, *стар. 208*).

— І вось гэтыя „бровы" не даюць супакою гэрою. Яны яго мучаць, і як-бы ён ні стараўся забыцца на іх, кідаючыся да сучаснай вёскі, выйсьці з іхнага палону ён ня ў сілах. Яму толькі і сьніцца, як—

„Я хватаю
Любую ў абнімкі,

А ў адказ—
Гарачы пацалунак...“

(„*Рытмы буд.*“, *стар. 212*).

Такая абыватальская пашляціна прасякае ўсю паэму.

Але справа яшчэ ў тым, што побач з гэтай пашляцінай, прыкрываючыся густа ўсыпанай на кожнай старонцы рэвалюцыйнай фразэалёгіяй, праводзяцца яўна рэакцыйныя ідэйкі. Пад шыльдаю паказу новага ў вёсцы, пад вэлюмам халтурных дыфірамбаў па адрасу камсамолу, у паэме „Ліпневая радасьць“ Паўлюк Ананьнеў, хоча ён таго ці ня хоча, праводзіць яўна кулацкія тэндэнцыі паклёпу на пралетарскі горад, тэндэнцыі супроцьстаўленьня яму вёскі. Справа ў наступным:

Гэраіня паэмы—Марыся (каханка гэроя)—у пралетарскім цэнтры Ленінградзе нічога, акрамя багэмы ня ўбачыла. Пралетарскі горад застаўся па-за яе ўвагаю. Падаючы вобраз Марысі ў пачатку паэмы, як вобраз ідэальнай, чыстай сялянкі, аўтар далей праводзіць кулацкую ідэйку, што горад сапсаваў яе, скалечыў. Увогуле нешта накшталт Дударавага „Ветру з усходу“, дзе горад падаецца як носьбіт усяго адмоўнага і ў якім вясковы хлапец, прыехаўшы на вучобу, пападае ў багэмскае асяродзьдзе, разлагаецца. Так і Марыся, паехаўшы ў Ленінград на вучобу, знайшла там толькі багэму, у якой губляе ўвесь свой мінулы вясковы твар; багэма, уцягнуўшы яе ў сваё логава, калечыць. Праілюструем урыўкам з яе ліста да вядомага нам гэроя:

„К сэрцу гора падпаўзае вужам,
Пацямнела зорнасьць у вачах.
Праплылі цудоўныя імкненьні.
Патанула радасьць у туманах,
На маіх шляху яры, каменьні...
Я цяпер—адна... Адна...“

Дзе ты, дзе, каханы мой, далёкі?
Мо' жо на прысьбе шэрых хат?
Я цяпер за буслаў стук і клёкат,
Аддала-б адразу Ленінград.
Ленінград... і неўскія гулянкі...
Енк гітары... у зале бляск і ціш...
Мне юнацтва атруцілі рана,
Загубілі мэту у жыцьці.“.

Некалі кулацкі сьпявака Язэп Пушча ў сваіх „Асеньніх песьнях“ амаль гэтак-жа ўспрыняў пролетарскі цэнтр — Ленінград. І тут Ананьнеў змыкаецца з гэтымі кулацкімі плёткамі пра пролетарскі горад.

„Душна мне сярод муроў і цяжка...
Мне-б цяпер у далях росных быць...
... Я згубіла сэнс жыцьця і працы
(Так вясковы часта гіне люд)“.

(„*Рытмы буд.*“, *стар. 223*).

Гэтую ідэю гібеньня „вясковага люду“ ў пралетарскім горадзе аўтар разьвівае ў паэме і далей. Выхад з становішча, выходзіць з паэмы, трэба шукаць толькі ў звароце на вёску. Аб пролетарскім асяродзьдзі гораду ні гуку, яно абсалютна ігнаруецца, абмінаецца, як нешта няіснуючае. У якасьці лекаў гэрой паэмы раіць гэраіні вярнуцца ў вёску. І тут яна знаходзіць збавеньне, выхад з таго становішча, у якім апынулася ў горадзе.

„Дзяўчыну знаў... на выцьвеўшых вачох
З тугой рабінавай (у Піцер лёс закінуў
І насьмяяўся)... Гора ні-пачом...
Яна з другімі ложыць канюшыну.
І зьзяе твар усьмешкай пекных зор,
А вочы сэрца мне здалёк мяцеліць“.

(„*Рытмы буд.*, *стар. 231*).

Так кулацкую ідэю, няпрыняцьце і варожасьць дагораду, Ананьнеў прывёў, як бачым з пэўнай пасьлядоўнасьцю, прычым так завэлюмавана, што адразу можа здацца паэма рэвалюцыйным творам, тым больш прыемным, што гэроем выступае камсамолец, ды й на кож-

ным кроку паэма „ўпрыгожана" такімі вось „камсамольскімі матывамі", як:

„Сабірайся. камсамолія!
Гайда з песьнямі ўпярод!
У Абрузава Міколы
Мы бязбожны зробім сход".

(*„Рытмы буд."*, *стар. 222*).

А сам гэрой—аўтар на кожным кроку абяцае—

„А я ў песьні камсамольца
Радасьць жыцьця пералью".

(*„Рытмы буд"*. *стар. 222*).

Усё гэта толькі лішні раз сьведчыць аб тым, што халтура зьяўляецца формай мімікрыі буржуазна-кулацкай рэакцыі на літаратурным фронце, і ў прыватнасьці на фронце камсамольскай тэматыкі. Гэта гаворыць, што халтура выступае ў цеснай змычцы з буржуазнай рэакцыяй у літаратуры. І ўсё гэта гаворыць за неабходнасьць узмацненьня змаганьня з халтурай, узмацненьня агню па халтуры ў камсамольскай тэматыцы. А такою-ж халтураю, наборам агульных слоў і мэханічнай зрыфмоўкі іх зьяўляюцца і вершы пра камсамол Зіны Бандарынай у зборніку „Веснацьвет" (вершы „Камсамол Беларусі", „Камсамол у паходзе" і інш.).

І прыходзіцца дзівіцца, што гэткія творы, як „Ліпнёвая радасьць" Паўлюка Ананьнева, „Камсамольскія вершы"—Лявоннага і „Веснацьвет" З. Бандарынай убачылі сьвет у 1931 годзе. Правільна адносна халтуры паставіў пытаньне т. Авэрбах:

„Што мы робім для таго, каб па сапраўднаму выпаліць гэтую сьмяцьцёвую траву, якая ў нас маецца ў вялізарнай колькасьці? Дзе ў нас быў паказальны суд над рэдактарамі кніжок чырвонай халтуры? Дзе мы зьнялі таго ці іншага выдаўца, які выпусьціў гэтую чырвоную халтуру? Дзе арганізаваны грамадзкі суд над такімі рэдактарамі, якія друкуюць халтурныя рэчы?

Зараз усе згаджаюцца, што трэба зьнішчаць і біць чырвоную халтуру. Давайце пра гэта менш гаварыць, але больш рабіць".

„Выкрываць, прасьледваць, зьнішчаць чырвоную халтуру"—гэта нашыя штодзённыя задачы.

А паглядзеце ў нашы часопісы. Колькі там друкуецца яшчэ халтуры. Патрэбна мабілізаваць увагу ўсяго камсамолу, усіх пісьменьнікаў, усяе савецкае грамадзкасьці на змаганьне з халтурай у камсамольскай літаратуры, не паслабляючы пры гэтым змаганьня з адкрыта-буржуазнымі тэндэнцыямі. Кожны нумар нашых часопісаў, кожная літстаронка, кожны зборнік пад агонь змаганьня з буржуазна-кулацкай рэакцыяй—у якой-бы яна форме не праяўлялася: ці ў форме адкрытай рэакцыі, ці ў форме чырвонай халтуры!

За рашучы паварот тварам да камсамольскай тэматыкі

За вялікае мастацтва бальшавізму ў камсамольскай тэматыцы

Падагульваючы ўсё вышэйсказанае, мы вымушаны адкрыта і рэзка заявіць, што паказ камсамолу ў беларускай паэзіі недастатковы, ды і ня толькі недастатковы, але і нездавальняючы. Усе тыя спробы ў гэтай галіне яшчэ зусім не адпавядаюць тым патрабаваньням, якія высоўваюцца перад камсамольскай літаратурай нашай эпохай. Усе яны ў вельмі і вельмі малой ступені адказваюць задачам стварэньня камсамольскай літаратуры, вартай камсамолу. Жыцьцё камсамолу нагэтулькі апярэдзіла ўсе гэтыя спробы, што можам сьцьвярджаць значнае адставаньне камсамольскай літаратуры наогул і паэзіі ў прыватнасьці ад тэмпаў рэканструкцыйнага пэрыоду.

Для ліквідацыі адставаньня камсамольскай літаратуры ад жыцьця камсамолу ў рэканструкцыйны пэрыод неабходна ў першую чаргу мабілізацыя ўвагі вакол камсамольскай тэматыкі ўсяго БелАПП'у, усіх пісьменьніцкіх кадраў. З недаацэнкай камсамольскай тэматыкі неабходна пакончыць самым рашучым чынам. А да гэтага часу трэба сказаць ясна і адкрыта, з боку БелАПП'у камсамольскай тэматыцы, стварэньню камсамольскай беларускай літаратуры ня было аддадзена належнае ўвагі. Толькі ў самы апошні час некаторую ўвагу гэтаму пытаньню ўдзяляе камсамольская ячэйка пісьменьнікаў і „Чырвоная зьмена". Але гэтага зусім недастаткова. Патрэбен рашучы пералом у адносінах да камсамольскай літаратуры, як аднаго з важнейшых вучасткаў пралетарскай літаратуры. Праблемы камсамольскай літаратуры павінны стаць разам з іншымі пытаньнямі ў асяродку ўвагі і ўсяе працы БелАПП'у.

БелАПП тварам да камсамольскай тэматыкі, да камсамольскай літаратуры—такое запатрабаваньне на сёньняшні дзень у правох высунуць камсамол да БелАПП'у, бо гэтага пакуль што няма.

Камсамол Беларусі цікавіцца беларускай мастацкай літаратурай. Ён павінен мець сваю мастацкую літаратуру, паэзію. Для гэтага неабходна мабілізацыя ўвагі лепшых творчых сіл беларускай пралетарскай літаратуры.

Тут набывае асабліва вялікую важнасьць праца з рабочымі-ўдарнікамі, закліканымі ў літаратуру, бо асноўны склад іх маладыя рабочыя камсамольцы. Яны сваёй творчасьцю нясуць у літаратуру тое новае, сёньняшняе, сьвежае, што ў сваім разьвіцьці створыць сапраўдную камсамольскую літаратуру, вартую гэраічнага камсамолу, што здолее вывесьці камсамольскую літаратуру з становішча адставаньня ад жыцьця камсамолу рэканструкцыйнага пэрыоду, што ўвойдзе арганічнай часткаю ў вялікае мастацтва бальшавізму. Але гэта станецца толькі пры ўмове бязупыннай творчай дапамогі, пры ўмове здаровай сыстэматычнай крытыкі творчасьці рабочых ударнікаў і змаганьня з праявамі сюсюканьня па адрасу іхняе творчасьці.

Шмат новага здаровага вы сустрэнеце ў зборніку менскіх рабочых ударнікаў. Адзначым, між іншым што і тэму каханьня, якую так змусоліў абыватальска-мяшчанскай трактоўкай Лявонны і Ананьнеў, рабочыя-ўдарнікі падаюць у зусім іншым сьвятле—здаровым пралетарскім у навай трактоўцы.

Як дасягненьне мы маем ужо творы пра камсамол, напісаныя рабочымі-ўдарнікамі, камсамольцамі, як „Говар машын" (Зборнік Віцебскай філіі БелАПП „Рытмы будаваньня") і „Людзі вялікіх спраў" („Маладняк" № 9, 1931 г.) маладога пралетарскага паэты Андрэя Ўшакова і інш., у якіх знаходзіць свае адлюстраваньне гэраічная барацьба камсамолу на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

У творчасьці Андрэя Ўшакова мы маем спробы паказу камсамолу, паказу рабочай клясы на вытворчасьці, у змаганьні з прарывамі, у перамогах, горасьцях і радасьцях без якой-бы то ні было падробкі пад рабочую тэматыку, як гэта мае месца ў інтэлігенцкай, дробнабуржуазнай, халтурнай, фальшывай падробцы пад рабочую і камсамольскую тэматыку Юркі Лявоннага і Паўлюка Ананьнева (гл. вершы апошняга ў „Узвышшы" за мінулыя два гады). Вядома, вершы Андрэя Ўшакова і іншых рабочых-ударнікаў непазбаўлены значных недахопаў. Гэта перш за ўсё—схэматызм, плякатнасьць, элемэнты павярхоўнасьці, сьлізганьня па паверхні, як вынік недахопаў сьветапогляду. Аўладаньне марксысцка-

ленінскім сьветапоглядам—зарука ліквідацыі ўсіх гэтых недахопаў у творчасьці рабочых-ударнікаў.

Рабочая непасрэднасьць, арганічнасьць і канкрэтнасьць паказу, адыход ад агульнае дэклярацыйнасьці і рыторыкі—усё гэта выгадна вылучае творчасьць Андрэя Ўшакова і іншых паэтаў рабочых ударнікаў-камсамольцаў ад інтэлігенцкага сюсюканьня ў бок камсамолу некаторых іншых пісьменьнікаў і няпісьменьнікаў (халтурнікаў).

Пралетарская камсамольская літаратура папаўняецца новымі сіламі з нетраў рабочае клясы. У гэтым парука таго, што беларускі камсамол пры належнай увазе ўсяго пралетарскага літаратурнага руху створыць сваю літаратуру.

АД РЭДАКЦЫІ.

Часопісь „Маладняк" уключылася ў творчы агляд камсамольскай літаратуры.

Друкуючы артыкул тав. Сядуры, рэдакцыя агаварвае сваю нязгоду з паасобнымі думкамі аўтара.

Сьцьвярджаючы, што „аўладаньне сьветапоглядам павінна адбывацца на аснове практыкі... і толькі ў практыцы будзе правярацца мера аўладаньня ідэямі Маркса, Энгельса і Леніна" (стар. 144), аўтар выпускае з-пад увагі тое, што тэорыя ад практыкі ня можа быць адарвана ў справе аўладаньня сьветапоглядам.

Няправільным зьяўляецца сьцверджаньне аўтара, што „пара ўжо адкінуць недаацэнку камсамольскай тэматыкі ў шэрагах спадарожніцтва". Гэтым аўтар адмаўляе камсамольскую літаратуру як неатрыўную частку пралетарскага літаратурнага фронту.

Неабходна аднатаваць пярэчаньні аўтара самому сабе ў ацэнцы творчасьці рабочых ударнікаў і някрытычны падыход да іх творчасьці.

Рэдакцыя ня згодна з паасобнымі ацэнкамі паасобных пісьменнікаў (Броўка і інш.).

Трэба адзначыць і тое, што артыкул, Сядуры далёка ня поўны, не ахапляе ўсяго матарыялу, не вызначае пэрспэктыў далейшага разьвіцьця камсамольскай літаратуры.

Да гэтых пытаньняў рэдакцыя зьвернецца ў наступных нумарох.

ХРОНІКА

Сацыялістычнае спаборніцтва паміж БДТ-І і Украінскім чырвоназаводзкім тэатрам

5 студзеня ў Доме пісьменьніка ў прысутнасьці прадстаўнікоў вМенАПП і тэатральнай грамадзкасьці Менску адбылося ўрачыстае падпісаньне ўмовы на сацыялістычнае спаборніцтва паміж Першым беларускім дзяржаўным тэатрам і Украінскім чырвоназаводзкім тэатрам.

Знаёмства тэатраў адбылося яшчэ на алімпіядзе мастацтва ў Маскве, улетку 1930 г. Увосень 1930 г. у Віцебску быў падпісаны першы дагавор на сацспаборніцтва.

Гастролі І Белдзяржтэатру па Савецкай Украіне (Харкаў, Кіеў) яшчэ мацней зьвязалі гэтыя абодва тэатры адзіным імкненьнем і адзінай барацьбою за пралетарскі тэатр.

Рэжысэр БДТ-І тав. Рахленка, адчыніўшы ўрачыстае пасяджэньне, зачытаў вынікі першага дагавору. Па шэрагу пунктаў пераможцам вышаў Украінскі чырвоназаводзкі тэатр.

Тав. Рахленка ў сваёй прамове асабліва адзначыў неабходнасьць разгортваньня ў абодвух тэатрах шырокай бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі ва ўсіх галінах творчай працы, неабходнасьць жорсткага перагляду прыёмаў і мэтадаў працы, неабходнасьць разгортваньня вучобы па аўладаньні марксысцка-ленінскай тэорыяй, неабходнасьць весьці барацьбу за партыйнасьць нашага мастацтва і за вядучую ролю пралетарскай драматургіі.

Т. т. Ліманоўскі і Кобец у сваіх прывітальных прамовах адзначылі выключную палітычную важнасьць падпісаньня сацумовы паміж БДТ-І і Харкаўскім чырвоназаводзкім тэатрам.

Рэжысэр Чырвоназаводзкага тэатру т. Канеўскі, адказваючы на ўсе прывітаньні, даў усебаковую ацэнку праробленай працы абодвух тэатраў. Прамоўца спыніўся на пытаньнях нацыянальнай палітыкі камуністычнай партыі, на аснове якой раней прыгнечаныя народы атрымалі магчымасьць будаваць сваю культуру, сацыялістычную па зьмесьце і нацыянальную па форме.

Тав. Канеўскі падкрэсьліў неабходнасьць рашучай барацьбы за падвышэньне якасьці нашай працы, за ўтварэньне мастацкіх каштоўнасьцяй, адпавядаючых нашай вялікай эпосе.

Вечар закончыўся канцэртам з удзелам артыстаў БДТ-І і ўдарных брыгад рабочага тэатру ЦСПСБ.

Інтэрнацыянальная пісьменьніцкая брыгада на Беларусі

Выбраная на Ўсесаюзнай канфэрэнцыі аўтарскіх таварыстваў інтэрнацыянальная дэлегацыя пісьменьнікаў у складзе т.т. Амаглобелі, Бухнікашвілі, Вішні, Досьвітнага, Дняпроўскага, Жгенці і Карнейчука прыяжджала на Беларусь для азнаямленьня з дасягненьнямі беларускага пралетарыяту ў сацыялістычным будаўніцтве, для абмену вопытам культурна-нацыянальнага будаўніцтва савецкіх рэспублік і ўстанаўленьня пастаяннай сувязі паміж пралетарскімі атрадамі мастацтва народаў СССР.

Дэлегацыя пісьменьнікаў азнаёмілася з вялізарнымі дасягненьнямі беларускага пралетарыяту на фронце гаспадарчага будаўніцтва, а таксама ў мастацтве і літаратуры.

Дэлегацыю і прадстаўнікоў беларускай АПП—т.т. Лынькова, Александровіча, Барашку і Бэндэ—прыняў старшыня Саўнаркому БССР т. Галадзед. У гутарцы старшыня СНК паведаміў, што некаторыя прадпрыемствы Беларусі ўжо выканалі пяцігодку, што па ўсіх вучастках пяцігодка будзе выканана ў 4 гады, і што па некаторых галінах яна будзе перавыканана.

Азнаёміўшы дэлегацыю з гаспадарчым становішчам дарэвалюцыйнай Беларусі і тымі дасягненьнямі, якіх беларускі пралетарыят дабіўся за апошнія гады, т. Галадзед рассказаў аб посьпехах культурнага будаўніцтва ў рэспубліцы. У заключэньне ён прасіў дэлегацыю, каб прадстаўнікі пралетарскіх і савецкіх пісьменьнікаў братніх рэспублік аддавалі больш увагі пытаньням сацыялістычнага будаўніцтва Беларусі, каб сувязь паміж пралетарскімі і савецкімі пісьменьнікамі братніх рэспублік і Савецкай Беларусі была замацавана і зрабілася пастаяннай.

Дэлегацыя прыняла гэты сацыялістычны рахунак.

Дэлегацыя прысутнічала на прэм'еры Другога беларускага дзяржаўнага тэатру (п'еса пралетарскага пісьменьніка Александровіча—„Напор"), выступіла на канфэрэнцыі настаўнікаў у Гомелі з дакладам аб нацыянальна-культурным будаўніцтве і прыняла ўдзел у шэрагу літаратурных выступленьняў сумесна з БелАПП.

Перад ад'ездам інтэрнацыянальная брыгада пакінула ў рэдакцыі „Зьвязды" наступны калектыўны ліст:

— Інтэрнацыянальная дэлегацыя пісьменьнікаў, вылучаная Ўсесаюзнай канфэрэнцыяй драматургаў, кампазытараў, сцэнарыстаў і аўтараў малых форм, пазнаёміўшыся з гаспадарча-культурным сацыялістычным будаў-

ніцтвам Савецкай Беларусі і завязаўшы братнія сувязі з пралетарскім атрадам беларускага мастацтва, пераконана, што наладжаная сувязь з кожным днём будзе ўзмацняцца на аснове ажыццяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, на аснове бальшавіцкага адзінства нацыянальных пралетарскіх культур усіх народаў СССР.

У Савецкай Беларусі—нябывалы гаспадарча-культурны росквіт, пасьпяховае выкананьне пяцігодкі, перамогі на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва. А там, за рубяжом—гаспадарча-культурнае дзікае падняволеньне Заходняй Беларусі польскім фашызмам, зьбядненьне працоўных мас і нячуваны палітычна-нацыянальны ўціск. Гэта зьяўляецца яскравым прыкладам, які характарызуе вырашэньне сацыяльных і нацыянальных пытаньняў у сыстэме сацыялізму, пры дыктатуры пралетарыяту, і ў сыстэме капіталізму, пры дыктатуры контррэвалюцыйнай буржуазіі і яе авангарду—фашызму і сацыял-фашызму.

Інтэрнацыянальная дэлегацыя пісьменьнікаў ужыве ўсе меры да таго, каб паказаць перад шырокай пралетарскай грамадзкасьцю сваіх братніх рэспублік буйнейшыя дасягненьні беларускага пралетарыяту пад кіраўніцтвам партыі ў барацьбе за сацыялізм. Дэлегацыя будзе змагацца за ўзмацненьне культурнай сувязі паміж братнімі нацыянальнымі рэспублікамі Савецкага саюзу, за абмен ня толькі культурнымі дасягненьнямі, але і ўзаемным прыцягненьнем пісьменьнікаў і мастакоў да стварэньня Магнітабудаў пралетарскага мастацтва на матэрыяле барацьбы пралетарыяту ўсіх народаў нашага вялікага Саюзу.

Члены інтэрнацыянальнай дэлегацыі пісьменьнікаў з новым запасам радасьці і энтузыязму, атрыманым ад перамог будаўніцтва сацыялізму ў Беларусі, накіроўваюцца ў розныя канцы Савецкага саюзу, каб перадаць баявое бальшавіцкае прывітаньне ад беларускага пралетарыяту, пралетарскіх пісьменьнікаў і работнікаў мастацтва пралетарыяту братніх народаў і садзейнічаць яшчэ больш моцнай культурнай сувязі паміж Савецкай Беларусьсю і іншымі братнімі народамі СССР.

С. Амаглобелі, Г. Бухнікашвілі' О. Вішня, О. Досьвітны, М. Дняпроўскі, Б. Жгенці, А. Корнейчук.

Ствараем усебеларускі цэнтр сацыялістычнай навукі

29 студзеня ЦК КП(б)Б вынес пастанову аб рабоце Беларускай акадэміі навук.

Гэтая пастанова адкрывае перад Акадэміяй вялізарнейшыя пэрспэктывы разьвіцьця. Падкрэсьліваючы, што работа Беларускай акадэміі навук павінна праводзіцца на аснове ажыццяўленьня ўказаньняў т. Сталіна і шчыльнай сувязі з сацыялістычным будаўніцтвам, рэзалюцыя ЦК КП(б)Б гаворыць аб цэлым радзе практычных мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць арганічную ўвязку навукі з сучаснасьцю.

Ставячы пытаньне аб далейшым укамплектаваньні Акадэміі марксысцкімі навуковымі кадрамі, рэзалюцыя ЦК КП(б)Б зусім правільна канцэнтруе асноўную ўвагу на арганізацыі працы навуковых работнікаў. На аснове пастановы ЦК КП(б)Б прэзыдыум Акадэміі зараз правярае нагрузку сваіх навуковых работнікаў з тым, каб іх работа працякала толькі ў сьценах Акадэміі, дапускаючы пры гэтым норму пэдагагічнай работы ў разьмеры, які не перашкаджаў-бы асноўнай, навуковай рабоце.

Асаблівую ролю адыгрывае пастанова ЦК КП(б)Б аб рэалізацыі Акадэміяй пастановы СНК ад 18 мая мінулага году па плянаваньні навукова-дасьледчай работы ў БССР. Правядзеньне ў жыцьцё гэтай пастановы СНК мае вялізарнае значэньне ў справе шчыльнай увязкі навукова дасьледчай работы з сучаснасьцю. У даны момант у Акадэміі сабраны пляны работы ўсіх навуковых устаноў БССР. Плянава-арганізацыйны сэктар Акадэміі гэтыя пляны ўжо разгледзеў і робіць сваё заключэньне. Апрача таго, на працягу году на прэзыдыуме будуць заслухоўвацца справаздачы навуковых устаноў БССР.

Важнай задачай Акадэміі зьяўляецца кантроль над тым, як ажыццяўляюцца навуковыя дасягненьні. Мы маем шмат выпадкаў, калі навуковыя адкрыцьці Акадэміі, якія маюць вялізарнае гаспадарчае значэньне, не скарыстоўваюцца нашымі ўстановамі. Пастанова ЦК КП(б)Б аб уключэньні дырэктароў Інстытутаў БАН у склад наркаматаў або адпаведных гаспадарчых устаноў дасьць магчымасьць сачыць за тым, як навуковыя дасягненьні сваячасова выкарыстоўваюцца ўстановамі ў іх апэрацыйнай рабоце.

Акадэмія ў гэтым годзе ставіць, як баявую задачу, шырокае разгортваньне масавай работы па прапагандзе навуковых і тэхнічных ведаў. Толькі ў шчыльнай сувязі з шырокімі працоўнымі масамі можна сапраўды справіцца з задачамі, якія стаяць перад БАН.

Студзеньская пастанова ЦК КП(б)Б ставіць рад вузлавых задач у справе далейшага разьвіцьця навуковай работы ў БССР і пераварэньні Акадэміі ў сапраўдны цэнтр беларускай сацыялістычнай культуры, вызначае задачы па падрыхтоўцы новых навуковых кадраў і бальшавіцкіх адносін да беспартыйнай савецкай інтэлігенцыі, падняцьці якасьці навуковых ведаў нашых работнікаў і г. д.

У сучасны момант у інстытутах і сэктарох Акадэміі рэзалюцыя ЦК шырока абгаварваецца, і ў сувязі з гэтым ажыццяўляецца цэлы рад практычных мерапрыемстваў.

ЦИК СССР. им. М. Горького

ІА 50 КАП.